# ПАМЯЦЬ

## УШАЦКІ РАЁН

МІНСК
БЕЛТА
2003

# 1941

# 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

### Так пачыналася...

22 чэрвеня 1941 г. у чатыры гадзіны раніцы нямецка-фашысцкія войскі нанеслі моцны бомбавы ўдар па чыгунцы, аэрадромах, групоўках савецкіх войскаў, размешчаных уздоўж дзяржаўнай мяжы. Пад прыкрыццём шквальнага агню рушылі ўдарныя групы гітлераўцаў. На тэрыторыю Беларусі ўварваліся войскі групы армій «Цэнтр». У яе склад уваходзілі 2 арміі (4-я і 9-я) і 2 танкавыя групы (2-я і 3-я) — усяго 50 дывізій. Наступленне падтрымліваў 2-і паветраны флот (1670 самалётаў). Ім супрацьстаялі войскі Заходняга фронту, які складаўся з 3, 10 і 4-й армій. Вялікая перавага сіл праціўніка, раптоўнасць яго нападу, непадрыхтаванасць савецкіх войскаў зрабілі сваю справу. Чырвоная армія несла цяжкія страты, нашы воіны траплялі ў акружэнне, палон. Але іх стойкасць і адвага ў жорсткіх баях на некаторых напрамках скавалі сілы праціўніка. Тым не менш спыніць наступленне нямецкіх войскаў было немагчыма. Яны блакіравалі вузлы супраціўлення савецкіх войскаў, абыходзілі іх і працягвалі рух на ўсход.

Зламаўшы абарону на флангах Заходняга фронту, варожыя злучэнні рушылі ў напрамку Вільнюс—Мінск, плануючы акружыць яго галоўныя сілы, адсекчы іх ад войскаў Паўночна-Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў.

Вестка аб вайне хутка дайшла і да Ушаччыны. На прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах прайшлі сходы. Усе былі ўзрушаны. Не верылася, што вайна дойдзе і сюды. Спадзяваліся, што Чырвоная армія спыніць ворага і адкіне яго назад. Але з кожным днём паступалі ўсё больш трывожныя паведамленні. Ушацкі райваенкамат атрымаў шыфроўку з аблваенкамата. Пачалася мабілізацыя. Частка мабілізаваных была накіравана ў Полацкі ўмацаваны раён.

25 чэрвеня ў раён прыйшло распараджэнне аб эвакуацыі. Ушацкі райком КП(б)Б, разгледзеўшы гэта пытанне, вызначыў установы, прадпрыемства для эвакуацыі, прызначыў адказных. Падрыхтаваліся да эвакуацыі тры МТС раёна. Найбольш удала прайшла эвакуацыя Велікадолецкай МТС. Яе тэхніка ішла сваім ходам пад бамбёжкамі ў напрамку Шклова праз Смаленшчыну да Ельні. Тураўская МТС дайшла толькі да Улы.

Калгаснікі хавалі малатарні і іншыя сельскагаспадарчыя машыны. Так на тэрыторыі Зарэчанскага сельсавета былі закапаны 20 трактарных плугоў мясцовай МТС.

Па распараджэнні Ушацкага РК КП(б)Б пад кіраўніцтвам загадчыка ваеннага аддзела Пятніцы фарміраваўся знішчальны батальён па барацьбе з дыверсантамі. Пагранатрад на чале з А.Я.Захаравым ахоўваў тылы арміі, падтрымліваў парадак, разбіраўся з падазронымі людзьмі.

Праз раён ішлі бежанцы, параненыя байцы Чырвонай арміі. Жыхары раёна ўсім дапамагалі, чым маглі.

3 ліпеня 1941 г. ва Ушачах з'явіліся немцы. Успыхнулі пажары. Гарэлі грамадскія пабудовы, якія абстраляла артылерыя ворага.

... Знішчальны батальён адышоў да Вялікіх Лук, дзе ўліўся ў вайсковую часць, якая там фарміравалася.

Фронт працягваў адступаць на ўсход. Урад рэспублікі разам з камандаваннем Заходняга фронту прымаў надзвычайныя меры, каб затрымаць фашысцкія войскі на створаным рубяжы абароны па рэках Заходняя Дзвіна і Днепр. Тут трымалі абарону 20, 21 і 22-я арміі рэзерву. Галоўнай пагрозай для войскаў Заходняга фронту ў гэты момант была 3-я танкавая група Гота. Да 4 ліпеня яна дасягнула рубяжа Ушачы — Лепель — Ула — Полацк і захапіла невялікія плацдармы на ўсходнім беразе Заходняй Дзвіны ў раёнах Дзісны і Віцебска. Неаднаразовыя спробы нашых войскаў збіць гітлераўцаў з захопленых імі плацдармаў поспеху не мелі. Перад камандуючым 20-й арміяй генерал-лейтэнантам П.А.Курачкіным была пастаўлена задача знішчыць групоўку нямецка-фашысцкіх войскаў, якая наступала з раёна Лепеля.

Раніцай 6 ліпеня войскі арміі нанеслі контрудар у напрамку Сянно—Лепель. У контрудары ўдзельнічалі 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы пад камандаваннем генералаў І.П.Аляксеенкі і В.І.Вінаградава. Тут адбылася адна з буйнейшых у першым перыядзе вайны танкавая бітва, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш за 1,5 тысячы танкаў. Злучэнні механізаваных карпусоў у ходзе контрудара нанеслі праціўніку вялікія страты і да зыходу 8 ліпеня адкінулі яго на 30—40 кіламетраў у бок Лепеля. Іншае становішча склалася ў раёне Сянно. Савецкія войскі сустрэлі тут моцнае супраціўленне 47-га матарызаванага корпуса, які да таго ж быў падмацаваны значным паветраным дэсантам. 7-ы механізаваны корпус быў прыпынены на подступах да горада, а 5-ы трапіў у акружэнне, але на працягу 9 і 10 ліпеня вёў цяжкія абарончыя баі. 10 ліпеня паводле загаду камандуючага 20-й арміяй злучэнне было выведзена з акружэння.

Вынікам гэтых баёў было спыненне руху наперад гітлераўскіх войскаў на віцебскім напрамку.

*Р.А.Чарнаглазава.*

## Трывожная шыфроўка

Ноч на 22 чэрвеня стаяла ціхая і цёплая. Супрацоўнікі райваенкамата не спалі, была атрымана трывожная шыфроўка з аблваенкамата.

Днём усё стала зразумелым. Вайна. Мы пачалі мабілізацыю. Да канца чэрвеня яна была закончана.

3 ліпеня ва Ушачах з'явілася першая варожая машына. Пачуўшы стрэлы, мы выехалі з двара райваенкамата і трапілі пад кулямётны агонь. З'явіліся першыя забітыя і параненыя. Дабраліся да лесу і ўжо адтуль назіралі за рухам ворага. Мы бачылі, як па дарозе ішоў мужчына з дваімі дзецьмі. З імі параўнялася варожая бронемашына. Спынілася. Выйшаў афіцэр, нешта сказаў і прапанаваў ім бутэрброд. Мужчына з дзецьмі, відаць, падзякавалі і рушылі далей. Афіцэр сеў у бронемашыну, і раздалася кулямётная чарга. Усе трое ўпалі на дарогу. Хіба такое забудзеш?

Для нас пачалося новае, ваеннае жыццё, якое раскідала былых супрацоўнікаў ваенкамата ў розныя бакі. Некаторыя загінулі. Аб многіх я не маю звестак і цяпер, але ўпэўнены, што кожны з тых, хто ў нялегкія перадваенныя гады служыў побач са мноў, аддаў усе сілы для Перамогі.

*К.А.Атрашкевіч.*

## Мабілізацыя ва Ушачах

### З успамінаў Васіля Іванавіча Парахонькі, жыхара вёскі Жаўніна

Вайна да Ушаччыны дакацілася вельмі хутка. Ужо ў першай дэкадзе ліпеня немцы былі ў гарадскім пасёлку. Спешна эвакуіраваліся ўстановы. Яшчэ ў чэрвені адправіліся на ўсход усе тры МТС. Праз Ушачы пацягнуліся абозы з людзьмі на ўсход з заходніх раёнаў Віцебскай вобласці.

Ушацкі райваенкамат спешна праводзіў мабілізацыю. Прызвана было нямнога людзей. Адна група мабілізаваных у раёне Шуміліна была акружана немцамі, частка

з іх загінула, іншыя трапілі ў палон, некаторым удалося ўцячы. Другая — была накіравана ў Полацкі ўмацаваны раён.

Сельсавет прыслаў мне мабілізацыйную павестку з сіняй паласой, што азначала «тэрміновая». Пешшу дабраўся разам з іншымі сяльчанамі, атрымаўшымі такія ж павесткі, ва Ушачы. Прыйшлі ў ваенкамат. Там ужо была страшэнная неразбярыха, нервовая мітусня. Да каго ні звярталіся, ніхто талкова не растлумачваў, куды ісці, што рабіць. Казалі, што будуць звязвацца з начальствам. Мы засталіся начаваць ва Ушачах. На наступны дзень пад вечар нам было загадана накіравацца ў Полацк. Але мы яшчэ адну ноч правялі ва Ушачах. Раніцай, і зноў пешшу, рушылі да Полацка. У тым месцы, куды накіраваў нас ваенкамат, нікога не было. Толькі валяліся паперы. Нехта з мясцовых падказаў, куды ісці. Доўга мы блукалі па наваколлях Полацка. Нідзе нас ніхто не чакаў. Нават выказвалі здзіўленне, што мы прыйшлі. Пасля блуканняў дні тры ці чатыры па ваколіцах Полацка мы прыйшлі ў распалажэнне вайсковай часці. Сустрэча наша там пачалася з лаянкі нейкага начальніка на нас за тое, што так позна з'явіліся. Маўляў, вас тут чакалі тыдні два таму назад. Нас пераапранулі і накіравалі ў дзоты, што былі пабудаваны ў гэтым Полацкім умацаваным раёне. Дзот уяўляў сабой магутнае інжынернае збудаванне, сцены былі з жалезабетону да двух метраў таўшчынёй, абсталяваны тэлефоннай сувяззю. Падвоз боепрыпасаў быў прадугледжаны па вузкакалейцы. Селі мы ў гэтыя дзоты. Спачатку ўсё было нармальна. Дзейнічала тэлефонная сувязь, хадзілі ваганеткі па вузкакалейцы, падвозілі харчаванне. Ішлі актыўныя заняткі па ваенна-палітычнай падрыхтоўцы. З часам гэта ўсё аслабявала. Гэта мы адчулі недзе праз пяць-шэсць дзён. Спачатку кудысьці зніклі камандзіры, потым перарвалася тэлефонная сувязь, перасталі хадзіць ваганеткі па вузкакалейцы. Папаўзлі чуткі, што немцы ўжо за Масквой. Што заставалася рабіць? Сабраліся і вырашылі ісці дамоў. Полацк ужо быў заняты немцамі. Пераправяліся, здаецца, вельмі спакойна цераз адну з рэк, каб дайсці дадому. Плаваць не ўмеў. Прыйшлося зрабіць нейкі плыт. Пераплыў раку. Выйшаў на бераг. Тут каманда: рукі ў гару. Пачаліся доўгія гады палону, зняваг, аж да самага вызвалення з палону Чырвонай арміяй. Потым, ужо ў 1942 г., калі пачалі дзейнічаць партызанскія брыгады на Ушаччыне, праз Віцебскія «вароты» былі адпраўлены групы ўшачан у дзеючую армію. Афіцыйных дакументаў на гэты конт не выяўлена. Але з успамінаў камандавання брыгады імя Чапаева вынікае, што за лінію фронту было перапраўлена больш за тысячу чалавек. Гэта было зроблена непасрэдна брыгадамі з-за таго, што расла колькасць партызан, складана іх было узброіць і пракарміць... Складана было і пераправіць за лінію фронту такую колькасць людзей. Ад гэтых краёў да Віцебска быў доўгі і няпросты шлях па тылах фашыстаў.

Многія з ушачан траплялі на фронт і такім чынам. Раненне ў партызанах, вываз самалётам на лячэнне ў шпіталь на Вялікую зямлю, потым дзеючая армія.

Асобнай і масавай была мабілізацыя пасля вызвалення раёна і злучэння партызанскіх брыгад з войскамі Чырвонай арміі.

Так выйшла, што на тэрыторыі раёна фронт не стаяў. Пасля ўпорных і цяжкіх баёў ва ўсходняй частцы раёна каля Заходняй Дзвіны войскі Чырвонай арміі прайшлі тэрыторыю раёна амаль без бою. Фронт спыніўся недзе толькі ў раёне Вілейкі.

Вось тут і пачалі масава гінуць у ліпені 1944 г. былыя ўшацкія партызаны. Гляньце ў спіс загінуўшых воінаў-землякоў. Большасць з іх палегла летам 1944 г. А потым былі баі ў Прыбалтыцы. Ну і штурм Кёнігсберга, дзе таксама многа загінула ўшачан. А тыя, што выжылі, яшчэ працяглы час служылі ў арміі, потым аднаўлялі гаспадарку раёна.

*Запісаў М.М.Кірпіч.*

# Ушацкі знішчальны батальён

## З успамінаў М.Л.Повала, жыхара г.п. Ушачы

Пачатак вайны застаў мяне ва Ушачах. Тут ужо ішло фарміраванне знішчальнага батальёна па барацьбе з дыверсантамі. У яго ўступіў і я. У задачу батальёна ўваходзіла ахова моста цераз р. Ушача, ахова памяшканняў РК КП(б)Б, райвыканкома і райваенкамата. Знаходзіліся мы на казарменным становішчы, размяшчаліся ў



Ф.М.Ступакоў.

раённым Доме культуры. Кіраваў намі загадчык ваеннага аддзела райкома партыі Пятніца. Ён правёў з намі некалькі заняткаў па вывучэнні матэрыяльнай часткі вінтоўкі. Для патрулявання нам выдавалася вінтоўка, але без патронаў. Баявых дзеянняў батальён не праводзіў, бо ніякіх дыверсій у гэты час у раёне не было.

У першай дэкадзе ліпеня ва Ушачах з боку Кубліч з'явілася некалькі нямецкіх браневікоў. Паколькі ў нас не было зброі, мы не змаглі ім супрацьстаяць. Яны абстралялі грамадскія будынкі, успыхнулі пажары. Па малых дарогах наш батальён пачаў адыходзіць у тыл. Так мы дайшлі да Вялікіх Лук. Там фарміраваліся воінскія часці, і тых з нас, хто быў ваеннаабавязаны, накіравалі ў іх. Мы ж, юнакі 1922 і 1923 гг. нараджэння, былі адпраўлены ў глыбокі тыл. Так мы, пяцёра ўшачан, Сяргей Лось, Абрам Борд, Юрась Сімкін, Яўсей Лейтман і я аказаліся ў Кіраўскай вобласці і працавалі ў калгасе. У пачатку 1942 г. нас пачалі выклікаць у райцэнтр Шаранга і абучаць ваеннай справе. А ў сакавіку пачаўся прызыў у армію. Я быў прызваны ў маі 1942 г. і накіраваны ў Львоўскае пяхотнае вучылішча, якое тады знаходзілася ў г. Кіраве. Адтуль, у жніўні таго ж года, трапіў у 59-ю асобную стралковую брыгаду і ваяваў на Паўночна-Каўказскім фронце.

# Эвакуацыя Велікадолецкай МТС

## З успамінаў Фамы Мікалаевіча Ступакова, былога намесніка дырэктара па палітчастцы Велікадолецкай МТС

Прыметы вайны дакаціліся да нашых мясцін недзе праз тыдзень.

Ужо 25 чэрвеня мы атрымалі загад аб эвакуацыі матэрыяльнай часткі і людзей МТС. Трактарныя брыгады тэрмінова сабралі на цэнтральную сядзібу.

Ушацкі райком партыі і райвыканком прызначылі мяне адказным за эвакуацыю МТС. На той час яна налічвала 39 трактароў, 3 цыстэрны па 5 тон з газай, 3 цыстэрны са змазачнымі матэрыяламі і іншую дапаможную тэхніку. На сёмы дзень вайны мы, а гэта 74 трактарысты, рушылі ў дарогу. Тэхніка ішла сваім ходам па маршруце Вялікія Дольцы — Шклоў — Ельня. Пасля таго, як мы праехалі тэрыторыю Талачынскага раёна, на



Удзельнікі эвакуацыі Велікадолецкай МТС (злева направа): А.Хмяльінскі, І.Л.Храмёнак, А.А.Піскун.

трактары ЧТЗ з прычэпам нас дагналі першы сакратар Ушацкага райкома партыі і старшыня райвыканкома. Ад іх мы даведаліся, што немцы ўжо ў Талачыне, а Тураўская МТС на чале з дырэктарам Багданавым змагла дайсці толькі да Улы.

Пад Шкловам трапілі пад першую варожую бамбёжку. Два трактары былі пашкоджаны і цяжка паранены два трактарысты, якіх мы пакінулі ў армейскім шпіталі. Трактары мы потым адрамантавалі. За намі рухалася Селішчанская МТС. Яе эвакуацыю ўзначальваў дырэктар Вітушка. У Шклове на нафтабазе мы папоўнілі запас паліва, налілі яго ў 3 цыстэрны. Пераправіліся цераз Днепр. Нашы воіны паспешвалі нас з пераправай. Непадалёку быў лес, дзе мы і схаваліся ўсёй калонай. У лесе было вельмі многа пакінутай тэхнікі, менавіта той, што эвакуіравалася з МТС. Каля яе людзей ужо не было. У гэтым лесе мы сустрэліся з трактарыстамі Ушацкай МТС, якія эвакуіраваліся раней за нас. Эвакуацыю яе ўзначальваў дырэктар І.А.Дайлідзёнак. Не ведаю па якой прычыне, але далей гэтага Шклоўскага лесу яны не рухаліся.

Селішчанскай МТС не ўдалося пераправіцца ў Шклове. Да іх падыходу мост цераз Днепр быў ужо ўзарваны.

Далей наш шлях ляжаў праз Смаленшчыну. Трэба адзначыць, што часам прыходзілася вельмі цяжка: нямецкая авіяцыя ўвесь час бамбіла і абстрэльвала калону, галадалі. Рухаліся толькі па начах прасёлачнымі дарогамі, без святла фар.

Дабраліся мы да Мураўлянскага раёна Разанскай вобласці. Тут правялі сеў азімай збажыны, бо мясцовых трактарыстаў амаль не было, усе пайшлі на фронт. Мы працавалі дзень і ноч. Сеў правялі паспяхова. 25 снежня сваім ходам рушылі далей на ўсход. Праехалі недалёка, спыніліся на ноч і за-



Д.Д.Прытыка.



І.І.Клопаў.

раўку. Паступіў загад пагрузіць тэхніку на чыгуначныя платформы і ехаць ў Молатаўскую вобласць. Але платформы нам чамусьці не падалі. Тут мы пачулі аб разгроме немцаў пад Масквой. Таму нам было загадана вяртацца ў Мураўлянскі раён. Наша МТС была раздзелена на дзве часткі і іх улілі ў склад Мураўлянскай і Андрэеўскай МТС.

З 74 нашых трактарыстаў больш за 60 пайшлі на фронт. Астатнія ўсю вайну працавалі ў Разанскай вобласці, сярод іх Ягор Паршонак, Канстанцін Жалейка, Ягор Сюбараў, Антон Піскун, Дзмітрый Калдуненка, Станіслаў Пухальскі, Даніла Прытыка і іншыя. З цеплынёй успамінаю, як самаадданa змагаліся за захаванне тэхнікі Міхась Лабэцкі, Васіль Смаляк, Сцяпан Петухоў, Васіль Паршонак, Іван Клопаў, Іван Шэршань, Іван Храмёнак.

Пасля вызвалення Беларусі Даніла Прытыка і Ягор Сюбараў былі накіраваны ў Рудняскую МТС Магілёўскай вобласці. Я ў пачатку 1942 г. пайшоў на фронт, дзе ўсю вайну змагаўся на 2-м Украінскім фронце. А пасля вайны ўвесь час працаваў на сваёй Далеччыне.

# Выратавала выпадковасць

## З успамінаў І.С.Падгола, былога партызана брыгады імя ЦК КП(б)Б

Да вайны я жыў у вёсцы Капцы, загадваў Весніцкай поштай.

У хуткім часе, пасля пачатку вайны, мы атрымалі загад аб эвакуацыі. На калгаснай машыне разам са старшынёй мясцовага калгаса Касяком дабраліся да райцэнтра Ушачы. Але далей было ехаць немагчыма з-за таго, што дарогі ўжо былі перарэзаны немцамі. Мы вярнуліся дамоў.

З першых дзён акупацыі мы пачалі праводзіць дыверсіі па знішчэнні сувязі ворага: рэзалі слупы, рвалі правады. Па даносе аднаго з сялян былі арыштаваны немцамі і дастаўлены ў вёску Заляддзе. Выпадковасць дазволіла нам вызваліцца. У хуткім часе разам з вясковымі хлопцамі пайшоў у партызанскую брыгаду імя ЦК КП(б)Б.

## Пагранічнік з заставы Кублічы

Андрэй Захараў служыў на пагранзаставе ў Кублічах камандзірам аддзялення. У нядзелю, 22 чэрвеня, на заставе чакалі артыстаў. Раптам нечаканы збор. Па радыё пачулі страшнае слова — вайна.

Праз нейкі час Андрэя Захарава выклікаў да сябе начальнік пагранзаставы:

— Бярыце аддзяленне і на станцыю Зябкі. Удакладніце становішча.

Фашысты ўжо бамбілі станцыю, з'явіліся першыя ахвяры. Потым было адступленне.

Пагранзастава, на якой служыў Захараў, забяспечвала ахову тылу дзеючай арміі, падтрымлівала парадак у прыфрантавой паласе. Стаялі на цэнтральных дарогах, правяралі дакументы, затрымлівалі ўсіх падазроных, сярод якіх было нямала дыверсантаў. Гэта была не вельмі прыкметная, чарнавая, але патрэбная справа. За выдатнае выкананне сваіх абавязкаў Андрэй Захараў атрымаў падзяку ад камандавання.

У 1944 г. Андрэй Захараў прыняў удзел у баях пад Лёзнам. Тут пагранатрад праходзіў так званую снайперскую стажыроўку. Шмат ворагаў знішчылі адважныя пагранічнікі, білі без промаху. У хуткім часе быў сфарміраваны Беларускі пагранічны атрад і Андрэя Захарава прызначылі начальнікам заставы.

*У.К.Жыткоў.*

## Акупацыя і акупацыйны рэжым

Ушацкі раён быў акупіраваны гітлераўскімі войскамі 9 ліпеня 1941 г. На яго тэрыторыі, як і па ўсёй рэспубліцы, акупанты ладзілі так званы «новы парадак» — рэжым рабавання, гвалту, масавых забойстваў. Яго асноўныя палажэнні былі выказаны Гітлерам 16 ліпеня 1941 г., калі ён, задаволены поспехамі нямецкай арміі на ўсходнім фронце, зазначыў: «Зараз перад намі стаіць задача разрэзаць тэрыторыю гэтага вялізнага пірага так, як гэта патрэбна нам, каб, па-першае, гаспадарыць на ёй, па-другое, кіраваць ёю, і, па-трэцяе, эксплуатаваць яе». Каб зручней было гаспадарыць на заваяванай тэрыторыі, правялі яе новы адміністрацыйны падзел. Тэрыторыя Беларусі, па якой ішлі асноўныя ўзброеныя сілы вермахта, падзялілася на дзве часткі суадносна лініі Полацк — Барысаў — Старыя Дарогі — возера Чырвонае — рака Зальвянка. На ўсход ад яе была вобласць тылу групы армій «Цэнтр», на захад — вобласць палітычнага кіравання гітлераўскай акупацыйнай грамадзянскай адміністрацыі. У зоне палітычнага кіравання былі створаны рэйхскамісарыяты «Остланд», «Украіна» і акруга «Беластох». Паміж імі ў асноўным і была падзелена тэрыторыя рэспублікі. Толькі трэцяя частка яе даваеннай тэрыторыі склала генеральную акругу «Беларусь», якая да красавіка 1944 г. падпарадкоўвалася рэйхскамісарыяту «Остланд».

У склад вобласці тылу групы армій «Цэнтр» уваходзіла ўсходняя частка рэспублікі (Віцебская і Магілёўская вобласці, частка Гомельскай, усходнія раёны Мінскай, частка Палескай абласцей). Паводле выступлення генеральнага камісара Беларусі Кубэ на нарадзе ў Мінску ў красавіку 1943 г., на гэтай тэрыторыі пражывала амаль 50 працэнтаў насельніцтва рэспублікі (без насельніцтва акругі «Беластох»). У вобласць тылу групы армій «Цэнтр» уваходзіў і Ушацкі раён.

Так акупанты разарвалі тэрыторыю Беларусі на часткі, разлічваючы такім чынам пакончыць з беларусамі як з нацыяй, ліквідаваць яе тэрытарыяльнае, эканамічнае, культурнае, моўнае і маральна-палітычнае адзінства. Усё гэта, на думку захопнікаў, павінна было спрыяць фізічнаму знішчэнню часткі насельніцтва рэспублікі, германізацыі яе.

Правядзенне ў жыццё нацысцкай палітыкі ў вобласці тылу групы армій «Цэнтр» было ўскладзена на генерала Шэнкендорфа, затым — на генерала Кюблера і ваенныя органы ўлады: палявыя і мясцовыя камендатуры. З 11 палявых і 23 мясцовых камендатур, што дзейнічалі ў вобласці армейскага тылу, па адной з іх размяшчаліся ў Лепелі. Іх дзейнасць распаўсюджвалася і на Ушацкі раён.

Мясцовыя камендатуры займаліся ўлікам і рэгістрацыяй насельніцтва і маёмасці, размяшчэннем вайскоўцаў і акупацыйных устаноў, устаноўкай паказальнікаў на дарогах, станам дарог,

выкарыстаннем насельніцтва на карысць нямецкіх войскаў, вярбоўкай яго на працу ў Германію і г.д.

У сваёй дзейнасці яны абапіраліся на створаныя імі раённыя, гарадскія і валасныя ўправы, на стараст у вёсках. Ушацкім раёнам кіравалі ваенны камендант, раённая ўправа. Раён быў падзелены на воласці, якія ў асноўным адпавядалі даваенным сельскім Саветам. У раёне іх было 10. Бургамістраў валасцей, стараст вёсак акупанты прызначалі з ліку мясцовага насельніцтва. На гэтыя пасады ішлі хто па згодзе, хто пад прымусам, а хто і па заданні партызан, як бургамістр Гарбаціцкай воласці Вайтовіч, сакратар Глыбачанскай воласці Кіслоў.

У раёне ўводзілася ваеннае становішча. Насельніцтва прайшло агульную рэгістрацыю па вёсках, валасцях. Іх даныя былі абагульнены па ўсяму раёну. Прайшла рэгістрацыя дамоў і іншых памяшканняў для выкарыстання іх для ваенных патрэб. Уводзіўся каменданцкі час.

Жыхарам было загадана выяўляць і дакладваць аб камуністах, яўрэях, чырвонаармейцах, наогул аб усіх асобах, якія прыпыняліся на ноч ці шукалі прытулку, здаваць радыёпрыёмнікі і фотаапараты. За невыкананне загадаў насельніцтва падлягала жорсткай кары па законам ваеннага часу.

Дапамагала акупантам мясцовая паліцыя (служба аховы парадку). Яна выдавала сельскіх і раённых актывістаў. Гітлераўцы расправіліся з савецкім актывам з мястэчка Ушачы і іншых населеных пунктаў. 40 чалавек загінулі ў вёсцы Хоціна за дапамогу партызанам. Пасля катавання іх пасеклі сякерай.

Частымі былі карныя налёты і выезды па вёсках. Ушачы сталі цэнтрам расправы над мірнымі жыхарамі, якіх вешалі, катавалі, расстрэльвалі. Шыбеніцы ў цэнтры мястэчка сімвалізавалі сабой «новы парадак». Толькі за адзін год ва Ушачах гітлераўцы знішчылі 1200 чалавек, 900 з іх былі яўрэі.

У кастрычніку 1941 г. па распараджэнні ваеннага каменданта Ушач усё насельніцтва яўрэйскай нацыянальнасці мястэчка (464 чалавекі) было сагнана ў гета на вуліцы Кастрычніцкай. Гета было агароджана ў два рады калючым дротам. Уваход у яго насельніцтву мястэчка быў забаронены. Усе яўрэі маркіраваліся жоўтымі латамі. За паяўленне без іх яўрэяў адразу ж забівалі.

У снежні 1941 г. у г.п. Ушачы прыгналі яшчэ каля 500 яўрэяў з Кубліч, Бабыніч і іншых населеных пунктаў раёна. Іх размясцілі ў другім гета — на вуліцы Ленінскай.

Створаныя з працаздольных вязняў гета рабочыя калоны выводзілі пад аховай паліцыі на расчыстку вуліц, разгрузку аўтамабіляў. Дзяўчаты ў бочках вазілі ваду з ракі для коней нямецкай кавалерыйскай часці. Яўрэяў рабавалі, з іх здзекаваліся, іх забівалі.

12 студзеня 1942 г. усіх яўрэяў павыганялі з дамоў. Каля пяці гадзін трымалі на марозе, а затым пад канвоем пагналі па Далецкай вуліцы ў бок мясцовых могілак, што знаходзіліся за паўкіламетра ад Ушач. Там ужо былі прыгатаваны дзве вялікія ямы. Здранцвелым ад холаду людзям загадалі распрануцца і класціся ў рад на дно ямы, а затым іх расстралялі з аўтаматаў. Да месца расправы быў падцягнуты карны атрад з Полацка.

Гітлераўцы развязалі сапраўдны тэрор супраць мірнага насельніцтва. На Ушаччыне, як і на ўсёй Беларусі, праводзіліся ў жыццё варварскія планы ачышчэння заваяванай на ўсходзе тэрыторыі ад насельніцтва. Ішла вайна за «жыццёвую прастору», неабходную для росквіту Трэцяга рэйха. Згодна з гэтымі планамі 75 працэнтам беларусаў не было месца на сваёй зямлі. Іх знішчалі мэтанакіравана. Нямецкія салдаты вермахта, карных службаў і войскаў былі аднолькавымі катамі, якія дзейнічалі пад агульным дэвізам: «Рускі павінен памерці, каб мы жылі!». У дадатак да гэтага кожны з іх меў раздрукаваныя «12 запаведзей паводзін немцаў на Усходзе», шостая частка з якіх вяшчала: «У выніку таго, што далучаныя тэрыторыі павінны быць надоўга замацаваныя за Германіяй і Еўропай... вы павінны зазначыць сабе, што вы на цэлыя стагоддзі з'яўляецеся прадстаўнікамі вялікай Германіі і сцяганосцамі нацыянал-сацыялісцкай рэвалюцыі і новай Еўропы. Таму вы павінны з асэнсаваннем сваёй годнасці праводзіць самыя жорсткія і самыя бязлітасныя мерапрыемствы, якія патрабуе ад вас дзяржава».

Не існавала ніводнага населенага пункта, дзе б не было ахвяр гітлераўцаў. У Велікадолецкім сельсавеце загінулі 432

жыхары, у Лутаўскім — 411, Жарскім — 202, Кубліцкім — 287, Мосарскім — 168, Селішчанскім — 128, Сарочынскім — 280 чалавек. Гэтыя лічбы складаліся з колькасці загінуўшых па вёсках: Бабовішча — 432 чалавекі, Кублічы — 170, Жары — 79, Двор Пліна — 79, Матырына — 51 і г.д. Ва Ушачах загінулі 1165 чалавек. Гінулі мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці. У вёсцы Бадзяліна гітлераўцы задушылі вяроўкай старога Франца Рагоўскага, які цудам выратаваўся з падпаленай хаты, у якой гітлераўцы зачынілі траіх старых. Гэта адбылося ў студзені 1943 г. у вёсцы Чырвоная Горка. У вёсцы Ляхава карнікі застрэлілі з кулямёта старога Кірылу Давыдава. У Загаваліне тыдзень трымалі ў яме шэсць старых жанчын.

Рабаванне і гвалт дапаўняліся прымусовым вывазам насельніцтва ў Германію для працы на заводах і фабрыках, у сельскай гаспадарцы. Вываз працаздольнага насельніцтва праводзіўся ў дзвюх мэтах: папершае, шырока выкарыстаць амаль бясплатную працу і, па-другое, ліквідаваць базу партызанскага руху ў сваім тыле. Добраахвотнікаў для паездкі ў Германію на Ушаччыне амаль не было. На загад лепельскага каменданта, які быў вывешаны ў вёсках Ушацкага раёна ў 1942 г., аб увядзенні абавязковай працоўнай павіннасці моладзі 1925—1927 гг. нараджэння з адпраўкай у Германію моладзь адказала масавымі ўцёкамі да партызан. Тады гітлераўцы пачалі аблавы на людзей, адпраўлялі ў Германію захопленых у час карных экспедыцый супраць партызан. 1825 жыхароў раёна трапілі ў Германію, з якіх 1432 вярнуліся дамоў. Найбольшую колькасць людзей вывезлі з Велікадолецкага сельсавета — 467, Лутаўскага — 310, Сарочынскага — 240, Селішчанскага — 194, Дубраўскага — 152 і г.д.

У эканамічных адносінах раён меў сельскагаспадарчы накірунак: быў багаты на буйную рагатую жывёлу, зерне. У шматлікіх азёрах было многа рыбы. Толькі частка калгаснага статка была вывезена пры адступленні Чырвонай арміі, раздавалі жывёлу і сялянам. Але ў калектыўных гаспадарках засталося многа жывёлы і зерня. Усё гэта тэрмінова бралася акупантамі на ўлік, каб задаволіць патрэбы вермахта і вывезці ў Германію. Таму асноўныя мерапрыемствы праводзіліся ў сельскай гаспадарцы. Работамі ў гэтай сферы кіравалі раённыя гаспадарчыя камендатуры, укамплектаваныя немцамі.

Германскае ваеннае камандаванне ў памятцы «Аб вядзенні гаспадаркі на занятых усходніх абласцях», выдадзенай 26 ліпеня 1941 г., каб пазбегнуць недапаставак сельгаспрадукцыі, нагадвала захаваць калгасы. Яны перайменавалі іх у сельскагаспадарчыя абшчыны (агульныя двары) і ўключылі ў сістэму германскай ваеннай эканомікі. Абшчыны былі зручнай формай для эксплуатацыі сялян, якія былі звязаны паміж сабой кругавой парукай. Праз абшчыну акупанты ўтрымлівалі ў сваіх руках усю сельскагаспадарчую вытворчасць і маёмасць.

На тэрыторыі раёна актыўна дзейнічала нарыхтоўчая служба вермахта, якая складалася з нарыхтоўчых каманд. Яны дзейнічалі разам з разведвальнымі, ахоўнымі і транспартнымі камандамі, вырашалі пытанні забяспячэння армейскіх часцей.

Сяляне абкладаліся шматлікімі падаткамі і зборамі на карысць Германіі. Падаткі былі натуральныя і грашовыя. Імі абкладаліся пасевы, жывёла, куры, козы, сабакі, кошкі... Сяляне здавалі малако, яйкі, лён, воўну, мяса, сала і г.д. Забіралі ўсё, не лічачыся з патрэбамі гаспадароў. Становішча ў вёсках пагаршалася з кожным днём. У сярэднім 2—3 сялянскія гаспадаркі мелі адну карову, на траіх гаспадароў прыходзіўся адзін конь.

Сяляне неахвотна выконвалі здачу падаткаў. Як сведчыць прапагандыст Ушацкага падпольнага райкома партыі, неаднаразова «справа даходзіла да прамога сабатажу, адмаўлення ад здачы падаткаў, іншы раз да арганізаваных сутычак з паліцыяй».

З наступленнем зімы, асабліва пасля паражэння гітлераўцаў пад Масквой, нямецкае ваеннае камандаванне зразумела, што войскі не падрыхтаваны да вайны ў зімовых умовах. Таму пачаліся павальныя зборы цёплых рэчаў. Зборы праводзілі старасты вёсак, валасныя кіраўнікі пры падтрымцы паліцыі. Забіралі вопратку, футры, шалікі і хусткі, пальчаткі і шкарпэткі. Ваенны камендант Ушачаў устанавіў тэрмін збору — 5 студзеня 1942 г. Насельніцтва ратавала сваю маёмасць. Акрамя гэтых збораў, рабавалі насельніцтва нямецкія салдаты, што ішлі на

фронт. Яны ўрываліся ў вёскі і забіралі ўсё, што траплялася ім у рукі. На патрэбы гітлераўцаў у раёне былі адноўлены і працавалі лесапільны завод (м. Ушачы), электрастанцыя (в. Бароўка), МТС (м. Ушачы), аўтарамонтныя майстэрні (Бачэйкава), малаказаводы, валіцкія майстэрні і майстэрні па вырабе валёнак...

Ушацкі раён па сваім месцазнаходжанні меў важнае значэнне для забеспячэння 3-й танкавай нямецкай арміі, што стаяла ў суседнім Лепельскім раёне, а штаб яе — у Лепелі. Па бальшаку Полацк — Заскоркі — Ушачы — Лепель праходзіў асноўны рух войскаў, тэхнікі, іх забеспячэння. Значную ролю адыгрывалі і дарогі Беразіно — Ушачы — Віцебск, Полацк — Суя — Лепель, Полацк — Глыбачка, Глыбачка — Пышна. Для аховы іх ад партызан гітлераўцы размяшчалі гарнізоны. Яны былі ва Ушачах, Бачэйкаве, Ворані, Забароўі, Усовінках, Юраўшчыне, Жарах і іншых населеных пунктах. Трэба адзначыць, што амаль усе гарнізоны, размешчаныя ў раёне, на 70 працэнтаў складаліся з нямецкіх салдат і афіцэраў.

Гарнізоны ўмацоўваліся акопамі, дзотамі, бліндажамі. Агароджваліся дротам у тры рады. Пад аховай гарнізонаў і ахоўных часцей размяшчаліся нямецкія войскі і ваенныя аб'екты. Так, у Бачэйкаве знаходзілася бензасховішча на 140 тон, сховішча боепрыпасаў, амуніцыі, прадуктаў харчавання. Гарнізоны былі раскіданы па ўсім раёне. У вёсцы Усовікі гарнізон налічваў да 150 чалавек. На яго ўзбраенні была 75-мм гармата, 2 мінамёты, кулямёты. Гарнізон меў кругавую абарону. У вёсцы Навасёлкі гарнізон налічваў да 200 немцаў, у Слабодцы — да 150, у Бобчы — каля 200 немцаў, у Бароўцы — да 350 чалавек з сямю гарматамі рознага калібра, дзевяццю мінамётамі (2 палкавыя і 1 батальённы). Гарнізон у м. Ушачы налічваў звыш тысячы чалавек.

Прысутнасць у раёне вялікай колькасці нямецкіх войскаў, узмоцненых гарнізонаў, карных устаноў і войскаў стваралі асабліва цяжкае становішча для насельніцтва і партызан. У м. Ушачы размяшчаўся карны атрад у 200 чалавек.

У кастрычніку 1942 г. партызаны вызвалілі м. Ушачы і шэраг буйных населеных пунктаў. Нямецкія ўлады (ваенны камендант, раённая ўправа, сельскагаспадарчы камендант, гарнізон і нават карны атрад) перабраліся ў Лепель. Ушачы сталі цэнтрам партызанскай зоны, у якую акрамя Ушацкага раёна ўвайшла значная частка Лепельскага, Ветрынскага, Чашніцкага, Бешанковіцкага і Полацкага раёнаў. Зона займала тэрыторыю ў 3 тысячы кв. кіламетраў, на якой пражывала каля 80 тысяч чалавек. За яе штодзённа ішла жорсткая барацьба. Населеныя пункты абстрэльваліся варожай артылерыяй, падвяргаліся бомбавым ударам авіяцыі. Многія вёскі былі знішчаны. Людзі жылі ў зямлянках, хаваліся па лясах. Прапагандыст Ушацкага падпольнага райкома КП(б)Б І.А.Гарэлік паведамляў, што з 15 па 30 верасня 1943 г. у час бамбёжкі былі спалены ў Мосараўскім сельсавеце вёскі Жывалака (30 двароў), Казьяне (19 двароў), Белае (4 двары). У Сарочынскім сельсавеце — вёскі Чарсцвяды (7 двароў), Наваселле (4 двары), Слабада (10 двароў), Славена (3 двары). Ад м. Ушачы амаль нічога не засталося. У час верасnёўскіх бамбёжак загінулі 9 чалавек. У вёсцы Жывалокі згарэлі два дзіцяці, у Бярозаве — 2 забітыя і 2 параненыя.

Супраць партызан і насельніцтва зоны гітлераўцы праводзілі карныя экспедыцыі. Буйнейшыя з іх праходзілі пад кодавымі назвамі: «Дворнік», якую праводзілі падраздзяленні 3-й танкавай арміі ў снежні 1943 г., «Дождж, які імжыць», «Лівень» у красавіку 1944 г. правялі 12 нямецкіх палкоў СС і паліцыі, часці 5 пяхотных дывізій пад агульным кіраўніцтвам камандуючага 3-й танкавай арміяй генерал-палкоўніка Рэйнгарта. У красавіку — маі 1944 г. амаль без перапынку прайшла карная экспедыцыя «Свята вясны» сіламі папярэдняй экспедыцыі з дадаткам да яе баявой групы фон Готберга. У ходзе аперацыі карнікі захапілі 11 тысяч чалавек для адпраўкі ў Германію. Учынялі жудасныя злачынствы ў вёсках. 32 жыхары былі забіты ў вёсцы Воснава, 20 чалавек — у Царкоўшчыне, 2 чалавекі — у Вялікіх Дольцах. Забілі двух старых жанчын, якія меркавалі, што іх немцы не будуць чапаць. У вёсцы Замошша карнікі спалілі 100 дамоў. Шмат страт і пакут людзям прыносілі карныя аперацыі. У вёску Кублічы ў час баёў двойчы ўрываліся нямецкія танкі. У Маладолецкім і Весніцкім сельсаветах было спалена 50 вёсак, у тым ліку Царкоўшчына, Замошша, Заазёры, Весніцк і іншыя.

Вывезлі з іх у Германію 224 сям'і. У Мураўскім рове ў Долецкім сельсавеце пасля адыходу карнікаў было знойдзена 60 забітых і закатаваных людзей.

Усяго па Ушацкім раёне за час акупацыі былі знішчаны 53 населеныя пункты і 3573 мірныя грамадзяніны. На франтах вайны загінулі 2275 землякоў, у партызанах — 1506 чалавек. Усяго раён страціў 7747 чалавек.

Прайшло больш чым 50 гадоў пасля вайны. За гэты час насельніцтва раёна ледзь дасягнула ўзроўню даваеннага часу.

*Р.А.Чарнаглазава.*

## Дакументы сведчаць

### З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

**7 ліпеня 1941 г.**

I. О назначении бургомистров в волостях

1. На должности бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надежные и квалифицированные лица по возможности из числа белорусов.

2. Бургомистр является представителем волости.

3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.

4. Бургомистр несет ответственность за финансовые дела волости.

5. Все жители, проживающие в волости по состоянию на 21.6.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.

6. Бургомистры немедленно должны позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.

7. Бургомистры привлекаются к ответственности за совершенные акты саботажа в вверенной им волости. Он должен всеми средствами предотвращать акты саботажа. В его обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.

8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 тысяч жителей, назначает местный комендант, а в населенных пунктах свыше 20 тысяч жителей назначает комендант полевой комендатуры.

II. О запрещении оставления квартир в ночное время

1. В период с 21-00 до 5-00 утра населению запрещается покидать квартиры.

2. Исключения допускаются по письменному разрешению местного коменданта для лиц, работающих в ночное время на жизненно важных предприятиях врачами, акушерками, на машинах скорой помощи.

3. Нарушители будут строжайшим образом наказываться местными комендантами. Как вспомогательными мерами наказания могут быть временный арест с ограниченным питанием, насильственное задержание и привлечение к работам.

VIII. Создание вспомогательной полиции

1. Для проведения полицейских мер безопасности бургомистрам поручается привлечь во вспомогательную полицию надежных «фольксдойче», белорусов, и если таковых не имеется, то поляков, и использовать эту полицию по согласованию с начальниками команд полиции безопасности.

2. Служащие вспомогательной полиции, которые работают в тесном контакте с местными айнзатцкомандами полиции безопасности и СД, могут поддерживать связь только с местными начальниками полиции безопасности и СД или назначенными ими органами.

3. Служащие вспомогательной полиции носят белую нарукавную повязку с надписью «Вспомогательная полиция».

4. Местные комендатуры до 20-го числа каждого месяца, а впервые к 20.7.1941 г., сообщают о численности и вооружении вспомогательной полиции.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1, 2, 4—5.*

*Пераклад з нямецкай мовы.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ УШАЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ КАРНІКАЎ У РАЁНЕ

**31 студзеня 1944 г.**

24 января с.г. по поручению зав. отделом пропаганды т. Ястребова я выехал в зону, где происходили бои с немецкой грабительской экспедицией с 16 по 22 января. Я объехал деревни, где побывали немцы: Осиновка, Ковалевщина, Кранов, Ляхово, Радьково, Заговалино, Аделино, Бадялино, Усвица. Общий результат немецкого набега на эти и прочие деревни — это ограбление, опустошение имущества, оставленного ушедшими жителями, издевательства над оставшимися жителями. Во всех деревнях, где побывали немцы, уничтожен и угнан поголовно весь скот — от кур до коров. Почти во всех деревнях ограблено, увезено мелкое имущество — хозяйственная посуда, даже деревянные ночевки, кадки, сундуки, утварь, одежда. Жителей немцы почти не застали: остались лищь некоторые из деревень, расположенных ближе к Улле.

В деревне Красное, озлобленные поражениями, гитлеровцы сожгли 12, и в Красной Горке — 2 дома. После партизанского налета на батальон немцев в Красном (600 человек), убито 152 немца, они, выбираясь и забирая имущество, поджигали за собой дома, предварительно ограбленные. Характерный пример: дом одного старика, которому не удалось удрать, немцы при отходе стали поджигать: нанесли в сени солому и зажгли. Старик с двумя старухами оставались запертые в хате. В сенях уже горела солома и люди собирались выскакивать в окна. К'счастью, немцы-поджигатели ушли к другому дому. Старухи выскочили и затушили пылавшую солому.

В Ляхове немцы застрелили из пулемета случайно выглянувщего в дверь старика Кирилла Давыдова, ранили другого старика. В Ляхове были вскрыты ямы с одеждой и хлебом. Некоторые семьи остались совершенно ограбленными. Я видел женщину, которая удрала от немцев, но оставила имущество и скот. Немцы все забрали. В деревне оставалось много овец, свиней — все забрали грабители. Три коровы не успели сожрать — их просто постреляли и бросили на улице. Когда население вернулось — в домах не нашли ни посуды, ни топоров, ни пил, ни одежды. Деревня осталась в нищете.

В Заговалине также ограблено имущество. Немцы вывезли даже деревянную посуду. Шесть старушек загнали в яму, не выпускали их оттуда неделю. Забрали посуду, топоры, пилы, железные зубья из деревянных борон выбили и забрали. У Андрея Григорьева забрали в сенях ячменя пудов 20, жита пудов 15, чугуны, топор, пилу, выбили зубья из бороны, забрали кур, гусей, овцу и потом корову. Всего в Заговалине кроме мелкого скота забрали 13 коров.

Из этой деревни немцы угнали 11 мужчин средних лет и стариков: Андрей Михайлович Лиленко — 50 лет, Карп Тарасович Кагаленок — 55 лет, его брат Захар — лет 70, Сильвестр Васильевич Калиновский — 62 года, слабый, горбатый Сергей Михайлович Орех — лет 65, Егор Яковлевич Калиновский — лет 70, Лаврен Михайлович Лещенок — лет 60, хромой Иван Иванович Слизкий — 54 года, у него на руках было четверо детей (жена умерла). Немцы оставили детей в землянке на произвол судьбы, Иван Никонорович Камачонок — лет 47, слепой на один глаз.

В Бадялине немцы удавили веревкой старика Франца Роговского, который, ожидая милости от гитлеровцев, не удрал, пошел им навстречу.

В Аделине от немцев люди удрали, оставалось 8 старых женщин. Здесь немцы забрали всего 30 коров: 5 аделинских и остальные приведенные из-за Двины, из деревни Черчица. Надо сказать, что это произошло из-за несвоевременной эвакуации жителей и имущества дер. Аделино и нераспорядительности командира отряда Сюлькова бригады Сакмаркина, который в это время находился в деревне. Он своевременно не предупредил жителей об опасности и не потребовал от населения, чтобы все имущество увозили...

Аделино также подверглось ограблению.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3812. Воп. 1. Спр. 19. Л. 29—30.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

## З АКТА НАДЗВЫЧАЙНАЙ КАМІСІІ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ УШАЦКАГА РАЁНА

**1945 г.**

Нямецкія каты сагналі ўсё яўрэйскае насельніцтва ў лагер, размешчаны на Кастрычніцкай вуліцы мястэчка Ушачы. Лагер быў абнесены калючым дротам у два рады, уваход быў закрыты. У снежні месяцы 1941 г. было прывезена з мястэчка Кублічы, Бабыніч і Усы яўрэйскае насельніцтва. Сабраўшы больш 900 грамадзян, нямецкія палачы вывадзілі з лагера маладых дзяўчат і ў галалёдзіцу прымушалі вазіць ваду на сабе для коней кавалерыйскай часці. Стаміўшыхся дзяўчат білі прыкладамі вінтовак і палкамі. Выхаду за пакупкай харчоў у магазін яўрэям не было. Нават купляць харчы на базары было недазволена.

У ясны студзеньскі марозны дзень, 12 студзеня 1942 г., з лагера ўсіх яўрэяў выгналі на вуліцу, пад канвоем паліцэйскіх і жандараў пагналі па Долецкай вуліцы за рускія могілкі.

За могілкамі былі раней выкапаны дзве вялікія ямы, па правы бок дарогі, на адлегласці 500 м ад мястэчка Ушачы. Гналі старых, былі грудныя дзеці. Прыгнаўшы да ям, нямецкія каты пачалі распранаць грамадзян да сподняга адзення. Прымушалі класціся ў рад на дно ямы, пасля чаго з аўтаматаў расстрэльвалі. Малых дзяцей штыкамі праколвалі і кідалі ў яму. Так з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін вечара было расстраляна больш за 900 грамадзян. Запоўніўшы дзве ямы трупамі, ямы закапалі. Расстрэл узначальваў камендант ОРС-камендатуры мястэчка Ушачы Карл (воінскае званне і прозвішча не ўстаноўлены). Для расправы над мірнымі грамадзянамі быў прыцягнуты карны атрад з г. Полацка.

*Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 92. Л. 229.*

*Падрыхтаваў М.М.Кірпіч.*

## З ДАВЕДКІ УШАЦКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ СТРАТАХ, ЯКІЯ НАНЕСЛІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІЯ ЗАХОПНІКІ УШАЦКАМУ ГАРПАСЯЛКОВАМУ САВЕТУ

**1948 г.**

1. Расстреляно, повешено и зверски замучено участников партизанского движения и членов их семей, советско-партийного актива и мирного белорусского и еврейского населения — 1021 чел.

2. Из общего количества — 68 домов колхозников и единоличников, в колхозном поселке сожжено — 18 домов, кроме этого сожжено 7 колхозных строений. В райцентре м. Ушачи сожжено и разрушено путем бомбежки с самолетов немецкой авиации — до 80 %.

3. Угнано и уничтожено: лошадей — 54, коров — 54, овец — 30, свиней — 60.

4. Угнано на каторжные работы в Германию — 18 человек.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 841. Воп. 1. Спр. 13. Л. 110 адв.*

## ЗВЕСТКІ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ ПА СЕЛЬСКІХ САВЕТАХ УШАЦКАГА РАЁНА Ў 1941—1944 гг.

**1964 г.**

| Назва сельскага савета і населенага пункта | Колькасць да вайны | | Знішчана ў час вайны | | Адноўлена пасля вайны | | Не адноўлена пасля вайны | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Насельніцтва | Двароў | Населеных пунктаў | Двароў | Населеных пунктаў | Двароў | Населеных пунктаў | Двароў |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| Сельсаветы: | | | | | | | | |
| 1. Вялікадолецкі | 1602 | | 23 | 1063 | 14 | 693 | 9 | 368 |
| 2. Глыбачанскі | 1109 | | 14 | 961 | 9 | 678 | 5 | 355 |
| 3. Гарбаціцкі | 514 | | 0 | 180 | 0 | 172 | 0 | 2 |
| 4. Дубраўскі | 932 | | 1 | 427 | 0 | 415 | 1 | 12 |
| 5. Жарскі | 1297 | | 5 | 283 | 1 | 241 | 4 | 42 |
| 6. Кубліцкі | 1029 | | 2 | 350 | 0 | 283 | 2 | 67 |
| 7. Лутаўскі | 1300 | | 3 | 206 | 1 | 145 | 2 | 61 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8. Мосарскі | 948 | | 1 | 352 | 1 | 172 | 0 | 180 |
| 9. Селішчанскі | 611 | | 2 | 117 | 1 | 94 | 1 | 22 |
| 10. Сарочынскі | 817 | | 2 | 173 | 2 | 149 | 0 | 34 |
| У выніку: | 10159 | | 53 | 4112 | 29 | 3042 | 24 | 1143 |
| Гарадскі пасёлак | | | | | | | | |
| Ушачы | 600 | | | 147 | | 147 | | |
| У выніку: | 10759 | | 53 | 4259 | 29 | 3189 | 24 | 1143 |

Старшыня выканаўчага камітэта раённага Савета дэпутатаў працоўных І.Цараў

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4693. Воп. 3. Спр. 752. Л. 104.*

## НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ УШАЦКАГА РАЁНА, ЗНІШЧАНЫЯ РАЗАМ З ЖЫХАРАМІ Ў ЧАС НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ І НЕ АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| Назва населенага пункта | Колькасць напярэдадні вайны | | Колькасць знішчаных | | Дата знішчэння |
|---|---|---|---|---|---|
| | Двароў | Насельніцтва | Двароў | Насельніцтва | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Асавіна | 2 | 40 | 22 | 40 | чэрвень 1942 г. |
| Мурагі | 9 | 32 | 9 | 32 | ліпень 1943 г. |
| Ралля | 28 | 30 | 28 | 30 | чэрвень 1943 г. |
| Тухаціна | 25 | 84 | 25 | 68 | май 1944 г. |

## НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ, ЗНІШЧАНЫЯ РАЗАМ З ЖЫХАРАМІ Ў ЧАС НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ І АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Бабовішча | 12 | 98 | 12 | 73 | май 1944 г. |
| Загаваліна | 81 | 144 | 81 | 68 | май 1944 г. |
| Кублічы | 141 | 410 | 115 | 170 | май 1944 г. |

## НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ, ЗНІШЧАНЫЯ З ЧАСТКАЙ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ПЕРЫЯД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ І НЕ АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Асінаўкі Малыя | 11 | 42 | 11 | — | сакавік 1943 г. |
| Бялошы | 17 | 29 | 17 | 2 | сакавік 1943 г. |
| Бачкары | 13 | 50 | 13 | 12 | май 1944 г. |
| Гвазды | 7 | 28 | 7 | 3 | красавік 1944 г. |
| Гліннікі | 14 | 56 | 14 | 6 | красавік 1944 г. |
| Гуцішча | 17 | 43 | 17 | 6 | люты 1942 г. |
| Жарэнькава | 12 | 51 | 12 | | ліпень 1943 г. |
| Карчы | 11 | 45 | 11 | | чэрвень 1942 г. |
| Кісялі | 12 | 39 | 12 | 4 | красавік 1944 г. |
| Кублішчына | 7 | 32 | 7 | | май 1944 г. |
| Курленкі | 4 | 16 | 4 | | май 1944 г. |
| Ліпнікі | 7 | 27 | 7 | 2 | красавік 1944 г. |
| Мацюшы | 25 | 118 | 25 | 5 | май 1944 г. |
| Астрава | 5 | 28 | 5 | | май 1944 г. |
| Прыштонкі | 8 | 30 | 8 | 5 | чэрвень 1942 г. |
| Слабодка | 7 | 25 | 7 | 2 | красавік 1944 г. |
| Стараселле | 7 | 23 | 7 | 3 | красавік 1943 г. |

## НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ, ЗНІШЧАНЫЯ З ЧАСТКАЙ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ЧАС НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ І АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Адэліна | 12 | 54 | 11 | | ліпень 1943 г. |
| Азаранкі | 26 | 123 | 26 | 3 | красавік 1944 г. |
| Антунова | 25 | 94 | 25 | 5 | чэрвень 1944 г. |
| Антанова | 15 | 55 | 15 | | май 1944 г. |
| Бадзяліна | 13 | 63 | 13 | 4 | чэрвень 1943 г. |
| Бальбінава | 35 | 132 | 33 | 12 | чэрвень 1943 г. |
| Банькава | 31 | 120 | 29 | | май 1944 г. |
| Бярозава | 32 | 90 | 30 | 5 | красавік 1944 г. |
| Бараўляне | 16 | 75 | 15 | 12 | красавік 1944 г. |
| Быстрыкі | 10 | 62 | 10 | 3 | сакавік 1943 г. |
| Васілевічы | 30 | 165 | 30 | 3 | ліпень 1943 г. |
| Вялічкаўцы | 37 | 141 | 32 | 3 | люты 1943 г. |
| Весніцк | 67 | 158 | 67 | 34 | май 1943 г. |
| Галюгі | 25 | 107 | 24 | 11 | красавік 1943 г. |
| Глінішча | 18 | 110 | 8 | 71 | май 1943 г. |
| Глыбачка | 78 | 197 | 58 | 19 | сакавік 1943 г. |
| Гарадок | 33 | 90 | 29 | 6 | кастрычнік 1943 г. |
| Жары | 136 | 275 | 74 | 79 | кастрычнік 1942 г. |
| Жывалака | 65 | 229 | 45 | 60 | верасень 1943 г. |
| Залужжа | 42 | 128 | 31 | | жнівень 1943 г. |
| Заляддзе | 19 | 83 | 19 | 39 | май 1943 г. |
| Замошша | 38 | 133 | 38 | 15 | чэрвень 1943 г. |
| Заазер'е | 52 | 210 | 52 | 14 | май 1944 г. |
| Заполле | 9 | 41 | 8 | 6 | сакавік 1943 г. |
| Заполле | 26 | 126 | 19 | | верасень 1943 г. |
| Зарубаўшчына | 18 | 75 | 11 | 30 | май 1943 г. |
| Зачысце | 26 | 107 | 20 | | люты 1943 г. |
| Казімірова | 12 | 46 | 12 | 4 | май 1944 г. |
| Калушчына | 8 | 46 | 8 | 8 | жнівень 1943 г. |
| Кісялёва | 78 | 480 | 68 | 3 | красавік 1944 г. |
| Капцы | 12 | 63 | 12 | 17 | май 1944 г. |
| Касары | 74 | 332 | 74 | 65 | май 1943 г. |
| Краснае | 66 | 124 | 59 | 12 | чэрвень 1943 г. |
| Крывушчына | 30 | 122 | 25 | 7 | сакавік 1943 г. |
| Крыжы | 13 | 41 | 11 | 4 | сакавік 1943 г. |
| Кугоні | 67 | 240 | 63 | 5 | красавік 1943 г. |
| Лісічына | 31 | 124 | 28 | 9 | красавік 1944 г. |
| Лагі | 41 | 173 | 35 | | май 1944 г. |
| Ляхава | 68 | 100 | 41 | 6 | чэрвень 1943 г. |
| Муравец | 7 | 32 | 6 | 7 | красавік 1944 г. |
| Новае жыццё | 40 | 192 | 35 | | май 1943 г. |
| Наваселле | 15 | 45 | 14 | 5 | верасень 1943 г. |
| Асінаўка | 47 | 84 | 37 | 9 | чэрвень 1943 г. |
| Астраўляны | 50 | 242 | 43 | 9 | ліпень 1943 г. |
| Паўлаўшчына | 13 | 43 | 13 | 3 | сакавік 1943 г. |
| Пілатаўшчына | 18 | 80 | 16 | 19 | жнівень 1943 г. |
| Плігаўкі | 8 | 26 | 8 | | верасень 1943 г. |
| Пруды | 29 | 148 | 22 | 2 | красавік 1944 г. |
| Пуцілкавічы | 28 | 131 | 28 | | май 1944 г. |
| Рагозіна | 32 | 112 | 32 | 16 | май 1944 г. |
| Расна | 15 | 57 | 15 | 8 | май 1944 г. |
| Рацькава | 63 | 212 | 52 | 7 | чэрвень 1943 г. |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Роўбы | 16 | 75 | 11 | 19 | красавік 1944 г. |
| Салаўёўка | 33 | 90 | 27 | 40 | сакавік 1943 г. |
| Сонькін Рог | 21 | 79 | 21 | 8 | ліпень 1943 г. |
| Стаі | 102 | 400 | 100 | 9 | жнівень 1942 г. |
| Старынка | 43 | 179 | 43 | 2 | сакавік 1943 г. |
| Цётча | 25 | 100 | 12 | 8 | красавік 1943 г. |
| Усвея | 80 | 270 | 80 | 7 | чэрвень 1943 г. |
| Усвіца | 100 | 413 | 79 | 28 | ліпень 1943 г. |
| Царкавішча | 160 | 398 | 160 | 9 | чэрвень 1943 г. |
| Чамярычына | 25 | 76 | 23 | | красавік 1944 г. |
| Шахнаўцы | 8 | 41 | 6 | 11 | красавік 1944 г. |
| Шалапечына | 12 | 63 | 11 | 3 | сакавік 1943 г. |
| Юзафатава | 18 | 68 | 18 | 4 | чэрвень 1943 г. |
| Якаўкі | 30 | 101 | 30 | 4 | чэрвень 1943 г. |
| Янова | 30 | 90 | 25 | 5 | красавік 1944 г. |

*Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995. С. 31—280.*

## З'явіліся немцы ва Ушачах

### З успамінаў Я.П.Васілеўскага, жыхара г.п. Ушачы

Добра памятаю з'яўленне немцаў ва Ушачах. Гэта было як бы двойчы. Першы раз прайшлі дзве бронемашыны. Невялічкія такія бронемашыны па тры чалавекі ў кожнай. На мосце цераз раку стаяла ахова. На мой сучасны погляд, якая там ахова: хлопец гадоў шаснаццаці з гарэлай вінтоўкай з чатырма ці крыху больш патронамі.

Потым з боку Кубліч неяк неспадзявана і страшна прыйшла нямецкая танкетка. Установы ўлады былі ўжо эвакуіраваны. Перад гэтым праз Ушачы прагналі калоны зняволеных з турмаў заходніх раёнаў вобласці. Казалі, нібыта іх нават расстралялі недзе ў нашым раёне.

Першым дзеяннем немцаў было разбурэнне помніка Леніну. Ён да вайны быў зроблены з цэменту і складаўся з трох частак. Немцы падагналі на праход у скверы магутную італьянскую аўтамашыну, зачапілі тросам помнік і з першага разу сарвалі толькі верхнюю частку, з другога разу — сарвалі сярэднюю. Засталіся толькі ногі. Як ні рвалі гэтую частку помніка, нічога не атрымалася. Тады немцы сабралі яўрэяў з падручнымі сродкамі — малаткамі, зубіламі, і загадалі ім разбіць астаўшуюся частку помніка. Яны недзе больш тыдня разбівалі яе. У хуткім часе немцы ўстанавілі сваю ўладу. Акупанты сабралі яўрэяў і загадалі вырваць траву на абочыне праезджай часткі цэнтральнай вуліцы. Старыя і дзеці поўзалі па схілах цэлымі днямі.

Хутка было ўтворана яўрэйскае гета. Яно размяшчалася на вуліцы, што вядзе на пасёлак Пралетарый. З правага боку вуліцы ў два рады калючым дротам была агароджана тэрыторыя ад вуліцы Ленінскай да перадапошняга дома ў Пралетарыі. Туды і сагналі ўшацкіх яўрэяў. Узімку іх расстралялі. Потым у гета прыгналі яўрэяў з Бабыніч, Кубліч і Селішча. Усяго іх сабралася прыкладна 200—250 чалавек. Усіх іх расстралялі. Потым трупы звезлі ў яму на вуліцы Долецкай, дзе раней былі знішчаны ўшацкія яўрэі.

## Абяцалі, што павязуць у Палесціну

### З успамінаў С.В.Маркевіча, былога кіраўніка Велікадолецкай падпольнай групы

Ад надзейных людзей мы даведаліся, што паступіла распараджэнне нямецкіх улад выявіць усё насельніцтва яўрэйскай нацыянальнасці, а затым сабраць яго ва Ушачах, у спецыяльна адведзеным для іх месцы — гета. Прычынай таму, як тлумачылі гітлераўцы, была адпраўка яўрэяў у Палесціну. У Велікадолецкай

воласці жылі дзве яўрэйскія сям'і — адна ў Малых Дольцах, другая — у вёсцы Капцы. У Малых Дольцах яўрэй быў кавалём (прозвішча яго не памятаю). Каб выратаваць яго, дамовіліся запісаць яго грэкам, хаця ён больш быў падобны на цыгана.

Сям'я, што жыла ў вёсцы Капцы Весніцкага сельсавета, была змешанай: муж Алесь Антонавіч Карабань быў беларус, а яго жонка Фрада яўрэйка. У іх было двое дзяцей. У сям'і жыла і цешча. Вырашылі змяніць іудзейскую веру жонкі на хрысціянскую. Гэта каштавала нам паловы парасяці. Фрада стала Ефрасінняй, а яе маці Хася — Хрысцінай. Пасля ўсіх нашых «мерапрыемстваў» адрапартавалі камен-данту, што на тэрыторыі воласці яўрэяў няма.

Пры перасяленні ў гета яўрэям дазволілі ўзяць з сабою самае неабходнае. Бралі самае лепшае.

Ад справавода воласці даведаліся, што ўсіх яўрэяў заб'юць. Параіўшыся, вырашылі папярэдзіць жыхароў гета. Зрабіць гэта даручылі С.Я.Барадаўкіну, які добра ведаў старасту гета Іосіфа Калманавіча Пейсахава, былога старшыню райспажыўсаюза.

У крыху загрыміраваным выглядзе Сцяпан Якаўлевіч прыйшоў ва Ушачы. На кватэры камуніста Міхаіла Фёдаравіча Машчова адбылася сустрэча са старастам гета. Барадаўкін прапанаваў, калі павядуць калону, перабіць ахову, захапіць зброю і разбегчыся. Вядома, страты будуць, але большасць застанецца жыць, дзяцей і старых схавае насельніцтва раёна, а дарослыя пойдуць у партызаны.

Здавалася, што ўсё ідзе добра. Аднак Пейсахаў, вярнуўшыся ў гета, аб усім расказаў членам савета. Па прапанове савета ён накіраваўся да каменданта гарнізона, каб высветліць, ці праўда, што замест адпраўкі яўрэяў у Палесціну іх расстраляюць?

Пасля добрай дозы бізуна той назваў С.Я.Барадаўкіна, ад якога дазнаўся аб гэтым.

Гарнізон быў падняты па трывозе, пачаліся вобыскі.

Праз два тыдні ўсе жыхары гета (735 чалавек) у суправаджэнні 12 салдат спецкаманды былі расстраляны каля дарогі з Ушач на Вялікія Дольцы.

## Адна карова на тры сям'і

### З успамінаў Я.М.Мікалаева, жыхара вёскі Жары

Аднойчы фашысты аб'явілі, што будзе сход. На сходзе яны сказалі, што карову можна трымаць адну на тры сям'і. Мая карова давала менш малака, чым у суседзяў, таму я і павёў яе ў Баркоўшчыну, дзе знаходзіўся нямецкі гарнізон. Па дарозе даведаўся, што адтуль вяртаюцца толькі жанчыны і дзеці. Вырашыў не ісці туды. Звярнуў з дарогі, але папаўся на вочы двум паліцэйскім. Яны і пагналі мяне ў вёску. Прывялі. Адзін пайшоў у хату, але хутка выйшаў і пачаў распытваць у мяне, дзе жыве Паршонак Мікалай. Яго хата была побач. Мікалай пачуў нашу размову і ўцёк. Бачыў я, як катавалі людзей: клалі на лаўку і білі палкамі. Білі да паўсмерці. Пачалі дапытваць Плігаўку Васіля, а затым і мяне. Пыталі аб тым, хто як жыў пры Саветах, што меў да вайны. Пасля гэтага мяне вывелі на вуліцу. Раптам бачу, што афіцэр паклікаў у хату салдат. Тут я і сігануў у агарод...

## Жудасная раніца

Раніцай 17 лістапада 1941 г. вёску Касары з усіх бакоў акружылі фашысты. Здарылася так, што ў гэты дзень тут знаходзіліся партызаны Мікалай Бялоў, Рыгор Іваноў, Міхаіл Папоў і Павел Землякоў, якія першымі распачалі барацьбу супраць акупантаў. Знайшоўся здраднік, які выдаў іх...

Фашысты з'явіліся нечакана. Партызаны ўбачылі іх, калі вёска ўжо была акружана, выскачылі праз вокны хаты і пабеглі ў напрамку лесу. Папоў і другі партызан, імя якога я не ведаю і да гэтага часу, былі забіты адразу кулямётнай чаргой. Бялова параніла ў нагу разрыўной куляй. Але яму пашанцавала вырвацца жывым. Праз нейкі час усе жыхары вёскі былі сабраны на вуліцы. З аднаго боку фашысты паставілі кулямёт, з другога — мінамёт, вакол стаялі паліцаі.

Партызаны Рыгор Іваноў і Павел Землякоў знаходзіліся ў гэты момант у хаце

Вольгі Іванаўны Скобавай. Яны таксама не паспелі схавацца і трапілі ў рукі фашыстаў. Іх вывелі на вуліцу, прывязалі да тэлефоннага слупа, пачалі здзекавацца. А паліцаі працягвалі шукаць гаспадыню, якая паспела схавацца ў яме пад падлогай. Але яны знайшлі яе, вывелі на вуліцу ў адной сукенцы, без хусткі. Людзі стаялі моўчкі.

Фашысты вынеслі з хаты стол, паставілі яго пад дубам, які стаяў насупраць маёй хаты. Прымусілі Скобаву ўзлесці на яго. Паліцай перакінуў вяроўку, зрабіў спакойна пятлю, накінуў яе на шыю жанчыне і выбіў з-пад ног стол.

— Так будзе з кожным за сувязь з партызанамі, — страшылі фашысты.

Карнікі загадалі жыхарам выкапаць глыбокую яму, у якую кінулі забітых партызан. Потым дапытвалі Іванова і Землякова. Іванова застрэлілі. Землякова прывязалі вяроўкай да саней і прымусілі бегчы за імі. Завялі яго ў лес, каб ён паказаў, дзе партызаны, але ён маўчаў. Тады фашысцкія каты выразалі яму язык і кінулі ў яму, дзе ён і памёр.

*В.Літвінава.*

## Забівалі і гадавалых дзяцей

### З успамінаў В.К.Гардзіёнак

Страляніна, гвалт узрушылі раняшнюю цішыню. Зірнула ў акно, па вуліцы немцы вядуць брата. Той убачыў мяне і нешта крыкнуў. Я выбегла на ганак. Немец штурхануў мяне ў сенцы, некалькі разоў ударыў прыкладам па спіне. Я страціла прытомнасць. Калі апрытомнела, убачыла, што гарыць мая хата. Спрабавала падняцца, але не змагла. Да хаты набліжаўся немец. Ён узяў мяне за валасы і перацягнуў на другі бок вуліцы. Колькі я праляжала там, не памятаю, толькі потым даведалася, што ў той дзень шасцярых маіх родных фашысты расстралялі, не пашкадавалі і сямігадовую пляменніцу. Ды што казаць. Калі мы раскопвалі потым яму, то сярод расстраляных былі зусім малыя дзеці.

*Падрыхтавау У.К.Жыткоў.*

## Як у страшным сне

...Летам 1943 г. немцы сагналі сялян да в. Малыя Дольцы. Былі тут і малыя, і старыя. Адна жанчына стаяла з голым дзіцем. Яна, відаць, мыла яго, і ёй не дазволілі дзіця нават апрануць. Чакалі самага страшнага, але гэтага не здарылася...

У вёсцы знаходзіўся Гіль-Радзіёнаў з часткай свайго атрада. Убачыўшы, што мясцовых жыхароў збіраюцца расстрэльваць, ён доўга гаварыў нешта нямецкаму афіцэру. Пасля звярнуўся да людзей і сказаў, што сем'і адпусцяць, а моладзь павязуць у Германію. Сярод апошніх быў і шаснаццацігадовы Віктар Самуйла.

З Лепеля моладзь разам з мірнымі жыхарамі іншых вёсак адправілі ў лагер Васэнфінген. Віктар папаў у групу, якая павінна была рэзаць чыгуначныя рэйкі.

Аднойчы, ноччу, яму ўдалося выбрацца з лагера. Але гэта каштавала яму дорага. На другі дзень у вёсцы, куды зайшоў папрасіць паесці, трапіў у рукі паліцыі. Яго пасадзілі ў турму, затым адправілі ў канцлагер Дахау. Прывезлі іх ноччу. Навічкоў пагналі пад душ, дзе пачаргова ўключалі то ледзяную ваду, то кіпень. Пасля лазні выгналі на пляцоўку. Пачаўся адбор. Віктара доўга разглядаў адзін з эсэсаўцаў, нарэшце адправіў у рабочую групу. Астатнія трапілі ў печы крэматорыя. Смерць і жорсткія катаванні чакалі вязняў на кожным кроку. Іх прымушалі закладваць рукі за галаву і скакаць па пляцы. Хто падаў — расстрэльвалі. Калі людзі вярталіся з работы, найбольш стомленых выхоплівалі з калоны і адпраўлялі ў крэматорый. На палонных ставіліся медыцынскія доследы, выпрабоўваліся газы розных відаў. Распранутых вязняў выносілі на мароз, замарожвалі, а пасля спрабавалі ажывіць...

З Дахау практычна не ўцякалі. Але вязні супрацьстаялі ворагу. ...Палонным, што працавалі на падземным заводзе, удалося перадаць план лагера адной з груп, у якую ўваходзіў В.Самуйла. Трое вязняў па трубах паспяхова пакінулі лагер. На іх пошукі былі кінуты вялікія сілы. Праз два дні ўцекачоў знайшлі і прыгаварылі да пакарання смерцю. Перад пакараннем па-

лонным дазвалялася сказаць некалькі слоў. Калі аднаму з вязняў накінулі на шыю пятлю, ён крыкнуў: «Я са станцыі Тайга, завуць Косця. Няхай жыве сусветная рэвалюцыя! Смерць фашызму...»

Вязняў канцлагера Дахау вызвалілі ў канцы красавіка 1945 г. Віктар Пятровіч Самуйла вярнуўся дадому. Больш трыццаці гадоў працаваў начальнікам Маладолецкага аддзялення сувязі.

Спрабаваў адшукаць родных Канстанціна, што загінуў у лагеры, але не змог: станцый Тайга аказалася многа. Той быў сібіраком. Прозвішча яго было Собалеў. Пісаў у школы. На жаль, адказу не атрымаў.

*У.К.Жыткоў.*

## Ведаў вайну не па чутках...

...Пасля аднаго з баёў пад Масквой Р.І.Талочка трапіў у варожы палон. Лагер знаходзіўся пад г. Ржэў. Ад лютых маразоў і голаду людзі паміралі як мухі. Страшна сказаць, але здараліся нават выпадкі людаедства. Спробы ўцячы канчаліся дрэнна. Але Талочку пашчасціла ўцячы. У завею падлез пад дрот, прыйшоў у вёску і схаваўся ў мясцовага настаўніка. Той параіў застацца ў тыле, бо фронт быў далёка.

Нядоўга давялося яму пабыць на волі. Аднойчы на вясковай вуліцы схапілі немцы. Калі скінулі з яго галавы шапку, то ўбачылі коратка састрыжаныя валасы. Чырвонаармеец. Зноў лагер палонных, на гэты раз у Віцебску.

Палонныя працавалі разам з вольнанаёмнымі. Апошніх вартавыя выпускалі за тэрыторыю па дакументах. Людзей было шмат, дакументы не паспявалі праверыць у кожнага. Гэтым і скарыстаўся Раман Ігнатавіч.

Немцы былі розныя, трапляліся і сярод іх людзі. Аднойчы вартавы, калі ўбачыў, што палонны збіраецца ўцячы, нават дапамог яму. Вайна, яна не кожнаму даспадобы. Аднак былі сярод іх і вырадкі. Па дарозе дадому сустрэў паліцыяў. Яны прывялі яго ў хату. Адзін з іх, моцна п'яны, узняў вінтоўку: «Застрэлю! Будзе тут кожная свалата бадзяцца па нашых пастах».

Іншыя паліцаі былі, відаць, у добрым настроі. Адзін з іх затрымаў выстрал, другі выпіхнуў Рамана Ігнатавіча на ганак са словамі: «Ідзі. Больш не трапляйся нам на вочы».

У хуткім часе Раман Ігнатавіч пайшоў да партызан.

*Н.Э.Багдановіч.*

## Маці паэта

### З успамінаў Н.А.Волах, былой вязніцы фашысцкага канцлагера Асвенцім

Ішоў 1943 г. Мне было ўсяго чатырнаццаць. Нашу маленькую вёсачку Карчы спалілі немцы. Мяне разам са старэйшай сястрой Марыяй забралі ў палон за тое, што муж сястры быў у партызанах. Павезлі нас у Лепель. Размясцілі за горадам на месцы ваеннага гарадка. Людзей было шмат сюды сагнана. Потым немцы сталі распытваць, хто мы і адкуль. Мы сказалі, што ў нас нікога няма ў партызанах. За сталом сядзеў разам з фашыстамі здраднік, які жыў непадалёку ад нашай вёскі. Ён усё ведаў і сказаў, што мы з партызанскай сям'і і таму нас трэба расстраляць.

Але нас не расстралялі, а загналі ў будынак, дзе ўжо было многа народу. Памятаю як цяпер: сяджу ў куточку і гляджу на ўсіх, якія яны змучаныя. Бачу, як адна бабка бярэ нешта з далоні і есць. Неўзабаве яна паклікала мяне да сябе і пачала распытваць, чыя я і адкуль. Я расказала. Потым я даведалася, што бабуля Алена Броўка з в. Пуцілкавічы. Тады я не ведала, што гэта добрая жанчына — маці вядомага беларускага паэта Петруся Броўкі. Мы пасябравалі. З таго моманту я тулілася да яе. Яна адносілася да мяне як да роднай дачкі. Праз месяц нас павезлі ў Віцебск, дзе неўзабаве пагналі на вакзал, пагрузілі ў таварныя вагоны. Было цесна, сядзелі амаль што адзін на адным. Бабуля Алена клала маю галаву сабе на калені і казала: «Не бойся, дачушка, будзем жыць, толькі трэба трымацца і не падаць духам». Пасля такіх слоў я з палёгкай засынала.

Ехалі мы доўга. Прывезлі нас у канцлагер, як потым даведаліся, у Асвенцім. Пачаліся страшныя пакуты, у якіх давялося пражыць амаль што дзевяць месяцаў. Нас строем па тры чалавекі ў рад прыгналі да нейкіх збудаванняў. У адным з іх адчыніліся дзверы і мы ўвайшлі ў цёмны смярдзючы барак. Але самае жудаснае было наперадзе. У гэтым бараку на нас зверху пусцілі атрутны дождж і сталі людзі падаць у непрытомнасці. Затым рассунулася падлога і людзі пачалі падаць у агонь. Гэта была печ-крэматорый, дзе спальвалі людзей. Але тут адчыніліся дзверы і ў барак увайшоў немец і закрычаў, што загналі не тых, каго трэба. Тыя, хто застаўся жывым, пачалі выпаўзаць на двор.

Мы доўга ляжалі на зямлі, потым пачалі адыходзіць. Нас пагналі ў лазню, мыліся халоднай вадой. У другім бараку нам абрэзалі валасы і накалолі на руках нумары. Мне накалолі на левай руцэ нумар 61630, надзелі калючыя жорсткія пасякі (так называлі паласатыя сукенкі), далі драўляныя чаравікі. На сукенках былі латкі з нумарам, адпаведным таму, што быў на руцэ. Пачалося лагернае жыццё. Жыла я ў бараку нумар 32. Там былі трох'ярусныя нары. Кармілі нас дрэнна. Адзін раз у дзень давалі маленькую місачку супу і невялічкі кавалачак хлеба з пілавіннем. Рэжым быў вельмі жорсткі: раніцай і ўвечары нас на 2 гадзіны выганялі на холад на пераклічку. Немка з сабакамі і бізуном абыходзіла строй, лічыла нас.



А.Броўка.

Я зноў сустрэлася з бабуляй Аленай. Памятаю, аднойчы было вельмі холадна, мы групкамі сядзелі, каб сагрэцца. Бабуля Алена штосьці нам расказвала.

Адзін момант у маім жыцці я не змагу забыць ніколі, таму што ён вырашыў мой лёс. Пастроілі неяк нас — і кожнага дзесятага чакала смерць. Я апынулася дзесятай, а бабуля Алена — дзевятай. Лёгенька абняла яна мяне і паставіла на сваё месца. Так бабуля Алена выратавала мяне. У апошнюю хвіліну яна сказала: «Ты маладзенькая, сілы яшчэ ў цябе знойдуцца, каб выжыць». І выйшла ў рад смяротнікаў.

Далейшы мой лёс быў такі. У лагеры нас рассартавалі: тых, каму было менш за шаснаццаць, павезлі ў Германію. Туды і я трапіла. Мая сястра засталася ў лагеры з маленькай дачушкай, у якой немцы бралі кроў. Дзяўчынка памерла. Я і мая сястра былі вызвалены нашай арміяй.

## Падполле на Ушаччыне

Перад акупацыяй раёна Ушацкі райком партыі падабраў групу людзей для работы ў падполлі на акупіраванай тэрыторыі. Сярод іх былі 2-і сакратар райкома С.Я.Барадаўкін, інструктары райкома С.Б.Боркар і С.К.Паршонак, старшыні сельсаветаў І.Т.Коршун і І.А.Сарокін, дырэктар лясгаса З.П.Тамашэвіч, дырэктар малаказавода М.Ф.Машчоў, старшыні калгасаў А.І.Хвошч, А.Р.Волах, настаўнікі У.В.Васілеўскі, А.А.Карабань і П.П.Катлёнак і іншыя.

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА г.п. УШАЧЫ**

Падпольшчыкі Ушач пачалі дзейнічаць са жніўня 1941 г. Узначаліў іх Сцяпан Якаўлевіч Барадаўкін. Да вайны ён працаваў сакратаром Ушацкага райкома партыі. У групе налічвалася каля 30 чалавек. Іх дзейнасць распаўсюджвалася і на бліжэйшыя вёскі Ліпавец, Цялічына, Ляснеўшчына, Строкты, Пралетарый, Кавалеўшчына, Матырына, Ціханяты, Астравенец.

У мэтах канспірацыі група дзялілася на звёны па 3—5 чалавек. Агульных сходаў не праводзілася.

Кіраўніцтва падполлем ажыццяўлялася праз сувязных Аляксандру Сцяпанаўну Паршонак, настаўніцу, якая ведала нямецкую мову, і Міхаіла Фёдаравіча Машчова, дырэктара маслазавода.



С.Я.Барадаўкін.

У М.Ф.Машчова знаходзілася явачная кватэра, пра якую ведалі толькі сувязныя і старшыя звёнаў.

Актыўная работа пачалася з верасня 1941 г., калі адбылася сустрэча С.Я.Барадаўкіна з прадстаўніком Віцебскага абкома партыі Ф.Ф.Дуброўскім. Праводзілася палітычная работа з людзьмі, слухаліся радыёперадачы з Масквы. Гэтым займаўся дырэктар лясгаса Захар Пятровіч Тамашэвіч. З Арэхаўскай групы паступалі звесткі з Масквы, якія яны прымалі па радыёпрыёмніку. Іх прыносіла ад В.Ф.Вітко А.С.Паршонак. Звесткі размнажаліся ў выглядзе лістовак і распаўсюджваліся сярод насельніцтва. Але хутка гэта работа спынілася, бо ў Арэхаўне і Ушачах зламаліся радыёпрыёмнікі. Трэба было шукаць іншую крыніцу інфармацыі. І яна знайшлася. С.В.Маркевіч з Велікадолецкай падпольнай групы праз А.С.Паршонак і С.Я.Барадаўкіна інфармаваў ушачан аб становішчы на франтах. Ён жа перадаў некалькі дзесяткаў аусвайсаў (асабістыя пасведчанні), што былі неабходны для перамяшчэння па тэрыторыі раёна.

Падпольшчыкі вялі актыўную работу па разлажэнні нямецкага гарнізона.Вясной 1942 г. немцы паслалі групу паліцэйскіх для нарыхтоўкі харчоў для арміі. У в. Усая яны заняліся павальным рабаваннем. Падпольшчыкі, пад выглядам памагатых фашыстам, паведамілі каменданту, што паліцэйскія прапіваюць сабранае для нямецкай арміі. Гітлераўцы павесілі некалькі паліцэйскіх, а іншыя са зброяй перайшлі на бок партызан.

Зборам зброі, боепрыпасаў у групе займаліся Уладзімір Лявонавіч Качан і Пётр Фёдаравіч Хрыпель. Было сабрана больш за 40 вінтовак, шмат гранат і боепрыпасаў. Аб дзейнасці падполля даведаліся немцы. Былі арыштаваны і расстраляны С.Дз.Казачонак, К.В.Казачонак, С.К.Паршонак і З.П.Тамашэвіч.

Гэта адбылося ў чэрвені – жніўні 1942 г.

*М.М.Кірпіч.*

**АЎЧАРКАМІ ЦКАВАЛІ ЖАНЧЫН**

Падпольшчыца г.п. Ушачы Ксенія Васільеўна Казачонак была сувязной. Яна падтрымлівала сувязь з партызанамі, якія дзейнічалі ў раёне. Аднойчы падпольшчыкаў напаткала бяда. Арыштавалі адразу ўсю пяцёрку. Гітлераўцы знянацку ўварваліся ў хату Ксеніі, выцягнулі яе на вуліцу. Яна толькі і паспела крыкнуць сястры: «Вара, беражы сына». Каля камендатуры яна ўбачыла сваіх таварышаў. Дапытвалі іх па адным, вельмі жорстка, але яны не выдалі адзін аднаго. На наступны дзень іх вывелі на вуліцу. Стаяў май 1942 г. Іх павялі да невялікага загона. Там стаялі гітлераўцы, якія трымалі за ашыйнік аўчарак. Дзяўчат увялі ў загон. Тры вялікія аўчаркі кінуліся на жанчын.

*Т.М.Шалак.*

**ПАТРЫЁТЫ ВЁСКІ ІЛЬЮШЫНА**

У кастрычніку 1941 г. у в. Ільюшына прыбыло падраздзяленне фашысцкіх салдат з гарнізона Баркоўшчына. Яны сагналі ўсё насельніцтва на сход. Гітлераўскі афіцэр на ламанай рускай мове паведаміў, што камуністы і камсамольцы, камандзіры і камісары, лётчыкі і танкісты будуць расстрэльвацца, а іх сем'і накіроўвацца ў лагеры і на работу ў Германію. Тое ж чакае і тых, хто не будзе падпарадкоўвацца фашысцкім уладам і іх парадкам.

Трэба было як мага хутчэй разгортваць барацьбу з ворагам. Мы пачалі збіраць зброю, боепрыпасы, псаваць тэлефонную сувязь, рабіць завалы на дарогах Ушачы – Лепель, Ушачы – Кублічы, разбіраць масты. Была сарвана ініцыятыва бургамістра Гарадзецка-Жарскай воласці К.Пугача аб стварэнні паліцэйскага атрада.

У красавіку 1942 г. на кватэры былога старшыні калгаса «Чырвоны сцяг» А.М.Карабаня адбыўся сход падпольшчыкаў, на якім прысутнічаў прадстаўнік Віцебскага падпольнага абкома партыі П.К.Бажанок. Было вырашана стварыць

партызанскі атрад і пачаць узброеную барацьбу. Камандзірам яго стаў Ф.Ф.Дуброўскі, камісарам С.Я.Барадаўкін.

Партызаны мелі сваіх надзейных людзей у многіх нямецкіх установах. Па заданні партызан працаваў загадчыкам склада збожжа П.З.Асташкевіч. З дапамогай яго і Апанаса Карабаня на партызанскую базу ў Істопішча было вывезена каля 40 т мукі і зерня, нарыхтаванага акупантамі. У рукі партызан трапіла многа жывёлы.

Фашысты лютавалі. У в. Ільюшына пачаліся арышты. Былі расстраляны Пётр Хрыпель і Аляксандр Віннік. Узнікла небяспека Апанасу Карабаню, Фёкле Палонскай, мне і іншым падпольшчыкам. Далей заставацца ў вёсцы было немагчыма. 23 падпольшчыкі ўліліся ў партызанскі атрад.

Аднак падполле ў в. Ільюшына працягвала існаваць. Там дзейнічала рэзервовая група на чале з Іосіфам Кніпам і Міхаілам Апёнкам.

*Ц.Ф.Хрыпель.*

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА АПАНАСКАВІЧЫ — ЯНОВА**

Па заданні Ф.Ф.Дуброўскага С.Б.Боркар у жніўні 1941 г. стварыла падпольную групу. Яе намеснікам з лістапада 1941 г. стаў І.К.Касьмін з ваеннаслужачых-акружэнцаў. Групу ў в. Янова ў жніўні — кастрычніку ўзначальваў былы палітрук Чырвонай арміі І.І.Бялоў. Спачатку група складалася з 12 чалавек, у лістападзе ў яе ўвайшлі яшчэ 2.

Кіраўніцтва групай ажыццяўлялася праз І.К.Касьміна і П.А.Калітуху. Частка падпольшчыкаў нават не ведала свайго кіраўніка. Сувязь з падпольшчыкамі в. Янова падтрымліваў І.К.Касьмін праз М.К.Вайтовіча, былога старшыню калгаса «Перадавы», і братоў Лявона і Кірыла Гракоў.

Члены групы праводзілі палітычную работу сярод насельніцтва, арганізоўвалі сабатаж мерапрыемстваў нямецкіх улад, рыхтавалі насельніцтва да барацьбы з ворагам, збіралі зброю і боепрыпасы.

Падпольшчыкі мелі 2 радыёпрыёмнікі. Адзін знаходзіўся ў Э.П.Сямёнавай, жонкі афіцэра Чырвонай арміі, другі ў в. Бікульнічы ў Фёдара Дзенісёнка. Э.П.Сямёнава запісвала зводкі Саўінфармбюро, С.Б.Боркар размнажала іх і перадавала І.К.Касьміну для распаўсюджвання сярод насельніцтва.



К.К.Грак.

З дапамогай М.К.Вайтовіча, які ўладкаваўся па заданні падпольшчыкаў на пасаду бургамістра Гарбаціцкай воласці, яноўскія патрыёты мелі паперу і нават пішучую машынку. Яна знаходзілася на кватэры С.К.Грак у в. Янова. Яе сыны Лявон і Кірыл перыядычна наведвалі «радню» ў в. Бікульнічы, дзе атрымлівалі ад Фёдара Дзенісёнкі паведамленні з Масквы. Падпольшчыкі І.І.Бялоў, А.А.Несцераў і Лявон Грак множылі іх. Распаўсюджвалі лістоўкі Кірыл Грак і Марыя Сакалова, выхавацелька Полацкага дзіцячага дома, якая стала смелай разведчыцай.

Палітычная работа падпольшчыкаў актывізавала антыфашысцкую дзейнасць насельніцтва раёна. Восенню 1941 г. ураджай з калгасных палёў быў разабраны па хатах і не трапіў да акупантаў.

Староста в. Апанаскавічы С.Неругаёнак загадаў пяцярым сялянам адвезці сена ў каменскі нямецкі гарнізон. Сярод сялян быў і падпольшчык І.К.Касьмін. Па дарозе яны вырашылі схаваць сена. Суткі яны прабылі ў Сарочынскім лесе, а ноччу вярнуліся дадому і схавалі сена ў хлявах.

Аднойчы М.К.Вайтовіч паведаміў пра намеры фашыстаў восенню і зімою 1941 — 1942 гг. збіраць па вёсках у насельніцтва цёплае адзенне і абутак для нямецкіх войскаў. Папярэджаныя вяскоўцы ўсё пахавалі.

Падпольшчыкі падбіралі надзейных людзей у партызаны, збіралі зброю, медыкаменты. У верасні 1941 г. пасля працяглых пошукаў Лявон Грак знайшоў у в. Крупеніна склад трафейнай зброі, з якога ноччу вынеслі 50 вінтовак, 2 станковыя кулямёты і шмат патронаў. На двух падводах да раніцы зброя была дастаўлена ў в. Бікульнічы і схавана, а праз некаторы час



М.І.Ястрабаў.

яна была перапраўлена ў в. Янова і закапана ў хляве С.К.Грак. 10 вінтовак схаваў у сябе М.К.Вайтовіч. У в. Бікульнічы знайшоўся здраднік. У канцы верасня былі арыштаваны і закатаваны ў Полацку падпольшчыкі Ф.Дзенісёнак і П.Бурак.

Пачаліся аблавы ў вёсках Янова і Павулле. У час адной з іх была знойдзена зброя ў С.К.Грак. Жанчыну і яе малодшага сына Кірыла дапытвалі, хто хаваў зброю, для каго. Дапытвалі і М.К.Вайтовіча з жонкай. Але нічога не дазналіся.

Кіраўнікі групы разышліся па вёсках суседняга раёна. У кастрычніку 1941 г. пакінулі свае вёскі падпольшчыкі І.І.Бялоў, А.А.Несцераў, М.В.Сакалова і Лявон Грак. У сувязі з хваробай Грак хутка вярнуўся дадому. Нягледзячы на рэпрэсіі і страты, падпольшчыкі працягвалі дзейнічаць. Яноўскую групу ўзначалілі Лявон Грак і М.К.Вайтовіч. І.К.Касьмін устанавіў сувязь з Астраўлянска-Глыбачанскім падполлем.

Вясной 1942 г. група мела кулямёты «максім» і Дзегцярова, 13 вінтовак, 10 гранат і шмат патронаў. У маі—чэрвені падпольшчыкі разам з групай ваеннаслужачых Чырвонай арміі, што ўцяклі з палону, стварылі партызанскі атрад «Смерць фашызму».

*М.М.Кірпіч.*

## З успамінаў І.І.Бялова, былога кіраўніка Яноўскай падпольнай групы

Аднойчы да нас у Янова прыехаў усхваляваны М.К.Вайтовіч і паведаміў, што немцы без яго згоды прызначаюць яго старастам. Ён намерваўся збегчы з дому. Мы разам усё абдумалі і вырашылі, што ён павінен ісці на работу да немцаў і выкарыстаць гэты факт. Ён здабываў каштоўныя звесткі, інфармаваў падполле пра планы немцаў, ратаваў арыштаваных жыхароў, удзельнічаў у зрыве хлебапаставак акупантам.

У в. Павулле ў вялікім калгасным хляве Вайтовіч зрабіў сховішча, дзе пры аблавах хаваліся падпольшчыкі, тут жа захоўвалася і зброя.

Дзейнасць падполля занепакоіла немцаў. Пачаліся частыя налёты на Бікульнічы, Янова, Павулле. Немцы шукалі сляды падполля. У канцы верасня яны арыштавалі ў Бікульнічах Фёдара Дзенісёнка і Андрэя Бурака. Хлопцаў немцы па-зверску закатавалі, але тыя нікога не выдалі.

Праз тыдні два карнікі зноў зрабілі налёт на нашу групу. Яны акружылі в. Янова і блакіравалі хату Соф'і Канстанцінаўны, маці братоў Гракоў. Жанчыну і яе сына Кірыла білі, дапытваючыся прозвішчы кіраўнікоў падполля.

Затым была акружана в. Павулле. Вайтовіча і яго жонку Ганну Мікалаеўну збілі, але яны нічога не сказалі.

У в. Янова немцы ліквідавалі наша сховішча зброі. А.Несцераў, Сакалова і Лявон Грак вырашылі ісці за лінію фронту. Гэта было ў лістападзе 1941 г. Астатнія пайшлі да партызан.

З нашай групы загінулі Лявон Грак, Аляксей Несцераў, Марыя Сакалова, Андрэй Бурак, Міхась Крупскі, Талочка.

## АРЭХАЎСКАЯ ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА

Група пачала дзейнічаць з ліпеня 1941 г. пад кіраўніцтвам дырэктара Арэхаўскага дзіцячага дома І.А.Клопава і механіка Ушацкай МТС В.В.Чобата. Арганізацыйна аформілася ў жніўні пасля сустрэчы І.А.Клопава з Ф.Ф.Дуброўскім у Сарочынскім лесе, дзе было дамоўлена аб сувязі і дзейнасці падпольшчыкаў. Да гэтага часу ў групе налічвалася 11 чалавек. У верасні да іх далучыліся ваеннаслужачыя-акружэнцы М.І.Ястрабаў, А.Р.Сычоў, М.Ц.Юртаеў і Батыр Гулямаў.

Падпольшчыкі Жарскай групы перадалі І.А.Клопаву радыёпрыёмнік. Сувязь з іншымі групамі ажыццяўлялі І.А.Кулакоў і настаўніца А.С.Паршонак. На нарадзе падпольшчыкаў, якая адбылася ў лістападзе, выбралі кіраўніцтва групы, куды ўвайшлі Ц.П.Гірсёнак, І.А.Клопаў і М.І.Ястрабаў.

Падпольшчыкі вялі палітычную работу сярод насельніцтва, займаліся дыверсійнай дзейнасцю, зборам зброі.

Першапачаткова радыёпрыёмнік быў у В.В.Чобата, затым у былога шафёра Лепельскага райкома партыі В.Ф.Вітко. Ён запісваў зводкі Саўінфармбюро, якія падпольшчыкі перапісвалі і распаўсюджвалі па вёсках.

В.В.Чобат стварыў дыверсійную групу, якая псавала сельскагаспадарчую тэхніку былой Ушацкай МТС і нямецкай гаспадаркі «Арэхаўскі земскі двор». Восенню 1941 г. яны вывелі са строю малатарню, чым сарвалі абмалот збожжа. Гэта група вывела са строю тэлефонную лінію Сарочына — Ушачы, раскідвала па дарогах «вожыкі».

Жыхары в. Арэхаўна як маглі ўхіляліся ад працы на акупантаў. Восенню 1941 г. яны не выканалі загаду кіраўніка двара Папко па перавозках бярвён з рэчкі Ушача. Немцы жорстка расправіліся з сялянамі. Падпольшчыкі выпусцілі лістоўку, у якой расказалі пра гэты выпадак і «новы парадак» немцаў. Група падпольшчыкаў на чале з І.А.Клопавым рабіла ўсё магчымае, каб выратаваць дзяцей яўрэйскай нацыянальнасці, што жылі да вайны ў дзіцячым доме. Іх стараліся размясціць па беларускіх сем'ях. Яўрэйскіх дзяцей узялі ў сем'і братоў Самуйлавых, брата і сястры Бенемянсонаў і інш.

Цяжкай справай для падпольшчыкаў была здабыча зброі і боепрыпасаў. Першапачаткова гэтай справай займаліся выхаванцы дзіцячага дома. Ужо восенню 1941 г. яны знайшлі 2 пісталеты, 8 гранат, некалькі тысяч патронаў. Вясной 1942 г. у іх было 5 вінтовак, 1 карабін, 2 пісталеты, 2 наганы, 8 гранат і каля 5 тысяч патронаў.

Падпольшчыкі згуртавалі вакол сябе каля 60 патрыётаў, якія былі гатовы весці барацьбу з ворагам. У канцы сакавіка 1942 г. падпольшчыкі наладжвалі сувязь з партызанскім атрадам «Смерць фашызму», а летам сталі яго байцамі.

Толькі І.А.Клопаў застаўся да жніўня 1942 г. у Арэхаўне і выконваў заданні партызан.

*М.М.Кірпіч.*

## З успамінаў К.Ц.Бандарэнкі, былой падпольшчыцы Арэхаўскай групы

Прыпамінаецца такі выпадак. Прынесла мне неяк Марыя Аўласенка лістоўкі. Я іх паклала ў сенцах на шафу, накрыўшы нейкай анучкай. Толькі яна пайшла, як з'явіліся немцы. Ну ўсё, думаю, прапала. Фашысты пачалі ўсё пераварочваць. Шукалі, як пасля высветлілася, патэфон.



К.Ц.Бандарэнка.

Галоўным у той час было падтрымаць баявы дух нашых людзей. Яны павінны былі ведаць праўду аб падзеях на фронце.

Аднойчы ворагі сагналі ўсіх жыхароў з навакольных вёсак у Матырына. Зімой гэта было. Моўчкі стаяў натоўп вяскоўцаў. Фашысты гаварылі: «Маскаў капут. Сталін капут». Гэта быў канец 1942 г., калі гітлераўцы ўжо былі адкінуты ад сталіцы нашай Радзімы. Пасля гэтага мы раскідалі лістоўкі, у якіх гаварылася аб перамозе Чырвонай арміі.

Не толькі я распаўсюджвала лістоўкі. Гэтай справай займаліся мой брат Уладзімір Тарасевіч, Сяргей Сісковіч, Марыя Чобат, Ганна Алексяёнак.

Неўзабаве Уладзімір і Сяргей пайшлі ў партызаны. Зусім хлапчукамі яны былі, а імкнуліся змагацца са зброяй у руках.

Многае прыйшлося рабіць у вайну. Капалі акопы ў вёсках Ветрынскага раёна для абароны створанай восенню 1942 г. Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Збірала прадукты харчавання для партызан. Калі партызаны прыходзілі на адпачынак, дапамагалі ім уладкоўвацца па кватэрах.

Пасля была блакада. Разам з усімі давялося шмат перажыць.

### ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА АСТРАЎЛЯНЫ — УСВІЦА — ГЛЫБАЧКА

Астраўлянскую групу узначаліў М.А.Цябут. З пачаткам вайны ён прыйшоў у родную вёску з Піншчыны, дзе працаваў загадчыкам аддзела абкома камсамола. Дырэктар пачатковай школы І.Я.Васілеўскі сабраў

вакол сябе патрыётаў в. Усвіца. На чале Глыбачанскай групы быў сакратар сельсавета У.Ф.Талочка. У жніўні 1941 г. 3 групы аб'ядналіся. Для кіраўніцтва абралі партыйнае бюро: М.А.Цябут (сакратар), У.Я.Васілеўскі (намеснік сакратара), І.Я.Васілеўскі, Дз.Нікіцін і В.С.Мядзведскі (члены). Кіраўнікі падполля мелі псеўданімы: М.А.-Цябут — Уральскі, У.Я.Васілеўскі — Чорны. Паміж членамі бюро былі падзелены абавязкі. М.А.Цябут і У.Я.Васілеўскі ажыццяўлялі агульнае кіраўніцтва. В.С.Мядзвядскі адказваў за збор зброі і асабіста здабыў станковы кулямёт, некалькі пісталетаў і многа патронаў. Дз.Нікіцін вёў палітычную работу сярод чырвонаармейцаў, якія апынуліся ў акружэнні, з мэтай прыцягнення іх да барацьбы з фашыстамі.

У М.А.Цябута меўся радыёпрыёмнік, які спачатку знаходзіўся ў доме яго маці, а потым быў схаваны ў лесе. Быў радыёпрыёмнік і ў У.Я.Васілеўскага.

Каб ведаць намеры ворага, па заданні падполля У.Ф.Талочка ўладкаваўся на працу ў валасную ўправу пісарам.

Яго дачка Рыта перадавала падпольшчыкам звесткі, якія дабываў бацька. З мэтай здабычы інфармацыі ўладкаваліся на работу да немцаў прыёмшчыкамі лесу А.В.Шыхель і М.А.Цябут.

У той час акупанты прымушалі насельніцтва пілаваць будаўнічы лес. М.А.Цябут лесасклад зрабіў канспіратыўным пунктам. Да таго ж ён мог па службовых абавязках бываць у лесе, што давала магчымасць сустракацца з партызанамі.

Вясною 1942 г. з Полацкага лагера збегла група ваеннапалонных. Яны намерваліся перайсці лінію фронту. У.Я.Васілеўскі пераканаў іх застацца на Ушаччыне, весці партызанскую барацьбу з акупантамі.

*М.М.Кірпіч.*

### З успамінаў У.Я.Васілеўскага, былога кіраўніка Астраўлянскай падпольнай групы

У канцы жніўня 1941 г. у в. Астраўляны я сустрэўся з М.А.Цябутам. Расказаў яму аб рашэннях партыі па арганізацыі барацьбы ў тыле ворага. Абмеркавалі іх на сходзе, які адбыўся ў верасні 1941 г. На ім апрача мяне прысутнічалі В.С.Мядзведскі, М.А.Цябут, Дз.А.Нікіцін і І.Я.Васілеўскі. Усе выказалі жаданне весці барацьбу з акупантамі, вырашылі разгарнуць палітыка-масавую работу сярод насельніцтва з мэтай стварэння партызанскага атрада. Уся далейшая наша дзейнасць была падпарадкавана гэтай справе. Намецілі план, які прадугледжваў збор зброі і яе захаванне, арганізацыю прыёму па радыё зводак Саўінфармбюро і распаўсюджванне іх сярод насельніцтва, вывучэнне нямецкай прапаганды, каб супрацьпаставіць ёй нашу, савецкую, выяўленне актыву, на які можна было б абаперціся ў падпольнай рабоце.

Мне даручылі ўстанавіць сувязь з мясцовай інтэлігенцыяй, Дз.А.Нікіціну — з чырвонаармейцамі-акружэнцамі, якіх многа жыло ў вёсках. В.С.Мядзведскі перайшоў у в. Шашы Шумілінскага раёна, каб наладзіць сувязь з падпольшчыкамі суседніх тэрыторый.

Праз А.П.Сінкевіча і Ф.Д.Васіленка разгарнулі работу сярод насельніцтва Тураўлянскага сельсавета Полацкага і Хоцінскага сельсавета Бешанковіцкага раёнаў. З кожным днём сувязі пашыраліся. Ад нас людзі даведваліся аб становішчы на фронце, аб жыцці нашай краіны. Работа наша была вельмі патрэбнай. Людзі чакалі ад нас праўдзівых навін.

У хуткім часе мне ўдалося звязацца з камсамольцамі лейтэнантам Чырвонай арміі М.В.Уткіным, настаўнікамі Т.У.Стануль, Н.Іванковіч, П.Красновым, М.Ф.Каваленкам. Яны вялі падпольную работу ў в. Глыбачка. На наступным пасяджэнні партбюро М.А.Цябут, В.С.Мядзведскі, І.Я.Васілеўскі, М.В.Уткін, Ф.Д.Васіленка, І.К.Касьмін, Ф.Ц.Шырокіх былі зацверджаны кіраўнікамі падпольных груп, якія яны і арганізоўвалі. Групы складаліся з 10—12 чалавек, і павінны былі ў любы момант быць гатовымі да баявых дзеянняў.

Я ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва. Праз сувязных Н.Іванковіч, Т.Стануль, М.І.Цябут падтрымлівалі сувязь з патрыётамі Глыбачанскай воласці.

Ішоў час. Падпольшчыкі пашыралі сваю дзейнасць. Удалася нам кампанія па зрыве паставак хлеба акупантам. Абмалот збожжавых быў сарваны. Не атрымалі немцы і мяса. Насельніцтва хавала жывёлу па лясах.

Узрос баявы дух насельніцтва. Усе верылі ў перамогу. Насельніцтва падтрымлівала нас і было гатова ў масавым

парадку ўступіць у створаны партызанскі атрад. Яно збірала зброю, боепрыпасы, займалася нарыхтоўкай хлеба для партызан. Камандзіраў і палітработнікаў стараліся падбіраць з акружэнцаў.

Дзейнасць баявых груп распаўсюджвалася на тэрыторыю нашага, а таксама Полацкага, Сіроцінскага, Бешанковіцкага раёнаў.

У канцы красавіка 1942 г. у лес каля в. Двор Усвея Уткін прывёў групу, у склад якой уваходзілі Каваленка, Красноў, Станульь, Ніна Іванковіч, Надзя Гарбук і іншыя. Шырокіх прывёў Сысоева, Бераснёва, Сашука і іншых. Адначасова М.А.Цябут накіраваў у атрад групу Плахатнюка з дзесяці чалавек, якія ўцяклі з лагера ваеннапалонных з Полацка. Прыбыў да партызан і я разам з І.М.Мальгіным, Н.І.Яжовым. Партызанскі атрад рос і набіраў сілу.

### СХОД У ЛЕСЕ

## З успамінаў Т.І.Чуднікавай, былой партызанкі брыгады імя В.І.Чапаева

У першыя дні нямецкай акупацыі мы згрупаваліся вакол настаўніка Уладзіміра Якаўлевіча Васілеўскага. Ён падбадзёрваў нас, раіў шукаць і хаваць зброю, чытаў нам лістоўкі са зводкамі Саўінфармбюро. Праз яго мы даведваліся аб цяжкім становішчы на фронце, пра фашысцкую хлусню аб захопе Масквы і будучым парадзе гітлераўскіх войскаў на Чырвонай плошчы. Весткі аб перамозе Чырвонай арміі пад Масквой узнімалі настрой, умацоўвалі веру людзей у перамогу.

У нашу падпольную групу ўваходзілі Надзея Гарбук, Мікалай Уткін, Міхаіл Каваленка, Пётр Красноў і Ніна Іванковіч. Мы былі не адны, дзейнічалі і іншыя групы, асабліва пасля таго, як быў забіты бургаміст Бакланаў. Падпольнымі групамі кіраваў раённы падпольны камітэт партыі. З нашай групай быў звязаны Міхаіл Цябут.

8 мая 1942 г. да мяне зайшоў піянер Шурык Красінскі з пісьмом ад Чорнага (псеўданім У.Я.Васілеўскага). Ён збіраў нас на сход каля в. Усвіца.

Кіраўніком нашай групы быў М.В.Уткін. Мы павінны былі сабрацца каля Лысай гары. Пароль — кукаванне зязюлі.

Я крыху спазнілася. Тут ужо былі Мікалай Уткін, Міша Каваленка, Пеця Красноў. Асцярожна падаліся да ўмоўленага месца. Мікалай увесь час трымаў напагатове гранату. Прайшлі без прыгод. Сабралася чалавек пятнаццаць. У цемры я разгледзела 2 дзявочыя постаці. Гэта былі сёстры Юля і Валя Бераснёвы. Пачула знаёмы голас Уладзіміра Якаўлевіча.

На ўсё жыццё запомніўся той незвычайны сход. Трыбунай нам служыў разбіты танк. Усе гаварылі горача. Абмеркавалі арганізацыйныя справы: выбары камандзіра і камісара партызанскага атрада, яго назву.

Камандаваць атрадам даверылі Ц.Дз.Плахатнюку, таму што ён мужна паводзіў сябе ў палоне, здолеў нават дастаць пісталет і хаваў яго, рызыкуючы жыццём. Камісарам аднадушна выбралі Васілеўскага. Атрад назвалі «Смерць фашызму!».

На другую ноч, пасля арганізацыі атрада, партызаны прыйшлі з «візітам» да паліцаяў. Большасць з іх не супраціўлялася, добраахвотна здала зброю, а потым і самі прыйшлі ў партызанскі атрад, ваявалі сумленна. Толькі некалькі мацёрых здраднікаў аказалі супраціўленне. З такімі размова была кароткай.

Расправіліся і з рукшаніцкай паліцыяй, у выніку чаго былі знішчаны даўгавыя спісы па зборы для немцаў прадуктаў харчавання. У прыёмным пункце, які знаходзіўся ў старым будынку Глыбачанскай школы, партызаны знайшлі немалы запас. Частку яго раздалі насельніцтву, астатні павезлі ў лагер атрада.

Вестка аб разгроме паліцыі і захопе прыёмнага пункта хутка разнеслася па вёсках. Пайшлі чуткі, што дзейнічае буйны савецкі дэсант, асабліва пасля таго, як у паліцаяў забралі коней і жывёлу і вярнулі сялянам. Людзі радаваліся.

### ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЯЛІКІЯ ДОЛЬЦЫ — ВЕСНІЦК

Дзейнасць групы пачалася ў верасні 1941 г. Яе арганізатарам і кіраўніком быў С.В.Маркевіч, былы настаўнік хіміі Ушацкай сярэдняй школы. Спачатку С.В.Маркевіч звярнуў увагу на М.З.Станкевіча, якога добра ведаў. Да таго ж, яго бацька быў рэпрэсіраваны і гэта было выкарыстана падпольшчыкамі для ўладкавання яго на работу да немцаў.

Хутка М.З.Станкевіч стаў бургамістрам Велікадолецкай воласці, а пісарам С.В.Маркевіч.



С.В.Маркевіч.



М.З.Станкевіч.



П.П.Катлёнак.



Ф.П.Кудраўцаў.



М.І.Пярэдня.

М.З.Станкевіч прысутнічаў на многіх нарадах, дзе даведваўся аб намерах ворага і перадаваў падпольшчыкам, а тыя партызанам.

Работа групы была добра заканспіравана. Падпольшчыкі не ведалі адзін аднаго, кожны падпарадкоўваўся свайму кіраўніку, выконваў яго заданні. С.В.Маркевіч праз С.К.Паршонка, яго дачку Сашу і І.Ф.Гуркова быў звязаны з Ушацкай і Жарскай падпольнымі групамі.

У першыя дні вайны адной з галоўных задач падпольшчыкаў было інфармаванне насельніцтва аб стане спраў на фронце. Крыніцай інфармацыі былі 3 радыёпрыёмнікі, якія знаходзіліся ў в. Вялікія Дольцы ў М.З.Станкевіча, у в. Масцішча ў П.П.Катлёнка і ў в. Кублічы ў В.Салаўёвай. Атрыманыя зводкі Саўінфармбюро ў вуснай ці пісьмовай форме перадаваліся надзейным людзям, якія ў сваю чаргу распаўсюджвалі іх па воласці. Вялікую дапамогу падпольшчыкам у гэтай справе аказваў С.В.Маркевіч. Ён забяспечыў іх аўсвайсамі, якія здабываў ва Ўшацкай камендатуры.

Справы ў групе ішлі няблага да выдання акупацыйнымі ўладамі загаду аб вяртанні немцам маёмасці, што належала савецкім дзяржаўным і каапeратыўным арганізацыям і была разабрана па дамах насельніцтвам. Чакаліся вобыскі. Бацька паліцэйскага Нікіфар Падгол вырашыў схаваць частку гэтай маёмасці ў падвале медпункта. Там ён знайшоў радыёпрыёмнік і паведаміў аб гэтым немцам. М.З.Станкевіч і С.В.Маркевіч былі арыштаваны і пад канвоем адпраўлены ва Ушачы.

М.З.Станкевіч мужна трымаўся на допыце, нягледзячы на здзекі, нікога не выдаў. 25 кастрычніка 1941 г. яго расстралялі. С.В.Маркевіча, з-за адсутнасці ўлік, адпусцілі.

Бургамістрам назначылі начальніка валасной паліцыі Ігната Пазняка. Працаваць стала складаней. Смела і рашуча дзейнічалі былы начальнік Стадолецкай пагранзаставы Фёдар Пятровіч Кудраўцаў, ветэрынар Васіль Кірылавіч Дарашкевіч. Апошні быў расстраляны ў снежні 1941 г.

Механік МТС Мікалай Іосіфавіч Пярэдня рамантаваў сабраную падпольшчыкамі зброю, каваў клінкі для партызан.

Патрыёты знішчылі здрадніка Чапкоўскага, які перадаў немцам спісы камуністаў воласці.

Гэты выпадак і паўторны арышт кіраўніка групы С.В.Маркевіча вымусілі падпольшчыкаў у чэрвені 1942 г. пайсці ў партызаны.

*М.М.Кірпіч.*

**ЯГО НАГНАЛА ВАРОЖАЯ КУЛЯ**

## З успамінаў Ф.Елісеева, былога ўдзельніка Велікадолецкай падпольнай групы

Сярод падпольшчыкаў нашай групы асобым аўтарытэтам карыстаўся

Ф.П.Кудраўцаў. Вакол яго згрупавалася моладзь. Былі сярод іх Пётр Гудзенка, настаўнікі Мікалай Полазаў, Ільля Шпіронак і многія іншыя. Усе мы сталі яго надзейнымі памочнікамі. Сябравалі мы з ім і раней, калі ён быў яшчэ начальнікам пагранзаставы. Ён часта запрашаў нас у госці, дазваляў ездзіць на конях у сёдлах. Гэта было да вайны. Цяпер іншы час і мы ведалі, што наша дапамога патрэбна партызанам. Усю знойдзеную зброю, у т. л. і кулямёт, мы адразу перадалі Кудраўцаву. Аднойчы мне пашанцавала, я знайшоў ротны мінамёт і 2 скрынкі мін да яго. Спачатку схаваў усё гэта, а потым перадаў партызанам. Сустрэч з Фёдарам Пятровічам было шмат. Мы з'яўляліся надзейнымі памочнікамі гэтага адважнага падпольшчыка, выконвалі яго даручэнні і заўсёды зайздросцілі яго непахіснасці і мужнасці, глыбокай веры ў перамогу. Аднойчы гітлераўцы ачапілі дом, у якім спыніўся на начлег падпольшчык. Знайшоўся здраднік, які выдаў яго. Каб хутчэй расправіцца з Кудраўцавым, фашысты падпалілі хату. Аднак Фёдару Пятровічу ўдалося непрыкметна выбрацца з палаючага памяшкання. Хаваючыся за дымам, ён падаўся да лесу. Фашысты ўбачылі яго і адкрылі агонь. Кулямётная чарга нагнала яго. Так загінуў адважны падпольшчык.

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЁСКІ ЖАРЫ**

Група была створана ў жніўні 1941 г. У яе ўваходзіла каля 20 чалавек. Кіраваў ёю Ф.Ф.Дуброўскі. Праз настаўніка мясцовай школы Івана Аляксандравіча Кулакова падпольшчыкі былі звязаны з Арэхаўскай групай. Сувязь з Ушацкім падполлем ажыццяўлялася праз Ніну Сцяпанаўну Паршонак. Знайшлі надзейных людзей у Лепелі. Праз Васіля Кузьміча Паршонка даведаліся пра нямецкі гарнізон, аб становішчы ў лагеры ваеннапалонных, магчымасці іх вызвалення. Удалося выратаваць з палону чырвонаармейцаў Міхаіла Чайніка і



І.А.Кулакоў.

Палюкевіча, якія хутка сталі партызанамі. В.П.Сальнікаў прыйшоў у падполле са зброяй, якую ён сабраў разам з надзейнымі хлопцамі. Мікалай Данілавіч Сафонаў да 1939 г. служыў у Чырвонай арміі на Ушаччыне. Ён добра ведаў, дзе знаходзіліся склады зброі. На балоце знайшоў дзве 76-мм гарматы і снарады да іх. Восенню 1942 г. ён вывез іх у партызанскі атрад Дубава. Пайшлі ў партызаны і падпольшчыкі.

**НЕ ВЕДАЛІ, ШТО ПАЧАЛАСЯ ВАЙНА**

21 чэрвеня 1941 г. моладзь пасля работы сабралася ў в. Двор Жары на танцы. Весяліліся да раніцы. Ніхто не ведаў, што пачалася вайна.

У першыя дні вайны мне давялося быць у в. Двор Жары па службовых справах. Там я сустрэў Варвару Міхейку. Вырашылі змагацца з ворагам. Родныя заўважылі, што яна часта стала хадзіць у лес, які быў недалёка ад іх хутара. Аднойчы, гэта было зімой, яна прыбегла, хуценька распранулася і забралася на печ. Хвілін праз дзесяць у хату ўвайшлі паліцаі, якія высачылі яе. Дзяўчыну забралі.

Ніякія просьбы родных не дапамаглі. Павялі яе на могілкі в. Бачкары і там расстралялі. Родныя не ведалі аб гэтым, чакалі яе некалькі дзён.

*К.А.Атрашкевіч.*

## Удзельнікі антыфашысцкага падполля, якія дзейнічалі на тэрыторыі Ушацкага раёна ў 1941—1942 гг.

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЁСАК АПАНАСКАВІЧЫ — ЯНОВА**

**БЯЛОЎ Іван Іванавіч**, н. у 1909, палітрук, кіраўнік падпольнай групы в. Янова.

**БОРКАР Сцепаніда Барысаўна**, н. у 1894, інструктар Ушацкага РК КП(б)Б, кіраўнік групы.

**БУРАК Пётр Іванавіч**, н. у 1910, калгаснік.

**ВАЙТОВІЧ Марцін Кузьміч**, н. у 1896, старшыня калгаса «Перадавы».



М.М.Асіпёнак.



В.В.Чобат.



Я.С.Жалейка.

**ГОЛІК Іван Яфрэмавіч**, н. у 1924, вучань.

**ГОЛІК Павел Сямёнавіч**, н. у 1923, студэнт Полацкага лясного тэхнікума.

**ГРАК Леанід Кірылавіч**, н. у 1920, калгаснік.

**ГРАК Кірыл Кірылавіч**, н. у 1925, вучань.

**ГРАК Соф'я Канстанцінаўна**, н. у 1895, калгасніца.

**ДЗЯНІСЁНКА Фёдар Рыгоравіч**, н. у 1907, бухгалтар калгаса.

**КАЛІТУХА Пётр Ануфрыевіч**, н. у 1909, дарожны майстар.

**КАСЬМІН Іван Карпавіч**, н. у 1917, ваеннаслужачы, намеснік кіраўніка групы.

**КРУПСКІ Міхаіл Пятровіч**, н. у 1912, калгаснік.

**МЯДЗВЕДЗЕЎ Дзмітрый Ягоравіч**, н. у 1912, настаўнік.

**НЕСЦЕРАЎ Аляксей Андрэевіч**, н. у 1907, начальнік штаба 201-га палка 84-й мсд, намеснік кіраўніка Яноўскай падпольнай групы.

**САКАЛОВА Марыя Васільеўна**, н. у 1923, выхавацелька Полацкага дзіцячага дома.

## ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЁСКІ АРЭХАЎНА

**АСІПЁНАК Міхаіл Міхайлавіч**, н. у 1917, настаўнік.

**ВІТКО Васіль Фёдаравіч**, н. у 1906, шафёр Лепельскага РК КП(б)Б.

**ГІРСЁНАК Тамара Віктараўна**, н. у 1920, медсястра Лепельскай бальніцы.

**ГІРСЁНАК Цярэнцій Піліпавіч**, н. у 1912, ваенфельчар, кіраўнік групы з лістапада 1941.

**ГІРСЁНАК-ПАЗНЯК** Эмілія Піліпаўна, н. у 1918, служачая.

**ДЗЯРЫБА Пётр Іванавіч**, н. у 1922, кладаўшчык дзіцячага дома.

**КЛОПАЎ Ілья Апанасавіч**, н. у 1900, дырэктар Арэхаўскага дзіцячага дома, кіраўнік групы са жніўня 1941, з лістапада 1941 — намеснік кіраўніка.

**ЛІСОЎСКІ Сямён Сямёнавіч**, н. у 1918, калгаснік.

**ФЕДАРЭНКА-СТРУКАВА** Соф'я Маркаўна, н. у 1917, настаўніца.

**ЧОБАТ Васіль Васільевіч**, н. у 1914, механік МТС.

**ШАРАЕВА-ПЯТРОВА** Алена Данілаўна, н. у 1916, настаўніца.

**ЯСТРАБАЎ Мацвей Іванавіч**, н. у 1913, журналіст, намеснік кіраўніка групы з лістапада 1941.

## ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЁСАК ВЯЛІКІЯ ДОЛЬЦЫ — ВЕСНІЦК

**ВОЛАХ Арцём Раманавіч**, н. у 1908, старшыня калгаса.

**ГУРКО Іван Фёдаравіч**, н. у 1918, ветурач, упаўнаважаны Віцебскага абкома КП(б)Б.

**ДАРАШКЕВІЧ Васіль Кірылавіч**, н. у 1912, заг. ветучастка.

**КАРАБАНЬ Аляксандр Антонавіч**, н. у 1916, дырэктар Весніцкай НСШ.

**КАТЛЁНАК Пётр Пятровіч**, н. у 1912, дырэктар Царкавішчанскай пачатковай школы.

**КУДРАЎЦАЎ Фёдар Пятровіч**, начальнік Стадолецкай пагранзаставы.

**МАРКЕВІЧ Сяргей Васільевіч**, н. у 1916, настаўнік, салдат 190-га палка 126-й сд, кіраўнік групы.

**ПЯРЭДНЯ Мікалай Іосіфавіч**, н. у 1906, механік Велікадолецкай МТС.

**СТАНКЕВІЧ Міхаіл Захаравіч**, н. у 1920, настаўнік Велікадолецкай школы, намеснік кіраўніка групы.

## ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЁСКІ ЖАРЫ

**ДУБРОЎСКІ Фёдар Фаміч**, н. у 1901, дырэктар Ушацкай МТС, кіраўнік групы.

**ЖАЛЕЙКА Кузьма Андрэевіч**, н. у 1916, сакратар Жарскага сельсавета.

**ЖАЛЕЙКА Ягор Сямёнавіч**, н. у 1916, рахункавод Жарскага сельсавета.

**ЗВОНАЎ Барыс Паўлавіч**, н. у 1920, служачы.

**КАРАБАНЬ Міхаіл Фёдаравіч**, н. у 1904, работнік паштовага аддзела Жары.

**КАРПЕНКА Міхаіл Ягоравіч**, н. у 1918, дырэктар Арэхаўскай НСШ, сувязны.

**КУЛАКОЎ Іван Аляксандравіч**, н. у 1916, настаўнік Жарскай школы, сувязны.

**ПАРШОНАК Ніна Сцяпанаўна**, н. у 1924, вучаніца, сувязная.

**САЛЬНІКАЎ Васіль Пракопавіч**, н. у 1925, вучань.

**САЛЬНІКАЎ Фёдар Іванавіч**, н. у 1900, калгаснік.

**САФОНАЎ Мікалай Данілавіч**, н. у 1913, кіраўнік групы.

**ХВОШЧ Андрэй Ісакавіч**, н. у 1900, старшыня калгаса, кіраўнік групы.

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА ВЁСАК УСВІЦА — АСТРАЎЛЯНЫ — ГЛЫБАЧКА**

**БЕРАСНЁВА Валянціна Анісімаўна**, н. у 1918, справавод РК КП(б)Б.

**БЕРАСНЁВА Юлія Данілаўна**, н. у 1919, настаўніца Глыбацкай школы, сувязная.

**ВАСІЛЕЎСКІ Іван Якаўлевіч**, н. у 1915, дырэктар НСШ.

**ВАСІЛЕЎСКІ Уладзімір Якаўлевіч**, н. у 1920, дырэктар НСШ, намеснік кіраўніка групы.

**КАРПОЎСКІ Павел Міхайлавіч**, н. у 1916, настаўнік Усвіцкай школы.

**ЛАПШАНКОЎ Генадзь Паліектавіч**, н. у 1908, рабочы.

**МЕЛЬНІКАЎ Уладзімір Васільевіч**, н. у 1909, ваеннаслужачы.

**МЯДЗВЕДСКІ Віктар Савельевіч**, н. у 1911, настаўнік.

**СТАНУЛЬ Тамара Усцінаўна**, н. у 1920, настаўніца, сувязная.

**ТАЛОЧКА Уладзімір Фёдаравіч**, н. у 1907, сакратар Глыбачанскага сельсавета, кіраўнік звяна.

**ЦЯБУТ Марыя Іванаўна**, н. у 1916, хатняя гаспадыня.

**ЦЯБУТ Міхаіл Андрэевіч**, н. у 1913, загадчык аддзела Пінскага АК ЛКСМБ, кіраўнік групы.

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА г.п. УШАЧЫ**

**БАРАДАЎКІН Сцяпан Якаўлевіч**, н. у 1905, сакратар Ушацкага РК КП(б)Б, кіраўнік групы.

**ВАЛЯЎКА Ганна Якаўлеўна**, н. у 1918, піянерважатая Ушацкай СШ.

**ГОЛІК Іосіф Платонавіч**, н. у 1908, дырэктар Зарачанскай сямігадовай школы.

**КАЗАЧОНАК Ксенія Васільеўна**, н. у 1916, машыністка Ушацкага райвыканкома.

**КАЗАЧОНАК Сідар Дзмітрыевіч**, н. у 1879.

**КАЧАН Уладзімір Лявонавіч**, н. у 1914, настаўнік.

**КОРШУН Ігнат Трыфанавіч**, н. у 1914, старшыня Весніцкага сельсавета.

**МАШЧОЎ Міхаіл Фёдаравіч**, н. у 1902, дырэктар Ушацкага малаказавода, сувязны.

**МАШЧОВА Ганна Сяргееўна**, н. у 1902, прыбіральшчыца бібліятэкі, сувязная.

**ПАРШОНАК Аляксандра Сцяпанаўна**, н. у 1921, настаўніца, сувязная.

**ПАРШОНАК Сцяпан Кузьміч**, н. у 1898, інструктар Ушацкага РК КП(б)Б, намеснік кіраўніка групы.

**САРОКІН Іван Аляксандравіч**, н. у 1905, старшыня Гарбаціцкага сельсавета.



П.М.Карпоўскі.



Г.П.Лапшанкоў.



Г.Я.Валяўка.



У.Л.Качан.



С.К.Паршонак.

**СПІРЫДЗЁНАК Андрэй Майсеевіч**, н. у 1914, настаўнік.

**ТАМАШЭВІЧ Захар Пятровіч**, н. у 1894, дырэктар Ушацкага лягаса.

**ХРЫПЕЛЬ Пётр Фёдаравіч**, н. у 1915, карэспандэнт газеты «Прымежны калгаснік».

**ШАРАГ Сцяпан Пятровіч**, н. у 1911, бухгалтар плодаагароднінага завода.

**ШЧЭРБІК Мікалай Сцяпанавіч**, н. у 1922, вучань.

*Падрыхтавала Г.Х.Талапілава па матэрыялах Ушацкага музея народнай славы імя У.Е.Лабанка.*

# Падпольныя органы, якія дзейнічалі на тэрыторыі раёна

**УШАЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б (6.7.1942—29.6.1944)**

У 1941 г. на падпольную работу быў пакінуты сакратар Ушацкага РК КП(б)Б С.Я.Барадаўкін. Але хутка ён быў вымушаны перайсці ў Чашніцкі раён. Райком партыі быў створаны Віцебскім абкомам КП(б)Б 6 ліпеня 1942 г. Сакратаром зацверджаны І.Ф.Каранеўскі (да вайны 1-ы сакратар Гарадоцкага райкома партыі, застаўся ў 1941 г. на падпольную работу ў Гарадоцкім раёне, але хутка быў вымушаны пайсці ва Ушацкі раён, дзе ён нарадзіўся. Прыняў удзел у арганізацыі партызанскага руху).

17 лютага 1944 г. райком КП(б)Б зацвердзіў 2-м сакратаром райкома партыі М.І.Ястрабава, 3-м — С.Б.Боркар.

Райком партыі базіраваўся ў партызанскіх брыгадах імя В.І.Чапаева (камбрыг У.В.Мельнікаў, камісар І.Ф.Каранеўскі) і імя П.К.Панамарэнкі (камбрыг М.В.Уткін, камісар М.А.Цябут).

СКЛАД ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б

Сакратары: Каранеўскі Іван Фёдаравіч (6.7.1942 — 4.5.1944, загінуў),Федарэнка Максім Харытонавіч (1.4.1943 — 2.1944, 2-і сакратар), Ястрабаў Мацвей Іванавіч (17.2.1944 — 29.6.1944, 2-і сакратар), Боркар Сцепаніда Барысаўна (17.2.1944 — 5.1944, 3-і сакратар; загінула), члены райкома: Боркар Сцепаніда Барысаўна (6.7.1942 — 17.2.1944), Мельнікаў Уладзімір Васільевіч (6.7.1942 — 29.6.1944), Цябут Міхаіл Андрэевіч (7.7.1942 — 15.8.1943), Васілеўскі Уладзімір Якаўлевіч (17.2.1944 — 29.6.1944).



У.Я.Васілеўскі.



А.М.Спірыдзёнак.

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Прымежны калгаснік», рэдактар Гайсёнак Міхаіл Іванавіч.

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941 — 1944): краткие сведения об организации, структуре и составе. Мн., 1975. С. 124 — 125.*

**УШАЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ (23.7.1942—29.6.1944)**

Командование бригады заверяет Вас, что наши партизаны еще сокрушительней будут наносить удар по зарвавшемуся фашизму. Весь состав бригады готов бороться до последней капли крови.

Ждем Вашей помощи. Комбриг Дубровский.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 40. Л. 2.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

## Тайны сход акружэнцаў

...Аднойчы вечарам у в. Малыя Туросы да ўрача А.Л.Вейнберг зайшлі два камандзіры Чырвонай арміі, што выходзілі з акружэння. У іх групе былі параненыя. Ім патрэбна была медыцынская дапамога.

Пад выглядам хворых у медпункце тайна збіраліся акружэнцы: Георгій Стральцоў, Мікалай Караблёў, Юрый Хімін, Аляксандр Самарадаў, Сцяпан Лунёгаў. Яны абмяркоўвалі падзеі на фронце, чыталі лістоўкі, якія даставала Настасся Львоўна. Галоўным пытаннем была арганізацыя барацьбы ў тыле ворага.

Сярод байцоў вызначаўся малады хлопец Мікалай Караблёў. Ён ненавідзеў бургамістраў і паліцаяў, не даваў ім спакою: знойдзе гранату і да іх.

Паліцаі паведамілі аб гэтым у нямецкую камендатуру. Неўзабаве выйшаў загад нямецкага камандавання аб абавязковай прапісцы ўсіх жыхароў. Непрапісаных і западозраных асоб прыцягваць да адказнасці. Прапісацца мог толькі той, за каго ручаўся гаспадар. Пайшлі прапісвацца і акружэнцы. Але іх напаткала бяда. Караблёва і Лунёгава затрымалі ў камендатуры, а потым расстралялі.

Аднойчы група акружэнцаў зайшла да бургамістра Ф.Папко, паліцаяў А.Шопа і А.Герцына, забралі зброю і вопратку. Потым запрэглі некалькі коней і пад'ехалі да складоў, дзе знаходзілася харчаванне для нямецкіх войскаў. Выламалі дзверы, забралі масла, яйкі і накіраваліся ў лес.

Аб гэтым даведаліся немцы. Хутка з Лепеля і Полацка наехала шмат аўтамашын з салдатамі. Яны акружылі жыхароў, якія ў гэты час перабіралі бульбу... У вёсцы пачаліся вобыскі, допыты. На гарышчы медпункта знайшлі кажух і падушкі. Настассю Львоўну арыштавалі. Даведаўшыся аб гэтым, Георгій Стральцоў з таварышамі арганізавалі пісьмы жыхароў у камендатуру з просьбай вызваліць урача, даказвалі яе невіноўнасць.

Калі Настассю Львоўну вызвалілі, Стральцоў ноччу пагрузіў яе маёмасць і лекі з медпункта на падводу і адвёз у партызанскі лагер. Да прыходу Чырвонай арміі яна працавала ў партызанскім шпіталі.

*Я.Лявонаў.*

## Былыя чырвонаармейцы сталі партызанамі

### З успамінаў К.Д.Склярэнкі, былога камісара партызанскага атрада імя А.В.Суворава брыгады імя В.І.Чапаева

У красавіку 1942 г. дзесяць чырвонаармейцаў уцяклі з полацкага лагера ваеннапалонных. Сярод іх былі Цімафей Плахатнюк, Васіль Савінаў, Васіль Болатаў, Мікалай Федзічаў, Іван Літвіжэнка, Аляксей Хальмін, Міхаіл Шчэр, Канстанцін Цабека, Дзівіцкі і я. Мы імкнуліся як мага хутчэй ўзяцца за зброю, але ў нас быў толькі адзін наган, набыты ў час уцёку. У лесе знайшлі дваццаць запалаў для гранат. Даведаліся, што на Ушаччыне дзейнічаюць партызаны і накіраваліся туды.

Вясна ў 1942 г. спазнялася. У лесе месцамі яшчэ ляжаў снег і лёд, надвор'е было пахмурнае. Ішлі днём і ноччу, збіваючыся з маршруту.

Арыенцірамі нам служыла Заходняя Дзвіна. Нарэшце нам пашанцавала. У в. Двор Усвея сустрэлі У.Я.Васілеўскага. Даведаўшыся, хто мы і куды ідзём, прапанаваў застацца ў гэтых мясцінах і арганізаваць партызанскі атрад. Дамовіліся аб новай сустрэчы. Калі мы прыбылі на месца сустрэчы, убачылі групу юнакоў і дзяўчат на чале з Уладзімірам Васілеўскім. Нам расказалі аб становішчы на фронце і прапанавалі стаць байцамі партызанскага атрада. Мы так і зрабілі.

## Баі за Ушачы

Трохпавярховы будынак школы ва Ушачах займала нямецкая камендатура, а насупраць знаходзілася турма. Тут пакутавала шмат вязняў, многіх чакала немінучая смерць. Камандаванне партызанскай брыгады «Дубава» вырашыла іх вызваліць.

10 верасня 1942 г. 1-ы і 3-і атрады брыгады «Дубава» пад кіраўніцтвам начальніка штаба С.Я.Барадаўкіна, які добра ведаў Ушачы, пайшлі на баявое заданне. Падышлі да ўскраіны райцэнтра, раздзяліліся на 2 групы. Адна з іх на чале

з камандзірам узвода Дзмітрыем Фраловым накіравалася на ўсходнюю ўскраіну Ушач, другая — у цэнтр, да маслазавода.

Група Фралова асцярожна падпаўзла да склада з сенам, бясшумна зняла вартавых і рушыла да турмы. За некалькі хвілін знялі варту, адчынілі вароты турмы, выпусцілі з камеры вязняў.

Адначасова паспяхова дзейнічала і група партызан пад кіраўніцтвам Сяргея Маркевіча і Аляксея Ярмоша. Быў падпалены склад з сенам. З боку склада па школе ўдарыў партызанскі кулямёт. Гэта была адна з самых бліскучых аперацый партызанскай брыгады «Дубава». Вестка аб нападзе на фашысцкі гарнізон у раённым цэнтры хутка данеслася да Полацка і Лепеля, але лёс яго быў вырашаны. Умацаваць гарнізон ва Ушачах праціўнік не меў магчымасці. Таму нямецка-фашысцкае камандаванне вымушана было прыняць рашэнне аб вывадзе свайго гарнізона з раённага цэнтра. Партызаны ўзмацнілі націск на Ушачы. Сіламі брыгад «Дубава» і імя В.І.Чапаева яны зрабілі яшчэ некалькі налётаў на ўшацкі гарнізон.



Дз.А.Фралоў.

Толькі ў выніку адной з такіх аперацый 25 гітлераўцаў былі забіты і столькі ж паранена. Рэшткі разгромленага варожага гарнізона ўцяклі ў Лепель.

23 кастрычніка 1942 г. у вызваленым ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў раённым цэнтры Ушачы адбыўся мітынг. Як і ў даваенны час, на вуліцах і цэнтральнай плошчы луналі чырвоныя сцягі. 75 ушачан запісаліся ў партызаны.

*М.А.Тараткевіч.*

## З бою ў бой

### З успамінаў Я.А.Крупскага, былога партызана брыгады імя В.І.Чапаева

...Разведка данесла, што кожную пятніцу нямецкая грузавая аўтамашына прыходзіла з Полацка ў в. Гомель па рыбу. Мы зрабілі засаду ў лесе на дарозе Полацк – Гомель. Калі аўтамашына наблізілася да нас, адкрылі агонь. Немцаў перабілі, затым селі на машыну і пад чырвоным сцягам праехалі па некалькіх населеных пунктах, заклікаючы людзей да барацьбы з ворагам.

У хуткім часе мы аб'ядналіся з баявой групай Конева і падпольнай групай У.Я.Васілеўскага. Утварыўся партызанскі атрад пад назвай «Смерць фашызму». Яго камандзірам стаў старшы лейтэнант Ц.Дз.Плахатнюк.

Партызанам не хапала зброі. Камандаванне брыгады вырашыла дастаць яе з пакінутых умацаваных раёнаў Ветрына—



Партызаны брыгады «Дубава» ў засадзе пад Ушачамі.

Фарынава. Выдзелілі спецыяльную групу, якую ўзначаліў Леанід Грак. У в. Янова мы ўзялі 2 пары коней. Да раніцы дабраліся да в. Заскаркі. Затым звярнулі на Вішнева. Па дарозе сустрэлі чалавека. Ён сказаў нам, што едзе да ўрача. Як высветлілася потым, гэта быў бургамістр. Ён і выдаў нас немцам. У в. Вішнева мы забралі ў Аляксея Бухарына многа кулямётаў, вінтовак, гранат, узрыўчаткі. Партызаны вырашылі дачакацца ночы, каб рушыць назад. Аднак мы пралічыліся. Не паспелі пагрузіцца, як убачылі немцаў з сабакамі. Яны ішлі прама на нас. Мы пачалі адыходзіць. Немцы адкрылі агонь, спусцілі сабак. Першая з іх напала на Леаніда Грака. Леанід прыстрэліў яе з пісталета, у другую кінуў процітанкавую гранату. З вялікімі цяжкасцямі нам удалося адарвацца ад немцаў…

Адной з памятных аперацый з'яўляецца знішчэнне чыгуначнага моста на рацэ Сож. Подступы да яго былі дасканала разведаны. На выкананне гэтай задачы пайшлі атрады А.Я.Конева і М.І.Ражнова. Першай у бой уступіла штурмавая група, якую ўзначальваў Іван Бутузаў. Увесь агонь сканцэнтравалі на агнявых кропках ворага. Па сігнале партызаны падняліся ў атаку і захапілі мост. Зладжана працавалі падрыўнікі — мост быў узарваны. У гэтым баі загінулі камісар 3-га атрада С.С.Галасоўскі, камандзір узвода І.Бутузаў і некалькі партызан.

## Сям'я мужных

У сям'і Пістуновічаў было сямёра сыноў. Старэйшыя, Міхаіл і Канстанцін, працавалі, Ілья служыў у Чырвонай арміі, Мацвей быў курсантам лётнага вучылішча, Павел і Дзмітрый вучыліся ў школе, падрастаў маленькі Вася.

Калі пачалася вайна, Міхаіл, Канстанцін, Ілья і Мацвей пайшлі змагацца за Радзіму. Неўзабаве Павел, а за ім і пятнаццацігадовы Дзмітрый сталі партызанамі. Іх абодвух залічылі ў атрад імя І.В.Сталіна партызанскай брыгады імя У.І.Леніна.

Хлопцы разведвалі варожыя гарнізоны, іх умацаванні, удзельнічалі ў дыверсіях, засадах. Паспяхова атакавалі калону варожых аўтамашын на дарозе Ула — Лоўша.

Пасля вызвалення Беларусі Павел пайшоў на фронт. Загінуў у Прыбалтыцы ў 1944 г. Загінулі Міхаіл, Канстанцін і Ілья. Лётчык Мацвей закончыў вайну ў Берліне. Дзмітрыю пашчасціла застацца жывым. Ён перажыў змрочныя дні варожай блакады на Ушаччыне, прымаў удзел у прарыве яе каля в. Паперына.

*П.А.Доўгі.*

## Разведчык Андрэй Хвошч

Немцы даведаліся аб месцы размяшчэння партызанскага атрада Ф.Ф.Дуброўскага. Трэба было мяняць дыслакацыю. Ф.Ф.Дуброўскі ведаў, што да вайны Андрэй Хвошч быў добрым паляўнічым, ведаў кожны кусцік, кожную сцяжынку. Каб папярэдзіць людзей, што трымалі сувязь з атрадам, накіравалі яго. Але знайшоўся здраднік. Па дарозе Андрэя арыштавалі і накіравалі ва ўшацкую камендатуру.



Партызаны брыгады імя В.І.Чапаева вядуць агонь па ворагу.

Немцы здагадваліся аб сувязі Андрэя з партызанамі, таму вырашылі катаваннямі дабіцца ад яго прызнання. Накалілі да чырвані «буржуйку». Афіцэр загадаў прывесці арыштаванага. Андрэй быў так змучаны і збіты, што не мог трымацца на нагах. Афіцэр дапытваўся аб месцы размяшчэння партызанскага атрада. Андрэй маўчаў. Па знаку афіцэра канваіры кінулі Андрэя на распаленую пліту. Задымілася вопратка. Вырвацца не было сілы, яго моцна трымалі. У прытомнасць прыйшоў, калі аблілі вадой. У пакоі пахла паленым мясам. Пласкагубцамі зрывалі пазногці з пальцаў, ламалі рукі ў дзвярных праёмах, а потым расстралялі.

*У.І.Хвошч.*


А.І.Хвошч.


С.П.Шараг.

## Сцяпан Шараг з вёскі Гарані

Партызаны рыхтаваліся да разгрому варожага гарнізона, які размяшчаўся ў в. Сукнеўшчына. Гарнізон быў вялікі, добра ўмацаваны. Таму на яго разведку паслалі Сцяпана Шарагу. Падысці да вёскі было цяжка: раз-пораз у неба ўзляталі ракеты, асвятляючы наваколле, адразу ж чуліся чэргі кулямётаў. Але разведчыкі змаглі прасачыць за перамяшэннем немцаў, вызначыць нямецкія пасты, дзоты. Усё гэта дапамагло партызанам разграміць гарнізон. Дзоты партызаны закідалі процітанкавымі гранатамі, падпалілі аўтамашыны, знішчылі гарнізон. За ўдала праведзеную разведку С.Шараг быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, да якога пазней далучыліся баявыя медалі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.».

*Р.Я.Грынкевіч.*

## Партызанская артылерыя

У адным з разбураных дзотаў Полацкага ўмацаванага раёна партызаны знайшлі «саракапятку» і схавалі яе ў лесе. Гармата аказалася без замка. Нашы майстры з узвода боезабеспячэння Міна і Арсен Цар пад кіраўніцтвам былога артылерыста капітана А.В.Ярмоша адрамантавалі яе. А.В.Ярмош прапанаваў выкарыстаць гармату супраць варожых эшалонаў: біць прамой наводкай па цягніку. Гэта ідэя спачатку здалася фантастычнай.

Настаў дзень, а дакладней ноч, баявога выпрабавання першай партызанскай гарматы. Гэта было 16 лістапада 1942 г. 1-ы і 3-і атрады зрабілі засаду паміж станцыямі Зябкі і Крулеўшчызна. Партызаны размясціліся ўздоўж чыгункі, а гармату паставілі на ўзвышшы, метрах у двухстах ад яе. Паказаўся эшалон. Капітан Ярмош сам навёў гармату на састаў і з першага стрэлу прабіў кацёл паравоза. Эшалон спыніўся. Партызаны адкрылі па ім шквальны агонь.

У тую ноч на іншых участках падрыўнікі брыгады пусцілі пад адхон 3 варожыя воінскія эшалоны і ўзарвалі 2 чыгуначныя масты.

Ф.Ф.Дуброўскі і У.Е.Лабанок былі задаволены вынікамі гэтай аперацыі і тым, што партызаны і камандзіры знаходзяцца ў пастаянным пошуку.

*М.В.Тараткевіч.*

* * *

Гармату малога калібру партызаны знайшлі ў балоце. Адрамантавалі і выпрабавалі на чыгунцы. Праз сувязных даведаліся, што з Полацка ў бок фронту будзе ісці варожы эшалон. Яго і чакалі з гарматай у вызначаным месцы. Эшалон цягнулі два паравозы, якія і былі разбіты партызанамі. У гэтым баі загінула каля 3 тысяч гітлераўцаў і было знішчана 10 танкаў.

*А.П.Вітко.*

## Заслужаная кара

Памочнікам каменданта фашысцкага гарнізона ў мястэчку Кублічы быў маёр Цімс. Ён любіў наведваць вясковыя вечарынкі, гулянкі і наогул быў не супраць пазабаўляцца.

Па заданні партызан Жэня Лябік арганізавала ў сябе вечар пад выглядам сваіх імянін. Быў запрошаны і маёр Цімс. Дом Жэні стаяў на водшыбе. Партызаны паслалі разведчыка. Той паведаміў, што маёр з ахраннікамі прыехаў.

Пачакаўшы, партызаны асцярожна падышлі да хаты. Да іх слыху данесліся гукі патэфона. Лабанок, які кіраваў гэтай аперацыяй, вырашыў, што пара дзейнічаць. Падаў знак С.В.Маркевічу, той астатнім. Як і было дамоўлена, некалькі чалавек засталіся каля акон, астатнія са зброяй увайшлі ў сенцы і ўварваліся ў памяшканне.

— Рукі ў гору!

Першым падняў рукі маёр. Разгубленыя салдаты зразумелі, што супраціўленне дарэмна, і паследавалі за ім. Усіх іх не мінула заслужаная кара.

*М.В.Тараткевіч.*

## Мае аднавяскоўцы

### З успамінаў У.А.Первянёнка, былога партызана брыгады імя В.І.Чапаева

Да вайны ў в. Рог, што ў Вяркудскім сельсавеце, налічвалася больш за 20 двароў. У кожнай сям'і было па 7 – 9 чалавек. Калі гітлераўскія войскі напалі на нашу краіну, каля 20 жыхароў вёскі змагаліся ў радах Чырвонай арміі. Сярод іх былі капітан Аркадзь Шалыга, былы намеснік старшыні калгаса Сямён Шалыга, Васіль Первянёнак. Пільна нёс ахову грамадскага парадку ў блакадным Ленінградзе Уладзімір Шалыга і інш.



У.А.Первянёнак (злева) з В.М.Болатавым, былым камандзірам разведкі атрада імя Кутузава брыгады імя В.І.Чапаева.

У першую ваенную зіму нам удалося звязацца з Глыбачанскім падполлем праз Леаніда Грака. У пачатку лета 1942 г. амаль усе рогаўцы ўліліся ў партызанскую брыгаду імя В.І.Чапаева. Сярод іх былі Арсен і Уладзімір Первянёнкі, Міхаіл Шалыга, Андрэй Шалыга, Іван Первянёнак, Леанід Первянёнак, Мікалай Шалыга, Васіль Первянёнак, Васіль Шалыга, Яфім Лунёнак. Яны ўдзельнічалі ў разгроме гарнізонаў у вёсках Варонічы, Шалягоўка, пры падрыве моста цераз раку Ула каля в. Фролкавічы, у рэйкавай вайне, у штурме Лепеля.

Не ўсім рогаўцам давялося дажыць да дня вызвалення. У баях з фашыстамі загінулі Мікалай Шалыга, Сямён Шалыга, Іван Первянёнак, Леанід Первянёнак.



Партызанская брыгада імя В.І.Чапаева перад выхадам на баявую аперацыю.

## Ратаваў туман

Выдатным разведчыкам у партызанскай брыгадзе імя В.І.Чапаева быў васемнаццацігадовы Аляксандр Шнітко.

Ішоў аднойчы А.Шнітко ў разведку. Густы туман спрыяў яму. Раптам пачуў нямецкую гаворку. Зразумеў, што рыхтуецца новая аперацыя супраць партызан. Трэба папярэдзіць сваіх. Але ў некалькіх кроках ад сябе ён убачыў трох фашыстаў, якія ішлі наперадзе групы. У адно імгненне скаціўся ён у кювет. Адразу ж пачулася аўтаматная чарга. Пад покрывам туману разведчыку ўдалося адпаўзці і папярэдзіць партызан.

Падобныя сітуацыі не раз здараліся ў яго партызанскім жыцці, адна з іх закончылася трагічна. У разведку пайшлі ўтраіх. Аляксандр ішоў па краі сцяжынкі. Раптам раздаўся выбух, і ён страціў прытомнасць. Аляксандр наступіў на міну. Апрытомнеў у шпіталі ўжо без нагі.

*Я.Парчынскі.*

## Першае заданне

### З успамінаў П.Р.Баграца, былога партызана атрада імя А.В.Суворава брыгады імя В.І.Чапаева

У чэрвені 1942 г. я з групай моладзі ўступіў у партызанскі атрад, якім камандаваў М.М.Пучкоў. У атрадзе ўжо было 170 чалавек. Нам, навічкам, даручылі адказную задачу — агітаваць людзей ісці ў партызаны. І людзі папаўнялі рады народных мсціўцаў. Ніколі не забуду свой першы бой. Група партызан атрымала заданне разграміць нямецкі абоз на дарозе Ушачы — Полацк. Мы паспяхова правялі аперацыю, узялі багатыя трафеі.

У той час гэта было вельмі важна, партызаны адчувалі вялікую патрэбу ў зброі і боепрыпасах. З таго часу мне давялося ўдзельнічаць у падрыве семнаццаці варожых аўтамашын з тэхнікай і жывой сілай.

## Вораг нёс значныя страты

### З успамінаў М.М.Пучкова, былога камандзіра партызанскага атрада імя А.В.Суворава брыгады імя В.І.Чапаева

Першую аперацыю наш атрад правёў у раёне «Лясных азёр». Былі знішчаны 2 грузавыя аўтамашыны, 10 т бензіну, забіта некалькі фашыстаў. У той самы час другая група знішчыла рамонтную майстэрню.

Атрад хутка рос. У яго ўступалі мясцовыя жыхары, салдаты і афіцэры Чырвонай арміі, якія ўцякалі з лагераў ваеннапалонных. Мацнелі нашы ўдары па ворагу.

Восенню 1942 г. атрад каля хутара Зялёнкі разбіў групоўку немцаў. Вораг панёс у гэтым баі значныя страты. Дзейнічаў наш атрад і на камунікацыях ворага. Групы, узводы і роты знішчалі на чыгунках і шашэйных дарогах тэхніку і жывую сілу ворага. Вясной 1943 г. наш атрад удзельнічаў у разгроме варожага гарнізона ў в. Шалягоўка ў Полацкім раёне.

## Усе засталіся жывымі

У атрадзе М.М.Пучкова Маркіян Гуськоў быў камандзірам аддзялення кулямётчыкаў. На ўсё жыццё ўрэзаўся ў яго памяць выпадак, калі ён ледзь не загінуў. Пайшоў у разведку ў Бешанковіцкі раён, каб прасачыць рух тэхнікі па шашы. Наткнуўся на варожую засаду. Выратаваўся цудам. Усё адзенне пасеклі кулі, а ён астаўся жывым... Удзельнічаў ён і ў баі каля в. Астраўляны. Пераправіўшыся цераз раку, фашысты атакавалі пазіцыі партызан. Сутычка была кароткай, але гарачай. Кулямёт Маркіяна Гуськова «працаваў» без перадыху. Ворага змаглі адбіць. У гэтым баі быў цяжка паранены і хутка памёр яго 16-гадовы пляменнік. Разам з Маркіянам ваявалі яго браты Васіль, Мінай, Якаў, Аляксандр. На шчасце, усе засталіся жывымі.

*У.К.Жыткоў.*

## Атрымаў ордэн праз 25 гадоў

...Партызанскія падрыўнікі рабілі дыверсіі на чыгунцы Обаль — Лоўша. Група, дзе быў І.М.Сапега, чакала варожы эшалон. Заклалі міну, трымалі ў руках канцы шнуроў. Нямецкі патруль заўважыў шнур і перарэзаў яго. Пачуўся грукат эшалона. Што рабіць? Імгненна Іван Сапега ўскочыў на насып, прывязаў шнур да канца чакі і скаціўся ўніз. Ірвануў шнур. Моцны ўдар скалыхнуў наваколле.

Дзейнічалі партызаны і на шасэйных дарогах. У баі па разгроме варожай аўтакалоны ў пачатку 1943 г. І.М.Сапега быў паранены, разрыўная куля трапіла ў пазваночнік. Да канца вайны лячыўся партызан. Ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, які атрымаў праз дваццаць пяць гадоў.

*Я.М.Лявонаў.*

## Фейерверк на шашы

### З успамінаў М.К.Касьміна, былога партызана атрада імя Б.Хмяльніцкага брыгады імя В.І.Чапаева

Нашаму атраду было загадана выйсці ў раён Ушач для арганізацыі засады на шашы Лепель — Ушачы. У гэты час ва Ушачах размяшчаўся буйны нямецкі гарнізон. Былі гарнізоны і ў вёсках Завячэлле, Жары, Дольцы, Кублічы. На баявое заданне пайшлі 63 чалавекі. Залеглі ў лагчыне непадалёку ад в. Баркоўшчына. Замаскіраваліся. Дарожнае перакрыжаванне як на далоні.

Чакаць прыйшлося доўга. Нарэшце пачуўся гул аўтамашын, якія рухаліся з боку Лепеля на Ушачы. З'явіліся 2 аўтамашыны, на кожнай па 3—4 фашысцкія салдаты. Як толькі машыны параўняліся з засадай, партызаны адкрылі агонь.

Але раптам адбылося нечаканае: наш кулямёт даў адну чаргу і замоўк. Непрадбачаная замінка. Тады з засады выскачыў начальнік штаба І.С.Біржаў і кінуў пад колы першай аўтамашыны гранату. Мы перанеслі агонь на другую. Машыны пачалі ўзрывацца. Пазней высветлілася, што немцы везлі бочкі з бензінам...

## Сігнал да бою — чырвоная ракета

### З успамінаў М.М.Асіпёнкі, былога намесніка камісара па камсамоле 5-га атрада партызанскай брыгады «Дубава»

Гэта было ў маі 1943 г. Ноччу партызаны атрадаў Б.П.Звонава, М.М.Дзідзенкі, В.С.Клопава і І.Г.Чарнова, дзе я быў намеснікам камісара па камсамоле і часова замяшчаў камісара атрада, выйшлі на баявую аперацыю. На досвітку падышлі да дарогі Ушачы — Лепель. Размясціліся ў маладым невысокім лесе, акапаліся, добра замаскіраваліся.

У хуткім часе на дарозе з'явіліся аўтамашыны. Калі яны параўняліся з засадай, узвілася над лесам чырвоная ракета — сігнал да бою. Агонь абрушыўся на ворага з усіх бакоў. Бой зацягнуўся. З Лепеля немцам падышла падмога. Партызаны арганізавана адышлі, захапіўшы немалыя трафеі. Каля 70 варожых салдат былі забіты, нямала было і параненых.

## «Вароты» цераз Заходнюю Дзвіну

285 чалавек, якія пражывалі на тэрыторыі цяперашняга калгаса «Дружба», актыўна змагаліся на франтах і ў партызанскіх атрадах супраць гітлераўскіх захопнікаў.

А.М.Бурак і яго сын Мікалай кінуліся са звязкай гранат пад танкі ў час баёў з карнікамі пад в. Пышна. Яны абодва пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Працяглы час брыгада імя В.І.Чапаева ўтрымлівала «вароты» цераз Заходнюю Дзвіну ў раёне вёсак Астраўляны і Шашы. Атрад П.В.Кундалевіча абараняў іх. Нем-

цы пачалі блакіраваць партызан. Кулямётчык Я.Я.Рацько стрымліваў націск азвярэлых гітлераўцаў. Паранены ў нагу, ён адстрэльваўся да апошняга патрона. Фашысты захапілі яго ў палон і пасля жорсткіх катаванняў спалілі.

У барацьбе супраць фашыстаў удзельнічалі 13—14-гадовыя падлеткі У.І.Балабоўка, В.П.Рацько, С.П.Крацёнак, В.Р.Клопаў, У.М.Карабань.

*Г.І.Нікіціна.*



К.Р.Гладышаў.

## Засада на дарозе

### З успамінаў К.Р.Гладышава, былога камандзіра ўзвода атрада № 1 партызанскай брыгады «Дубава»

...У маі 1942 г. я звязаўся з Міхаілам Карабанем з групы Ф.Ф.Дуброўскага, якая размяшчалася ва ўрочышчы Істопішча. Ён даручыў мне спачатку збіраць зброю і боеприпасы. За кароткі час я перадаў ім 3 вінтоўкі, ручны кулямёт з трыма дыскамі... У жніўні 1942 г. мяне залічылі ў 1-ы атрад брыгады «Дубава».

Першая баявая аперацыя, у якой я прымаў удзел — засада на дарозе Лепель — Камень, дзе мы знішчылі 3 аўтамашыны з немцамі. У канцы 1942 г. на перагоне Празарокі — Зябкі мы пусцілі пад адхон варожы эшалон з жывой сілай і тэхнікай. Праз 2—3 тыдні на тым жа перагоне зноў зрабілі засаду, паставілі міну. Была ў нас і 45-мм гармата на санях. Самі размясціліся ўздоўж дарогі. Калі эшалон параўняўся з намі, ударыла гармата, паравоз узарваўся на міне, а мы адкрылі ружэйна-аўтаматны агонь па вагонах. У адказ стральбы не было і мы кінуліся да эшалона. Мы з кулямётчыкам Пятром Шарахам уварваліся ў адзін з вагонаў, абяззброілі двух нямецкіх салдат, захапілі кулямёт і 2 вінтоўкі. Эшалон аказаўся з харчаваннем, абмундзіраваннем і боеприпасамі.

## Ваявалі разам

У пачатку 1943 г. лётчыкі авіядэсантнай дывізіі генерала Шчарбакова даставілі на партызанскі аэрадром пад Бягомлем аператыўную групу ЦК КП(б) Літвы. Паводле загаду опергрупы ўсе літоўскія партызанскія групы, што дзейнічалі на тэрыторыі рэспублікі, павінны былі прыбыць у вёскі Лясіны і Зарубаўшчына Ушацкага раёна.

Не паспелі літоўскія партызаны як след абжыцца, як пачалася карная экспедыцыя фашыстаў супраць партызан Міншчыны і Віцебшчыны пад назвай «Котбус». Тут, на Ушаччыне, і атрымалі баявое хрышчэнне літоўскія партызаны.

У канцы красавіка камандзір разведгрупы літоўцаў А.Йаселявічус паведаміў, што ў в. Касары ўступілі немцы. Выpашылі на ўскрайку лесу каля в. Лясіны заняць абарону. Меркавалі, што фашысты будуць наступаць ці на літоўскую партызанскую базу, ці накіруюцца ў бок Беразіно, куды вёў бальшак.

На наступны дзень калона немцаў накіравалася ў бок Беразіно. Літоўскія партызаны вырашылі сустрэць фашыстаў агнём. Бой цягнуўся нядоўга. Праціўнік панёс вялікія страты.

9 мая 1943 г. каля в. Зарубаўшчына сабраліся літоўцы, што прыбылі з-за лініі фронту, і атрады П.Пранявічуса і А.Зайцава, што ваявалі ў тыле ворага з восені



М.Ю.Шумаўскас.

1942 г. і аб'ядналіся ў партызанскі атрад «Жальгірыс».

У сярэдзіне мая атрад «Жальгірыс» накіраваўся ў казянскія лясы. Ад в. Лясіны да месца прызначэння трэба было пераадолець больш за 200 км. Брыгада «Дубава» выдзеліла для сваіх літоўскіх сяброў надзейных праваднікоў. Аб адносінах мясцовага насельніцтва да літоўскіх партызан кіраўнік аператыўнай групы ў ЦК КП(б) Літвы М.Ю.Шумаўскас пісаў: «...Не магу не ўспомніць, як мы сёння снедалі... Нашы людзі былі размеркаваны па хатах. Гаспадыні з раніцы частавалі іх. Вядомая справа, не ўсіх аднолькава: адных лепш, іншых больш сціпла — хто як мог. Людзі тут добрыя. Нашых прымаюць добра, аказваюць ім павагу, кормяць і турбуюцца пра іх». Гэтыя словы адносіліся ў першую чаргу да жыхароў беларускіх вёсак Зарубаўшчына і Лясіны.

*М.М.Кірпіч.*

## Партызанскі плацдарм

Актыўныя дзеянні партызан Ушаччыны і суседніх раёнаў прывялі да ачышчэння значнай тэрыторыі, на якой была ўтворана партызанская зона.

Яна прасціралася ад Полацка на поўначы да Лепеля на поўдні, ад граніц Вілейскай вобласці на захадзе да ракі Заходняя Дзвіна на ўсходзе. Плошча зоны складала 3,2 тыс. км$^2$, дзе ў 1220 населеных пунктах пражывала каля 80 тыс. чалавек, у тым ліку бежанцы з іншых раёнаў.

У склад партызанскай зоны ўваходзіла поўнасцю тэрыторыя Ушацкага раёна і часткова тэрыторыі суседніх з ім Бешанковіцкага, Лепельскага, Докшыцкага, Глыбоцкага, Пліскага, Ветрынскага, Полацкага, Сіроцінскага раёнаў.

У зоне была адноўлена савецкая ўлада, у розны час тут базіраваліся Ушацкі, Лепельскі, Ветрынскі, Докшыцкі, Пліскі, Бешанковіцкі, Сіроцінскі падпольныя райкомы партыі і камсамола.

Працавалі 6 млыноў з памолам на іх 25 т зерня ў суткі. Два шкіпінарна-дзягцярныя заводы выраблялі збраевыя змазачныя матэрыялы і запальныя сумесі для барацьбы з варожай тэхнікай. 80 кузняў і слясарных майстэрань рамантавалі сельскагаспадарчы інвентар, рамантавалі і рабілі зброю. 60 гарбарных прадпрыемстваў выраблялі скуры для абутку, збруі, амуніцыю. Сталярна-бандарныя майстэрні забяспечвалі лыжамі, прыкладамі для вінтовак і аўтаматаў, рамантавалі сані, фурманкі, драбіны. Тры электрастанцыі выраблялі 65 кВт электраэнергіі ў суткі. На 20 маслазаводах перараблялі не толькі малако, але і льнасемя. Былі арганізаваны 6 рыбалоўных арцелей. Да паслуг насельніцтва была адкрыта бальніца.

Важнай справай для партызан і насельніцтва былі сельскагаспадарчыя работы. Пасяўная і ўборка ўраджаю праводзіліся сумеснымі сіламі. У тыле ворага разгортвалася літаральна барацьба за хлеб. Партызаны вялі паўсюдна барацьбу з акупантамі, каб выратаваць збожжа. У выніку ўраджай 1943 г. быў убраны, абмалочаны, размеркаваны і схаваны ад гітлераўцаў. 85—90% ураджаю, які сабралі, было выкарыстана насельніцтвам і партызанамі. Такое становішча характэрна і для Ветрынскага, Лепельскага, Ушацкага раёнаў.

Насельніцтва бачыла ў партызанах сваіх абаронцаў і дапамагала ім чым толькі магло.

Паводле даных на ліпень 1943 г., насельніцтва Ушацкага раёна перадало партызанам 500 паўшубкаў, 700 пар валёнак, 150 пар абутку, 250 м палатна, 200 масхалатаў. У вёсках для партызан вязаліся шкарпэткі, шылася бялізна. Людзі дастаўлялі ім на падводах боепрыпасы і зброю, нарыхтоўвалі прадукты, выраблялі аўчыны, вугаль для партызанскіх майстэрань, арцелі рыбакоў лавілі для іх рыбу.

Падпольшчыкі забяспечвалі неабходнымі медыкаментамі, інструментарыем, перавязачнымі сродкамі размешчаныя ў зоне партызанскія шпіталі. Сяляне прыносілі ў шпіталі льняны паркаль, рушнікі, прасціны. Жанчыны мылі бялізну, бінты, выходжвалі параненых і хворых партызан як сваіх родных. Аднойчы ў шпіталь партызанскай брыгады імя К.Я.Варашылава быў дастаўлены пакет, у якім ляжала запіска: «Дарагія браты і сёстры, прыміце падарунак ад камсамольска-маладзёжнай арганізацыі в. Плігаўкі. Хай гэты бінт, гэта вата спыняць кроў, якая цячэ з вашых ран, сагрэюць вашы раны, атрыманыя ад фа-

шысцкай кулі. Жадаем вам хутчэй паправіцца, каб зноў ісці ў бой і дабіваць фашысцкія банды. З камсамольскім прыветам Валя Захарэнка».

Паслугамі партызанскіх медыкаў карысталася і мясцовае насельніцтва. Цяжкай была зіма 1943/44 гг.: у партызанскай зоне ўспыхнула эпідэмія тыфу. Яна ахапіла да 30% насельніцтва. Былі хворыя амаль у кожнай брыгадзе.

Тэрмінова ствараліся групы медыкаў па барацьбе з эпідэміяй. За 3 дні савецкія лётчыкі скінулі ў партызанскую зону 12 пакетаў з медыкаментамі, процітыфознай вакцынай. Былі зроблены прывіўкі ва ўсіх партызанскіх брыгадах, у многіх вёсках. У населеных пунктаў у зоне эпідэміі быў уведзены строгі каранцін. Агульнымі намаганнямі эпідэмію ўдалося прыпыніць, а потым і ліквідаваць. [Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 597.]

На тэрыторыі зоны выдавалася 6 раённых газет: «Сталінец» (Бешанковіцкі раён), «Чырвоная Звязда» (Ветрынскі раён), «Партызанская праўда» (Докшыцкі раён), «Калгасная праўда» (Лепельскі раён), «За свабоду» (Пліскі раён), «Прымежны калгаснік» (Ушацкі раён) і 2 шматтыражкі: «Кліч партызана» брыгады «Аляксея» і «Народны мсцівец» Смаленскага партызанскага палка І.Ф.Садчыкава. Было выпушчана некалькі нумароў шматтыражак «Ушацкі партызан» у брыгадзе імя В.І.Чапаева і «За Савецкую Радзіму» ў 1-й Антыфашысцкай брыгадзе.

Партызанскія газеты, лістоўкі, адозвы дапамагалі людзям у глыбокім варожым тыле разабрацца ў складаных сітуацыях, з іх ведалі аб падзеях на франтах вайны, аб жыцці краіны. Партызанскія агітатары, гурткі мастацкай самадзейнасці даходзілі літаральна да кожнай вёскі і былі заўсёды жаданымі гасцямі.

У мастацкай самадзейнасці ўдзельнічалі і мясцовыя жыхары. У 1943 г. жыхары в. Плігаўка рыхтаваліся да свята 1 Мая. У пуні пабудавалі сцэну. У дзень свята на ўрачыстым сходзе калгаснікаў партызанскі агітатар зрабіў даклад. Расказаў аб барацьбе з германскімі войскамі на фронце і ў яго тыле, выказаў упэўненасць у перамозе над ворагам. Моладзь вёскі дала канцэрт. Такія ж мерапрыемствы адбыліся і ў вёсках Арэхаўна і Заазёр'е (НАРБ. Ф. 3793. Воп. 1. Спр. 7. Л. 106).

Рады партызан у зоне папаўняліся за кошт партызанскіх брыгад суседніх раёнаў. Яны сцягваліся сюды бараніць зону, якая стала важным аператыўным плацдармам для Чырвонай арміі ў час вызвалення рэспублікі.

Важную ролю ў кіраўніцтве буйнымі партызанскімі сіламі адыгрывала сувязь. Яна была рознабаковай і добра наладжа-



Алена Шараева і сёстры Ладзік вышываюць сцяг партызанскай брыгады «Дубава».



М.Дз.Стрэпетаў.

най — конная, тэлефонная, па радыё. Тэлефонная сувязь існавала амаль з усімі партызанскімі брыгадамі. Яе забяспечвала ЦТС ва Ушачах і звязвала вёскі Будзькоўшчына, Лабаноўшчына, Піскуны, Осіпаўка, Прудок, Капылоўшчына, Ліповая, Тураспаль, Заслаўка, Наваселле, Гомель, Рыбакі — усяго 31 населены пункт. Праз радыёстанцыі РБМ, В-100А, «Север» апаратыўная група мела сувязь з ЦШПР, БШПР, ЦК КП(б)Б, штабам 1-га Прыбалтыйскага фронту. Днём і ноччу забяспечвалі надзейную сувязь радысты Алееў, Андрэеў, Бальшакоў, Емяльянаў, Лазукін, Лукін, Прататопаў і інш. (НАРБ. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 597. Л. 4, 26—27).

Існаваў і паветраны мост, для якога партызаны пабудавалі аэрадромы, пасадачныя пляцоўкі. Партызанскія аэрадромы дзейнічалі каля вёсак Сержаны, Двор Пліна, Ушацкага льнозавода. Пасадачныя палосы — каля вёсак Загор'е, Ляхавічы, Віркі, Пастрэжжа і інш.

Акрамя папаўнення партызанскіх радоў з акупіраванай тэрыторыі ішло папаўненне і Чырвонай арміі ваеннаабавязанымі. Так, у Гарбаціцкім сельсавеце Ушацкага раёна партызаны выкарысталі картатэку раённага ваенкамата, якую схаваў старшыня гэтага сельсавета І.А.Сарокін. Партызаны ва Ушацкім раёне стварылі 2 мабілізацыйныя пункты ў вёсках Рыбакі і Істопішча, куды ішлі мужчыны, каб змагацца з ворагам, многія з іх нават з ваеннымі білетамі. У выніку праведзенай партыйнымі органамі работы з Ушаччыны праз Віцебскія «вароты» было выведзена каля 3 тыс.добраахвотнікаў, хоць раён знаходзіўся ад лініі фронту на адлегласці больш за 100 км (НАРБ. Ф. 3793. Воп. 1. Спр. 7. Л. 6).

Ушачане былі ў адзіным страі барацьбітоў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

*М.М.Кірпіч, Р.А.Чарнаглазава.*

## Дакументы сведчаць

### ПІСЬМО РОДНЫМ М.ДЗ.СТРЭПЕТАВА, БЫЛОГА КАМАНДЗІРА ДЫВЕРСІЙНАЙ ГРУПЫ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ П.К.ПАНАМАРЭНКІ

**23 красавіка 1942 г.**

Привет!

Здравствуйте мама, Толя и все родные и знакомые. Шлю я вам наилучший привет и желаю всего хорошего в вашей жизни.

Мама, сейчас нахожусь еще в деревне, но завтра, наверное, выступаем в походик, где будем ночными блохами, как говорят гитлеровские солдаты-мерзевир.

Жив и здоров: кушал хорошо, так же будет и дальше.

Мама, Толе скажи, чтобы он не баловался и слушался тебя. Мама, вернусь только с победой, когда на нашей Советской земле не останется ни одного фашистского мерзавца. И этот день настанет для них.

До свидания.

Жму крепко руку. Ваш сын Миша. 23/VI-42 г.

*Ушацкі музей народнай славы імя У.Е.Лабанка. КП 4. Спр. 82.*

*Падрыхтавала Г.Х.Талапілава.*

### СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ РАБОЦЕ УШАЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА ЛКСМБ АБ ДЗЕЙНАСЦІ РЭЗЕРВОВЫХ ГРУП У РАЁНЕ

**27 снежня 1942 г.**

В результате широко развернутой политико-массовой работы среди населения по зоне, контролируемой нашей бригадой, почти в каждой деревне созданы боевые негласные ре-

зервные группы, в которые входят мужчины и женщины всех возрастов. В группах состоит более 1 тыс. чел. Негласные исключительно энергично взялись за выполнение поставленных перед ними задач. Большую работу они проделали по розыску оружия. Так, например, негласная группа дер. Паульє Горбатицкого сельсовета (командир Крупский) имеет на вооружении 12 винтовок. Эта группа передала в отряд 1 ручной пулемет, 1 миномет. Из-под самого Лепеля привезли 170 снарядов к противотанковой 45-мм пушке. Группа из дер. Крольня сдала пулемет ДС 4-му отряду. Сейчас нет такой группы, где бы не было оружия.

Негласники энергично дерутся с немцами. Так, Усайская группа (командир тов. Денисов) 7 немцев убила и 5 ранила. Шелковская группа (командир тов. Кундалевичи) из ручного пулемета полностью уничтожила автомашину и 12 немцев. Эта же группа разгромила земский двор, коровники, угнала оттуда 70 лошадей и увезла много хлеба. Сейчас эта группа выросла в 6-й отряд нашей бригады. В боях под дер. Красное негласники под командованием их командира Плискевича Александра Васильевича участвовали в бою. В боях под мест. Заскорки участвовало много групп.

Группы провели большую работу по разрушению шоссейных и грунтовых дорог, телеграфно-телефонной связи. Мяницкая группа подпилила мост. 2 немецкие автомашины вместе с людьми, налетев на мост, обернулись. «О Рус, бандит народ», — ругался офицер. Группа их обстреляла. Эта же группа уничтожила 15 км телефонной связи между Лепелем, Ветрином и Полоцком. Негласные группы Сорочинского и Ушачского сельсоветов под руководством тов. Федоренко разрушили большак между Ушачами и Кубличами. Сейчас боевые резервы (группы) разрушили дороги (поделали на них завалы, волчьи ямы, противотанковые рвы) Улла — Сорево, Улла — Ушачи, Улла — Полоцк, Ушачи — Сорочино — Полоцк, Ушачи — Заскорки — Полоцк, Ушачи — Кубличи и др.

Группы Сорочинского, Ушачского сельсоветов провели на большаках одностороннее снегозадержание, в результате которого все большаки завалены сугробами.

Секретарь Ушачского райкома РК ЛКСМБ Василевский.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 63. Воп. 16. Спр. 12. Л. 163—168.*

## ЛІСТОЎКА-ЗВАРОТ ДА ПАЛІЦЭЙСКІХ, БУРГАМІСТРАЎ І ДОБРААХВОТНІКАЎ, ЯКАЯ БЫЛА ВЫДАДЗЕНА Ў ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЗЕ «ДУБАВА»

**1943 г.**

«Смерть немецким оккупантам»

К полицейским, бургомистрам и добровольцам

Людские резервы немцев и их союзников. Им нужно вооружение и сила для борьбы с нашим народом и партизанами, а также для грабежа населения. Для этой цели немцы создают полицейские и «добровольческие» отряды. Вы, находясь в этих отрядах, подняли оружие против своего народа и его Красной Армии. Этим вы делаете гнусное дело. Вы топчете честь и достоинство русского человека. Вы помогаете врагам нашего отечества.

В район города Сталинграда, на Центральном фронте, в районе среднего течения Дона, а также г. Нальчика Красная Армия начала наступление, гонит их с Советской земли. В районе среднего течения Дона Красная Армия продвинулась от 150 до 200 км. Захвачено только пленными больше 60 тыс. солдат и офицеров. Северо-западнее Сталинграда на 70—80 км. Окружен г. Великие Луки и г. Ржев. Противник оставляет на поле боя горы трупов солдат и офицеров. Захвачено много трофеев. Гитлеризм будет разбит. Вас ждет беспощадная расплата народа за измену Родине. Вы можете еще спасти свою жизнь и ваших родных, если немедленно перейдете на сторону партизан. Пока не поздно, убивайте немцев, жгите склады, разрушайте средства связи и дороги, уничтожайте все виды транспорта и с оружием в руках переходите к нам.

Комбриг Дубровский

Комиссар бригады Лобанок

Эта листовка служит пропуском для неограниченного количества лиц при переходе к нам.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3813. Воп. 1. Спр. 5. Л. 1.*

## З АДКАЗУ ЎШАЦКІХ ПАРТЫЗАН НА ЗВАРОТ ВОІНАЎ-БЕЛАРУСАЎ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

**1943 г.**

...Мы не даем немецким разбойникам врываться на территорию нашего района, в наши деревни и поселки, не даем здесь грабить крестьянский хлеб и скот. В бессильной злобе посылают оккупанты на наши деревни бомбовозы, чтобы бомбами сжечь мирные деревни, сжечь урожай, побить жителей и посеять в них тревогу. Только за август месяц немецкие стервятники сожгли в нашем районе свыше 30 деревень, среди которых районный центр Ушачи, местечки Вороничи, Гомель, деревни Глыбочка, Яново, Заполье, Быстрики, Рукшеница, Плиговка и многие другие.

Иногда крупным немецким карательным экспедициям под прикрытием авиации, танков и артиллерии удается ворваться в районы, контролируемые нами. Там, где они проходили, со звериной жестокостью уничтожалось все живое и неживое.

Так было весной этого года.

Ворвавшись в Мало-Долецкий, Велико-Долецкий, Весницкий и Жарский сельсоветы, немецкие бандиты стерли с лица земли свыше 50 деревень. Сотни людей зверски замучили, убили и сожгли живьем. Сотни семей загнали на каторгу в Германию и в концлагеря. Когда немцы были изгнаны из этих сельсоветов, партизаны обнаружили страшные следы злодеяний гитлеровцев. На берегу озера около деревни Муроги Мало-Долецкого сельсовета мы нашли могилу, в которой лежат до 40 человек зверски убитых жителей сожженной деревни, стариков, женщин и детей. В деревне Осново, где немцы сожгли 40 домов, было найдено 9 сгоревших трупов. 14 человек сожжены живьем в деревне Липняки. Но дикие зверства фашистских людоедов не сломят наше мужество и стойкость в борьбе с врагом. Муки и горе, слезы и кровь наших братьев и сестер, отцов и матерей взывают к мести. Сожженные города и села, скорбные руины зовут нас на мщение. Земля наша, истерзанная и поруганная немецкой нечистью, вопиет о мщении, о кровавом возмездии злому врагу.

И мы, партизаны и партизанки, как носители разгневанной совести народа, оруженосцы народной карающей ярости, неустанно, ежедневно и еженощно ведем грозную борьбу, уничтожаем лютых немецких чужинцев.

Свято выполняя Первомайский приказ вождя и полководца великого Сталина об усилении партизанской войны в тылу врага, мы только за последние четыре месяца в районе наших действий убили и ранили свыше 2000 немецких солдат и офицеров, взяли в плен 35 солдат, разгромили три вражеских гарнизона и уничтожили два штаба, пустили под откос до 10 эшелонов, разрушили железную дорогу, ведущую с запада к фронту, и вывели ее надолго из строя, подорвали около 50 автомашин, сбили немецкий самолет, взорвали до 10 мостов, уничтожили 10 складов с продовольствием, боеприпасами и разным имуществом...

*Ушацкі музей народнай славы імя У:Е.Лабанка. КП. 303. Спр. 153.*

*Падрыхтавала Г.В.Багдановіч.*

## З ПРАТАКОЛА № 11 ПАСЯДЖЭННЯ УШАЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б АБ НАРЫХТОЎЦЫ МАЛАКА І ЯЕК ДЛЯ ПАРТЫЗАН

**15 сакавіка 1943 г.**

1. Обязать всех старшин деревень организовать обязательную сдачу молока от населения, имеющего коров, занятой партизанами территории, для партизанских отрядов по их зонам с 15 марта 1943 г. в количестве ежедневной сдачи — один литр от коровы.

2. Разрешить командирам и комиссарам партизанских отрядов по своему усмотрению полностью или частично освобождать хозяйства пострадавших от пожара и других бедствий от руки подлых немецко-фашистских оккупантов.

3. Довести обязательную поставку яиц с населения занятой партизанами территории для партизанских отрядов в размере 30 штук с хозяйства.

4. Обязать командиров и комиссаров партизанских отрядов приступить к обязательной поставке яиц с населения по своим зонам не позже 16 марта 1943 г.

Слушали: О весеннем севе.

Постановили:

1. Обязать старшин деревень наделить землей семьи бежавших с территории занимаемой немцами, а также оказать помощь в деле обеспечения семенами и закрепления за ними тягловой силы.

2. Обязать старшин деревень навести строжайший порядок в вопросе закрепления лошадей. Для чего всю тягловую силу и сельскохозяйственный инвентарь распределить среди хозяйств с таким расчетом, чтобы ни одного хозяйства не осталось без незакрепленной лошади и сельхозинвентаря по запашке весенней посевной кампании и других работ.

3. Обязать командиров и комиссаров партизанских отрядов провести совещания с населением по зонам и деревням по вопросу весеннего сева, распределения лошадей и сельхозинвентаря среди хозяйств.

Слушали: Командира бригады тов. Мельникова по обеспечению обувью бойцов партизанских отрядов.

Постановили:

1. Обязать старшин деревень произвести добровольный сбор старых сапог, ботинок и голенищ с населения для партизанских отрядов.

2. Обязать командиров и комиссаров партизанских отрядов провести разъяснительную работу среди местных бойцов-партизан по вопросу самообеспечения обувью, в виду большого недостатка товара для обеспечения всех партизан отрядов.

3. Для скорейшего обеспечения обувью бойцов партизанских отрядов обязать командиров и комиссаров взять на учет всех кустарей-одиночек на занятой партизанами территории, что вырабатывают кожи от заказчиков на дому. Довести до них задания по выработке кож для партизанских отрядов. Там, где имеются выработанные кожи заказчиков, частично изъять и заменить невыработанными.

4. Обязать партийные и комсомольские организации оказать максимальную помощь партизанским отрядам по сбору обуви, проводя массовую разъяснительную работу среди местного населения.

Секретарь Ушачского РК КП(б)Б Корженевский

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 262. Л. 41—42.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

## З ПРАТАКОЛА № 5 ПАСЯДЖЭННЯ УШАЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б

**15 лютага 1944 г.**

Слушали: О создании комиссии по составлению истории партизанского движения в Ушачском районе.

Постановили: Утвердить комиссию по составлению истории партизанского движения в Ушачском районе в следующем составе:

Председателем комиссии т. Ястребова Матвея Ивановича.

Члены комиссии:

1. Мельников Владимир Васильевич — командир бригады им. Чапаева.
2. Конев Афанасий Яковлевич — командир отряда.
3. Рожков Борис.
4. Гирсёнок Терентий Филиппович.
5. Василевский Василий Яковлевич.
6. Тябут Михаил Андреевич.
7. Алещенок Борис Прокофьевич.
8. Забияко Ефим Каллиникович.
9. Клинов Иван Акимович.
10. Драгун Дмитрий Матвеевич.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 262. Л. 121.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

## РАСПАРАДЖЭННЕ КАМАНДЗІРА ЗЛУЧЭННЯ ПАРТЫЗАНСКІХ БРЫГАД ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЙ ЗОНЫ У.Е.ЛАБАНКА АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

**7 красавіка 1944 г.**

В связи с приближением периода весенне-полевых работ, в целях обеспечения населения и партизан продовольствием, оперативная группа ЦК КП(б)Б и БШПД предлагают

всем секретарям РК КП(б)Б, командирам и комиссарам партизанских бригад Полоцко-Лепельской партизанской зоны провести следующие мероприятия:

1. В закрепленных за бригадами и отрядами населенных пунктах организовать работу по подготовке к весеннему севу. Провести соответствующую политико-массовую работу среди населения и партизан по этому вопросу.

2. Добиться засева всей посевной площади каждым двором. Принять все меры, чтобы сев провести на высоком агротехническом уровне, используя все виды местного удобрения.

3. Провести учет запасов картофеля и зерновых культур в каждом доме, за счет перераспределения ... обеспечить семенным материалом каждую семью закрепленных деревень, включая и семьи беженцев, проживающих в нашей зоне.

4. Установить строгий контроль за сохранением семенного материала, не допуская случаев расходования семян не по назначению.

5. Строго запретить партизанам брать лошадей у крестьян на всякие перевозки без ведома командования бригад.

6. Обязать граждан, имеющих лошадей, принять возможные меры к улучшению их состояния.

7. Провести работу по подготовке крупного рогатого скота для полевых работ.

8. Выделить крестьянам часть партизанских лошадей на период посевной кампании.

9. Для организации проведения ремонта сельхозинвентаря отпустить всех партизан-кузнецов сроком на 15 дней, равномерно распределить их по деревням своей зоны.

10. Учитывая, что тягловой силы недостаточно, каждому двору заранее приобрести 2—3 железные лопаты и мотыги для использования их при обработке земли ручным способом.

11. В целях повышения санитарного состояния в районах в пятидневный срок организовать закопку в землю глубиной не менее 2 м лошадиных трупов и другого скота, валяющегося по дорогам и в поле.

Оперативная группа обращает внимание районных комитетов КП(б)Б и командования партизанских бригад, что весенне-посевная кампания 1944 г. в нашей зоне будет проходить в тяжелых условиях, в тылу немецких оккупантов.

Выполнение этой задачи требует от нас напряжения сил и мобилизации всех наших возможностей для того, чтобы в трудных условиях засеять всю посевную площадь и в короткие сроки.

Представитель ЦК КП(б)Б и БШПД Герой Советского Союза полковник Лобанок

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3812. Воп. 1. Спр. 11. Л. 19.*

## АБ БОЕЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ П.К.ПАНАМАРЭНКІ

**1944 г.**

В р-не ст. Ветрино были обнаружены сожженные склады с оружием, оставленные при отступлении Красной Армии. Оставались только горелые стволы с такими же затворами, которые и были использованы.

Пришлось мобилизовать всех кузнецов, слесарей с задачей скорейшего восстановления горелого оружия.

Были наскоро созданы мастерские, которые усиленно принялись за работу. Стволы, затворы выпрямляли и перековывали. Особенно трудно было восстановить боевую пружину и пружину стрелкового механизма, но в скором времени эти части успешно изготовлялись из стальной проволоки. Ложи делались в столярных мастерских. Горелые винтовки с ненадежными стволами, могущими быть разорванными от выстрела винтовочным патроном, переделывали в автоматы со стрельбой патроном ППШ, из которых успешно без диска можно было вести огонь. Горелое оружие, конечно, было далеко не доброкачественное — гильзы после выстрела обычно при помощи затвора не выбрасывались, нужно было применять обязательно шомпол. Пристрелять такую винтовку по цели тоже было трудно... Таких винтовок в бригаде насчитывалось до 50%.

Из артиллерии в бригаде было собрано из частей две 45-мм, одна 122-мм, два 82-мм миномета, один 120-мм миномет. Особую трудность в сборе 45-мм пушки представляло сделать прицел, который обычно брался от снайперской винтовки. Станины, колеса тоже делались в своих мастерских. Из такой пушки огонь, конечно, был неточен, но при большой

тренировке артиллеристов и изучении капризов орудия можно вести действенный огонь. Доказательством этого могут служить подбитые немецкие танки этими же пушками.

Большой недостаток партизаны испытывали в боеприпасах (до снабжения из-за линии фронта). Патроны добывали в оставленных Красной Армией дзотах. Бывали частые случаи, когда у бойца на винтовку … оставалось 3–5 патронов. За использованный впустую патрон боец получал взыскание; сохранение боеприпасов, строгий учет — все это было необходимо.

С большим трудом добывались снаряды к пушке. Их мы собирали сотни, но они были разные и от этого попадание было не всегда.

Взрыватели, основные и дополнительные заряды к минам тоже делали в партизанских мастерских. Также изготовляли в мастерских патроны к пистолету «Вальтер», револьверу «Наган», используя для этого патроны ППШ.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 47а. Л. 14–16.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

# Партызанскі камендант

## З успамінаў В.В.Бармінскага, былога намесніка камісара партызанскага атрада імя М.А.Шчорса брыгады імя В.І.Чапаева

Усе пытанні быта нашай брыгады вырашаліся камендантам Міхаілам Лабёнкам. Ён быў з мясцовых ушацкіх жыхароў. Да вайны працаваў настаўнікам.



Рамонт і пашыў абутку ў брыгадзе імя В.І.Чапаева.



У збраевай майстэрні брыгады імя В.І.Чапаева.

Клопатаў у яго хапала. Трэба было прасачыць, каб паспяхова прайшла веснавая сяўба і быў убраны вырашчаны ўраджай, арганізавана пастаўка партызанам хлеба і іншых прадуктаў. Клапаціўся і аб рабоце кузняў, майстэрань па вырабе скур і аўчын. У в. Крошына працавала валюнаўчоска, у в. Спашчына знаходзілася швейная майстэрня. Тут шылі кажухі, маскіровачныя халаты, іншае адзенне з нямецкага трафейнага абмундзіравання.

Праз Міхаіла Лабёнка мы ведалі нашы людскія рэзервы. Атрад пастаянна папаўняўся. Нярэдка ў партызаны прыходзілі цэлымі сем'ямі. Памятаю, аднойчы заявіліся адразу 3 браты: Пётр, Мікалай і Аркадзь Дукі. Народнымі мсціўцамі сталі зусім яшчэ юныя Фёдар Сурвіла з в. Лутава і Надзея Вярхоўская.

Партызанскі камендант праводзіў работу, абапіраючыся на рэзервовыя групы, камсамольскія арганізацыі. У в. Казлы, напрыклад, рэзервовай групай кіраваў Раман Коршун, у в. Ліпаўцы — Рыгор Смаляк, у в. Крошына — Сяргей Кулачонак. Настаўніца Ніна Памялкова была камсамольскім сакратаром у Сарочыне.

Партызанскі тыл паспяхова выконваў свае задачы. Без падтрымкі насельніцтва партызанскі рух на Ушаччыне не атрымаў бы такога размаху.

## Партызанскі староста

### З успамінаў І.С.Сцяпанава, былога намесніка камісара атрада па камсамоле 16-й Смаленскай партызанскай брыгады

У 1943—1944 гг. 16-я Смаленская партызанская брыгада дзейнічала на тэрыторыі Ушацкага раёна. Вялікую дапамогу нам аказвала мірнае насельніцтва.

Мне давялося пазнаёміцца з Іванам Дзмітрыевічам Сухарскім. У той час наш атрад спыніўся ў в. Гаравыя. Мне даручылі правесці сход жыхароў. Хату заноўнілі жанчыны, старыя і падлеткі. Я выступіў перад імі. Заклікаў вяскоўцаў дапамагаць народным мсціўцам. Прапанаваў выбраць старасту вёскі. Яго задача — падтрымліваць сувязь паміж насельніцтвам і партызанскім атрадам. Прысутныя сказалі, што такі чалавек ёсць. Гэта Іван Дзмітрыевіч Сухарскі, ён стаў старастам яшчэ ў 1942 г., калі тут дзейнічала брыгада М.В.Уткіна.

З лаўкі падняўся хударлявы высокі мужчына. Гэта і быў Сухарскі. Мы пазнаёміліся. Пасля сходу дамовіліся аб далейшых сумесных справах.

Ужо на наступны дзень Іван Дзмітрыевіч прыйшоў у штаб атрада і прынёс вялікі клунак з рэчамі, якія сабралі сяляне. У ім былі валёнкі, кашулі, ручнікі, саматканае палатно.

З таго дня партызанскага старасту часта можна было бачыць у штабе атрада. У той час мы вялі жорсткія баі з фашыстамі. Але Сухарскі знаходзіў нас усюды. Здаралася, што партызаны заходзілі на адпачынак у в. Гаравыя. Мясцовыя жыхары прымалі нас шчыра і цёпла, дзяліліся апошнімі харчамі. Дапамога партызанскага старасты была даволі адчувальнай. Ён дастаўляў на партызанскую базу то зброю, то прадукты харчавання, арганізаваў выраб скур, стварыў майстэрню па пашыве ботаў.

Параненыя ў баях партызаны нашага і іншых 7 атрадаў брыгады знаходзіліся ў шпіталях, якія размяшчаліся ў вёсках Гута і Арэхаўна. Па ініцыятыве І.Дз.Сухарскага аднавяскоўцы рыхтавалі ім падарункі.

Вясной 1944 г. варожае кола блакады пачало сціскацца вакол партызанскай зоны. Але і ў гэты цяжкі час мы адчувалі дапамогу насельніцтва. Сям'я Сухарскіх пякла хлеб, а жыхары в. Гаравыя прывозілі яго да нас. Калі фашысты занялі вёску, усе сяляне са скарбам падаліся ў лес.

Толькі гараўчанам не ўдалося схавацца. Немцы высачылі іх, нейкім чынам даведаліся аб партызанскім старасце. На вачах аднавяскоўцаў фашысты катавалі Івана Дзмітрыевіча, а потым кінулі ў балота. Але сяляне выратавалі Сухарскага...

Пасля вызвалення Ушаччыны партызанскі староста разам з Чырвонай арміяй рушыў на захад, пайшоў граміць фашыстаў, штурмаваў Берлін.

# Хочаш стаць партызанам — здабудзь зброю

## З успамінаў С.В.Маркевіча, былога намесніка камандзіра па разведцы партызанскай брыгады «Дубава»

Жадаючых уступіць у партызанскія атрады было больш чым можна было ўзброіць. Перш за ўсё патрэбна было разлічваць на саміх сябе: хочаш стаць партызанам — здабудзь зброю ў ворага.

Аднак, калі вінтоўка ці аўтамат могуць служыць доўга, то з боепрыпасамі справа была складаная. Іх было мала. Таму засяроджвалі ўвагу на пошук складоў, якія былі пакінуты часцямі Чырвонай арміі пры адступленні. Такім чынам нешта ўдавалася здабыць.

Аднак асноўную надзею ўскладалі на атрыманне боепрыпасаў з Вялікай зямлі. Ішлі за лінію фронту. Пасля абмеркавання з камандзірам брыгады «Дубава» Ф.Ф.Дуброўскім сітуацыі, якая склалася на той час, вырашылі, што за лінію фронту на сувязь з Віцебскім падпольным абкомам пайду я. Меркавалі сфарміраваць групу з дзевяці чалавек, а добраахвотнікаў набралася каля сотні. Фёдар Фаміч, даведаўшыся пра гэта, з сялянскай хітрасцю, як бы незнарок, сказаў: «Бяры ўсіх, але без зброі...» — і мы абодва рассмяяліся.

Аказваецца, гэта ідэя даўно прадумвалася камбрыгам, і вось прыйшла пара яе рэалізаваць. Падабралі групу ў 90 чалавек з надзеяй, што кожны за лініяй фронту атрымае аўтамат. На ўсю групу ўзялі восем вінтовак, адзін аўтамат, пісталет, 2 гранаты.

Група выйшла з лагера Антунова, што ў лясным масіве на захад ад Пуцілкавіч, 11 снежня 1942 г. У раёне в. Астраўляны атрымалі неабходную інфармацыю ад разведчыкаў партызанскай брыгады імя В.І.Чапаева і ўзялі курс на Суражскі раён, дзе брыгада «Бацькі Міная» кантралявала так званыя Віцебскія «вароты». За 19 сутак пераходу мы пераадолелі Заходнюю Дзвіну і Обаль, чыгунку, шашэйную дарогу, мінулі шэраг буйных гарнізонаў ворага. У ноч на новы 1943 г. мы сустрэліся з часцямі Чырвонай арміі.

У в. Ясіновец, дзе ў той час размяшчаўся Віцебскі падпольны абком партыі, атрымалі зброю і патроны, прычым столькі, колькі кожны з нас мог несці, і накіраваліся назад.

Цяпер у групе было 90 аўтаматаў, 3 процітанкавыя ружжы і па рукзаку патронаў на кожнага. Пад кіраўніцтвам Міхаіла Жукава партызаны вярнуліся ў лагер, а я на тыдзень затрымаўся ў абкоме. На сустрэчах з сакратарамі абкома І.А.Стулавым, Я.А.Жыляніным, старшынёй аблвыканкома І.М.Рабцавым і ўпаўнаважаным БШПР І.І.Рыжыкавым абмяркоўвалі пытанні актывізацыі барацьбы партызан з ворагам, дапамогі з нашага боку Чырвонай арміі, каардынацыі нашых дзеянняў.

# Сям'я Шчэрбікаў

Мікалай Шчэрбік перад вайной закончыў Ушацкую сярэднюю школу на выдатна. Гэтым летам пачалася вайна. Пайшоў у партызаны бацька, а следам за ім Мікалай. Хлопец збіраў звесткі аб ворагу і перадаваў іх народным мсціўцам, выконваў даручэнні кіраўніка падпольнай групы Паўла Міхайлавіча Усцінава. Прынёс партызанам кулямёт і рацыю, якія яму ўдалося вынесці з варожага гарнізона.

У 1942 г. дваццацігадовы юнак стаў камандзірам атрада разведчыкаў партызанскай брыгады «Дубава». Разведчыкі рабілі смелыя вылазкі ў варожыя гарнізоны, знішчалі тэхніку і салдат праціўніка, падрывалі масты, здабывалі звесткі аб ворагу, яго планах.

Адважны разведчык загінуў у няроўным баі ў маі 1944 г. пад час варожай блакады партызанскай зоны. У гэтых баях загінулі яго бацька Сцяпан Мікалаевіч і браты Сцяпан, Міхаіл і Нікадзім.

М.С.Шчэрбік пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

*В.В.Караленка.*

# Дапамагалі партызанам

Жыхары Ушаччыны наладзілі сістэму дапамогі партызанам. У некаторых вёсках пяклі хлеб, вязалі цёплыя рэчы, шылі кажухі, рабілі валёнкі, гадавалі жывёлу, каб пракарміць сваіх абаронцаў. Лячылі ў сваіх хатах нараненых партызан.

У в. Двор Пліна для байцоў Смаленскага партызанскага палка шылі бялізну, вопратку. Для перавязачнага матэрыялу выкарыстоўвалі старую бялізну, ручнікі. Больш за іншых сабрала такога матэрыялу Тацццяна Прыстаўка з дзецьмі. Цяжка ў гэтай справе называць лепшых. Многія дзяліліся апошнім. Н.С.Русецкая выратавала траіх палонных чырвонаармейцаў.

В.С.Касцюковіч страціла ў партызанах мужа і сына, у час блакады была паранена яе дачка Ганна.

Праз яе рукі прайшоў не адзін паранены, а яе дом быў прытулкам для многіх падпольшчыкаў і пасланцоў з Вялікай зямлі.

*В.С.Міранові.*

## Партызанскія медыкі

У верасні 1942 г. быў створаны шпіталь у партызанскай брыгадзе імя В.І.Чапаева. Ён размяшчаўся спачатку ў в. Рыбакі Ветрынскага раёна, пазней у в. Перадавыя. Ён быў разлічаны на 30 ложкаў. Асобна былі абсталяваны перавязачная, кухня, пральня, амбулаторыя для партызан і насельніцтва. У вызваленых Ушачах была адкрыта



Партызаны брыгады «Дубава». 1 мая 1943 г.



Будаўніцтва ўмацаванняў на мяжы партызанскай зоны.

бальніца для жыхароў. Самаадданa працавалі ўрачы М.Т.Царынскі, А.М.Верашчагіна, А.Л.Вейнберг, Т.Ф.Гірсёнак, І.А.Рыбакоў, Г.Рыбакова, Н.А.Рыбакова, медсёстры С.В.Літвін, М.М.Марковіч, З.К.Федаровіч, З.Калеснікава і іншыя. З падзелам у чэрвені 1943 г. партызанскай брыгады імя В.І.Чапаева на 2 былі створаны і 2 санітарныя службы. У брыгадзе імя В.І.Чапаева яе ўзначаліла А.Л.Вейнберг, у брыгадзе імя П.К.Панамарэнкі — Т.Ф.Гірсёнак. Шпіталь брыгады імя В.І.Чапаева (начальнік І.А.Рыбакоў) на 80 ложкаў размясціўся ў Арэхаўскай школе і ў праўленні былога калгаса. У ім працавалі хірургічнае, тэрапеўтычнае, інфекцыйнае аддзяленні, перавязачная, аперацыйная, аптэка, зубаўрачэбны кабінет, амбулаторыя, санітарны прапускнік і гаспадарчыя службы. Медыкаменты і перавязачныя матэрыялы атрымлівалі з Вялікай зямлі, выкарыстоўвалі і трафейныя. Насельніцтва дапамагала ў нарыхтоўцы дроў, мыцці бялізны, выпечцы хлеба, прыносіла прадукты харчавання. У сувязі з успышкай сыпнога тыфу ў в. Рог была адкрыта інфекцыйная бальніца.

У вёсках былі створаны санітарныя пасты, якія лячылі хворых дома, праводзілі шпіталізацыю з санапрацоўкай і іншыя мерапрыемствы. У 1943—1944 гг. у раёне перахварэла на сыпны тыф каля 25% насельніцтва. У час майскай блакады 1944 г. праз эвакапункты амаль усе параненыя і хворыя былі вывезены за лінію фронту.

Санітарныя службы абслугоўвалі партызан кожнага атрада, санінструктары — у ротах і ўзводах. У перыяд з 15 ліпеня 1942 г. па 1 чэрвеня 1944 г. у шпіталях партызанскіх брыгад імя П.К.Панамарэнкі і В.І.Чапаева была аказана дапамога 965 партызанам (з іх каля 50% параненых), 206 жыхарам раёна. На Вялікую зямлю эвакуіраваны 159 чалавек. 725 партызан былі вернуты ў строй.

Многія партызанскія медыкі загінулі ў баях з гітлераўцамі. Сярод іх І.А.Рыбакоў, В.Андрэева, І.Бакуганец. Былі паранены А.Л.Вейнберг, Т.Ф.Гірсёнак і іншыя.

*А.В.Пашковіч.*


І.А.Рыбакоў.


С.В.Літвінава.


З.К.Федаровіч.

## Два канцэрты

### З успамінаў Ф.Праніка

У прапагандысцкай рабоце сярод насельніцтва немцы выкарыстоўвалі розныя сродкі: наглядную агітацыю, лекцыі, канцэрты. На адным такім канцэрце ў в. Старое Сяло, што каля Селішчанскай пушчы, давялося пабываць і мне.

На дзвярах школы вісеў вялікі партрэт Гітлера і флаг з фашысцкай свастыкай. Паліцэйскія сагналі сюды жыхароў і з навакольных вёсак. З дынамікаў, устаноўленых на вялікіх крытых аўтамашынах, аглушальна грымелі нямецкія маршы.

Усе маўчалі. На нізкі драўляны ганак школы ўзышоў чалавек у касцюме нямецкага ўзору з жалезным крыжам на грудзях. На рускай мове ён расказаў аб тым, што бачыў у Германіі, якія там будынкі, як жывуць немцы, хваліў парадкі Гітлера і закончыў словамі: «Скажыце тым, хто ў лесе, каб вярталіся дадому і верна

служылі Германіі. Савецкай улады больш не будзе».

У адказ — цішыня. Немцы насцярожана глядзелі ў натоўп. Потым немец аб'явіў, што артыст спяе песню. З-за спіны немца выйшаў прысадзісты мужчына і заспяваў. Людзі нізка апусцілі галовы. Чалавек спяваў адзін, без акампанементу. Голас дужы, прыгожы, песня лілася шырока. Ён спяваў песню пра ўдалага рускага героя. Спявак і слухачы былі акружаны фашыстамі з аўтаматамі і кулямётамі.

Затым па знаку афіцэра салдаты раздалі людзям прапагандысцкія брашуры і паштоўкі з партрэтамі Гітлера. Усе разышліся.

Заклікі фашыстаў прагучалі ўпустую. Ужо восенню гэтага ж года немцаў выгналі з Ушач.

Другі канцэрт, партызанскі, мне давялося чуць ужо будучы партызанам у в. Навасёлкі Мосарскага сельсавета ў студзені 1944 г. У хаце чацвёра маладых хлопцаў у нямецкай форме без пагонаў рыхтаваліся да выступлення, у аднаго быў баян, у другога — акардыён, у трэцяга — саксафон. Яны ціхенька спрабавалі інструменты пасля марознай дарогі.

Радзіёнаўцы, — прашаптаў мне сусед на вуха.

— Дарагія таварышы, вітаем вас ад імя партызан брыгады Гіля-Радзіёнава, жадаем вам паспяхова біць фашыстаў. А цяпер пачынаем канцэрт.

Было бачна, што гэта артысты-прафесіяналы. Сыгралі канцэртны вальс, а потым артыст спяваў песню пра жар-птушку. Больш гэтай песні я ніколі не чуў. Затым невысокая дзяўчына заспявала песню «Вьётся в тесной печурке огонь...». Ціха гучаў баян. Гэты канцэрт я не забуду ніколі.

## Незабыўнае свята

7 лістапада 1943 г. ушацкія партызаны сустракалі ў складанай абстаноўцы. Насельніцтва арганізавала збор святочных падарункаў для партызан, у іх ліку было шмат цёплага адзення, бялізны, пальчатак, валёнак. Толькі ў атрадзе імя А.В.Суворава брыгады імя П.К.Панамарэнкі на ўрачыстасцях было раздадзена 73 падарункі. 6, 7 і 8 лістапада былі праведзены ўрачыстыя сходы, прысвечаныя Кастрычніку. Самалётамі даставілі святочныя газеты. Яны былі распаўсюджаны сярод партызан і насельніцтва. На сходзе ў в. Ільюшына стары селянін Хрыпель сказаў: «Наша Беларусь захоплена немцамі, а мы сёння сустракаем Кастрычнік свабодна і радасна. За гэта мы павінны дзякаваць нашым слаўным абаронцам у тыле ворага, партызанам».

*Л.А.Мядзведзева.*

## Песні партызан

Для партызанскай паэтычнай творчасці найбольш характэрнымі з'яўляліся баявыя песні, паходныя маршы. Яны нараджаліся пасля ўдала праведзеных баявых аперацый, славілі гераічныя подзвігі партызан, ушаноўвалі памяць таварышаў, якія загінулі ў баях. Сярод партызан Полацка-Лепельскай зоны папулярнымі былі песні «Па дарозе Ушацкай» (М.Пекаў), «Песня ўшацкіх партызан» (І.Клімаў), «Марш 16-й Смаленскай брыгады» (У.Глебаў) і іншыя. Яны нарадзіліся ў час барацьбы з карнікамі. Іх спявалі на матыў вядомых даваенных песень. Партызанскія песні арганізоўвалі народных мсціўцаў на барацьбу з ворагам, яднал іх у адзіны баявы строй, натхнялі на подзвігі.

«ПА ДАРОЗЕ ЎШАЦКАЙ»

Песня партызан. Словы партызана М.Пекава. Спявалі на матыў песні часоў грамадзянскай вайны «По военной дороге».

По земле партизанской,
По дороге Ушачской,
По густым белорусским лесам
Лезут немцы-бандиты,
На фронтах не добиты,
Хотят зону занять партизан.

На заслон против немцев
Шла бригада смоленцев
За народ, за родную страну.
И пошли в бой отряды
Нашей славной бригады,
Опрокинули гадов в бою.

Враг жесток и опасен.
На ночь стал в селе Красном,
Утром должен был дальше пойти.
Но решили смоленцы
Из села выбить немцев,
Ночью с тыла врага обойти.

Темной ночью без шума
Шли отряды для штурма
По занесенным снегом полям.
И раздалась команда:
«В бой, отряды, на банду!»
Штурмом ринулись к темным домам.

К спящим фрицам по хатам
Полетели гранаты,
А бегущих косил пулемет,
Чтобы вольные села
Не терпели позора,
Чтобы высохли слезы сирот.

Озверелые немцы
На бригаду смоленцев
В наступление утром пошли.
Но фашистские танки,
Минометы, тачанки
Их от смерти спасти не смогли.

В третьей схватке бандиты
Были снова разбиты
И до Ушач они не дошли,
Подобрали убитых,
До исходных позиций
Ночью к Улле назад отошли.

Так в борьбе с врагами
Бьются все партизаны
Во глубоком, во вражьем тылу
Будут помнить те немцы,
Как дерутся смоленцы
За народ, за родную страну.

## З песняй пра Маскву

### З успамінаў У.Е.Лабанка

Актыўным удзельнікам самадзейнасці ў партызанскай брыгадзе імя К.Я.Варашылава быў масквіч Мікалай Паўлаў. Ён прыгожа спяваў. Голас у яго быў не вельмі моцны, але мяккі, ласкавы. Простыя, пранікнёныя словы песні бралі за сэрца. Была ў гэтай песні і вялікая сіла:

Сядь-ка рядом, что-то мне не спится,
Письмо я нынче другу написал,
Письмо в Москву, далекую столицу,
Которой я давно уж не видал...

Той, хто ведаў Мікалая блізка, разумеў, чаму такі сум у яго голасе. Ваяваць ён пайшоў разам з бацькам. Уступілі ў народнае апалчэнне, папалі на фронт. У час баёў разлучыліся, сустрэліся пад Полацкам, у Баравусе, у лагеры для ваеннапалонных. Бацька памёр ад голаду і пакут. Мікалай уцёк з палону і прыйшоў да партызан. Адважна змагаўся ён з ненавісным ворагам. На сваю апошнюю баявую аперацыю Мікалай Паўлаў пайшоў пасля канцэрта, на якім выканаў песню пра Маскву...

Пачуўся шум падыходзячага поезда. Паўлаў вырашыў мініраваць чыгунку пры падыходзе эшалона. Ён ускочыў на насып. Вартавыя прыкмецілі яго, але міна была ўжо пастаўлена. Мікалай скаціўся з адкосу, і ў той жа момант раздаўся выбух... Цяжкапаранены партызан памёр на руках у баявых сяброў.

## Мастацкі летапіс вайны

З полацкага лагера, дзе ўтрымліваліся савецкія ваеннапалонныя, збеглі дзевяць вязняў. Сярод іх былі і мастакі М.І.Абрыньба і М.Ц.Гуціеў. Блукаючы па ўшацкіх лясах, сустрэліся яны з начальнікам разведкі партызанскай брыгады «Дубава» С.В.Маркевічам. Уцекачоў залічылі ў брыгадную разведку. У вольны час браліся яны за алоўкі, накідвалі партрэты партызан. Неўзабаве М.І.Абрыньба пачаў маляваць фарбамі карціны аб жыцці і баявых справах партызан. Пачалося гэта так. Пад час разгрому варожага гарнізона ва Ушачах М.І.Абрыньба забег у хату паліцэйскага і ўбачыў там шмат цюбікаў з фарбамі. Не ўтрымаўся і набіў імі свае кішэні, запіхнуў і за пазуху. «Рызыкаваць за фарбы?» — здзівіліся партызаны. Але рызыка сябе хутка апраўдала.

Набліжалася гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. У брыгадзе ішла падрыхтоўка да ўрачыстага сходу. М.І.Абрыньба на адной прасціне намаляваў героя грамадзянскай вайны В.І.Чапаева ў баі, на другой — групу партызан на чале з У.Е.Лабанком у час разгрому варожага штаба пад Бароўкай. Абодва палотнішчы былі расцягнуты ў лагеры паміж дрэвамі. На дрэвах віселі

і ўрачыстыя лозунгі. У партызан адбылося сапраўднае свята.

М.Ц.Гуціеў маляваў карыкатуры на акупантаў і іх памагатых, лістоўкі, плакаты: «Што ты зрабіў для разгрому фашыстаў?», «Чаму ты не ў партызанах?», «Не балбачы — вораг падслухвае!», «Білі, б'ём і будзем біць!».

Паўстала задача: як распаўсюдзіць лістоўкі? Звычайна гэта рабілі сувязныя, падпольшчыкі, партызанскія агітатары. Міша Чайкін, ад'ютант камбрыга, прапанаваў змайстраваць паветранага змея, з дапамогаў якога партызаны закінулі лістоўкі ў варожы гарнізон у Лепелі.

У студзені 1943 г. карнікі спалілі в. Слабодку, што непадалёку ад Пышна. Камандаванне брыгады загадала мастакам па свежых слядах замаляваць учыненыя злачынствы над мірнымі жыхарамі і выпусціць пра гэта лістоўку. Заданне камандавання было выканана. Была выпушчана не толькі лістоўка, але і намалявана карціна «Фашысты прайшлі».

Камандаванне бачыла, якое вялікае ўздзеянне аказвалі творы мастакоў на партызан. Было вырашана стварыць мастацкі летапіс барацьбы ў тыле ворага. Для гэтага пісаліся партрэты партызан, якія вызначыліся ў баях. Ствараліся і групавыя партрэты. Цікавай была карціна М.І.Абрыньбы «Выезд партызанскай брыгады «Дубава» на аперацыю». У яе кампазіцыі больш за 50 асоб. Наперадзе — камандзір брыгады Ф.Ф.Дуброўскі і



Мемарыяльная экспазіцыя «Партызанская карцінная галерэя» ва Ушацкім музеі народнай славы.



Мастак М.І.Абрынька (справа) у час наведвання Ушацкага музея народнай славы.

камісар У.Е.Лабанок. Па рашэнні камандавання як падзяка за паспяховыя баявыя дзеянні на пярэднім плане маляваліся партрэты асабліва праславіўшыхся партызан. Мастак М.І.Абрыньба, які вызначыўся ў баі пры захопе ў гітлераўцаў гарматы, атрымаў загад намаляваць сябе на гэтай карціне другім ездавым.

Каб усе партызаны бачылі мастацкія творы, у лагеры пабудавалі асобную зямлянку. Так з'явілася партызанская карцінная галерэя. У час блакады карціны былі перапраўлены самалётамі на Вялікую зямлю.

*Р.К.Гладышаў.*

## Расказваюць былыя лётчыкі...

**У.Кузняцоў, былы начальнік штаба эскадрыллі 105-га авіяпалка**

Нашу эскадрыллю ў палку называлі партызанскай. З восені 1942 г. мы ажыццяўлялі рэгулярныя палёты да партызан Расіі, а потым Беларусі. Лятаі на машынах У-2 і Р-5. Шмат грузаў было дастаўлена партызанам, асабліва ва Ушацкую зону, у час барацьбы з карнікамі. Камандзір нашай эскадрыллі А.В.Фядотаў 167 разоў вылятаў да партызан, І.Л.Тарасаў — 213, В.С.Паўзуноў — 199, крыху менш З.І.Нохаў, М.І.Жукаў, А.В.Жога, Н.Н.Варанцоў. Мы жылі справамі і патрэбамі партызан.

**В.Такаеў, былы лётчык 389-га авіяпалка**

У пачатку 1944 г. для работы з партызанамі Ушацкай зоны была прыцягнута 314-я авіядывізія, што ўваходзіла ў склад 3-й паветранай арміі.

Найбольшую колькасць вылетаў да партызан Ушаччыны зрабілі лётчыкі 389-га авіяпалка, дзе я служыў штурманам экіпажа. Камандаваў палком палкоўнік Чаркасаў, аўтарытэтны і вопытны камандзір. Лётчыкі і штурманы лятаі ў складаных пагодных умовах, пераадольвалі заслоны нямецкіх зенітных батарэй і начных знішчальнікаў.

Многа вылетаў было зроблена на аэрадромы Ушачы, Пліна, Забор'е, Бягомль, Альхоўка. Лётчыкі Аганэсаў, Гайдар, Аляксашкін, Салагуб, Якаўлеў, Лысікаў, штурманы Сенчанкаў, Сідараў, Дворскі рабілі проста цуды. Яны знаходзілі пасадачныя партызанскія пляцоўкі, абазначаныя кастрамі. Прывозілі з Вялікай зямлі зброю, боепрыпасы, узрыўчатку. З партызанскай зоны эвакуіравалі параненых і дзяцей. Яны дзёрзка садзілі самалёты на лёд возера, выконвалі адказныя заданні па высадцы разведчыкаў у тыл ворага.

**М.Агапаў, былы лётчык 1-га асобнага авіяпланернага палка**

Да партызан мы лятаі з прыфрантавога аэрадрома Старая Таропа. На самалётах Р-6 лятаі з пасадкай. Калі атрымалі самалёты СБ, пачалі дастаўляць грузы ў мяшках на парашутах. Такіх вылетаў наш экіпаж зрабіў пяць. Пазней мы асвоілі дастаўку грузаў на партызанскія аэрадромы з дапамогай планераў А-7, якія бралі больш грузаў, чым самалёт. Мы адбуксавалі пяць такіх планераў. Для лётчыкаў такія палёты былі самымі складанымі. За замок, што знаходзіўся пад фюзеляжам самалёта, планер чапляўся тросам даўжынёй 80 — 100



У.А.Кузняцоў.



В.Ф.Такаеў.



І.Л.Тарасаў.



М.Я.Агапаў.

метраў. Пілот-планерыст у палёце арыентаваўся па сілуэце самалёта ці выхлапным маторным полымі. Таму неабходна была добрая бачнасць. Нельга было зайсці ў воблакі, манеўраваць.

**А.Пляшкун, былы лётчык асобнага авіятранспартнага палка**

16 сакавіка 1944 г. мы ўзялі на борт самалёта 2 тоны грузаў і ў 22 гадзіны вылецелі ў раён Бягомля, каб даставіць груз партызанам. Прайшлі Полацк, прыкладна ў 23 гадзіны ў раёне в. Клапы Ушацкага раёна мы трапілі ў зону аховы нямецкіх знішчальнікаў Ме-110. Кулямётна-гарматнай чаргой наш самалёт быў збіты. На вышыні 2 тыс. метраў загарэўся левы рухавік, левае крыло было адарвана, вырваны левы борт, самалёт загарэўся. Я і бартавы тэхнік Рабаў выкінуліся з парашутамі з самалёта, які палаў і пачаў падаць. Нас абстралялі нямецкія знішчальнікі, але нам пашчасціла застацца жывымі. Прызямліліся ў кіламетры ад в. Клапы.

Гэтыя мясціны кантраляваліся партызанамі брыгады «Аляксея». Нас перакінулі ў в. Вялікія Дольцы, дзе размяшчаўся штаб брыгады. Туды ж даставілі і абгарэлыя целы членаў нашага экіпажа Барады, Лешчанкі і Тарасюка. Пахавалі іх у Вялікіх Дольцах на ўскрайку лесу, а пасля вайны перапахавалі ў брацкай магіле ў цэнтры вёскі.

Дэталь таго збітага самалёта захоўваецца ў музеі ва Ушачах. У сваіх запісах знайшоў, што той Лі-2 меў заводскі нумар 1844809 і 15-ы бартавы.

## Дакументы сведчаць

### ДАВЕДКА АБ СТАНЕ АВІЯПЛЯЦОЎКІ

**1943 г.**

Площадка расположена в 7,5 км южнее местечка Ушачи, у дер. Сержаны, озеро того же названия продолговатой формы находится восточнее большака. Сама площадка западнее большака на 250—300 м. Координаты по пятикилометровой карте 3329-6. Размеры посадочной полосы 600 х 75 м. Грунт средней твердости, в северной части площадки более мягкий, в южной — плотный, супесчаный. Вокруг посадочной полосы — ровный луг, также более плотный в южной части. Южная часть площадки выше северной на 4—5 м. Подходы с юга и севера открытые. Наилучший подход — с севера. Площадка пригодна для посадки планеров, с-тов У-2, Р-5, ЯК-6, Р-6, «Дуглас»(последние два в сухую погоду).

Малиновский

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 131. Л. 129.*



Вываз параненых з аэрадрома на возеры Вечалле.

# Падаў груз з неба

## З успамінаў Г.В.Бутоўскай, былой падпольшчыцы вёскі Пліна

У 1943 – 1944 гг. каля нашай вёскі зрабілі партызанскі аэрадром. Пачалі прылятаць лётчыкі 389-га авіяпалка і прывозіць партызанам боепрыпасы, медыкаменты, вопратку, звесткі аб падзеях на фронце, аб жыцці краіны. Калі чакалі самалёты ноччу, палілі кастры. Здаралася, што ў скінутых грузах разбіваліся скрынкі з патронамі і гранатамі. Тады даводзілася збіраць іх.

Немцы даведаліся пра наш аэрадром. Па начах нямецкі самалёт бамбіў аэрадром і вёску.

Аднойчы немцы падбілі наш У-2, ён сеў у лесе. На шчасце, паблізу аказаліся партызаны, яны хутка знайшлі лётчыкаў. Капітан Дзянісаў выцягнуў з палаючага самалёта стралка-радыста Мікалая Лебедзева, але выратаваць яго, на жаль, не ўдалося. Мы пахавалі яго на вясковых могілках, а затым яго астанкі перапахавалі ў брацкай магіле. Яго імя ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе «Прарыў».

# «Прынялі» нямецкі самалёт

Аб лясным аэрадроме даведаліся немцы. Яны вырашылі зрабіць засаду і знішчыць самалёт і партызан, якія яго сустракалі.

Стаяла ціхая чэрвеньская ноч 1943 г. На вялікай паляне ляжала ламачча для кастроў. Чакалі прылёту нашага самалёта, але яго не было. Партызаны пачалі непакоіцца. Прайшло яшчэ паўгадзіны. Раптам пачуўся прыглушаны гул самалёта. Ён набліжаўся. Ужо хацелі запальваць кастры, але тут прыбег радыст і сказаў, што самалёт не прыляціць.

У паветры над лесам быў варожы самалёт. Немцы хацелі, каб іх прынялі за сваіх. Партызаны вырашылі захапіць самалёт ворага. Запалілі кастры і акружылі паляну з усіх бакоў. Самалёт прызямліўся, з яго пачалі выходзіць людзі ў чорных мундзірах. Па іх быў адкрыты агонь народных мсціўцаў. У лагер партызаны вярталіся з трафеямі.

*В.Міхаль.*

# Дзяцей ратавалі партызаны і лётчыкі

Полоцкий детский дом не смог эвакуироваться в начале войны. Осенью 1943 г. немцы начали проявлять к нему повышенный интерес. Комендант Демель несколько раз вызывал к себе директора Форинко, спрашивал у него о количестве воспитанников, об их национальности. Через некоторое время было выяснено, что немцы



Выратаваныя дзеці Полацкага дзіцячага дома.

решили использовать детей в качестве доноров. Воспитатели уговорили коменданта вывезти детей в деревню из-за нехватки продуктов. Расположили детей в пустующих домах деревни Бельчицы. В штабе партизанской бригады имени В.И.Чапаева разрабатывалась операция по спасению детей под названием «Звездочка».

Отряд им. М.А.Щорса размещался в двадцати километрах от Бельчиц. Партизанам пришлось совершить трудный марш-бросок по глубокому снегу. За короткое время опушка леса у Бельчиц была превращена в укрепленный оборонительный рубеж на случай, если придется вступить в бой с гарнизоном и отбивать детей. Одной группе партизан было поручено вывести из деревни детей, другой оставаться на опушке леса и быть готовой прикрыть партизан с детьми. В лесу ожидал санный обоз в 30 подвод.

По договоренности командования зоны с Большой землей, чтобы отвлечь внимание фашистов, в назначенный срок над Бельчицами закружили советские самолеты. Они проносились на бреющем полете, наводя панику в стане врага.

Весть о спасении детей облетела окрестные села, отряды и бригады. Местные жители несли им одежду, обувь, продукты.

Вскоре договорились с Большой землей о перевозке детей в советский тыл. Летчики решили делать по два рейса за ночь, а если потребуется, то рискнуть и на дневные полеты.

Командование авиаполка приняло особые меры предосторожности. На партизанском аэродроме у деревни Ковалевщина сменили посадочные сигналы, последовательность цвета ракет. Первым на самолете Р-5 прилетел Александр Мамкин. Раненые настояли, чтобы сначала вывезли детей. В самолет погрузили только двоих тяжелораненых. Полеты шли нормально. Летчики А.Мамкин и А.Кузнецов делали по нескольку рейсов за сутки. В одном из рейсов на самолет, пилотируемый А.Мамкиным, напали истребили и подбили его. Охваченный огнем самолет летчик дотянул за линию фронта. В самолете было девять детей и раненые партизаны. На детях уже горела одежда. Едва успели вытащить пассажиров, как взорвался бензобак. Взрывной волной обгоревшего летчика отбросило метров на тридцать. А.Мамкин умер в госпитале.

На Большую землю удалось перевезти не всех воспитанников детдома. 18 детей старшего возраста остались у партизан. Авиасвязь с Большой землей стала ненадежной.

*Друкуецца са скарачэннямі паводле кн.: Лобанок В.Е. Партизаны принимают бой. Мн., 1976. С. 88—95.*



А.П.Мамкін вывозіць дзяцей на Вялікую зямлю.

# Партызанскі фронт у 1943—1944 гг.

1943 г. азнаменаваўся значнымі перамогамі Чырвонай арміі. Была прарвана блакада Ленінграда, спынена наступленне ворага, разгромлены гітлераўская тэхніка і войскі пад Курскам і Арлом. Савецкія войскі перайшлі ў контрнаступленне, у выніку чаго вызвалілі 2/3 акупіраванай тэрыторыі былога СССР і падышлі да меж Беларусі. Гэта значна паўплывала на падзеі ў тыле ворага: узмацніўся і пашырыўся партызанскі рух. Уся дзейнасць партызан была накіравана на ўсебаковую дапамогу Чырвонай арміі. Асабліва жорсткая была барацьба на камунікацыях ворага. Партызаны Полацка-Лепельскай зоны літаральна асядлалі шашэйныя і грунтавыя дарогі Віцебск — Сянно, Чашнікі — Талачын, Лепель — Барысаў, Лепель — Докшыцы, Лепель — Полацк, Лепель — Ула. На гэтых дарогах былі ўзарваны амаль усе масты. Многія бальшакі былі перакапаны, на лясных дарогах зроблены завалы. Уздоўж дарог гітлераўцы размяшчалі свае гарнізоны, якія былі адной з форм абароны акупантаў ад партызан. Іх колькасць павялічвалася з кожным днём. Многія з іх ператварыліся ў непрыступныя крэпасці: умацоўваліся дотамі, дзотамі, драцяной загародай, бліндажамі, акопамі. Буйнейшыя з іх размяшчаліся на правым беразе Заходняй Дзвіны, уздоўж чыгункі Полацк — Параф'янава і шашэйных дарог Пышна — Пустаселле, Лепель — Докшыцы. Так, шашу Лепель — Докшыцы ахоўвалі 17 варожых гарнізонаў. Але гэта не спыняла партызан. Яны аб'явілі ім вайну. Гэта ставіла нямецкія войскі ў цяжкае становішча. Нямецкае камандаванне ўлічвала, што пры пераходзе Чырвонай арміі ў наступленне на віцебскім напрамку іх войскі непазбежна апынуцца паміж двух агнёў. У снежні 1943 г. — лютым 1944 г. гітлераўцы пяць разоў спрабавалі прарваць абарону партызан, але безвынікова. Партызаны не толькі адбілі ўсе атакі, але і разбілі больш за 30 варожых гарнізонаў. Практычна ўвесь 1943 г. партызаны вялі баі з карнікамі.

Галоўны ўдар у маі 1943 г. карнікі накіравалі супраць партызанскіх брыгад, якія дзейнічалі ў прыфрантавой паласе, ва ўсходняй і паўночна-ўсходняй частках вобласці. Гітлераўцам удалося акружыць групу партызанскіх брыгад у раёне Крутой Гары. Яны імкнуліся адцясніць партызан да лініі фронту і да Заходняй Дзвіны.

Амаль адначасова ішла карная аперацыя супраць партызан Лепельскага і Ушацкага раёнаў Віцебшчыны, Барысаўскага і Бягомльскага раёнаў Міншчыны. Дзве групы карнікаў з чатырох бакоў дзейнічалі супраць віцебскіх партызан. Адна з іх з Лепеля рухалася на пазіцыі партызанскіх брыгад «Дубава» і С.М.Кароткіна. Другая з боку Полацка наступала на партызанскія брыгады У.В.Мельнікава, Дз.В.Цябута, М.А.Сакмаркіна. Карнікі рухаліся ў напрамку м. Пышна, мяркуючы далей выйсці да вёсак Варонь, Тартак,



Партызаны знішчаюць тэлефонную сувязь ворага.

8. Зак. 1737.

Весніцк, Касары, Зарубаўшчына. Нягледзячы на няроўныя сілы (карнікаў было значна больш), партызаны затрымалі іх каля Пышна і Тартака.

Каля в. Весніцк пад націскам карнікаў партызаны вымушаны былі адступіць. Гітлераўцы занялі Касары і Зарубаўшчыну, але ненадоўга. Яны былі выбіты партызанамі, якім удалося захапіць карту з планам карнай аперацыі. Яна была выкарыстана партызанскім камандаваннем. Аб'яднанымі сіламі народныя мсціўцы прарвалі блакаду на дарозе Барысаў — Лепель і выйшлі ў Чашніцкі раён. Адначасова працягваліся жорсткія баі каля м. Пышна. На працягу 20 сутак карнікі пры дапамозе авіяцыі імкнуліся зламаць супраціўленне партызанскіх брыгад «Дубава» і С.М.Кароткіна. Гітлераўцы кінулі дадатковыя сілы і 3 чэрвеня ажыццявілі масіраваны налёт авіяцыі, прыкрылі дымавой завесай 16 танкаў і пацяснілі партызан да Пуцілкавіч, Логава, Дубянца, Царковішча, Весніцка, Вялікіх Дольцаў. Партызаны здолелі не толькі адбіцца, але і з дапамогай насельніцтва пабудаваць лінію абароны (акопы, дзоты), дзе замацаваліся і прыпынілі рух праціўніка. 16-дзённыя баі партызан сарвалі планы гітлераўцаў. Але было зразумела, што праціўнік не супакоіцца і наладзіць чарговую карную экспедыцыю. Таму ў зону сцягваліся дадатковыя партызанскія сілы з суседніх раёнаў Віцебскай і Мінскай абласцей. Полацка-Лепельскую зону абаранялі 16 партызанскіх брыгад: імя У.І.Леніна (камандзір М.А.Сакмаркін), І.В.Сталіна (камандзір Дз.Ц.Караленка), К.Я.Варашылава (камандзір Дз.В.Цябут), В.І.Чапаева (камандзір У.В.Мельнікаў), дыверсійная Беларуская брыгада імя У.І.Леніна (камандзір М.Т.Гарбаценкаў), імя ВЛКСМ (камандзір І.А.Куксёнак), імя ЦК КП(б)Б (камандзір А.Д.Мядзведзеў), імя С.М.Кароткіна (камандзір У.М.Талаквадзе), «Кастрычнік» (камандзір Ф.К.Юрчанка), 1-я Антыфашысцкая (камандзір У.У.Гіль-Радзіёнаў), 16-я Смаленская (камандзір І.Р.Шлапакоў), 2-я Ушацкая імя П.К.Панамарэнкі (камандзір М.В.Уткін), 1-я імя Суворава (камандзір П.А.Хомчанка), «Аляксея» (камандзір А.Ф.Данукалаў), «За Савецкую Беларусь» (камандзір П.М.Раманаў). Партызанскія сілы налічвалі звыш 17 тысяч байцоў.

Кіраўніцтва і каардынацыя іх баявымі дзеяннямі была ўскладзена на створаную ў снежні 1943 г. ЦК КП(б)Б і БШПР аператыўную групу. У яе склад увайшлі У.Е.Лабанок (кіраўнік), А.І.Бруханаў, А.Ф.Бардадын, І.І.Зіненка, Дз.А.Фралоў. Аператыўная група правяла вялікую работу па стварэнні абароны зоны. Яна была пабудавана ўздоўж Заходняй Дзвіны ад Улы да Полацка, уздоўж чыгункі ад Полацка да Крулеўшчызны і ўздоўж шашэйных і грунтавых дарог ад Докшыц да Улы. У сувязі з падыходам Чырвонай арміі да Віцебшчыны паўсталі новыя задачы. Устанавіліся цесныя сувязі з камандаваннем 1-га Прыбалтыйскага фронту. Планаваўся дэсант у партызанскую зону, якую камандаванне фронту разгляда-



Лётчыкі 1-й партызанскай эскадрыллі 105-га гвардзейскага авіяпалка.

ла як плацдарм для нанясення ўдару па праціўніку на Полацкім напрамку з тылу. Перад партызанамі была пастаўлена задача ўтрымліваць зону метадам актыўнай абароны: узмацніць дзейнасць дыверсійных груп і партызанскіх засад. Разам з тым была вызначана задача аб стварэнні глыбокай паласы (да 12–15 км) і рубяжоў супраціўлення. Умацоўваліся ў зоне дзеяння партызан населеныя пункты, развілкі дарог. Ажывіліся дзеянні партызан па захопе «языкоў». Быў узяты унтэр-афіцэр сувязі, а з ім план абароны Полацка. Пастаянным ударам падвяргалася дарога Лепель–Докшыцы. Значны час яе гаспадарамі былі партызаны. Участак Пышна–Любава ўвесь час мініраваўся.

Партызанскія брыгады і атрады зоны ў снежні 1943 г. — студзені 1944 г. нанеслі фашыстам значныя страты. Яны забілі і паранілі вялікую колькасць нямецкіх салдат і афіцэраў, пусцілі пад адхон 40 эшалонаў праціўніка, разграмілі 31 гарнізон, знішчылі 329 аўтамашын. Шмат было захоплена трафеяў.

У красавіку 1943 г. камандаванне паветрана-дэсантных войскаў Чырвонай арміі правяло вялікую планерную аперацыю з прыфрантавых аэрадромаў на партызанскія пасадачныя пляцоўкі, у тым ліку і ва Ушачах. У час гэтай аперацыі было адбуксавана да партызан 138 планераў, на якіх было перакінута 215 тон баявых грузаў і 472 чалавекі. Для нямецкай авіяцыі і наземных войскаў гэта аперацыя з'явілася нечаканай, яны не змаглі ёй перашкодзіць. Ні адзін планер не быў знішчаны ў паветры.

У час барацьбы з карнікамі савецкія лётчыкі зрабілі 354 вылеты, пераправілі партызанам больш за 250 тон грузаў, бамбілі скопішчы нямецкіх войскаў. Узаемадзеянне і адвага лётчыкаў і партызан змаглі стварыць у тыле ворага жорсткі фронт.

*Р.А.Чарнаглазава.*

## Партызанскія брыгады, якія дзейнічалі на тэрыторыі Полацка-Лепельскай зоны ў 1943—1944 гг.

### 1-я АНТЫФАШЫСЦКАЯ БРЫГАДА

16 жніўня 1943 г. на бок партызан перайшла так званая «Руская нацыянальная народная армія», арганізаваная нямецка-фашысцкімі захопнікамі з ваеннапалонных. У яе склад уваходзілі 5 стралковых атрадаў, рота аўтаматчыкаў, рота сувязі, артылерыйская батарэя, сапёрна-падрыўны атрад. У верасні створаны вучэбна-рэзервовы батальён (9-ы атрад) з жыхароў Лагойскага, Плешчаніцкага і Смалявіцкага раёнаў. У сакавіку 1944 г. яго асабовы склад перададзены атрадам брыгады. У студзені 1944 г. створаны 10-ы атрад.

У красавіку–маі 1944 г. у цяжкіх баях з карнікамі брыгада панесла вялікія страты (1026 чал.), перасталі існаваць 5 атрадаў (5, 6, 7, 8, 10-ы) і рота сувязі. У выніку перафарміравання ў брыгадзе створаны 4 атрады.

Камісару брыгады І.М.Цімчуку ў студзені 1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Барысаўскім, Лагойскім, Плешчаніцкім раёнах Мінскай, Куранецкім, Плісскім, Пастаўскім Вілейскай, Лепельскім, Ушацкім Віцебскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 4 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 422 партызаны. Камандзіры брыгады: Гіль-Радзіёнаў Уладзімір Уладзіміравіч (жнівень 1943 — май 1944, загінуў), Цімчук Іван Мацвеевіч (май 1944 — ліпень 1944); камісары: Касцяневіч Андрэй Мікалаевіч (верасень 1943, в. а.), Цімчук Іван Мацвеевіч (кастрычнік 1943 – май 1944), Яўмененка Іван Максімавіч (май 1944 — ліпень 1944); начальнік штаба Панамарэнка Барыс Міхайлавіч (студзень 1944 — ліпень 1944).

### 1-я БРЫГАДА ІМЯ А.В.СУВОРАВА

Створана 2 сакавіка 1943 г. паводле загаду БШПР з групы партызан атрада «Спартак», якая ў лістападзе 1942 г. у час карнай экспедыцыі ворага выйшла ў Расонскі раён Віцебскай вобласці. Пры фарміраванні брыгады створаны атрады імя К.Я.Варашылава, «Бальшавік», імя В.П.Чкалава. У маі–ліпені 1943 г. частка яе асабовага складу перададзена атраду «Спартак», у кастрычніку ў брыгадзе створаны атрад «Камсамолец».

Брыгада дзейнічала ў Плісскім, Дзісенскім, Дунілавіцкім, Шаркаўшчынскім раёнах Вілейскай, Ушацкім Віцебскай абласцей.



М.Я.Усаў.



І.К.Алесянкоў.



А.М.Кулічкоў.



П.П.Юр'еў.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 1—4 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 225 партызан. З іх: мужчын — 193, жанчын — 32, беларусаў — 150, рускіх — 42, украінцаў — 7, іншых нацыянальнасцей — 26, членаў ВКП(б) — 6, кандыдатаў — 8, членаў ВЛКСМ — 69, беспартыйных — 142. Камандзіры брыгады: Хомчанка Пётр Антонавіч (сакавік 1943 — сакавік 1944, чэрвень 1944 — ліпень 1944), Раеўскі Трафім Карнеевіч (сакавік 1944 — красавік 1944), Кляцоў Аляксей Цімафеевіч (май 1944 — чэрвень 1944); камісар Усаў Мікалай Ягоравіч (красавік 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Піўкін Фёдар Дзянісавіч (сакавік 1943 — чэрвень 1943), Раеўскі Трафім Карнеевіч (чэрвень 1943 — сакавік 1944, май 1944 — ліпень 1944), Кляцоў Аляксей Цімафеевіч (сакавік 1944 — красавік 1944).

#### 16-я СМАЛЕНСКАЯ БРЫГАДА

Створана 28 ліпеня 1942 г. у Каспляснскім раёне Смаленскай вобласці на базе атрадаў У.І.Цалішчэўскага і А.С.Ляшчова, вылучаных 3-й брыгадай Смаленскай вобласці. Атрадам нададзены нумарныя абазначэнні 1-ы і 2-і. Пазней у складзе брыгады створаны атрады 3, 4, 5, 6, 7, 8-ы (апошні ў снежні 1943 г. расфарміраваны). Да вясны 1943 г. брыгада мела назву 5-я, дзейнічала ў Смаленскай вобласці, у сакавіку 1943 г. перадыслацыравалася ў Віцебскую.

Брыгада дзейнічала ў Каспляснскім, Руднянскім раёнах Смаленскай, Лёзненскім, Аршанскім, Сенненскім, Багушэўскім, Ушацкім, Віцебскай і Міёрскім, Шаркаўшчынскім, Свірскім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 5 ліпеня 1944 г. у складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 637 партызан. З іх: мужчын — 564, жанчын — 73, беларусаў — 303, рускіх — 280, украінцаў — 40, іншых нацыянальнасцей — 14, членаў ВКП(б) — 31, кандыдатаў — 40, членаў ВЛКСМ — 98, беспартыйных — 468. Камандзіры брыгады: Давыдкін Трафім Гур'евіч (ліпень 1942 — жнівень 1942), Шлапакоў Іван Раманавіч (жнівень 1942 — ліпень 1944), Алесянкоў Іван Кузьміч (сакавік 1944 — чэрвень 1944); камісары: Гольнеў Дзмітрый Цімафеевіч (ліпень 1942 — верасень 1943), Кулічкоў Аляксандр Міхайлавіч (кастрычнік 1943 — сакавік 1944), Цімашэнкаў Рыгор Мікалаевіч (сакавік 1944 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Шалыгін Апанас Яфімавіч (ліпень 1942), Алесянкоў Іван Кузьміч (сакавік 1943 — красавік 1943), Юр'еў Павел Піліпавіч (ліпень 1943 — студзень 1944), Вінаградаў Павел Іванавіч (студзень 1944 — май 1944), Бурцаў Аляксей Іванавіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944).

#### БРЫГАДА «ЗА САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ»

Створана 8 кастрычніка 1942 г. у Бешанковіцкім раёне па ўказанні Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе асобных атрадаў «Сібірак», імя В.І.Чапаева, А.С.Ільіна (пазней імя Р.І.Катоўскага). У 1943 г. у брыгадзе створаны новыя атрады імя С.Г.Лазо, імя М.А.Шчорса, імя А.Неўскага, імя М.І.Кутузава, імя А.В.Суворава.

Камандзіру брыгады П.М.Раманаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна).

Брыгада дзейнічала ў Гарадоцкім, Расонскім, Дрысенскім, Асвейскім, Ушацкім і Бешанковіцкім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 30 чэрвеня 1944 г. у складзе 8 атрадаў агульнай колькасцю 421 партызан. З іх: мужчын — 363, жанчын — 58, беларусаў — 265, рускіх — 132, украінцаў — 14, іншых нацыянальнасцей — 10, членаў ВКП(б) — 7, кандыдатаў — 11, членаў ВЛКСМ — 81, беспартыйных — 322. Камандзір брыгады Раманаў Павел Мінаевіч (кастрычнік 1942 — май 1944, загінуў); камісары: Падалец Дзмітрый Паўлавіч (кастрычнік 1942 — снежань 1943), Жыжаў Мікалай Георгіевіч (люты 1944 — май 1944, загінуў); начальнікі штаба: Дадзеркін Міхаіл Апанасавіч (кастрычнік 1942 — май 1943), Звераў Мікалай Андрэевіч (май 1943 — май 1944, загінуў), Ярашэнка Андрэй Іванавіч (май 1944 — чэрвень 1944).

## БРЫГАДА «КАСТРЫЧНІК»

Створана 1 верасня 1943 г. У верасні 1942 г. па ініцыятыве сакратара Мінскага легальнага абкома КП(б)Б І.Ф.Клімава з жыхароў Усвяцкага раёна Смаленскай вобласці арганізаваны атрад «Кастрычнік» і накіраваны ў Міёрскі раён Вілейскай вобласці. 14 кастрычніка ён прыбыў у тыл ворага. Да сакавіка 1943 г. дзейнічаў у Расонскім раёнах Віцебскай, потым Міёрскім і Плісім Вілейскай абласцей. Камандзір атрада Юрчанка Фёдар Кірылавіч (Вятроў) (верасень 1942 — верасень 1943); камісар Юкша Іван Іосіфавіч (верасень 1942 — верасень 1943); начальнік штаба Юрчанка Іван Кірылавіч (верасень 1942 — верасень 1943).

1 верасня 1943 г. атрад «Кастрычнік» пераўтвораны ў брыгаду з той жа назвай. У яе ўключаны атрады 1, 2, 3, 4-ы імя А.М.Горкага.

Брыгада дзейнічала ў Міёрскім, Плісім, Дзісенскім, Шаркаўшчынскім, Глыбоцкім, Ушацкім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 2—4 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 256 партызан. Сярод іх: мужчын — 232, жанчын — 24, беларусаў — 179, рускіх — 59, украінцаў — 7, іншых нацыянальнасцей — 11, членаў ВКП(б) — 10, кандыдатаў — 10, членаў ВЛКСМ — 56, беспартыйных — 180. Камандзіры брыгады: Юрчанка Фёдар Кірылавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944), Юкша Іван Іосіфавіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); камісар Юкша Іван Іосіфавіч (верасень 1943 — ліпень 1944); начальнік штаба Цяльноў Герман Трафімавіч (верасень 1943 — ліпень 1944, загінуў).



М.Г.Жыжаў.



І.І.Юкша.

## БРЫГАДА ІМЯ К.Я.ВАРАШЫЛАВА

Створана ў снежні 1942 г. Ветрынскім падпольным райкомам КП(б)Б на базе асобных атрадаў «Мсцівец» і «Смерць фашызму». Да студзеня 1944 г. называлася «Мсцівец». У 1943 г. у брыгадзе арганізаваны атрады «За Радзіму», «КІМ», «Бальшавік», імя М.Ф.Гастэлы.

Брыгада дзейнічала ў Ветрынскім, Ушацкім раёнах Віцебскай і Плісім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 1 ліпеня 1944 г. у складзе 6 атрадаў агульнай колькасцю 746 партызан. З іх: мужчын — 695, жанчын — 51, беларусаў — 641, рускіх — 83, украінцаў — 10, іншых нацыянальнасцей — 12, членаў ВКП(б) — 41, кандыдатаў — 80, членаў ВЛКСМ — 207, беспартыйных — 418. Камандзір брыгады Цябут Дзмітрый Васільевіч (снежань 1942 — ліпень 1944); камісар Лемза Уладзімір Антонавіч (снежань 1942 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Шапавал Яўстафій Сцяпанавіч (май 1943 — люты 1944), Кухта Аляксандр Аляксандравіч (люты 1944 — ліпень 1944).

## БРЫГАДА ІМЯ ВЛКСМ

Створана ў лістападзе 1943 г. на базе асобных атрадаў імя С.Г.Лазо, «Сібірак», «КІМ», 2-га і 4-га (пазней імя М.Ф.Сільніцкага).

Брыгада дзейнічала ва Ушацкім і Чашніцкім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 2 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў агуль-



У.А.Лемза.



К.В.Зюкаў.



В.А.Блахін.



І.І.Старавойтаў.

най колькасцю 282 партызаны. З іх: мужчын — 265, жанчын — 17, беларусаў — 173, рускіх — 93, украінцаў — 7, іншых нацыянальнасцей — 9, членаў ВКП(б) — 17, кандыдатаў — 16, членаў ВЛКСМ — 110, беспартыйных — 139. Камандзір брыгады Куксёнак Іван Архіпавіч (лістапад 1943 — ліпень 1944); камісар Зайцаў Фёдар Іванавіч (лістапад 1943 — ліпень 1944); начальнік штаба Шчурын Мікалай Пятровіч (лістапад 1943 — ліпень 1944).

**БРЫГАДА ІМЯ А.Ф.ДАНУКАЛАВА**

Створана ў красавіку 1942 г. па ўказанні Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе асобных атрадаў «Радзіма», «Крэпасць» і «Граза ворагам» (пазней 4-ы «Смерць ворагам»). У 1942—1943 гг. у брыгадзе стварающца атрады: 1-ы «Прагрэс», 2-і імя В.І.Чапаева, 6-ы «Марак», «Граза», І.І.Гур'ева, А.С.Гайдукова, І.І.Уласава, 10-ы імя К.Я.Варашылава, імя І.В.Сталіна, 11-ы «Савецкая Беларусь», 9-ы «Буравеснік», 12-ы «Інтэрнацыянал», 13-ы «Гвардзеец», 14-ы «Знішчальнік», 15-ы «Сокал», 16-ы «Камсамолец», 17-ы «Мсцівец», 18-ы «Зорка», 19-ы «Казбек», 20-ы «Бальшавік». Акрамя таго, у брыгаду ўліліся асобныя атрады К.В.Зюкава (у чэрвені 1942), «Качубея» (пазней «Перамога», у верасні 1942), 8-ы імя М.Н.Селіваненкі (у ліпені 1942).

Спачатку называлася брыгада «Аляксея». У маі 1944 г. ёй прысвоена імя камандзіра брыгады А.Ф.Данукалава, які загінуў у красавіку 1944 г., пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Касплянскім, Смаленскім, Лёзненскім, Суражскім, Віцебскім, Аршанскім, Багушэўскім, Бешанковіцкім, Чашніцкім, Ушацкім раёнах Віцебскай, Пліскім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 1 ліпеня 1944 г. у складзе 12 атрадаў агульнай колькасцю 1817 партызан. На 1 красавіка 1944 г. у брыгадзе налічваліся 1894 партызаны. З іх: мужчын — 1691, жанчын — 203, беларусаў — 1315, рускіх — 468, украінцаў — 52, іншых нацыянальнасцей — 59, членаў ВКП(б) — 52, кандыдатаў — 88, членаў ВЛКСМ — 456,беспартыйных — 1298.

Камандзіры брыгады: Данукалаў Аляксей Фёдаравіч (Аляксей) (красавік 1942 — красавік 1944, загінуў), Блахін Васіль Аляксандравіч (красавік 1944 — ліпень 1944); камісары: Паўлоўскі Трафім Васільевіч (красавік 1942 — май 1942, загінуў), Шчарбакоў Афанасій Цімафеевіч (май 1942 — май 1943), Старавойтаў Іван Ісакавіч (май 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Гайдукоў Антон Сцяпанавіч (красавік 1942 — ліпень 1942), Антоненка Яўген Мікітавіч (ліпень 1942 — красавік 1944), Пласкуноў Фёдар Іванавіч (верасень 1942 — красавік 1944), Піменаў Іван Піліпавіч (май 1944 — ліпень 1944).

**ДЫВЕРСІЙНАЯ БЕЛАРУСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА**

Створана ў ліпені 1942 г. Паўночна-Заходняй аператыўнай групай ЦК КП(б)Б у савецкім тыле як Беларуская дыверсійная брыгада асобага прызначэння з партызан, выдзеленых брыгадамі 1-й Беларускай і 2-й Беларускай імя П.К.Панамарэнкі. Пры яе фарміраванні створаны атрады 1-ы, 2-і, пазней 3-і. У лістападзе 1942 г. брыгадзе прысвоена імя У.І.Леніна. Асноўная база да снежня 1942 г. знаходзілася ў савецкім тыле, куды атрады перыядычна выходзілі

на экіпіроўку. Паводле загаду БШПР, у верасні 1943 г. з Віцебскай вобласці брыгада перадыслацыравана ў Вілейскую. Са снежня 1943 г. па красавік 1944 г. знаходзілася ў складзе Полацка-Лепельскай аператыўнай групы БШПР.

Брыгада дзейнічала ў Суражскім, Талачынскім, Ушацкім раёнах Віцебскай, Дунілавіцкім, Докшыцкім, Плісскім, Глыбоцкім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 1 ліпеня 1944 г. у складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 315 партызан. З іх: мужчын — 275, жанчын — 40, беларусаў — 252, рускіх — 48, украінцаў — 7, іншых нацыянальнасцей — 8, членаў ВКП(б) — 7, кандыдатаў — 12, членаў ВЛКСМ — 62, беспартыйных — 234. Камандзіры брыгады: Баскакаў Аляксей Андрэевіч (ліпень 1942 — май 1943, загінуў), Гарбаценкаў Максім Трыфанавіч (май 1943 — ліпень 1944), Фурсо Яўген Усцінавіч (красавік 1944 — чэрвень 1944); камісары: Лобараў Васіль Данілавіч (жнівень 1942 — студзень 1943), Гарбаценкаў Максім Трыфанавіч (люты 1943 — май 1943), Шастакоў Рыгор Фёдаравіч (май 1943 — снежань 1943), Умінскі Мікалай Захаравіч (студзень 1944 — люты 1944), Свірыд Уладзімір Сяргеевіч (люты 1944 — май 1944, загінуў), Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Падгорны Мікалай Пятровіч (лістапад 1942 — сакавік 1943), Сафонаў Сяргей Фёдаравіч (май 1943 — ліпень 1944).

**БРЫГАДА ІМЯ С.М.КАРОТКІНА**

Створана 20 чэрвеня 1942 г. па рашэнні Сіроцінскага падпольнага райкома КП(б)Б на базе асобных атрадаў «Мсцівец», «Грозны», імя К.Я.Варашылава. Да лютага 1943 г. называлася Сіроцінская, затым імя Ф.Э.Дзяржынскага. У чэрвені 1943 г. брыгадзе прысвоена імя яе камандзіра С.М.Кароткіна, які загінуў у кастрычніку 1942 г. Пазней у брыгадзе арганізаваны атрады імя В.І.Чапаева, «Сталінец», «За перамогу», «Беларускі мсцівец», імя Ф.Э.Дзяржынскага, імя С.М.Кірава, імя ВЛКСМ. 7 лютага 1943 г. у выніку баявых дзеянняў брыгада падзялілася. Загадам прадстаўніка БШПР А.Ф.Бардадына ад 14 сакавіка 1943 г. з яе атрадаў «Мсцівец», імя К.Я.Варашылава, «Сталінец» і часткова атрада «Грозны» створана брыгада імя У.І.Леніна.



М.З.Умінскі.

Брыгада дзейнічала ў Сіроцінскім, Расонскім, Полацкім, Ушацкім раёнах Віцебскай, Плісскім і Міёрскім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 2 ліпеня 1944 г. у складзе 6 атрадаў агульнай колькасцю 660 партызан. З іх: мужчын — 561, жанчын — 99, беларусаў — 534, рускіх — 57, украінцаў — 8, іншых нацыянальнасцей — 61, членаў ВКП(б) — 21, кандыдатаў — 45, членаў ВЛКСМ — 137, беспартыйных — 457. Камандзіры брыгады: Кароткін Сямён Міхайлавіч (чэрвень 1942 — кастрычнік 1942, загінуў), Хомчанка Пётр Антонавіч (кастрычнік 1942 — сакавік 1943), Талаквадзе Уладзімір Мануілавіч (сакавік 1943 — ліпень 1944); камісары: Фралоў Васіль Міхайлавіч (чэрвень 1942 — сакавік 1943), Эрдман Адольф Браніслававіч (сакавік 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Аляксандраў Усевалад Рыгоравіч (чэрвень 1942 — ліпень 1942, кастрычнік 1942 — студзень 1943), Хомчанка Пётр Антонавіч (ліпень 1942 — кастрычнік 1942), Мацвеенка Мікалай Фёдаравіч (студзень 1943 — ліпень 1944).

**БРЫГАДА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА**

Створана ў сакавіку 1943 г. па ўказанні БШПР і Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе атрадаў «Мсцівец», імя К.Я.Варашылава, «Сталінец» і групы партызан атрада «Грозны», вылучаных Сіроцінскай брыгадай 7 лютага 1943 г. Пры фарміраванні брыгады атрадам «Мсцівец», імя К.Я.Варашылава, «Сталінец» прысвоены нумары 1, 3, 6-ы, таксама створаны 2, 4, 5-ы, пазней 7-ы. У снежні 1943 г. замест нумароў атрадам прысвоены імёны: 1-му — М.В.Фрунзе, 2-му — С.М.Кірава, 4-му



А.У.Сіпко.

— І.В.Сталіна, 5-му — А.В.Суворава, 6-му — В.І.Чапаева, 7-му — М.І.Кутузава.

Брыгада дзейнічала ў Сіроцінскім, Расонскім, Ушацкім, Гарадоцкім, Бешанковіцкім раёнах Віцебскай і Шаркаўшчынскім, Дзісенскім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 2 ліпеня 1944 г. у складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 571 партызан. З іх: мужчын — 494, жанчын — 77, беларусаў — 453, рускіх — 92, украінцаў — 14, іншых нацыянальнасцей — 12, членаў ВКП(б) — 19, кандыдатаў — 21, членаў ВЛКСМ — 157, беспартыйных — 374. Камандзір брыгады Сакмаркін Мікалай Аляксандравіч (люты 1943 — ліпень 1944); камісар Сіпко Антон Уладзіміравіч (люты 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Раеўскі Трафім Карнеевіч (люты 1943 — чэрвень 1943), Ізафатаў Аляксандр Кузьміч (чэрвень 1943 — красавік 1944, загінуў), Аляксандраў Усевалад Рыгоравіч (красавік 1944 — май 1944, загінуў), Конюхаў Іван Іванавіч (май 1944 — ліпень 1944).

**БРЫГАДА ІМЯ К.К.РАКАСОЎСКАГА**

Створана ў ліпені 1942 г. 1 ліпеня 1942 г. па распараджэнні ваеннага савета 29-й арміі ў Расонскі раён Віцебскай вобласці прыбыў 17-ы атрад асобага прызначэння на чале з А.І.Петраковым. Да гэтага часу пад кіраўніцтвам Расонскага падпольнага райкома КП(б)Б у раёне дзейнічалі атрады імя І.В.Сталіна, імя К.Я.Варашылава, імя В.І.Чапаева, імя В.П.Чкалава і імя В.М.Молатава. Камандаванне 17-га атрада аб'яднала іх у брыгаду «За Савецкую Беларусь» (26 сакавіка 1943 г. перайменавана ў імя К.К.Ракасоўскага), у якую ўвайшоў і 17-ы атрад. У склад брыгады затым увайшлі асобныя атрады імя Сяргея, імя М.А.Шчорса, а таксама імя М.В.Фрунзе, якія дзейнічаў у Асвейскім раёне.

Пазней ствараюцца атрады ў Расонскім раёне — 2-і імя І.В.Сталіна, імя У.І.Леніна, імя Р.І.Катоўскага, імя С.М.Кірава, імя М.І.Калініна, у Дрысенскім — імя М.В.Фрунзе, імя М.І.Калініна, імя С.М.Кірава, імя А.Неўскага, у Асвейскім — імя А.А.Жданава, імя Р.К.Арджанікідзе, імя А.Я.Пархоменкі. Іх злучылі па месцы дыслакацыі ў групы атрадаў Расонскага, Дрысенскага і Асвейскага раёнаў. Па распараджэнні аператыўнай групы партызанскага руху пры ваенным савеце 4-й ударнай арміі ад 26 жніўня 1942 г. гэтыя групы атрадаў вызначаны самастойнымі брыгадамі: Расонская — імя І.В.Сталіна, Дрысенская і Асвейская — імя М.В.Фрунзе. У складзе брыгады «За Савецкую Беларусь» засталіся атрады 17-ы, імя Сяргея, імя М.А.Шчорса, імя Р.І.Катоўскага, імя У.І.Леніна і імя А.Я.Пархоменкі. У верасні 1942 г. атрад імя А.Я.Пархоменкі выбыў у Вілейскую вобласць, дзе на яго базе быў сфарміраваны 1-ы батальён, які быў падпарадкаваны брыгадзе да студзеня 1943 г. Па распараджэнні БШПР у чэрвені 1943 г. брыгада імя К.К.Ракасоўскага перадыслацыравана ў Вілейскую вобласць.

Камісару брыгады П.М.Машэраву і намесніку камандзіра атрада імя М.А.Шчорса па разведцы У.А.Хамчаноўскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Брыгада дзейнічала ў Расонскім, Асвейскім, Дрысенскім, Полацкім, Ушацкім раёнах Віцебскай, Сабежскім, Ідрыцкім, Невельскім, Калінінскім, Пастаўскім, Дунілавіцкім, Докшыцкім, Міёрскім, Глыбоцкім, Мядзельскім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 3 ліпеня 1944 г. у складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 915 партызан. З іх: мужчын — 841, жанчын — 74, беларусаў — 594, рускіх — 253, украінцаў — 32, іншых нацыянальнасцей — 36, членаў ВКП(б) — 53, кандыдатаў — 89, членаў ВЛКСМ — 226, беспартыйных — 547. Камандзіры брыгады: Петракоў Андрэй Іванавіч (ліпень 1942 — верасень 1942), Дорменеў Уладзімір Нічыпаравіч (верасень 1942 — лістапад 1942, верасень 1943 — студзень 1944), Раманаў Аляксандр Васільевіч (лістапад 1942 — сакавік 1943, сакавік 1943 — ліпень 1944); камісары: Раманаў Аляксандр

Васільевіч (ліпень 1942 — сакавік 1943), Нігамаеў Шайхун Нігамаевіч (снежань 1942 — сакавік 1943, лістапад 1943 — ліпень 1944), Машэраў Пётр Міронавіч (сакавік 1943 — лістапад 1943); начальнікі штаба: Дорменеў Уладзімір Нічыпаравіч (ліпень 1942 — сакавік 1944, май 1944 — ліпень 1944), Казарцаў Георгій Іванавіч (верасень 1943 — студзень 1944), Шчуцкі Уладзімір Пятровіч (сакавік 1944 — май 1944).

**СМАЛЕНСКІ ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК**

Створаны ў ліпені 1942 г. У маі 1942 г. па распараджэнні штаба Заходняга фронту ў тыл ворага, у раён дыслакацыі партызанскага злучэння «Баці» (камандзір Н.З.Каляда) Смаленскай вобласці, прыбыла група (8 чал.) на чале з І.Ф.Садчыкавым для арганізацыі партызанскага палка асобага прызначэння. Ён быў сфарміраваны 27 ліпеня 1942 г. з асабовага складу, які быў вылучаны злучэннем «Баці», у складзе атрадаў 1, 2, 3, 4-га, пазней створаны 5, 7, 8, 9, 10, 12, 13, 14-ы. 6-ы атрад увайшоў у склад палка ў кастрычніку 1942 г. У 1943 г. атрады аб'яднаны ў батальёны. Да сакавіка 1943 г. полк дзейнічаў на тэрыторыі Смаленскай вобласці, затым у Беларусі. У кастрычніку 1943 г. загадам начальніка ЦШПР перададзены ў падпарадкаванне БШПР.

Полк дзейнічаў у Касплянскім, Дзямідаўскім, Смаленскім, Сенненскім, Чашніцкім, Талачынскім, Ушацкім раёнах Віцебскай і Куранецкім Вілейскай абласцей.

Злучыўся з часцямі Чырвонай арміі 3 ліпеня 1944 г. у складзе 13 атрадаў агульнай колькасцю 942 партызаны. З іх: мужчын — 852, жанчын — 90, беларусаў — 276, рускіх — 566, украінцаў — 51, іншых нацыянальнасцей — 49, членаў ВКП(б) — 15, кандыдатаў — 52, членаў ВЛКСМ — 202, беспартыйных — 673. Камандзір Садчыкаў Іван Фёдаравіч (ліпень 1942 — ліпень 1944); камісар Юр'еў Андрэй Фёдаравіч (ліпень 1942 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Дамарацкі Генадзій Паўлавіч (ліпень 1942 — красавік 1943), Мінаеў Пётр Георгіевіч (красавік 1943 — ліпень 1944).

**БРЫГАДА ІМЯ ЦК КП(б)Б**

Створана ў сакавіку 1943 г. У верасні 1942 г. брыгадай «За Савецкую Беларусь» Віцебскай вобласці (пазней імя К.К.Ракасоўскага Вілейскай вобласці) у Вілейскую накіраваны атрад імя А.Я.Пархоменкі на чале з А.Д.Мядзведзевым. 9 кастрычніка 1942 г. атрад і асобныя групы П.Ф.Рудава і М.З.Умінскага, якія прыбылі ў Вілейскую вобласць па заданні ЦК КП(б)Б летам 1942 г., аб'яднаны ў групу атрадаў, што 20 кастрычніка рэарганізавана ў 1-ы батальён (камандзір Мядзведзеў Анатоль Данілавіч, камісары: Воранаў Фёдар Яфімавіч, Бондараў Ціхан Мікітавіч, начальнік штаба Цяста Ігнат Аляксандравіч).

Пры стварэнні батальёна атрад імя А.Я.Пархоменкі пераўтвораны ў 1-ю роту, групы П.Ф.Рудава — у 2-ю, М.З.Умінскага — у 3-ю. 26 кастрычніка ў склад батальёна уключана група А.І.Шаўчэнкі, што накіравана ў Вілейскую вобласць па заданні ЦК КП(б)Б летам 1942 г. Да 16 студзеня 1943 г. батальён падпарадкоўваўся брыгадзе «За Савецкую Беларусь», затым перададзены брыгадзе Ф.С.Шляхтунова (пазней імя Л.М.Даватара). 1-я рота батальёна ў брыгадзе Ф.С.Шляхтунова рэарганізавана ў 3-і атрад імя А.Я.Пархоменкі, з асабовага складу 2-й і 3-й рот створаны 4-ы атрад.



Партызаны брыгады імя ЦК КП(б)Б.



М.Р.Пучкароў.

16 сакавіка 1943 г. гэтыя атрады зноў аб'ядналіся ў самастойны батальён. 4-ы атрад быў расфарміраваны: групы П.Ф.Рудава, М.З.Умінскага, А.І.Шаўчэнкі пачалі дзейнічаць самастойна. Адначасова з часткі асабовага складу атрада імя А.Я.Пархоменкі сфарміраваны 2-і атрад (пазней імя В.П.Чкалава), у маі 1943 г. — 3-і (пазней імя Г.К.Жукава), у чэрвені — 4-ы атрад, які ў верасні 1943 г. перададзены брыгадзе імя К.К.Ракасоўскага. У чэрвені 1943 г. батальён перайменаваны ў брыгаду А.Д.Мядзведзева.

У жніўні 1943 г. у яе склад уключаны 5-ы атрад М.З.Умінскага, у сакавіку 1944 г. сфарміраваны 4-ы атрад імя Дз.А.Фурманава. У лютым 1944 г. брыгадзе А.Д.Мядзведзева прысвоена імя ЦК КП(б)Б.

Брыгада дзейнічала ў Пліскім, Докшыцкім, Глыбоцкім, Астравецкім раёнах Вілейскай і Ушацкім Віцебскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай арміі 6 ліпеня 1944 г. у складзе 5 атрадаў агульнай колькасцю 338 партызан. З іх: мужчын — 304, жанчын — 34, беларусаў — 242, рускіх — 51, украінцаў — 18, іншых нацыянальнасцей — 27, членаў ВКП(б) — 9, кандыдатаў — 28, членаў ВЛКСМ — 96, беспартыйных — 205. Камандзіры брыгады: Мядзведзеў Анатоль Данілавіч (сакавік 1943 — чэрвень 1944), Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (верасень 1943 — кастрычнік 1943), Фёдараў Мікалай Іванавіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); камісары: Бондараў Ціхан Мікітавіч (сакавік 1943 — чэрвень 1943), Воранаў Фёдар Яфімавіч (чэрвень 1943 — верасень 1943), Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (верасень 1943 — чэрвень 1944), Шчуцкі Уладзімір Пятровіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); начальнік штаба Цяста Ігнат Аляксандравіч (сакавік 1943 — чэрвень 1943).

## Партызанскія камандзіры — Героі Савецкага Саюза

**ДАНУКАЛАЎ Аляксей Фёдаравіч,** нарадзіўся 29.2.1916 г. у с. Новарасляеўка Дзергачоўскага раёна Саратаўскай вобласці. Закончыў Балашоўскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1936), Іркуцкае ваеннае вучылішча (1941). У Чырвонай арміі з 1937 г. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік абароны гарадоў Лепель, Орша, Смаленск. У жніўні 1941 г. трапіў у акружэнне, арганізаваў партызанскі атрад «Радзіма» (пазней атрад А.Ф.Данукалава), які дзейнічаў у Смаленскай, Віцебскай і Вілейскай абласцях. У красавіку 1942 г. атрад рэарганізаваны ў партызанскую брыгаду «Аляксея» (партызанскі псеўданім А.Ф.Данукалава). Загінуў 27.4.1944 г. у час блакады брыгады нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Брыгада перайменавана ў імя А.Ф.Данукалава. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.8.1944 г. пасмяротна. Пахаваны ў г. Лепель Віцебскай вобласці.



А.Ф.Данукалаў.



Ф.Ф.Дуброўскі.

**ДУБРОЎСКІ Фёдар Фаміч,** нарадзіўся 17.4.1901 г. у в. Замошша Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Генерал-маёр (1943). Закончыў Вышэйшую цэнтральную калгасную школу (1932). У 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію. Удзельнік грамадзянскай вайны на Заходнім фронце. З 1929 г. старшыня калгаса, сельсавета, дырэктар МТС у Віцебскай вобласці. Удзельнік вызвалення Заходняй

Беларусі ў 1939, савецка-фінляндскай вайны ў 1939—1940. У Вялікую Айчынную вайну арганізатар падполля ў Віцебскай вобласці, камандзір Чашніцкай партызанскай брыгады «Дубава». Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 16.9.1943 г. З 1944 г. працаваў сакратаром Чашніцкага РК КП(б)Б Віцебскай вобласці, дырэктарам саўгасаў імя У.І.Леніна, «Новыя Зелянкі». Памёр 3.3.1970 г.

**ЛАБАНОК Уладзімір Елісеевіч,** нарадзіўся 3.7.1907 г. у в. Востраў Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1931), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1956). У 1931—1940 гг. працаваў аграномам-эканамістам, дырэктарам Беліцкага, Смалянскага сельскагаспадарчых тэхнікумаў, 1-м сакратаром Лепельскага РК КП(б)Б. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Віцебшчыне: 1-ы сакратар Лепельскага падпольнага РК КП(б)Б, камандзір партызанскага атрада № 68, камісар партызанскай брыгады «Дубава», камандзір Лепельскай партызанскай брыгады імя І.В.Сталіна, кіраўнік аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і ЦШПР па Полацка-Лепельскай партызанскай зоне. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 16.9.1943 г. Пасля вайны — намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б, старшыня Полацкага і Гомельскага аблвыканкомаў, 1-ы сакратар Палескага і Віцебскага абкомаў КПБ, 1-ы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, міністр вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў БССР, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Член Бюро ЦК КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 2—9-га скліканняў, намеснік Старшыні Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 3-га, 6—8-га скліканняў. Памёр 4.11.1984 г.

**РАМАНАЎ Павел Мінаевіч,** нарадзіўся ў 1905 г. у г. Чыта. З 1931 г. на партыйнай і савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. З мая 1942 г. 2-і сакратар Суражскага, з верасня 1-ы сакратар Бешанковіцкага падпольных РК КП(б)Б. З 8.10.1942 г. адначасова камандзір партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь».


П.М.Раманаў.


І.М.Цімчук.

Загінуў у баях з карнікамі ў маі 1944 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.8.1944 г. пасмяротна.

**ЦІМЧУК Іван Мацвеевіч,** нарадзіўся 14.2.1901 г. у с. Грушка Тлумацкага раёна Івана-Франкоўскай вобласці. Закончыў Харкаўскі камуністычны універсітэт (1929), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1956). У Чырвонай арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Да Вялікай


У.Е.Лабанок.

Айчыннай вайны на гаспадарчай рабоце. У Айчынную вайну адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай, Вілейскай і Віцебскай абласцях: камісар партызанскага атрада «Мсцівец», сакратар Лагойскага падпольнага РК КП(б)Б, камісар, потым камандзір 1-й Антыфашысцкай партызанскай брыгады. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 1.1.1944 г. У 1960 — 1968 гг. старшыня Дзяржкамітэта СМ БССР па ахове прыроды. Памёр 16.10.1982 г.

## Партызанскія камандзіры

**ГАРБАЦЕНКАЎ Максім Трыфанавіч,** нарадзіўся ў в. Вялікія Хутары Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці. Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1958). З 1933 г. на савецкай рабоце. У партызанах з лютага 1942 г.: камандзір дыверсійнага атрада, камісар, камандзір партызанскай брыгады імя У.І.Леніна, адначасова член, сакратар Докшыцкага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на партыйнай і савецкай рабоце. Памёр 13.3.1981 г.

**ГІЛЬ-РАДЗІЁНАЎ Уладзімір Уладзіміравіч,** нарадзіўся 18.7.1906 г. у в. Дараганава Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1939 г. закончыў Ваенную акадэмію імя М.В.Фрунзе. У 1941 г. на фронце, начальнік штаба 229-й стралковай дывізіі, паранены трапіў у палон. З 1942 г. па 15.8.1943 г. камандзір дружыны, палка, брыгады «Рускай нацыянальнай народнай арміі», створанай нямецка-фашысцкімі захопнікамі з ліку ваеннапалонных. Падрыхтаваў і арганізаваў пераход 16.8.1943 г. гэтага фарміравання ў поўным складзе на бок партызан. Фарміраванне атрымала назву 1-й Антыфашысцкай партызанскай брыгады і адразу ўключылася ў баі з гітлераўцамі. 16.9.1943 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, прысвоена воінскае званне палкоўніка. Быў цяжка паранены і 14.5.1944 г. памёр.

**КУКСЁНАК Іван Архіпавіч,** нарадзіўся 23.10.1917 г. у в. Шчамілаўка Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1948). Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939 — 1940 гг. У 1938 — 1942 гг. у Чырвонай арміі. У партызанах з кастрычніка 1942 г.: камандзір атрада, партызанскай брыгады імя ВЛКСМ. З 1944 г. на партыйнай і адміністрацыйнай рабоце.

**МЕЛЬНІКАЎ Уладзімір Васільевіч,** нарадзіўся ў г. Кунгур Пермскай вобласці. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б) (1952). У 1931 — 1941 гг. у Чырвонай арміі. З 1942 г. адзін з кіраўнікоў партызанскага руху: камандзір групы, атрада, партызанскай брыгады імя В.І.Чапаева, адначасова член Ушацкага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на партыйнай рабоце ў Брэсце і Пінску. Памёр 2.1.1961 г.

**МЯДЗВЕДЗЕЎ Анатоль Данілавіч,** нарадзіўся 4.3.1907 г. у в. Цюмінёўка Балашоўскага раёна Саратаўскай вобласці. Закончыў Варонежскі хіміка-тэхналагічны інстытут (1934). Працаваў у харчовай прамысловасці. Са снежня 1941 г. на Калінінскім фронце. У партызанах з красавіка 1942 г.: камандзір групы, роты, начальнік штаба Асвейскай партызанскай брыгады імя М.В.Фрунзе, камандзір атра-



М.Т.Гарбаценкаў.



У.У.Гіль-Радзіёнаў.



І.А.Куксёнак.



У.В.Мельнікаў.

да, батальёна, партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б, адначасова член Докшыцкага падпольнага РК КП(б)Б. У 1945—1974 гг. працаваў у сістэме прамысловага будаўніцтва. Памёр 6.4.1980 г.

**РАМАНАЎ Аляксандр Васільевіч,** нарадзіўся 25.6.1918 г. у в. Максакава Чарапавецкага раёна Валагодскай вобласці. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1956). З чэрвеня 1941 г. на Паўднёвым фронце. З кастрычніка 1941 г. у партызанах: камандзір узвода, камісар 17-га партызанскага атрада асобага прызначэння, камісар, камандзір партызанскай брыгады імя К.К.Ракасоўскага, адначасова член Дунілавіцкага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на партыйнай і савецкай рабоце. Памёр у 1995 г.

**САДЧЫКАЎ Іван Фёдаравіч,** нарадзіўся 18.3.1909 г. у г.п. Ніжні Чыр Суравікінскага раёна Валгаградскай вобласці. З 1930 г. у Чырвонай арміі. З чэрвеня 1941 г. на фронце. З мая 1942 г. адзін з кіраўнікоў партызанскага руху: камандзір групы, Смаленскага партызанскага палка. У 1945—1946 г. намеснік міністра лёгкай прамысловасці БССР, затым у органах дзяржбяспекі, на гаспадарчай рабоце ў Мінску. Памёр 30.5.1978 г.

**САКМАРКІН Мікалай Аляксандравіч,** нарадзіўся 1.8.1912 г. у с. Ілек Арэнбургскай вобласці. З 1930 г. на гаспадарчай рабоце. З чэрвеня 1941 г. на фронце. З красавіка 1942 г. адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці: камандзір групы, атрада, намеснік камандзіра брыгады імя С.М.Кароткіна, камандзір партызанскай брыгады імя У.І.Леніна, адначасова член Сіроцінскага падпольнага РК КП(б)Б. Да 1967 г. на савецкай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце на Віцебшчыне.

**ТАЛАКВАДЗЕ Уладзімір Мануілавіч,** нарадзіўся 5.2.1914 г. у с. Мтыспіры Махарадзеўскага раёна, Грузія. У Чырвонай арміі з 1933 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941 г. на фронце. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці: камандзір групы, атрада «Грозны», партызанскай брыгады імя С.М.Кароткіна. Да 1957 г. у Савецкай арміі. З 1958 г. на гаспадарчай рабоце.

**УТКІН Мікалай Васільевіч,** нарадзіўся 29.12.1918 г. у в. Міранегі Валдайскага раёна Наўгародскай вобласці. Закончыў



А.Д.Мядзведзеў.



А.В.Раманаў.



І.Ф.Садчыкаў.



М.А.Сакмаркін.



У.М.Талаквадзе.



М.В.Уткін.

Маскоўскі універсітэт (1966). З чэрвеня 1941 г. на фронце. З мая 1942 г. камандзір партызанскага ўзвода, з чэрвеня 1942 г. начальнік штаба, камандзір 2-й Ушацкай партызанскай брыгады імя П.К.Панамарэнкі. З 1944 г. на савецкай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Памёр 13.7.1978 г.

**ХОМЧАНКА Пётр Антонавіч,** нарадзіўся 8.7.1906 г. у в. Міклашы Віцебскага раёна. Закончыў Аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР (1930),



П.А.Хомчанка.



Дз.В.Цябут.



І.Р.Шлапакоў.



Ф.К.Юрчанка.

Інтэнданцкую акадэмію Чырвонай арміі (1941). У Чырвонай арміі з 1927 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Айчынную вайну ўдзельнік баёў пад Ленінградам. У партызанах з чэрвеня 1942 г.: камандзір аддзялення, начальнік штаба, камандзір партызанскай брыгады імя С.М.Кароткіна, затым партызанскай брыгады 1-й імя А.В.Суворава. З 1944 г. на савецкай і гаспадарчай рабоце. Памёр 31.5.1973 г.

**ЦЯБУТ Дзмітрый Васільевіч,** нарадзіўся 6.11.1914 г. у в. Пуканаўка Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1962). З 1932 г. на педагагічнай, партыйнай і савецкай рабоце ў Полацкім і Ветрынскім раёнах. З верасня 1941 г. у Чырвонай арміі. З чэрвеня 1942 г. адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці: камандзір атрада, партызанскай брыгады імя К.Я.Варашылава, адначасова з верасня 1942 г. сакратар, 2-і сакратар Ветрынскага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. 1-ы сакратар Ветрынскага РК КП(б)Б. З 1950 г. сакратар, 2-і, 1-ы сакратар Полацкага, 2-і сакратар Віцебскага абкомаў КПБ. З 1961 г. намеснік міністра, міністр нарыхтовак БССР. З 1962 г. 1-ы сакратар Мінскага (сельскага) абкома КПБ. У 1964—1975 гг. старшыня Мінскага аблвыканкома. Член ЦК КПБ у 1952—1961 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1966—1974 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1967 гг. Памёр у 1987 г.

**ШЛАПАКОЎ Іван Раманавіч,** нарадзіўся 2.5.1909 г. у с. Самсоны Краснінскага раёна Смаленскай вобласці. З 1929 г. на гаспадарчай і камсамольскай рабоце. З ліпеня 1941 г. на фронце. Са жніўня 1941 г. адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці: камандзір атрада, 16-й Смаленскай партызанскай брыгады. Да 1958 г. у Савецкай арміі.

**ЮРЧАНКА Фёдар Кірылавіч,** нарадзіўся 13.9.1913 г. у в. Прудок Веліжскага раёна Смаленскай вобласці. Закончыў педтэхнікум. З верасня 1931 г. па люты 1934 г. загадчык пачатковай школы. У 1934—1935 гг. у Чырвонай арміі, у 1938—1941 гг. школьны інспектар, загадчык Усвяцкага райана. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны: камандзір партызанскага атрада № 7, які дзейнічаў ва Усвяцкім раёне, 2-і сакратар Усвяцкага падпольнага РК ВКП(б), камандзір партызанскага атрада і брыгады, якія дзейнічалі на Вілейшчыне, 1-ы сакратар Плісказа падпольнага РК КП(б)Б. Кантужаны трапіў у палон. Быў вызвалены Чырвонай арміяй. У 1945—1976 гг. загадчык Шаркаўшчынскага райана, дырэктар дзіцячага дома імя К.С.Заслонава, спецшколы-інтэрната.

## Дакументы сведчаць

### З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ БРЫГАДЭНФЮРЭРА СС І ГЕНЕРАЛ-МАЁРА ПАЛІЦЫІ ГОТБЕРГА АБ ПРАВЯДЗЕННІ КАРНАЙ АПЕРАЦЫІ «КОТБУС» СУПРАЦЬ ПАРТЫЗАН ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЙ ЗОНЫ

**28 чэрвеня 1943 г.**

Захват людей и скота часто был связан с трудностями, связанными с тем, что затребованные компетентные команды прибывали с опозданием и во многих случаях требовали

усиленной охраны, выделить которую не всегда имелась возможность из-за отсутствия необходимых сил.

Следует направлять в реквизиционные команды более смелых и решительных командиров.

Минирование противником шоссейных и грунтовых дорог вызывает необходимость изыскания дополнительных способов разминирования.

В этом отношении хорошо зарекомендовал себя метод, примененный особым батальоном Дирливангера, заключающийся в разминировании мин путем использования мирного местного населения, которое гонят по заминированным дорогам. Практика показывает, что всякое гуманное отношение к населению в ходе операций излишне и должно быть исключено. В ходе проведения операции «Котбус» мы неоднократно убедились в том, что местное население, в том числе женщины и дети, вновь минировало дороги в тылу наших войск.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 937. Л. 71.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

## РАСПАРАДЖЭННІ АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ ЦК КП(б)Б І БШПР ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗОНЫ ПА БАРАЦЬБЕ З КАРНІКАМІ

**Снежань 1943 г.**

Командирам бригад

Партизанские бригады развернули серьезную подготовку к защите Ушачского партизанского района. Для обороны призывают местное население путем широкой разъяснительной политической работы среди них. Движение за то, чтобы не допустить в границы нашей обороны фашистских злодеев и их прихвостней — предателей-каминцев растет с каждым днем.

В отряды прибывают старики и женщины, предлагающие себя для защиты района, для строительства укреплений, для обслуживания раненых и нужд бойцов, заявляя, что в предстоящих боях каждому найдется работа.

Учитывая, что народное движение, партизанские бригады тт. Романова, Уткина, Талаквадзе и другие проводят большую работу с невооруженным резервом и для вооружения их изготовляют холодное оружие: кинжалы, пики, шашки, финки, а также собирают ломы, топоры и лопаты для обеспечения рабочих команд.

Рекомендуем:

1. Невооруженный резерв вооружить холодным оружием (финки, кинжалы, шашки и пики) и организовать их обучение. Наиболее подготовленные группы ввести в боевые подразделения для пополнения потерь в бою, остальной состав резерва использовать для связи, эвакуации раненых и обслуживания хознужд бойцов.

2. В каждом населенном пункте нашей зоны создать из местных жителей боевые дружины и вооружить холодным оружием вплоть до топоров. Командование этими группами возложить на местный актив при постоянном руководстве командиров и комиссаров самообороны, добиться защиты населенных пунктов, расположенных в тылу обороны, силами самого населения и предупредить попытки врага внезапно проникнуть в глубину нашей обороны. Для этого надо силами обороны организовать круглосуточное патрулирование и наблюдение за местностью и воздухом.

3. Из остального трудоспособного местного населения создать рабочие команды, закрепив за каждой необходимый инструмент (лопаты, ломы, пилы и топоры) для разрушения дорог и их восстановления при подходе в наш район частей Красной Армии.

Руководство этими отрядами возложить на местные партизанские отряды (по указанию командиров и комиссаров бригады).

Одновременно предупреждаем, что эти мероприятия могут быть успешно реализованы при широко организованной политической разъяснительной работе.

**29 снежня 1943 г.**

т. Хомченко

В ночь на 1 января в районе необходимо Вам провести своими силами мелкие операции по срыву ж.-д. перевозок противника и движения автогужевого транспорта, а также поимки языков — сковывающими налетами на отдельные гарнизоны противника. Подоб-

ные операции следует провести с максимальной экономией людей и боеприпасов. Одновременно предупреждаем о необходимости усиления в новогоднюю ночь боевой готовности всех отрядов и мер охранения и разведки.

**29 снежня 1943 г.**

тов. Тябуту и тов. Лемзе

Наша авиация будет продолжать производить выброску грузов днем и ночью не только на площадки, но и в районы расположения наших бригад. В связи с этим предлагаем:

1. Организовать круглосуточное наблюдение за воздухом.

2. При выброске грузов организовать поиски таковых и о их численности немедленно сообщать в опергруппу.

3. Использование выброшенных грузов производить строго только по указанию опергруппы.

**31 снежня 1943 г.**

В нашем районе есть неизвестные группы, занимающиеся под видом партизан грабежом и мародерством.

Немцы усилили засылку шпионов и диверсантов в наш район.

В связи с этим под Вашу личную ответственность предлагаем:

1. Установить строгий контроль и проверку подозрительных лиц и отдельных групп, продвигающихся или находящихся в тылу нашего района.

2. Установить строгий инструктаж часовых и секретов, выставленных Вами в расположении отрядов и на входных путях в деревни.

3. Лиц, уличенных в бандитизме, мародерстве или не имеющих соответствующих пропусков, задерживать до выяснения их личности.

Виновных привлекать к строжайшей ответственности. О всех подобных фактах доносить в опергруппу.

**6 студзеня 1944 г.**

Комбригу тов. Алексею

Числа 10—12 нами намечается провести собрание всех военнопленных, добровольно пришедших к нам, нерусских национальностей — немцев, французов, чехов, словаков и других с целью привлечь их к борьбе с германским фашизмом и выпуска обращения от их имени. Вам необходимо прислать подробные справки на всех лиц такой категории, с указанием Ф.И.О., места рождения, домашний адрес и состав семьи, род войск и № воинской части, в которой ранее служил, время взятия в плен или перехода к партизанам, краткую характеристику, где указать их боевые качества и отдельные эпизоды борьбы с немцами. Одновременно оговорите работу среди них в направлении составления обращений к немецким солдатам, разоблачающих грабительский характер войны Гитлера и справедливой войны Советского Союза. В обращениях показать действительное лицо партизан как народных мстителей, борющихся за свою независимость...

**13 студзеня 1944 г.**

тов. Тябуту

1. Отдельные агентурные источники сообщают, что в бригаде Каминского ведется подготовка на наш партизанский район и якобы наступление должно начаться в ближайшие дни с направлений Камень — Лепель, Полоцк, Улла. Следует ожидать, что противник с целью отвлечения наших сил будет наносить сковывающие удары и в других направлениях.

2. С целью срыва замыслов противника в ближайшие дни будет нами предпринята наступательная операция. Ваша задача подготовить засады на дорогах и небольшими силами провести наступательную операцию на один из гарнизонов или участок дороги (по Вашему усмотрению, сохраняя живую силу и экономя боеприпасы) с целью отвлечения сил противника и демонстрации наступления Вашего соединения на участки. Операцию готовьте в строгой тайне. Проведение этой операции ориентировочно с 16 на 17 января по сигналу «Выезжайте к нам за получением подарков (час будет указан)» . Это будет пере-

дано по телефону и указанный час будет началом операции. Вас предупредим об этом за сутки.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 17. Л. 208, 294, 298, 303, 316; Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 597. Л. 32—33.*

## З ДАНЯСЕННЯЎ КАМАНДЗІРАЎ ПАРТЫЗАНСКІХ БРЫГАД У ШТАБ АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ ЦК КП(б)Б І БШПР ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЙ ЗОНЫ АБ БАЯХ З КАРНІКАМІ

ЛЕПЕЛЬСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ І.В.СТАЛІНА

**15 снежня 1943 г.**

По приказу полковника Родионова 13.12.1943 г. намеченная операция в 24.00 бригаде Лобанка занять д. Путилковичи была выполнена.

По приказанию полковника Лобанка два отряда были высланы в район д. Отрубок для прикрытия направления Берисполье — Березино. Отряды вышли в 15.00 14.12.43

3 отряда находятся в районе Путилковичи — Антуново — Логи.

Производим оборонительные работы по согласованности и указаниям полковника Родионова.

Один отряд выслан в район Волова Гора в 10.00 15.12.43

Рация, предназначенная для бригады Дубровского, также выслана.

В направлении Отрубок — Черница II 2 отряда бригады Лобанка завязали бой (с 12.00 15.12.43).

Данные от 5 отрядов бригады «Железняк» высылаем.

Ждем дальнейших указаний.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ С.М.КАРОТКІНА

**22 снежня 1943 г.**

Противник отброшен из района высоты 169,1 на 2 километра северо-восточнее Березино. Понес большие потери, вынужден был отойти в Березино. Отряды занимают прежние рубежи сопротивления. Отряд Родионова пока находится в резерве.

Талаквадзе

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ ВЛКСМ

**13 студзеня 1944 г.**

Немцы за последнее время ежедневно стали проводить разведку передовой линии нашей обороны группами по 200—300 человек. Ежедневно подходят к нашим укреплениям. Отряды вынуждены ежедневно держать бои с противником и отбивать его попытки. Исходя из расходования боеприпасов прошу на отряды бригады им. ВЛКСМ выдать русских патронов 6000 шт., патронов ППШ — 4000 шт. В ночь с 6 на 7 января 1944 г. п/отрядом «Сибиряк» на ж.-д. Полоцк — Крулевщизна в районе между Прозороками и Киселево спущен ж.-д. воинский эшелон противника. В результате взрыва разбито: паровоз, шесть вагонов с боеприпасами и три вагона повреждено.

В ночь с 12 на 13 января 1944 г. п/отрядом «Ким» на ж.д. Полоцк — Крулевщизна в районе переезда Хвощево спущен ж.-д. воинский эшелон противника. Эшелон после взрыва горел три часа. Результаты взрыва уточняются. Сообщу дополнительно.

С 28 декабря 1943 г. по 13 января 1944 г. отрядами бригады им. ВЛКСМ спущено 5 железнодорожных воинских эшелонов.

Командир бригады ст. лейтенант Куксенок

1-я АНТЫФАШЫСЦКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

**18 студзеня 1944 г.**

17.1.44 г. противник занимал гарнизоны м. Березино силою до 400 чел., мост через р. Березино силой до 60 чел. и мост через р. Мусковица силою до 120 чел.

Бригада в 2.00 17.1.44 г., усиленная 1 отрядом бригады Медведева и имея в резерве 1 отряд бригады Ленина, атаковала гарнизоны м. Березино и мостов через р. Березино и р.

Мусковица. Бой длился в течение 6 часов. Противник штурмовыми группами и группами автоматчиков на отдельных участках трижды совершал вылазки с целью контратаковать отдельные отряды бригады, но с потерями возвращался в свои укрепления.

К 8.00 овладеть гарнизоном м. Березино и мостами не удалось.

В результате боя уничтожено 2 дзота противника — 1 у.р. Мусковица и 1 в 1 км западнее Березино. Уничтожен 1 мост через перекоп длиной 8 м. Противник потерял убитыми и ранеными свыше 80 человек.

Трофеи: 2 нем. винтовки.

Потери бригады: убитыми 3, ранеными 11.

Боец 3 отряда Ананичев, будучи посланным связным в штаб, был захвачен в плен группой власовцев (преимущественно армяне и азербайджанцы), обезоружен, раздет, но при начавшейся в это время атаке нашего отряда ему удалось бежать.

В 17.00 14.1.44 г. противник силою до 2 рот появился перед передним краем обороны 5-го отряда в направлении дороги м. Березино — Осовок. Был подпущен до 100—150 м, встреченный ураганным огнем 1-й роты 5-го отряда, залег и вступил в бой. Бой длился в течение 40 минут и в результате противник, имея свыше 30 человек убитыми и ранеными, отошел в м. Березино.

Командир бригады Родионов.

ЛЕПЕЛЬСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ І.В.СТАЛІНА

**Студзень 1944 г.**

На операции с 16 на 17 января 1944 г. бригадой проделано:

1. Нашей бригаде было приказано взять гарнизоны м. Пышно, Закаливье*, Красной Горки. В ходе наступления на м. Пышно в целом было взято 2 дзота, которые уничтожил 9-й отряд. Вся охрана м. Пышно отошла в замурованное здание (быв. школа), которое обнесено проволочным заграждением в три кола, стены школы замурованы и сделана бойница для обстрела.

Противник вел сильный огонь из трех станковых пулеметов и двух крупнокалиберных пулеметов и с двух минометов. Здание нами было окружено, но взять не удалось, в виду сильного огня противника.

Гарнизон Закаливье был взят, противник отошел на оборону в д. Красная Горка, куда наши вели наступление. В ходе наступления противник был выбит из 2-х дзотов, но взять Красную Горку не удалось нам, так как противник был крепко укреплен и вел сильный ружейно-пулеметный и минометный огонь.

Высота 182,4 была занята 1-м отрядом. К утру противник повел наступление из м. Пышно и Лепеля, 1-й отряд принял бой. В результате которого было подбито 3 вражеские автомашины, одна из них легковая. Убито и ранено 15 вражеских солдат и офицеров.

Всего за эти бои бригадой убито 16 немецких солдат и офицеров, ранено 25, уничтожено 4 дзота, подбито и выведено из строя 3 автомашины. Наши потери: 6 человек раненых…

Комбриг ст. лейтенант Короленко

Комиссар капитан Ярмош

Нач. штаба бригады лейтенант Атрашкевич

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 17. Л. 198, 322, 330, 352—355, 364.*

**З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК РАЗВЕДАДДЗЕЛА ПРЫ ШТАБЕ НЯМЕЦКАЙ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАН**

**22 лютага 1944 г.**

На территории 3-й танковой армии отмечается нарастающая активность банд в районе деревени Камень. Неоднократные бои с бандитами и обстрелы ими наших опорных пунктов на дороге западнее Камень — Улла.

* Маецца на ўвазе в. Загаваліна.

**23 лютага 1944 г.**

На территории 3-й танковой армии в районе Камень — Улла происходит дальнейшая активизация банд, бои и нападения на наши опорные пункты.

**24 лютага 1944 г.**

1. Произошло 7 вооруженных столкновений с бандитами, в основном южнее Ушачи
2. Одно повреждение линии связи юго-западнее Пышно.
3. Дер. Сладневичи и Заглинники, район юго-восточнее Лепеля, снова заняты бандитами. Отсюда они проникают на север и действуют на дороге Лепель — Чашники.

**25 лютага 1944 г.**

1. Произошло 5 вооруженных столкновений с бандитами при этом: а) 22.2.44 г. нападение 200 — 300 бандитов, вооруженных минометом, станковым пулеметом и противотанковым ружьем на опорный пункт Лука. Забрали 52 лошади.

**28 лютага 1944 г.**

1. Произошло 3 вооруженных столкновения с бандитами.
2. 2 мины обезврежены, в том числе на дороге Бешенковичи — Улла. Совершена 1 минная диверсия на магистральном шоссе.
3. Повреждена линия связи юго-западнее Пышно.
4. По полученным данным Смоленский полк 6 — 7 недель тому назад отправился для усиления бригады Романова... Располагается якобы в районе севернее Ушачи.

**29 лютага 1944 г.**

1. Произошло 7 вооруженных столкновений с бандитами в ходе собственной разведки южнее Сенно и севернее дер. Камень. В ночь на 28.2.44 г. примерно 100 бандитов предприняли нападение на опорный пункт полиции службы порядка Крыльцево (3,5 км юго-западнее Сенно).
2. 2 повреждения линий связи, 1 подрыв на линии юго-восточнее Уллы (дорога Улла — Бешенковичи).
3. По данным своей разведки цепь высот (гряда холмов) юго-западнее дер. Урода, район севернее дер. Камень, на протяжении 3 км сильно укреплена.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1065. Л. 123, 127, 132, 138, 153, 161.*

## Нарада камандзіраў

### З успамінаў А.Ф.Бардадына, былога намесніка кіраўніка аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і БШПР у Полацка-Лепельскай партызанскай зоне

Лістапад (1943 г. — *Рэд.*) застаў мяне ўжо ва Ушацкім раёне. На беразе возера Чарсцвядскае правялі першую нараду камандзіраў усіх партызанскіх брыгад. Кожнай з іх быў вызначаны раён дзеяннаў, пастаўлены задачы.

У наша злучэнне ўваходзіла 15 партызанскіх брыгад і адзін партызанскі полк — 18 тысяч партызан.

Камандаваў злучэннем Герой Савецкага Саюза У.Е.Лабанок. Партызаны ўтрымлівалі не толькі бераг Заходняй Дзвіны на ўчастку Полацк — Ула працягласцю каля 30 кіламетраў, але і сістэму азёр, якія ўтваралі вялікі водны рубеж: азёры Гомель, Янова, Павульскае, Бярозавае, Атолава, Лепельскае, Бярэзінскі канал. Праз нашу зону праходзілі шашэйныя дарогі Віцебск — Мінск, Віцебск — Лепель — Параф'янава. Праціўнік вымушаны быў на працягу ўсяго шляху чыгункі Віцебск — Полацк — Маладзечна пабудаваць умацаванні, траншэі, дзоты, дротавыя агароджы, вышкі наглядання, мініраваць падыходы. Прыйшлося пастаянна трымаць буйныя сілы па ахове дарог. Гэты раён быў

важным плацдармам для наступаючых часцей Чырвонай арміі, а для нямецкіх войскаў таіў вялікую пагрозу...



А.Ф.Бардадын.

## Байцы ўспамінаюць мінулыя дні

### К.Д.Склярэнка, былы камісар атрада імя А.В.Суворава партызанскай брыгады імя В.І.Чапаева

Размяшчэнне нямецкіх гарнізонаў у вёсках Шаўкова і Шалягоўцы ўскладніла ўмовы для баявых дзеянняў партызан, асабліва для падрыўнікоў. Камандаванне брыгады паставіла задачу знішчыць іх. Гарнізон у Шалягоўцы павінны былі разграміць два атрады, якімі камандавалі А.Я.Конеў і я.

Прадстаяла складаная аперацыя. Немцы добра ўмацаваліся, пабудавалі шмат дзотаў, бліндажоў, мелі на ўзбраенні мінамёты і вялікую колькасць аўтаматычнай зброі. Разведка і мясцовыя жыхары выявілі агнявыя кропкі ў гарнізонах. Разведчыкам удалося захапіць «языка». Ён аказаўся ад'ютантам камандзіра батальёна і даў нам шмат каштоўных звестак. Вырашылі пачаць аперацыю па разгроме гарнізона ў ноч на 10 мая 1943 г. Былі выдзелены штурмавыя групы. Галоўная задача ўскладвалася на штурмавую групу, якую ўзначальваў я.

Апоўначы падраздзяленні атрада імкліва рушылі на штурм гарнізона і ўварваліся ў вёску. Гранатамі закідалі нямецкія дзоты, хаты, дзе размяшчаліся немцы. Ад нечаканага нападу і разгрому штаба немцы запанікавалі і не аказалі арганізаванага супраціўлення.

Большасць нямецкіх салдат была знішчана, частка з іх збегла ў Полацк, 32 чалавекі былі ўзяты ў палон, захоплены вялікія трафеі. У гэтым баі асабліва вызначыліся разведчыкі Сцяпан Стрэльчанка, Ягор Сінкевіч, Алена Сінкевіч і Раіса Міхальчанка, якая, на жаль, загінула.



У час нарады камандзіраў і камісараў партызанскіх брыгад Ушацкай зоны. Ушачы, снежань 1943 г.

## А.Я.Маслоўскі, былы палітрук 4-га атрада партызанскай брыгады «Дубава»

З 1 па 8 чэрвеня наш атрад нёс гарнізонную службу па абароне вёскі Пышна, якая была як для немцаў, так і для партызан важным стратэгічным пунктам. Наша рота, дзе камандзірам быў Мікалай Бераснёў, а палітруком я, займала абарону на канцы вуліцы, якая ішла ў напрамку вёскі Навасёлкі. Разам з намі знаходзіўся кулямётны разлік, у якім была і Надзя Касцючэнка. Камандзірам у іх быў ушачанін Аляксей Карабіцкі.

7 чэрвеня разведка паведаміла, што ў напрамку вёскі Пышна рухаюцца варожыя танкі. З боку ўрочышча Каменка ў напрамку могілак паказаўся лёгкі нямецкі танк. Ён быў падбіты разлікам ПТР І.Крыўца. У гэты ж час над нашымі пазіцыямі праляцеў фашысцкі самалёт і скінуў лістоўкі. Праз некалькі хвілін пачаўся артылерыйска-мінамётны абстрэл, які працягваўся звыш паўгадзіны. Затым наступіла зацішша. Потым на нас рушылі падраздзяленні паліцаяў і ўласаўцаў, апранутых у маскхалаты. Мы адкрылі агонь. Нас падтрымалі кулямётчыкі. Падняліся ў атаку і карнікі. Мы выстаялі. Фашысты, пакінуўшы на полі некалькі дзесяткаў забітых, адступілі.

Праз некаторы час фашысты зноў пайшлі ў атаку. Жорсткасць бою нарастала. Нямецкія танкі, мінуючы нас, рушылі па вуліцы. Утварылася пагроза акружэння.

Быў паранены Сямён Клопаў. Да яго хутка падпаўзла медсястра Ніна Флігоўская і пачала перавязваць. За кулямётам была Надзея Касцючэнка. Трапным агнём яна адсекла ад танка варожых аўтаматчыкаў і знішчыла іх. Замаўчаў кулямёт Аляксея Карабіцкага. Камандзір кулямётчыкаў, сабраўшы ўсе сілы, паспеў аддаць загад: «Ні кроку назад!». Надзея Касцючэнка і Ніна Флігоўская працягвалі стрымліваць націск фашыстаў. Аднак праз некалькі хвілін замоўк і іх кулямёт. Раптам прагрымеў выбух. Я паглядзеў у той бок і ўбачыў падбіты танк над акопам, дзе знаходзілася Надзя. Адважная дзяўчына кінулася пад гусеніцы танка са звязкай гранат. Цаной жыцця кулямётчыкі не прапусцілі варожыя танкі, сарвалі план карнікаў.

## Р.Калітуха, былы партызан брыгады «Дубава»

Разведка далажыла, што вораг напагатове і збіраецца раніцай пайсці ў наступленне. Мы вырашылі прыняць бой. На досвітку іх танкі і пяхота рушылі ў наш бок. Партызаны адкрылі агонь. Фашысты заляглі, а танкі працягвалі рухацца наперад. Я падпусціў першы метраў на 200 і выстраліў. Ён задыміў. Другі знарок пусціў завесу і пад яе прыкрыццём павярнуў назад. Праз паўгадзіны немцы адкрылі моцны мінамётны агонь і пачалі абыходзіць нас з двух бакоў. Мы пакінулі пазіцыю і рушылі да вёскі Забор'е, дзе было месца нашага збору пасля баёў.

Неўзабаве ў небе з'явіўся нямецкі самалёт-разведчык — «рама». Я ўзяў




Адкрыццё помніка Надзеі Касцючэнка ў в. Арэхаўна. 1978 г.



І.Ф.Аб'едкаў.

процітанкавае ружжо, залез на верх царквы і стаў чакаць зручнага моманту. Вось самалёт развярнуўся і нізка паляцеў прама на мяне. Я нават добра бачыў твар лётчыка. Калі самалёт параўняўся з царквой, націснуў на курок. Самалёт уздрыгнуў, захістаўся і ўпаў на зямлю.

### С.Т.Клопаў, былы партызан брыгады імя П.К.Панамарэнкі

Калі пачалася вайна, мне было ўсяго 15 гадоў. На фронт не бралі, а змагацца з ворагам хацелася. У 1942 г. наш раён стаў партызанскім. Людзі абаранялі сваю зямлю. Партызаны набіралі падмогу. Зімой у Вялікіх Дольцах запісвалі добраахвотнікаў. Я папрасіўся ў атрад. Збылася мая мара — я стаў народным мсціўцам.

Пры штабе брыгады імя П.К.Панамарэнкі арганізоўваўся атрад з маладога папаўнення. Туды мяне і залічылі. Давялося абараняць штаб брыгады ў раёне льнозавода ва Ушачах. Пабываў і ў блакадным пекле. З групай партызан прабіраўся да сваіх. Вакол былі карнікі. Ратаваліся ў лесе. Галадалі. Аднойчы рушыў на галасы. Аказалася, што гэта былі мужыкі з суседняй вёскі. Праз іх вызваў сястру. Яна вельмі нам дапамагла.

## Партызанскі Матросаў

Варожы гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы Бачэйкава, меў важнае стратэгічнае значэнне: ахоўваў шашу і мост цераз раку Ула, вёў барацьбу з партызанамі. Камандаванне партызанскай брыгады імя П.К.Панамарэнкі вырашыла разграміць яго. Група разведчыкаў на чале з начальнікам штаба атрада «Камсамольскі» Юрыем Галоўчанкам сабрала звесткі аб гарнізоне. У ім налічвалася 420 нямецкіх салдат і афіцэраў, паліцэйскіх. На іх узбраенні былі 2 гарматы, 5 мінамётаў. Гарнізон быў умацаваны дзотамі, дотамі, акопамі, бліндажамі.

У ноч з 23 на 24 ліпеня 1943 г. партызанскія атрады І.Ф.Аб'едкава, П.В.Кундалевіча і «Камсамольскі», якім у той час камандаваў А.Ц.Круглякоў, занялі зыходныя рубяжы. Ціха знялі вартавых і кінуліся ў атаку. Гітлераўцы аказалі моцнае супраціўленне. З'явіліся сярод партызан параненыя і забітыя. Руху наперад перашкаджаў кулямётны агонь з дота, які знаходзіўся каля школы. Юрый Галоўчанка з процітанкавай гранатай пад агнём папоўз да дота і кінуў яе ў амбразуру. Цаной свайго жыцця ён прымусіў варожы кулямёт замоўкнуць. Партызаны кінуліся ў атаку. Чатыры гадзіны ішоў бой. Партызаны разбілі гарнізон, забілі і паранілі пры гэтым больш за 70 варожых салдат і афіцэраў, падавілі шэсць агнявых кропак, знішчылі бензасклад, аўтарамонтную майстэрню, склад з боепрыпасамі, захапілі тры склады з прадуктамі харчавання, маслазавод, жывёлагадоўчую базу, дзе знаходзілася больш за 400 галоў жывёлы, і многае іншае.

*П.М.Карпоўскі.*

## Сталымі рабіла вайна

Пятнаццацігадовы Захар Касяк стаў партызанам у чэрвені 1943 г. Гітлераўцы збіраліся адправіць моладзь вёскі Старынка ў Германію. З дапамогай сувязных юнакі і дзяўчаты пакінулі вёску і пайшлі ў партызанскую зону. Вучыліся страляць, хадзілі на баявыя аперацыі. Памятнымі былі баі па разгроме варожых гарнізонаў, асабліва ў вёсцы Бабча. У гэтым баі З.Касяк захапіў багатыя трафеі: два аўтаматы, вінтоўку, чатыры карабіны. Пад іх цяжарам ён ледзь дагнаў сваіх таварышаў, што адыходзілі да лесу. На наступны дзень перад строем атрымаў падзяку камандавання.

*В.В.Караленка.*

* * *

Партызанамі атрада «Смерць фашызму» былі Сцяпан Львоў і Толя Красінскі. Падлеткі прыйшлі да партызан з чатырма вінтоўкамі і гранатамі. Хадзілі ў разведку, удзельнічалі ў засадах. Асабліва цяжкі боў ішоў на дарозе Глыбачка — Усвіца. У гэтым баі загінуў С.Львоў.

*С.Законнікаў.*

# Прарыў у бессмяротнасць

Вясна 1944 г. стала новым выпрабаваннем для партызан. Да меж партызанскай зоны было сцягнута да 60 тысяч карнікаў. Карная экспедыцыя ладзілася сіламі 252, 56, 82, 95 і 15-й пяхотных дывізій, 161-га пяхотнага палка, 201-й ахоўнай дывізіі, 95-й стралковай дывізіі, 6-й авіяпалявой дывізіі, 501-га танкавага палка, 2, 12, 24, 1, 3, 5 і 26-га паліцэйскіх палкоў, 2, 1 і 3-га палкоў СС, асобага батальёна Дырлевангера, групы Вітвіцкага, двух асобных палкоў СС. Важная роля адводзілася 3-й нямецкай танкавай арміі пад камандаваннем генерал-палкоўніка Рэйнгарта, якая, па сутнасці, была блакіравана партызанамі.

Карнікі выкарысталі ўсе віды разведкі, у тым ліку і аэрафотаздымкі, каб дакладна ведаць аб размяшчэнні партызанскіх сіл, іх узбраенні, сістэме абароны, вызначылі шляхі перамяшчэння артылерыі і абозаў ва ўмовах вясенняй распуціцы. Але гэтыя звесткі былі на справе не зусім дакладнымі, бо партызаны рабілі дэзінфармацыю: будавалі фальшывыя абарончыя збудаванні, уводзілі ў зман праціўніка шляхам засылкі праз падпольшчыкаў падманных звестак аб сваіх сілах, узбраенні і планах.

Карнікі ставілі перад сабой задачу акружыць і знішчыць партызан, ачысціць занятую імі тэрыторыю.

Нямецкае камандаванне планавала ажыццявіць аперацыю ў чатыры этапы. На першым — зламаць партызанскую абарону і ачысціць левы бераг Заходняй Дзвіны. Для яе выканання прыцягваліся 56-я і 252-я пяхотныя дывізіі і 161-ы пяхотны полк з прыдадзенымі ім 49 танкамі і арты-




Абарона Полацка-Лепельскай партызанскай зоны і прарыў блакады (11 красавіка — 5 мая 1944 г.). Аўтары карты: У.Е.Лабанок, А.Л.Манаенкаў.

лерыяй. Авалодаўшы левабярэжжам Заходняй Дзвіны, карнікі разлічвалі метадычным наступленнем з усіх бакоў выцесніць партызан з лясных масіваў і знішчыць іх на адкрытай мясцовасці. У гэтым заключаўся другі этап аперацыі.

На паўночным захадзе зоны быў пастаўлены магутны заслон у складзе 15-й пяхотнай дывізіі, асобнага палка СС, 26-га паліцэйскага палка і іншых падраздзяленняў. Пры падтрымцы бронепаяздоў, што курсіравалі па чыгунцы Полацк — Маладзечна, яны павінны былі разграміць партызан пры іх спробе праравацца цераз чыгунку. Гэта быў трэці этап аперацыі. Чацвёрты па часе супадаў з трыма папярэднімі і заключаўся ў рабаванні, знішчэнні і вывазе ў Германію мірнага насельніцтва. Аперацыя была разлічана на 8—10 дзён.

Супраць партызан былі кінуты 137 танкаў, 235 гармат, 70 самалётаў. Карнікам супрацьстаялі 16 партызанскіх брыгад агульнай колькасцю ў 17 185 чалавек. На іх узбраенні былі 9344 вінтоўкі, 1544 аўтаматы, 624 ручныя і 97 станковых кулямётаў, 151 процітанкавае ружжо, 143 мінамёты, 21 гармата. Агульная працягласць лініі партызанскай абароны складала 230 км. Найбольш працяглыя ўчасткі абароны да 25—30 км трымалі брыгады Лепельская імя І.В.Сталіна, імя В.І.Чапаева, 1-я Антыфашысцкая, імя К.Я.Варашылава, «За Савецкую Беларусь», 2-я Ушацкая імя П.К.Панамарэнкі.

На пачатку баявых дзеянняў партызанскія абарончыя рубяжы мелі глыбіню ў 15—20 км. Былі знішчаны ўваходныя шляхі ў зону: падарваны масты, завалены і замініраваны аб'езды, перакапаны дарогі. На танканебяспечных напрамках з дапамогай мірных жыхароў былі зроблены надаўбені, выкапаны глыбокія равы. Партызаны зрабілі зручныя замаскіраваныя пазіцыі для разлікаў процітанкавых ружжаў і знішчальнікаў танкаў з гранатамі і бутэлькамі з гаручай сумессю.

У кожным узводзе былі падрыхтаваны знішчальнікі танкаў. Вузлы абароны былі пабудаваны такім чынам, каб можна было адбівацца ад ворага з любога напрамку. Выкарыстоўваліся прыродныя перашкоды: рэкі, азёры, балоты, лясныя масівы.

Карная экспедыцыя пачалася 11 красавіка атакамі 56-й пяхотнай дывізіі на ўчастку абароны брыгады імя У.І.Леніна. Праціўнік наступаў з боку Полацка.

З самага пачатку баёў вельмі напружаная абстаноўка склалася каля вёсак Краснае, Ляхава, Залужэнне. Тут былі праведзены адна за адной чатыры атакі карнікаў.

У самы напружаны момант перад партызанскай абаронай з'явілася 8 танкаў, за імі ішла пяхота. Адзін з танкаў падарваўся на міне, другі падбілі бранябойшчыкі. Астатнія падышлі да рубяжоў абароны атрада імя А.В.Суворава і адкрылі агонь з гармат і кулямётаў. Атрад вымушаны быў адысці. Цяжкія баі ішлі на іншых участках. Партызаны прапускалі танкі цераз акопы, агнём адсякалі пяхоту і адкідвалі яе назад.

Каля вёсак Усая, Дубраўка, Ягадкі і на новым рубяжы каля Падліпак і Малінаўкі ўпартае супраціўленне ворагу ў першы дзень аказала брыгада «За Савецкую Беларусь». Тут наступаў полк варожай пяхоты і 10 танкаў. Карнікі вялі моцны артылерыйска-мінамётны агонь. Партызаны атрадаў імя С.Г.Лазо і імя М.А.Шчорса неаднаразова контратакавалі праціўніка, сыходзіліся ўрукапашную.

Нягледзячы на перавагу ворага ў жывой сіле і ўзбраенні, партызаны ў першы ж дзень прадэманстравалі стойкасць і высокае воінскае майстэрства.

Аднак карнікі фарсіравалі раку Дзіва, што злучае азёры Янова і Павульскае, і авалодалі зручнай вышынёй. 3-і атрад імя В.Ц.Кураленкі і 4-ы атрад 16-й Смаленскай брыгады выбілі гітлераўцаў з вышыні і адкінулі іх за раку.

На рубяжы абароны палка І.Ф.Садчыкава ў гэты дзень гітлераўцы вялі наступленне на вёску Заскаркі, але прайсці не змаглі.

15 дзён трымаліся партызаны на рубяжы Янова — Слабада — Павулле. Карнікам не дапамаглі ні артылерыя, ні авіяцыя, ні танкі. Жорсткія баі ішлі каля вёсак Цётча, Гарбаціца, дзе абарону трымала 16-я Смаленская партызанская брыгада. Праз некаторы час тут наступіла зацішша. Але пачалося наступленне ворага на паўднёвым захадзе, дзе абараняліся брыгады «Кастрычнік», імя ЦК КП(б)Б, імя У.І.Леніна і 1-я Антыфашысцкая. Супраць іх дзейнічалі паліцэйскія і ахоўныя часці, што ўваходзілі ў групу фон Готберга. Ядром яе быў батальён СС пад камандаваннем Дырлевангера.

Карнікі імкнуліся заняць лясіста-балотны масіў паміж азёрамі Шо і Медзазол і авалодаць дарогай Чарніца 1-я — Лясіны — Весніцк, каб адкрыць шлях на Ушачы. Мясцовасць не спрыяла выкарыстанню танкаў, таму карнікі абыходзіліся артылерыяй, мінамётамі, авіяцыяй. Каля вёсак Шалагіры і Кавалі ў бой уступілі атрады брыгады імя У.І.Леніна і аказалі ворагу моцнае супраціўленне.

Брыгада «Кастрычнік» не была непасрэдным суседам брыгады імя У.І.Леніна. Калі баявая абстаноўка ўскладнілася на Бярэзіне, 4-ы атрад імя А.М.Горкага брыгады «Кастрычнік» зрабіў вылазку ў тыл ворага і нанёс яму значны ўрон. 17 красавіка другая частка гэтай брыгады напала на калону гітлераўцаў каля вёскі Нежыўшчына.

У разгар баёў іншыя брыгады ажыццяўлялі вылазкі ў тыл ворага: рабілі засады, падрывалі машыны і эшалоны. Начны налёт на гарнізоны ў вёсках Долецкія і Шчаты здзейсніў атрад імя М.В.Фрунзе брыгады імя В.І.Чапаева, які трымаў абарону паміж азёрамі Гомель і Суя.

15 красавіка каля вёсак Лясіны і Мурагі партызаны палка імя І.Ф.Садчыкава збілі нямецкі самалёт-разведчык. На наступны дзень карнікі пры падтрымцы танкаў, артылерыі і мінамётаў перайшлі ў наступленне ў напрамку вёсак Косарава, Белы Двор. Артылерыйскім агнём праціўнік разбурыў частку партызанскіх умацаванняў.

18 красавіка гітлераўцы зноў пайшлі ў наступленне. 4-ы батальён палка адбіў за адзін дзень шэсць атак карнікаў.

Партызаны зрывалі планы карнікаў. Ота Хейдкемпер у кнізе «Віцебск. Барацьба і гібель 3-й танкавай арміі» адзначаў, што партызаны вялі барацьбу не па правілах, што іх метады «з'яўляліся здзекамі над усімі міжнароднымі нормамі», маючы на ўвазе дзейнасць невялікіх груп партызан у тыле ворага. «Адсутнічаюць словы, — працягваў ён, — якія маглі б апісаць д'ябальскія і грозныя дзеянні партызан у гэтыя дні».

16 красавіка ў бой уступіла брыгада «Аляксея». На наступны дзень 15 нямецкіх самалётаў 3 гадзіны бамбілі пазіцыі атрада «Мсцівец». Потым пайшла ў атаку пяхота, 2 гадзіны ішоў бой. Толькі вечарам пакінулі партызаны вёскі Ветча і Храмёнкі. Але ноччу 19 красавіка зноў авалодалі імі.

Партызаны брыгады «Аляксея» не далі карнікам прарвацца на сваім участку і выйсці ў тыл суседнім брыгадам. Дзесяцікіламетровую абарону паміж вёскамі Ветча, Храмёнкі і Вялікія Дольцы вораг змог пераадолець толькі за 12 дзён, страціўшы пры гэтым да 2500 забітымі і паранемымі.

На ўчастку абароны брыгады «Аляксея» асабліва актыўна дзейнічала варожая авіяцыя. З 18 па 30 красавіка было зроблена 520 самалёта-вылетаў. 27 красавіка масіраваны налёт быў зроблены на вёску Вялікія Дольцы, дзе размяшчаўся штаб брыгады. Асколкам бомбы быў забіты камандзір брыгады А.Ф.Данукалаў.

ЦК КП(б)Б, БШПР, штаб 1-га Прыбалтыйскага фронту ўважліва сачылі за ходам падзей у Полацка-Лепельскай зоне. Штабы аператыўнай групы ЦК КП(б)Б у зоне і партызанскіх брыгад мелі ўстойлівую радыёсувязь паміж сабой і Вялікай зямлёй. Да партызан рэгулярна прылыталі савецкія лётчыкі з неабходнымі грузамі. Франтавая авіяцыя наносіла ўдары па карніках. Каб дапамагчы партызанам, адцягнуць частку



Кіраўніцтва 4-га атрада імя А.М.Горкага брыгады «Кастрычнік» (злева направа): камандзір Ф.П.Зыранаў і камісар І.А.Кабранаў.

сіл праціўніка, войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту на ўчастку блізкім да партызанскай зоны, правялі на Полацкім напрамку наступленне мясцовага значэння сіламі пяці стралковых батальёнаў, узмоцненых артылерыяй і танкамі. Прадстаўніцтва БШПР на 1-м Прыбалтыйскім фронце на чале з І.І.Рыжыкавым перакінула на дапамогу партызанам 5 партызанскіх брыгад з Аршанска-Сенненскай зоны для ўдару на Ушацкім напрамку. Аказвалі дапамогу і партызаны Барысаўска-Бягомльскай зоны.

Аднак становішча ва Ушацкай зоне працягвала пагаршацца. Карнікі імкнуліся авалодаць бальшаком Ула — Ушачы. Брыгадзе «За Савецкую Беларусь» прыйшлося вытрымаць новы моцны ўдар. Камандзір брыгады П.М.Раманаў асабіста вадзіў атрады ў атакі.

21 красавіка вораг вялікімі сіламі павёў наступленне на пазіцыі брыгад 2-й Ушацкай імя П.К.Панамарэнкі і Лепельскай імя І.В.Сталіна, якія трымалі абарону на поўдзень ад брыгады «За Савецкую Беларусь». Цяжкія баі ішлі за вёскі Забалоцце, Плігаўкі, Замхавыя, Ворань, Двор Жары, Ізафатава.

22 красавіка варожая артылерыя і 7 бамбардзіроўшчыкаў нанеслі ўдары па партызанах, затым у наступленне пайшла пяхота, але прарваць партызанскую абарону не ўдалося.

Асабліва моцны мінамётны ўдар нанеслі карнікі па пазіцыях партызан каля вёскі Пяскі. Партызаны неслі вялікія страты. Смяротна быў паранены камандзір Лепельскай брыгады імя І.В.Сталіна Дз.Ц.Караленка.

Моцны націск рэгулярных войскаў праціўніка вытрымалі атрады 2-й Ушацкай брыгады імя П.К.Панамарэнкі каля вёсак Кісялёва, Ладасна, Жары, Макараўшчына. Гэтыя населеныя пункты па некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі.

Да канца красавіка брыгады імя С.М.Кароткіна і 1-я імя А.В.Суворава стрымлівалі карнікаў у раёне возера Шо і ракі Шоша. Сілы партызан былі падмацаваны брыгадай імя У.І.Леніна і батальёнам з 1-й Антыфашысцкай брыгады. Яны займалі абарону на ўчастку Кублічы — Лісічына.

У раёне возера Медзазол партызаны 1-й Антыфашысцкай брыгады ў выніку толькі аднаго бою знішчылі больш за 200 галаварэзаў батальёна Дырлевангера, захапілі 3 гарматы, 3 мінамёты, 8 кулямётаў, многа вінтовак, боепрыпасаў, харчу і іншай маёмасці.

Кола акружэння звужалася. Карнікі, авалодаўшы Чарсцвядамі, Слабадой, Крыжамі, Лабанямі, Славенямі, Красоўшчынай, нанеслі ўдар у тыл брыгадзе імя У.І.Леніна. Утварылася пагроза і для брыгад імя В.І.Чапаева і імя К.Я.Варашылава.

Перад камбрыгам М.А.Сакмаркіным была пастаўлена задача затрымаць карнікаў і даць магчымасць асноўным сілам партызан адысці на рубеж Буракі — Загорцы — Ліпаўка — Лагавыя — Казлы. Гэта задача была выканана.

30 красавіка баі ішлі ўжо пад Ушачамі. 230-кіламетровая лінія абароны партызанскай зоны скарацілася да 20-кіламетровай.

На вузкім участку абароны ў раёне Ушацкага льнозавода і вёскі Ліпаўкі пры



Удакладняецца план баявой аперацыі (злева направа): урач М.Т.Мусакоў, начальнік штаба 3-га атрада А.П.Любчык, камандзір 8-га атрада М.А.Разанаў, камандзір Лепельскай брыгады імя І.В.Сталіна Дз.Ц.Караленка.

падтрымцы артылерыі, 25 бамбардзіроўшчыкаў і 27 танкаў наступалі часці 96-й і 6-й нямецкіх дывізій. Тут мужна змагаліся партызаны палка І.Ф.Садчыкава, брыгад Лепельскай імя І.В.Сталіна і 2-й Ушацкай імя П.К.Панамарэнкі.

Увечары 30 красавіка карнікі занялі вёску Арэхаўна. Баі працягваліся каля вёскі Кублічы.

Вялікая колькасць бежанцаў запрудзіла дарогі. Усе рухаліся ў лясны масіў, за раку Ушача. Фашысцкія лётчыкі расстрэльвалі з кулямётаў мірных людзей.

Ад БШПР і ваеннага савета 1-га Прыбалтыйскага фронту паступіў загад пачаць падрыхтоўку да прарыву. Ён планаваўся на ноч 1 мая. Аднак сканцэнтраваць асноўныя сілы партызан да гэтага часу не ўдалося. Брыгады «Кастрычнік», 1-я Антыфашысцкая, 16-я Смаленская яшчэ вялі баі на сваіх рубяжах. Першымі на прарыў пайшлі ў ноч на 3 мая партызаны брыгады «Аляксея». Яны ўварваліся ў глыбока эшаланіраваныя пазіцыі карнікаў, прайшлі з боем 12 км, разграмілі гарнізоны ў вёсках Баяры, Бондары, Ліпейкі, Піскунова, Каменка, Слабада і штаб 26-га нямецкага палка, знішчылі 12 складоў з боепрыпасамі і харчаваннем, 40 аўта- і бронемашын, забілі і паранілі да 350 салдат і афіцэраў.

Карнікі зрабілі спробу не прапусціць партызан праз бальшак каля вёскі Кабылінка. Кінулі туды танкі. Аляксееўцы і частка 16-й Смаленскай брыгады сарвалі намер карнікаў. Начны рэйд партызан прымусіў гітлераўцаў прыняць тэрміновыя меры па ўзмацненні акружэння. Прарыў партызаны ажыццявілі ў ноч на 5 мая. Брыгады імя ВЛКСМ, імя С.М.Кароткіна, 16-я Смаленская і полк І.Ф.Садчыкава атакавалі варожыя гарнізоны ў вёсках Паперына і Новае Сяло. Вораг аказаў упартае супраціўленне, але быў выбіты з гэтых вёсак, страціўшы пры гэтым 12 танкаў, 6 гармат, 18 кулямётаў, да 900 забітымі і паранёнымі. Асноўныя партызанскія сілы вырваліся з акружэння. Разам з імі выйшлі каля 15 тысяч мірных жыхароў.

Не ўсе партызаны выйшлі ў тую ноч з Матырынскага лесу. Частка народных мсціўцаў зноў трапіла ў акружэнне. Член опергрупы А.Ф.Бардадын, які з групай аўтаматчыкаў адстаў ад асноўных сіл, сабраў разрозненыя групы партызан і павёў



І.Ф.Каранеўскі.

іх на прарыў. Аднак гэтая спроба не ўдалася і партызаны вярнуліся ў Матырынскі лес. 5 мая ў другой палове дня карнікі пачалі прачэсваць лес. Партызаны занялі кругавую абарону, тройчы ўступалі ў бой з карнікамі. Вечарам на захад ад вёскі Новае Сяло гэтай групе ўдалося перайсці дарогу Ушачы — Кублічы і выйсці ў Селішчанскую пушчу. Разам з гэтай групай партызан выйшла і шмат мірных жыхароў.

Многія з тых, хто не здолеў вырвацца з акружэння, прынялі пакутлівую смерць ад фашыстаў. Апусцелі населеныя пункты партызанскай зоны. Карнікі забралі ўсю жывёлу, вывезлі ўвесь знойдзены хлеб, плугі, нават чыгункі, скавароды. Усе турмы і лагеры Лепеля былі запоўнены арыштаванымі.

Галоўны вынік баявых дзеянняў партызан заключаўся ў тым, што яны знясілілі групоўку карнікаў, здолелі выйсці са складанага становішча і захавалі сваю баяздольнасць. Карнікі страцілі забітымі і паранёнымі больш за 20 тысяч салдат і афіцэраў, 59 танкаў, 116 аўтамашын, 7 бронемашын, 22 гарматы і 2 самалёты.

У баях з карнікамі загінула больш за 1500 партызан. Сярод іх камандзіры брыгад А.Ф.Данукалаў, Дз.Ц.Караленка, П.М.Раманаў, камісары М.Г.Жыжаў, І.Ф.Каранеўскі, У.С.Свірыд, член аператыўнай групы БШПР капітан І.І.Зіненка, кінааператары М.Сухава і М.Пісараў.

У ліпені 1974 г., у дні святкавання 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, на месцы прарыву блакады партызанамі быў адкрыты мемарыяльны комплекс «Прарыў» — помнік партызанскай славы.

*М.М.Кірпіч.*

# Дакументы сведчаць

## З ІНСТРУКЦЫІ КАМАНДАВАННЯ 3-й ТАНКАВАЙ АРМІІ ДЛЯ САЛДАТ І АФІЦЭРАЎ, ЯКІЯ БЫЛІ ПРЫЦЯГНУТЫ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З ПАРТЫЗАНАМІ

**Красавік 1944 г.**

Население:

Ненужный элемент, который только портит хлеб — уничтожайте. Оставить исключительно тех, которые могут принести пользу нашей Родине, отношение к последним должно быть строгое.

Истребление:

Трудоспособные и специалисты в возрасте от 15 до 65 лет должны быть отосланы в лагеря. Разрешается брать с собой продуктов на два дня. Если будут специалисты из бандитов — направить их в лагеря военнопленных. Больные дети и женщины эвакуируются в специальные районы. Разрешается брать с собой самое необходимое, но не больше, чем могут унести в руках. Трудоспособных женщин в возрасте от 15 до 65 лет отправлять под сильной охраной на сборные пункты.

Сельское хозяйство:

Лошадей, скот, сельхозпродукты и другое хозяйство конфисковывать и отправлять на специально назначенные пункты.

Деревни:

Деревни, которые не входят в зону боев, пока не уничтожаются. В деревнях, расположенных на удалении от большаков, можно временно устроить нетрудоспособных из бандитского района. Каждая воинская часть транспортирует своих пленных и захваченную рабочую силу в назначенные пункты танковой армии.

Лагеря танковой армии для пленных: Парафьяново (дулаг-230), Глубокое АГСС Т-8, Боровка (шоссе Камень — Лепель). Для рабочей силы в Парафьяново, Глубокое, Боровка (7 км северо-восточнее Лепеля).

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 600. Л. 14—15.*

## ДАНЯСЕННЕ КАМАНДАВАННЯ СМАЛЕНСКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА ПАЛКА Ў АПЕРАТЫЎНУЮ ГРУПУ ЦК КП(б)Б І БШПР ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗОНЫ АБ БАЯХ З КАРНІКАМІ

**15 мая 1944 г.**

За период карательной экспедиции с 10.4.44 по 10.5.44 полком убито и ранено 3016 гитлеровцев, взорвано и подбито 9 танков, подбит 1 самолет-разведчик. Разбито 6 грузовых и 1 легковая автомашины, 2 бронемашины, 1 трактор, 4 пушки, 4 миномета, 1 прицеп, 1 склад с боеприпасами, уничтожено 46 повозок с грузом, убито 97 лошадей. Захвачено в плен 18 немцев. Наши потери убитыми, ранеными и пропавшими без вести 223 чел.

Убиты в боях — командир отряда Самойленко Петр Михайлович, комиссар отряда Соловьев Дмитрий Дмитриевич, командир отряда капитан Бесчастный Виктор Иванович, комиссар отряда мл. политрук Макаренков Максим Трофимович.

Тяжело ранены — зам. ком. полка по разведке майор Максимов Владимир Иванович, комиссар батальона лейтенант Гос. безопасности Кумбарг Константин Соломонович, командир отряда Зверев Владимир Николаевич, командир отряда Тимофеев Яков Васильевич, пропал без вести комиссар отряда Воропаев Аркадий Иосифович.

Садчиков
Юрьев

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 53. Л. 19а.*

## Чакалі вайсковы дэсант

### З успамінаў П.К.Панамарэнкі, былога сакратара ЦК КП(б)Б і начальніка ЦШПР

Восенню 1943 г. выклікаў мяне Вярхоўны галоўнакамандуючы таварыш Сталін і спытаў: «Ці ёсць на поўначы Беларусі раён, насычаны партызанамі, куды можна высадзіць «вялікі авіяцыйны дэсант»? Пасля роздуму і парад з таварышамі я назваў Ушацкі партызанскі раён. Ён быў размешчаны ў тыле адной з самых магутных нямецкіх армій — 3-й танкавай арміі, што займала цэнтральны ўчастак фронту. Калі так можна сказаць, то партызаны Ушацкай зоны былі стрэмкай у целе гэтай арміі. Безумоўна, мелі значэнне і партызанскія атрады і брыгады, размешчаныя непадалёку ад гэтага раёна — на поўначы Расонскага, поўдні Сенненска-Чашніцкага партызанскіх раёнаў.

Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі абмеркаваў меры па падрыхтоўцы прыёму дэсанта і яго сумеснага дзеяння з партызанамі. Было вырашана ўзмацніць гэты партызанскі раён яшчэ чатырма брыгадамі. Хутка яны прыбылі ва Ушацкую зону. Усё было падрыхтавана для таго, каб прыняць дэсант і выканаць указанні Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання. Гэта дэсантная аперацыя не адбылася, але яна сыграла вялікую ролю ў тым сэнсе, што калі восенню нашы часці перайшлі ў наступленне на Гомельскім напрамку і занялі горад Гомель, немцы не знялі ні адной дывізіі з-пад Ушач, бо яны чакалі гэтага дэсанта. Іх нервы былі нацягнуты, яны чакалі значных падзей у сваім тыле.

Такая абстаноўка была і вясной 1944 г. ЦК КП(б)Б абмяркоўваў, што рабіць далей. Думка ўсіх была аднолькавай: не разводзіць сабраныя ў раёне Ушач партызанскія сілы таму, што чакаліся рашаючыя падзеі.

Немцы разумелі, якую вялікую пагрозу існаванню 3-й танкавай арміі ўяўляў гэты партызанскі раён і пачалі рыхтаваць буйную, амаль самую значную за ўсю вайну экспедыцыю па знішчэнні гэтай партызанскай зоны. Імі былі кінуты сюды вялікія сілы, цалкам некалькі ахоўных і пяхотных дывізій, часці сямі іншых дывізій агульнай колькасцю звыш 60 тысяч чалавек. З кожным днём барацьба прымала жорсткі характар. Партызаны праяўлялі нябачны гераізм, яны стаялі насмерць.

## Перамаглі разам

Особо страстное нетерпение охватило воинов, когда они весной 1944 г. узнали, что гитлеровцы предприняли крупную карательную экспедицию против белорусских партизан, основавших в тылу оккупантов своего рода партизанскую республику со столицей в городе Ушачи. В этом районе действовали 16 партизанских бригад. Желание не позволить фашистам расправиться с нашими доблестными партизанами было настолько велико, что даже мой старый друг начальник штаба фронта генерал В.В.Курасов, обычно всегда трезво оценивающий обстановку, на этот раз не выдержал и начал выдвигать идею немедленного наступления. Но, по условиям сложившейся к тому времени обстановки, это желание, к сожалению, было неосуществимым: наступила уже весенняя распутица, да и войска фронта еще далеко не были готовы к проведению крупного наступления. Именно в этих неблагоприятно сложившихся для нас условиях гитлеровское командование решило нанести белорусским партизанам решительное поражение, чтобы к началу летней кампании 1944 г. ликвидировать их основные очаги у себя в тылу. Для ликвидации крупных сил партизан в районе Ушачи фашисты привлекли несколько охранных и пехотных дивизий. К нашему счастью, врагу не удалось уничтожить партизанские соединения, действовавшие в этом районе. Однако в ходе отражения вражеского наступления для наших партизанских соединений не раз складывалась тяжелая обстановка.

Мне хорошо помнится, как в эту тяжелую пору военный совет и штаб нашего фронта принимали все возможные меры, чтобы облегчить положение партизан в районе Ушачи. Наша помощь выражалась, главным образом, в подаче по воздуху не-

которых видов вооружения, боеприпасов, взрывчатки, средств радиосвязи, медикаментов, в эвакуации через линию фронта в тыл страны небольшого количества раненых и тяжело больных партизан. Нередко по просьбе командования партизанских соединений им оказывали поддержку наши штурмовики и ночные бомбардировщики, нанося удары с воздуха по скоплениям фашистских войск.

Исключительно активную деятельность в эти трудные для партизан дни проявил прикомандированный к нашему фронту штаб по руководству партизанским движением во главе с инициативным и дельным товарищем Рыжиковым. На протяжении почти целого месяца партизаны мужественно отбивались от наседавших на них со всех сторон фашистских частей и соединений. Мы бесконечно были рады, когда узнали, что, объединившись под командованием своего прославленного вожака В.Е.Лобанка, они все-таки с боями вырвались из окружения и с началом последовавшего затем нашего наступления оказали войскам неоценимую помощь в наиболее ответственные моменты операции.

*Друкуецца паводле артыкула: Баграмян И.Х. В битве за Белоруссию. (Ушацкі музей народной славы імя У.Е.Лабанка. НВ № 2361.)*

## Прайшлі праз смерць

Ноч на 5 мая. Заўтра будзе позна. На шляху прыйдзецца штурмаваць вёскі Новае Сяло, Паперына і дарогу. Карнікі трывала замацаваліся там. Прадстаіць цяжкі бой. Пасля агляду мясцовасці праз сувязных перадаю загад камбрыгам: штурм пачынаем у 23.30 па маім сігнале — 2 чырвоныя ракеты.

Байцам з атрада імя Міхаіла Сільніцкага брыгады імя ВЛКСМ А.І.Шлюеву, І.М.Бурлакову і Г.Ф.Дваранінаву перагарадзіў шлях варожы мінамёт. Партызаны вырашылі знішчыць мінамётнае гняздо і рушылі прама на яго. Дзёрзкасць смельчакоў ашаламіла гітлераўцаў, яны разгубіліся. Страляючы ва ўпор, партызаны кінуліся наперад і дабілі фашыстаў прыкладамі.

Ворага здзіўляла знаходлівасць партызан, маланкавая хуткасць іх дзеянняў. Пяцёра смельчакоў з атрада імя С.Г.Лазо — палітрук узвода П.І.Сімукоў, камандзір аддзялення М.Г.Падгорных, баец П.С.Пуцінцаў і кулямётны разлік Н.І.Маслюкова — нарваліся на хуткастрэльны кулямёт праціўніка. Мясцовасць перад кулямётнай кропкай была роўная, добра прастрэльвалася. Партызаны зрабілі спробу прайсці ў абход, але натрапілі на абоз. Разграміўшы яго і бачачы, што кулямёт маўчыць, яны паспрабавалі ісці наперад. Аднак кулямётная кропка зноў ажыла. Тады ўсе трое падняліся ва ўвесь рост і кінуліся на кулямёт. Карнікі разгубіліся і сталі разбягацца.

На ўчастку палка І.Ф.Садчыкава праціўнік, асвяціўшы мясцовасць,



І.Ф.Садчыкаў са штабам палка распрацоўвае план аперацыі.

перагарадзіў шлях моцным прыцэльным агнём. На чале з камандзірам палка партызаны атакавалі фашыстаў і ўварваліся ў іх абарону. Першым ішоў 3-і батальён (камбат І.І.Яршоў). Атрад гэтага батальёна пад камандаваннем У.М.Зверава адну за адной падавіў пяць агнявых кропак праціўніка, знішчыў кулямёт з разлікам і шэсць павозак з боепрыпасамі. Завязаўся рукапашны бой. Карнікі не вытрымалі націску і пабеглі.

Некалькі агнявых кропак падавілі ў баі кулямётчыкі браты Слава і Павел Куксёнкі. Братам было не больш 14—15 гадоў. Юныя кулямётчыкі і раней праяўлялі выключнае бясстрашша і воінскае майстэрства. Браты ўмела выкарыстоўвалі вопыт баёў па разгроме гарнізона ў вёсцы Расходнае, за Чашнікі, у якіх яны праявілі мужнасць пры знішчэнні агнявой кропкі і аховы склада з боепрыпасамі.

Разам з партызанамі ва ўтвораны магутным ударам пралом рынуліся і мірныя жыхары, якія знаходзіліся ў баявых парадках атрадаў і ў іх бліжнім тыле. Многія маці беглі па полі, прыціснуўшы да сябе немаўлят. Варожыя кулі і асколкі даганялі бяззбройных людзей, і яны падалі на сырую зямлю, паліваючы яе крывёю. Параненых падхоплівалі і дапамагалі рухацца далей.

І вось вёскі Паперына і Новае Сяло засталіся ззаду, галоўная небяспека мінула. Усе ўздыхнулі з палёгкай. Плакалі жанчыны, дзеці, старыя.

Група А.Ф.Бардадына не адзіная, якая вырвалася з акружэння пасля прарыву асноўных сіл злучэння. Такіх груп было нямала. Праўда, іншыя былі меншымі, таму ім даводзілася расканцэнтроўвацца па розных напрамках, скрытна пераходзіць і перапаўзаць пазіцыі і пасты ворага, або некаторы час маскіравацца і чакаць у лесе. Многія з тых, хто не змог выбрацца з акружэння, прынялі пакутлівую смерць ад рук фашысцкіх карнікаў.

Хутка пасля нашага прарыву германскае вярхоўнае камандаванне апублікавала паведамленне аб выніках красавіцка-майскай карнай экспедыцыі. Паказальна тое, што ў ім, а таксама ў фашысцкіх газетах шмат месца адведзена ссылкам на «цяжкія пагодлівыя ўмовы і мясцовасць», «добра арганізаваную абарону», «упартае супраціўленне партызан» і г.д. Пасля гэтага прыводзяцца моцна перабольшаныя даныя аб нанесеных партызанам стратах...

У маі 1944 г. фашысцкія газеты на ўсе лады распісвалі «перамогі» карнікаў, сцвярджаючы, што партызанскія злучэнні разбіты, што нам нанесены цяжкія непапраўныя страты і што, маўляў, з партызанскім рухам у гэтым раёне пакончана. На самай справе ўсё выглядала інакш. За час красавіцка-майскіх баёў партызаны страцілі забітымі каля 1450 чалавек і параненымі да 1150 чалавек. Мы вывезлі з сабой 15 тысяч мірных жыхароў, з якіх да 7 тысяч чалавек выйшла ў завячэльскія лясы і да 3 тысяч — у Бягомльскі раён. Усе партызанскія брыгады захавалі сваю баяздольнасць.

*У.Е.Лабанок.*

## Удзельнікі прарыву ўспамінаюць

### І.Ф.Садчыкаў, былы камандзір Смаленскага партызанскага палка

У штабе мы (камандзіры брыгад. — *Рэд.*) атрымалі ад У.Е.Лабанка загад арганізаваць прарыў варожага акружэння. На штурм ішоў і наш полк. Зрабіць гэта трэба было як мага хутчэй, нечакана для праціўніка.

Становішча было складаным, баявая задача нялёгкай. Лес акружаны тысячамі фашыстаў, дзвюма баявымі лініямі танкаў. Мы вырашылі пачаць прарыў роўна ў 24.00 з 4 на 5 мая 1944 г. Камандзіры батальёнаў атрымалі загад з кожнага атрада адабраць па тры групы з самых надзейных, смелых байцоў і камандзіраў (у палку было 13 атрадаў). У кожную групу ўваходзіла па тры чалавекі, якіх узброілі гранатамі.

Наступіла поўнач. У неба ўзвілася зялёная ракета. Гранамётчыкі рушылі на прарыў, закідваючы нямецкія танкі гранатамі. За імі пайшлі 130 чалавек з ручнымі кулямётамі. Апошнімі ішлі 300 аўтаматчыкаў. Гэтыя групы прарвалі кальцо акружэння на глыбіню 300—400 метраў. У атаку пайшлі батальёны, якія ўступілі ў рукапашны бой. Фашысты не чакалі такіх націску і мужнасці і былі змяты. Полк і

брыгады вырваліся з акружэння і вывелі некалькі тысяч мірных жыхароў.

За гэту аперацыю сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка аб'явіў падзяку ўсяму асабоваму складу палка. Многія байцы і камандзіры былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Я быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

## С.П.Шмуглеўскі, былы камісар атрада № 10 16-й Смаленскай партызанскай брыгады

У ноч на 12 красавіка атрады занялі адведзеныя пазіцыі для абароны: першы — на поўнач ад вёскі Глыбачка, перакрываючы дарогу Ула — Полацк, трэці і чацвёрты — перад перашыйкам паміж азёрамі Цётча і Бярозавае, пяты — паміж азёрамі Янова і Цётча, на поўдзень ад іх ішлі пазіцыі шостага атрада, па краі вёскі Акуліна — сёмага.

Асноўны ўдар ворага быў скіраваны на абарону трэцяга атрада, пазіцыі якога праходзілі па ўсходнім краі невялікай вёскі Бярозава. Менавіта тут, з боку вёскі Красная Горка, вораг пайшоў у атаку пад прыкрыццём цяжкага танка. Бранябойшчыкі І.Мешчаракоў, П.Маёраў, І.Марозаў, А.Багачоў адкрылі агонь, аднак супраць цяжкага танка яны былі бяссільнымі.

У прыазёрным раёне гітлераўцы наступалі па трох напрамках: на перашыек паміж азёрамі Цётча і Бярозавае, па дарозе Ула — Полацк праз вёску Глыбачка і на перашыек паміж азёрамі Янова і Цётча. Вораг, наступаючы ўздоўж берага Заходняй Дзвіны, выйшаў да вёскі Глыбачка, дзе абарону заняў першы атрад. Гітлераўцы ўпарта імкнуліся зламаць супраціўленне атрада, іх атакі паўтараліся на працягу ўсяго дня. З наступленнем цемнаты дзеянні ворага спыніліся, і ён адышоў да вёскі Рукшаніцы.

Пяты атрад заняў абарону перад вёскамі Слабада, Павулле на левым беразе рэчкі Дзіва. У 10 гадзін раніцы на прыазёрнай раўніне паказаліся тры варожыя танкі з пяхотай. Яны наблізіліся да рэчкі, два танкі крута павярнуўшы на поўнач, пайшлі ўздоўж берага, адзін астаўся на месцы. Левы бераг здаваўся бязлюдным. Карнікі падышлі да рэчкі, у гэты момант цішыня была парушана кулямётным стрэлам. Частка гітлераўцаў кінулася да танка, каб схавацца за яго браней. Па гэтай групе кулямётчык В.Алейнікаў даў доўгую чаргу, салдаты кінуліся наўцёкі.

Яшчэ некалькі разоў на працягу дня гітлераўцы спрабавалі фарсіраваць рэчку і прарваць абарону атрада, аднак пазіцыі яго заставаліся непрыступнымі.

Баі, што разгарнуліся 17 красавіка, былі самымі цяжкімі. Партызаны ў гэты дзень адбілі дзесяць атак пяхоты. Аднак узмацніўся агонь артылерыі і мінамётаў. Сярод партызан з'явіліся забітыя і параненыя, колькасць іх хутка расла.

Партызаны адышлі ў бок вёсак Крукоўшчына і Апанаскавічы. Іх адыход прыкрывалі ўзводы, якімі камандавалі В.Смалкоцін і І.Скрыпнік. Асабліва пры гэтым вызначыліся кулямётчыкі М.Дзёмін, М.Яроменка, Ф.Казаног і іншыя.



Атакуюць байцы Смаленскага партызанскага палка.

За шэсць дзён, з 12 па 17 красавіка, карнікі прайшлі ўсяго сем кіламетраў, гэтыя кіламетры дасталіся ім дарагой цаной. Становішча партызан пагаршалася з кожным днём. Адзінае выйсце з яго — прарыў блакады. Першая спроба ў ноч на 3 мая дала мала. Прарвалася штурмавая група. З ёй і частка нашай брыгады. У другі раз на прарыў пайшлі 5 мая. Першым ішоў полк І.Ф.Садчыкава. Наша брыгада ішла яму ў падтрымку. Усе партызанскія сілы былі сабраны ў адзіны кулак. Моцы яго ўдараў карнікі не вытрымалі.



У.В.Гарбачоў.

## У.В.Гарбачоў, былы партызан Лепельскай партызанскай брыгады імя І.В.Сталіна

Кальцо блакады звужалася. Дарогі былі забіты мірнымі жыхарамі наколькі было бачна і спераду, і ззаду. Старыя і дзеці сядзелі на вазах, астатнія ішлі пешшу. Да вазоў былі прывязаны каровы. У баку ад дарогі хадзіла пакінутая жывёла. Людзі кідалі ўсё, што нажывалі ўсёй сям'ёй. Яны часцей кіраваліся не розумам, а інстынктам, эмоцыямі. Гэты стыхійны паток цывільных людзей перашкаджаў партызанскаму манеўру, дэмаскіраваў з паветра напрамак руху партызанскіх атрадаў, таму што абозы сялян рухаліся туды, куды ішлі і партызанскія. Мы тлумачылі жыхарам, што так рабіць нельга. Аднак выніку не было. Сяляне цягнуліся за партызанамі і траплялі пад агонь самалётаў і артылерыі.

На скрыжаванні дарог атраду было загадана заняць абарону на перасечанай мясцовасці, зараслай сасновым лесам. Зноў пазіцыйныя баі, вельмі цяжкія.

Хутка мы пакінулі і гэтыя пазіцыі. Немцы прарвалі абарону нашых суседзяў і абыходзілі нас з флангаў і тылу. Зноў наш атрад рушыў у патоку насельніцтва. Ахоўвалі шпіталь і калону з тылу. Калона шпітальных вазоў вялікая, шмат параненых. Усе яны ляжачыя. Рух павольны, з частымі прыпынкамі…

Аднойчы ўбачылі жудасную карціну і зразумелі, што фашысты дабівалі параненых ва ўпор, калолі штыкамі. Побач ляжаў пабіты медперсанал. Мы сабралі загінуўшых у адно



Пераправа партызан брыгады імя І.В.Сталіна з параненымі цераз Бярэзіну. Май 1944 г. Здымак А.Рэйзман.

9. Зак. 1737.

месца, расчысцілі дарогу і рушылі далей, на захад. З пункту гледжання радавых партызан, гэты напрамак быў горшым. Там была моцная нямецкая абарона, яна была гатова вытрымаць любы партызанскі націск. Мы разумелі, што вырвацца з акружэння тут будзе вельмі складана. Але, як кажуць, начальству больш бачна. З наступленнем цемнаты рух запаволіўся.

Памятаецца жорсткі начны бой. Фашысты не здавалі пазіцыі. Гэта сведчыла, што прарваць нямецкую блакаду партызаны не змаглі. Бой цягнуўся гадзіны дзве і потым заціх.

На світанку атрад заняў абарону на зусім голай вышыні. Унізе рухаліся партызаны. Яны расказвалі, што ва ўчарашняй спробе прарваць блакаду галоўны ўдар наносіла брыгада У.У.Гіль-Радзіёнава.

У партызанскім асяроддзі тады лічылася, што выбар месца прарыву быў сумніцельным. Каля чыгункі была моцная паласа нямецкай абароны. Менавіта туды планавалі фашысты выцесніць партызан у ходзе карнай экспедыцыі.

Атрымлівалася, што мы самі лезлі ў гэты капкан. Канчаткова зыход бою вырашыла прыбыццё бронепаяздоў. Брыгада У.У.Гіль-Радзіёнава панесла вялікія страты, камбрыг быў цяжка паранены і хутка памёр. Мне думаецца, для яго гэта быў найлепшы выхад, так як, застаніся ён жывым, пасля вайны яму так лёгка не даравалі б ні палон, ні службы ў немцаў.

Калі сцямнела, мы зняліся са сваіх пазіцый. Пачалі рухацца наперад. Наш атрад зноў з тылу ахоўваў шпіталь. Апоўначы спыніліся, было загадана захоўваць цішыню.

## Я.Бурдыка, былы камандзір роты атрада імя Л.М.Даватара партызанскай брыгады імя П.К.Панамарэнкі

У красавіку 1944 г. мы ўдзельнічалі ў баях з карнікамі, утрымлівалі абарону каля вёскі Вацлавова. Нашы пазіцыі на паўночным ускрайку лесу без перапынку бамбілі нямецкія самалёты. Але мы выстаялі. Толькі за адзін дзень адбілі тры атакі. Не дапамаглі карнікам і танкі. А вечарам мы самі перайшлі ў наступленне і захапілі вёску Вацлавова. Пры гэтым было знішчана больш за 2 дзесяткі нямецкіх салдат, захоплены 2 ручныя кулямёты, больш за 20 аўтаматаў і вінтовак. У гэтым баі праявілі ўсе свае лепшыя якасці камандзіры ўзводаў Іосіф Папоў, Уладзімір Чэпік, палітрук роты Аляксандр Шыпулін і іншыя.

Баі з карнікамі мы вялі аж да прарыву варожай блакады. Нашай роце пашанцавала, мы выйшлі амаль без страт.

## І.А.Кабранаў, былы камісар 4-га атрада партызанскай брыгады «Кастрычнік»

У апошняй блакадзе 1944 г. каля Кубліч нам прыйшлося насмерць біцца з карнікамі. Гарэла тады старая каменная Кубліцкая



У штабе партызанскай брыгады «Кастрычнік».

царква, дзе быў назіральны пункт партызан. Наш 4-ы атрад трымаў абарону ў акопах каля хутара Белакор'е-Ліпава ў Галубіцкай пушчы. Нёс вялікія страты. Ад самалётаў і артылерыі гінулі партызаны і мірныя жыхары. Карнікі жывымі палілі старых, жанчын і дзяцей, якія не паспелі схавацца ў лесе. Кальцо акружэння партызан звужалася. Варожая авіяцыя бамбіла і расстрэльвала бяззбройных людзей. Немцы скідвалі на іх кантэйнеры з малымі бомбамі, якія разрываліся над зямлёй і забівалі людзей. Атрады брыгады імя А.В.Суворава вымушаны былі адысці ад вёскі Ліпава да хутара Асовец. Тут мы даведаліся аб смерці камандзіра 1-й Антыфашысцкай брыгады У.У.Гіль-Радзіёнава. На чацвёртыя суткі баёў, уначы, несучы зброю і параненых, перайшлі балота і выйшлі ў раён Кубліч Ушацкага раёна. Разам з байцамі 1-й Антыфашысцкай брыгады вялі баі. Выбілі немцаў з іх акопаў. Карнікі адціснулі нас да чыгункі Полацк — Зябкі — Крулеўшчызна, дзе яны планавалі знішчыць партызан. З цяжкімі баямі групамі прарваліся мы цераз чыгунку і рушылі ў балота паміж Міёрскім і Шаркаўшчынскім раёнамі. Там зноў трапілі ў акружэнне. Немцы з аўчаркамі прачэсвалі балота. Выцягвалі партызан і мірных жыхароў з-пад моху і на месцы расстрэльвалі. Уначы дробнымі групамі па 4—6 чалавек партызанам удалося пад носам у немцаў перапаўзці праз іх абарону і сабрацца ў вызначаным месцы. Частка партызан тым часам злучылася з часцямі Чырвонай арміі.

### М.Я.Усаў, былы камісар партызанскай брыгады імя А.В.Суворава

У час красавіцка-майскай блакады наша брыгада трымала абарону на подступах да вёсак Кляпцы, Асавіна, Кублічы і на паўночна-ўсходнім беразе возера Белае. У акружэнні аказалася аддзяленне, якім кіраваў камсамолец М.С.Дуднік. Мужна адбівалася жменька храбрацоў ад наступаючага праціўніка. Раптам у гушчу немцаў з воклічам «Ура!» на белым кані ўварваўся разведчык Іосіф Альшэўскі і закідаў іх гранатамі. Але і сам быў смяротна паранены. На дапамогу яму кінуліся партызаны атрада імя В.П.Чкалава.



Д.І.Азевіч.

У гэтым баі геройскі загінуў ураджэнец вёскі Стараселле Ушацкага раёна камсамолец А.І.Конан, былі паранены Надзя Курылёнак і Міхаіл Балуеў.

Раніца 29 красавіка пачалася з моцнай бамбёжкі нашых пазіцый. Яна працягвалася і ўвесь наступны дзень. Па 14 гадзін у суткі фашысты бамбілі партызан не толькі звычайнымі бомбамі, але і мінамі-жабамі. Адарваўшыся ад самалёта, балон раскрываўся і ў розныя бакі на вялікую плошчу разляталіся міны, якія «скакалі».

У гэтых баях вызначыліся А.Г.Раманоўскі, Міхаіл, Васіль і Кацярына Падголы, Д.І.Азевіч, А.А.Саўчанка, Я.Я.Церашкевіч, А.Д.Апенак, І.М.Лось, П.Л.Квіцінскі, І.М.Клачок, М.А.Васілевіч, Н.Д.Волах. Усе яны былі ўраджэнцамі Ушацкага раёна.



Камандаванне брыгады імя А.В.Суворава (злева направа): А.Ц.Кляцоў, П.А.Хомчанка, М.Я.Усаў, Т.К.Раеўскі.



А.А.Лісоўская.

## Г.В.Багдановіч, былы партызан атрада «Смерць фашызму» партызанскай брыгады імя К.Я.Варашылава

Цяжэй за ўсё ў блакадзе было малым дзецям. Да гэтага часу не магу забыць іх змучаныя твары, плач. Нямецкая авіяцыя пачала бамбіць вёскі. Вельмі моцна бамбілі вёску Матырына. У некаторых вёсках сабраліся партызанскія абозы з боепрыпасамі і харчаваннем. На павозках ляжалі параненыя. Уся партызанская зона была ў агні. У першамайскі дзень, у другой палове дня, наш атрад напалову выцягнуўся з лесу. Самалёты ляцелі нізка і скідвалі бомбы. Я ў гэты момант быў каля калгаснага млына на ўскраіне вёскі. Непадалёку ўпала бомба, ад разрыву якой падняліся слупы дыму і агню. Асколкам параніла старога. Я адскочыў ад сцяны і пабег да ям, дзе мясцовыя жыхары сыпалі на зіму бульбу, хацеў там схавацца, бо над ямамі быў дах, аднак зрабіць гэта не ўдалося, таму што яны былі забіты людзьмі. Тады я кінуўся да складзеных снапоў. Цень самалёта накрыла мяне. Лётчык даў кулямётную чаргу. Кулі леглі недалёка ад маёй галавы, уздоўж цела, асколкамі параніла твар. Сцярвятнік нізка праляцеў нада мной. Я паспрабаваў стрэліць па самалёце, але прамахнуўся.

3 мая 1944 г. партызанскім брыгадам не ўдалося выйсці з акружэння. Зноў адышлі ў лес. Часта ўспамінаю вёскі Паперына, Забораўна, Угрынкі, Матырына. Маючы перавес у жывой сіле і тэхніцы, фашысты да гэтага часу звузілі блакаднае кальцо да 7—8 кіламетраў. Лес, у якім знаходзіліся партызаны, пастаянна бамбіла нямецкая авіяцыя, абстрэльвала артылерыя. Завязаўся бой у вёсцы Забораўна. Да нас падышлі партызаны палка І.Ф.Садчыкава, і мы разам пайшлі ў атаку. Вызвалілі вёску і ўзялі трафеі: абоз, гарматы, мінамёты, станковыя кулямёты. Але гітлераўцы паздымалі з гармат замкі, таму выкарыстаць іх мы не змаглі.

Тым часам карнікі адкрылі па вёсцы мінамётны агонь, нам прыйшлося адысці ў лес. Мы кінулі свае абозы, а боепрыпасы разабралі партызаны. Рэчавага мяшка ў мяне не было, прыйшлося прыстасаваць саматканыя кальсоны, якія я знайшоў у лесе. У мяне было 32 кілаграмы патронаў, 3 патроны для процітанкавага ружжа, 2 гранаты.

У перастрэлцы каля вёскі Угрынкі быў забіты кулямётнай чаргой партызан, з якім мы былі разам. Я адпоўз да балота. Мой «рэчавы мяшок» намок, стаў яшчэ цяжэйшым. Немец заўважыў мяне і даў доўгую кулямётную чаргу. У гэтым баі загінула мая сястра Галя. Пад раніцу з 4 на 5 мая 1944 г. выпадкова выйшаў да сваіх. Тут быў мой камандзір П.М.Кісялёў і камбрыг Дз.В.Цябут. Яны загадалі мне і яшчэ аднаму партызану з ручным кулямётам узяць дыскі з патронамі і прыкрыць прарыў партызан. Пачалі выходзіць з лесу, пад нагамі захлюпала вада. Тыя, што ішлі справа, пачалі правальвацца. Я са сваім новым сябрам пайшоў лявей. Хутка мы перабраліся на другі бераг балота. У гэты час раздаліся воклічы «Ура!» і страляніна з абодвух бакоў. Усе кінуліся ў атаку.

## А.А.Лісоўская, былая партызанка 6-га атрада партызанскай брыгады «Дубава»

Прыйшлося мне перажыць блакаду. Страшна ўспомніць тыя дні! Выбухі бомбаў, снарадаў. Брат схаваў мяне пад карчом, а сам паспрабаваў прарвацца. Не ўдалося. Аўтаматная чарга скасіла яго. Не ўратавалася і я. Карнікі знайшлі мяне і разам з іншымі палоннымі пагналі ў напрамку Мінска, а потым адправілі ў Германію. На адной станцыі з сяброўкай Аняй Барадзіч папрасілася ў вартавога схадзіць па ваду. Побач быў рэдзенькі лясок, там мы і схаваліся.

Доўга блукалі, у вёскі баяліся заходзіць. На адным хутары нас накармілі і мы пайшлі далей. Сустрэлі нашу конную разведку, потым савецкія танкі. Колькі было радасці!

## С.С.Школьнікаў, былы кінаапаратар кінастудыі «Масфільм»

Сакавік 1944 г. Мы з аператарам М.Пісаравым на партызанскім аэрадроме Ушацкай зоны.

Нас абступілі партызаны. Яны жартавалі, смяяліся. Нас здзівіў іх спакой, бо нас папярэджвалі, што ў партызанскім краі абставіны вельмі напружаныя. Жадаючы нас падбадзёрыць, вусаты партызан у кубанцы з чырвонай стужкай сказаў: «Не бойцеся, таварышы здымшчыкі, тут зямля сялянская, лясы партызанскія, шаша нямецкая, а ўлада савецкая».

Раніцай, калі мы адправіліся на здымкі, пачуўся далёкі гул самалётаў. У адной з хат я ўбачыў камбрыга А.Ф.Данукалава. Ён стаяў, прыкрываючы вочы далонню ад сонца, і глядзеў у той бок, адкуль чуўся гул. Стаў аддаваць распараджэнні. Гул матораў усё нарастаў. У небе з'явіліся варожыя самалёты. Мы пачалі здымаць іх. Над вёскаю адзін самалёт слізгануў у піке, за ім другі, трэці.

Пасыпаліся бомбы, застракаталі кулямёты. Загарэлася некалькі хат. Людзі расчынялі вароты і выганялі жывёлу. Кулямётныя чэргі прашывалі дахі і сцены, з аглушальным грокатам разрываліся бомбы. Дым пажараў закрыў дыск сонца.

А.Ф.Данукалаў нібы не заўважыў бамбёжкі. Раптам недалёка ад таго месца, дзе ён стаяў, здрыганулася зямля. Калі дым стаў рассейвацца, я убачыў Данукалава, паволі асядаючага на зямлю. Я кінуўся да яго, а Мікалай працягваў здымаць. Камандзір быў яшчэ жывы. Я пачаў бінтаваць яго, не заўважыўшы, што ён ужо мёртвы.

... З наступленнем цемры, у поўным маўчанні, мы зноў ішлі ланцужком да той маленькай балачкі, дзе пахавалі ўчора Косцю Зюкава. Прама з пахавання партызаны пайшлі ў бой. Смерць на вайне і, нават, самага дарагога чалавека не мяняла ходу падзей.

Раніца 1 мая 1944 г. застала нас у лесе. Прачнуўшыся, мы ўбачылі на сасне чырвоны сцяг — сімвал свята. Удзень у бязвоблачным небе з'явіліся фашысцкія самалёты. На паранепую зямлю пачалі зноў сыпацца бомбы. Ударыла і варожая артылерыя. У канцы дня быў атрыманы загад вырвацца з акружэння і выйсці ў тыл праціўніку. Прарывацца вырашылі ў паўночна-заходнім напрамку на ўчастку чыгункі Полацк — Крулеўшчызна.

З добраахвотнікаў-партызан былі сфарміраваны штурмавыя групы. З наступленнем цемнаты яны абавязаны былі падабрацца да варожых танкаў і закідаць іх гранатамі. Ціха ішлі калоны партызан, за імі абозы і дзесяткі тысяч мірных жыхароў. У ноч на 3 мая да раёна прарыву падцягнуліся павозкі з параненымі. У тую ж ноч партызанскія брыгады кінуліся на прарыў. З баямі мы прабіліся праз фашысцкія заслоны і на світанку выйшлі да вёскі Ражноўшчына. Яна была пустая. Раптам у ад-



Аператары кінастудыі «Масфільм» (сядзяць): М.Сухава (першая злева), А.Рэйзман (трэцяя злева) і карэспандэнт газеты «Віцебскі рабочы» В.Сіманава сярод камандзіраў партызанскіх брыгад Ушацкай зоны.

ной з хат я пачуў дзіцячы плач. Забег у хату, дзверы якой былі расчынены, і ўбачыў хлапчука, які сядзеў на падлозе і зваў маці. Аглядзеўся — нікога. Што было рабіць з малым? Выручыў партызан Васіль Страмовіч — хуткі на ўсе рашэнні. Ён скінуў з сябе куртку, закруціў у яе хлапчаня і выскачыў з ім на вуліцу. Зрабілі прывал у лесе, але кастроў не распальвалі. Немцы бамбілі лес. На змярканні накіраваліся на поўдзень, у бок бальшака Ушачы — Кублічы. Брыгада, у якой былі і мы з Мікалаем, ішла ўсю ноч, прыпынілася на дзень у рэдкім лесе на невялічкай высотцы. Занялі кругавую абарону. Спаць не дазвалялі. У 11 гадзін вораг стаў напіраць. Першая спроба прарвацца самастойна поспеху не мела. Групу прарыву змялі танкі ворага. Потым па рацыі мы звязаліся з астатнімі брыгадамі. Было вырашана ў 14 гадзін 30 хвілін 5 мая пачаць агульны штурм варожага кола. Цяпер партызаны пачалі цясніць гітлераўцаў, і яны не вытрымалі націску, пабеглі. Мы працягвалі наступаць. Атрымаўшы падмогу, немцы не сталі атакоўваць нас. Яны рухаліся злева і справа, паралельна нашым калонам. Як толькі мы прыпыняліся, гітлераўцы зараз жа замыкалі ланцуг. На працягу дня яны чатыры разы акружалі нас, і кожны раз нам прыходзілася прарывацца з боем. Ад стомленасці падкошваліся ногі. Закончылася лясная дарога. Наперадзе самае цяжкае — прайсці праз балота і паўтара кіламетра адкрытага поля. Дзве гадзіны ў балотным хмызняку ішла перастрэлка. Балота мы адолелі, а поле перайсці не ўдалося. Да канца дня ўсе брыгады згрупаваліся на поўнач ад шашы Ушачы — Кублічы, праз якую нам трэба было прарвацца. Набліжалася ноч. У неба ўзляталі нямецкія ракеты, асвятлялі шашу. Першымі на прарыў пайшлі батальёны партызанскага палка І.Ф.Садчыкава. Мы з Мікалаем далучыліся да іх. У 23 гадзіны 30 хвілін папаўзлі па сырым полі. Да шашы заставалася зусім мала, калі ў паветра ўзвіліся дзве ракеты і асвяцілі нас. Адразу запрацавалі кулямёты, затрашчалі аўтаматы. Пры святле ракет убачылі коней. Стральба спынілася. Партызаны выскачылі на шашу. Ехаў нямецкі абоз з харчаваннем і зброяй. Фашысты былі перабіты, частку харчоў і зброю партызаны захапілі з сабой. Беглі доўга. Світанак застаў нас у глухім бары. Сюды па адным і групамі сыходзіліся партызаны. Стаміўшыся, яны падалі прама на зямлю і засыналі. Наперадзе ляжаў заблакіраваны бальшак Лепель — Докшыцы. Калі стала цямнець, нам загадалі строіцца па адным. Партызанская «нітка» расцягнулася на добры кіламетр. Дождж не пераставаў ні на хвіліну. Калі зусім сцямнела, мы дабраліся да лесу. Ішлі доўга, натрапілі на вёску. Каля абгарэлай печы сядзеў стары з доўгай барадой. Ён чакаў гасцей з лесу. Прынёс гарачай бульбы. Усім хапіла па дзве бульбіны. Увечары пайшлі далей. На нас было бруднае, рванае адзенне і стаптаныя боты, іншыя ішлі і босыя. Да ночы прыйшлі ў Чашнікі. Тут паелі і адаспаліся. Праз дзень я сустрэў кінааператара Атылію Рэйзман. Яна стаяла і плакала. Яе сяброўка Маша Сухава загінула ў ноч прарыву. У тую ж ноч быў забіты і Мікалай Пісараў.

### У.В.Казачонак, былая жыхарка вёскі Жаўніна

Страшна ўспамінаць вайну. Яна зрабіла сваю чорную справу — засталася я толькі з сынком Васільком. Мужык загінуў, дачушка памерла.

Брат мой Мікола партызаніў. Зімой 1943—1944 гг. хварэў на тыф і быў дома ў бацькоў. Вычухаўся ад хваробы, вясной зноў пайшоў у партызанскі атрад. Вельмі страшна было перажыць блакаду. Хаваліся па зямлянках, лясах.

Як толькі партызаны выйшлі з акружэння ў Матырынскім лесе, разам з дзвюма жанчынамі пайшла туды шукаць брата. Казалі, нібыта бачылі яго загінуўшага ў лесе каля Пліны.

Лес меў жудасны выгляд. Уся зямля ўслана трупамі была. Па нябожчыках хадзілі, як па дровах. Усё змяшалася: калёсы, торбы... Жудаснай была карціна расстралянага немцамі шпіталя. На вазах ляжалі мёртвыя, побач — коні.

Па рацэ з вадой, чырвонай ад крыві, плылі чалавечыя галовы і рукі.

Выбіраліся мы ў Забораўна. Мясцовая жанчына сказала, што ў яе агародзе закапаны людзі, закатаваныя немцамі. Людцы мае, казала яна, вы гора шукаеце, а маё ў маім агародзе.

Брата ў той раз я не адшукала. У наступны раз мы зноў пайшлі ў той лес. Знайшлі чалавека, на брата падобнага. Рукі ў яго былі

завязаны назад. Іх такіх тут было шмат. Казалі, што іх гналі звязаных да сіласнай ямы і расстрэльвалі. Але не брат гэта быў. Яго б я пазнала. А побач хлопец ляжаў, маладзенькі, чысценькі такі…

Божачка мой высокі, баюся гукаць… А дзе брат ляжыць у зямельцы сырой, дык і зараз не ведаю.

*Запісаў М.М.Кірпіч.*

## Мемарыяльны комплекс «Прарыў»

30 чэрвеня 1974 г. у гонар подзвігу партызан Полацка-Лепельскай зоны адкрыты мемарыяльны комплекс «Прарыў» (скульптар А.Анікейчык, архітэктары Ю.Градаў, Л.Левін; бетон; бронза; вышыня скульптуры 9 м).

У пачатку мемарыяла забетанаваны адрэзак шляху, па якім ішлі на прарыў партызаны. Дарога на перападах рэльефу спускаецца прыступкамі, агінае невялікае балотца, робіцца шырэй каля бронзавай пліты — карты з рэльефнай схемай абароны партызанскай зоны на 11.4.1944 г. з надпісам: «Партызанскія злучэнні Полацка-Лепельскай зоны пасля працяглых жорсткіх бітваў з фашысцкімі карнікамі ў маі 1944 г. каля вёсак Пліна і Паперына здзейснілі легендарны прарыў варожай блакады. Іх было 17 185 супраць 60 000. Мужнасць народа перамагла смерць і стала бяссмерцем».

Далей дарога, сціснутая шэрымі бетоннымі сценамі, на якіх замацаваны бронзавыя пласціны з назвамі партызанскіх брыгад, што ўдзельнічалі ў прарыве, вядзе да вяршыні ўзгорка. На ім у разрыве бетоннай сцяны-глыбы (вышыня 11 м), якая сімвалізуе прарыў кальца блакады, узвышаецца 9-метровая бронзавая фігура партызана з аўтаматам у руцэ. На верхняй пляцоўцы ўзвышша, справа ад скульптуры, пахаваны 450 партызан з тых, што загінулі ў час прарыву, устаноўлены паўкругам 33 пліты з імёнамі 1452 удзельнікаў прарыву. Побач бронзавая кампазіцыя «Апошні прывал» — 3 карабіны ў пірамідзе і стужка з надпісам:



На мемарыяльным комплексе «Прарыў» (злева направа): намеснік старшыні Ушацкага райвыканкома Л.Р.Міхайлаў, кампазітар І.М.Лучанок, 1-ы сакратар Ушацкага РК КПБ М.М.Гірса, спявак Я.А.Еўдакімаў, намеснік старшыні Ушацкага райвыканкома І.С.Роўба, пісьменнікі В.У.Быкаў, Р.І.Барадулін. 1983 г.

«Яны загінулі ў барацьбе з ворагам, выканаўшы свой свяшчэнны абавязак перад Савецкай Радзімай і гісторыяй».

На ўзгорку пасаджаны 16 дубоў, якія сімвалізуюць стойкасць шаснаццаці партызанскіх брыгад. Ніцыя вербы і бярозы на вяршыні ўзгорка ўзмацняюць эмацыянальнае ўздзеянне ансамбля.

Мемарыяльны ансамбль «Прарыў» — адзін са значных твораў манументальнага мастацтва Савецкай Беларусі.

*В.Б.Караткевіч, Л.Г.Лапцэвіч.*

*Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. Мн., 1985. С. 433—435.*



Пятрусь Броўка ўскладае кветкі на партызанскіх могілках у в. Антунова.

**ПАЭТЫ З УШАЧЧЫНЫ АБ ПРАРЫВЕ**

## Пятрусь Броўка, народны паэт Беларусі

Калі я гляну сёння на ўшацкія сцежкі і прыгадаю, што яны ўсе паліты слязьмі нашых матак і сясцёр, і крывёй нашых братоў, нашых бацькоў і бачу, што на гэтых месцах расцвітаюць чырвоныя ружы, калі я бачу, што вы не забываеце тых, хто аддаў жыццё, — я ганаруся за сваіх землякоў, за ўшацкіх. Бо куды б я не паехаў, ва ўсім Савецкім Саюзе, ці нават за граніцай, я чую: «Во беларускія партызаны малайцы, а ўшацкія можа і тым больш».

А каб вы ведалі, як мне радасна было ў сорак трэцім годзе ў Маскве, калі прыехалі Дуброўскі і Маркевіч і прывезлі ад ушацкіх партызан, і ў тым ліку антуноўскіх, дзе быў Уладзімір Елісеевіч Лабанок, буханку нашага партызанскага хлеба і добры кавалак сала. Божа мой! Як пахнуў гэты родны хлеб. Ён выклікаў у нас слёзы!

І мы развіталіся з Дуброўскім і з Маркевічам. Я перадаваў усім прывітанне не



Партызаны брыгады імя П.К.Панамарэнкі на адкрыцці мемарыялу «Прарыў». Чэрвень 1974 г.

толькі ў вершах, якія я пісаў на фронце, а проста шчыра ім перадаючы, што мы хутка сустрэнемся і верыў у гэта. І мы сустрэліся.

**Рыгор Барадулін, народны паэт Беларусі**

УШАЧЧЫНА!

Злыя вятры
Ніколі цябе не абмінулі.
Слязу ўспамінаў сатры,
Салдатаў лясных матуля!

Ты рвалася з тхла
Да святла,
Палегла сыноў нямала:
Зялёнай калыскай
Была —
Блакаднай магілай стала.

Сыны не чакалі спагад,
Трывалі,
Стаялі трывала.
Жалезная воля брыгад
Смяротны ланцуг парвала.

# Вызваленне

МЫ ЧУЕМ ВАС!

*Братам воінам-беларусам*

Мы чуем вас!
Сыны вялікага народа.
Бо кожны дзень і кожны час
Грымоты бліжацца з усхода.

З зямлі Вялікай з вольным ветрам
Ваш заклік даляцеў да нас.
І сэрцы нашы ім сагрэты
Мы чуем вас.

Аб слаўных ратных справах вашых
Пяўцы складаюць песню-сказ.
Мацней забіліс сэрцы нашы,
Бо чуем вас.

У бой вядзе нас гнеў народны,
І блізак той чаканы час:
Зноў будзе Беларусь свабоднай!
Мы стрэнем вас.

Пакуль струменіць кроў у жылах,
Пакуль жыцця агонь не згас
Мы будзем біць фашыстаў з тылу,
Мы чуем вас!..

На ваш зварот, браты-героі,
Смерць акупантам! — Наш адказ,
У бой з фашысцкаю ардою!
Браты! Мы чуем вас!

*Аўтар верша партызан Павел Красноў*

23 чэрвеня 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя. Войскі 1-га Прыбалтыйскага, 2-га і 3-га Беларускіх франтоў пачалі наступленне на Віцебскім, Магілёўскім і Аршанскім напрамках.

У паласе наступлення войскаў 1-га Прыбалтыйскага фронту знаходзілася тэрыторыя Ушацкага раёна.

Яго вызвалялі часці 166-й (камандзір генерал-маёр А.І.Светлякоў), 46-й (ка-



Мітынг у г.п. Ушачы пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ліпень 1944 г.

мандзір палкоўнік К.А.Васільеў) і 9-й (камандзір генерал-маёр М.І.Бабахін) гвардзейскіх дывізій 2-га гвардзейскага стралковага корпуса (камандзір генерал-лейтэнант А.С.Ксенафонтаў) 6-й гвардзейскай арміі.

За тры дні наступлення савецкія войскі выйшлі да ракі Заходняя Дзвіна і захапілі пяць невялікіх плацдармаў на яе супрацьлеглым беразе. Адзін з гэтых плацдармаў знаходзіўся каля в. Хадакова Ушацкага раёна. Тут развярнуліся цяжкія баі з фашыстамі, што спрабавалі не даць фарсіраваць раку галоўнымі сіламі фронту. Ламаючы супраціўленне ворага, савецкія войскі пашырылі раней захопленыя плацдармы, якія аб'ядналіся ў адзін агульны плацдарм працягласцю ў 65 кіламетраў па фронце і да 10 кіламетраў углыбіню.

На плацдарме каля Хадакова вызначыліся сяржанты К.П.Кутрухін і Б.І.Юркін. Каб забяспечыць наступленне савецкіх войскаў, 27 чэрвеня ў баі за в. Хадакова Канстанцін Кутрухін закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота.

Камандзір аддзялення Барыс Юркін днём раней пераправіўся з байцамі цераз Заходнюю Дзвіну, падавіў агонь варожага дзота, уварваўся ў нямецкую траншэю, знішчаючы гітлераўцаў. У гэтым баі ён загінуў.

Абодвум ім пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля фарсіравання Заходняй Дзвіны камандуючы фронтам І.Х.Баграмян загадаў 6-й гвардзейскай арміі змяніць напрамак наступлення і нанесці ўдар па лініі Бачэйкава — Камень — Ушачы, а асноўным сілам ва ўзаемадзеянні з 39-й арміяй суседняга фронту наступаць на Лепель.

27 – 28 чэрвеня упартыя баі ішлі на тэрыторыі Ушацкага раёна на паўднёвым захадзе ад Улы. Да канца дня 28 чэрвеня савецкія войскі выйшлі на ўскраіну гарадскога пасёлка Ушачы.

29 чэрвеня воіны 46-й гвардзейскай стралковай дывізіі вызвалілі раённы цэнтр.

*М.М.Кірпіч.*

## Дакументы сведчаць

### ДАНЯСЕННЕ НАМЕСНІКА КАМАНДЗІРА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ДУБАВА» ПА РАЗВЕДЦЫ Ў АПЕРАТЫЎНУЮ ГРУПУ БЕЛАРУСКАГА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ НА 1-м БЕЛАРУСКІМ ФРОНЦЕ

**2 чэрвеня 1944 г.**

Разбитые германские воинские части, окруженные в районе Витебска, частично просочились из района окружения разными группами от единиц до 300 человек и больше. Показаниями пленных: Арссерлахен Вильгельм — 1921 г.р., г. Амстердам, 4-я дивизия, 51-й полк; Лоренс Франц — 1921 г.р., Татино, 206-я дивизия, механик-телефонист дивизии; Вольтц Кюнстер — шофер 156-й дивизии; Альфред Шмитотер — 4-я авиаполевая дивизия — установлено, что эти группы стремятся различными тропами, лесами продвинуться до м. Березино и в направлении г. Полоцка.

Такие группы имеются в лесах Сенненского, Чашникского, Лепельского районов. Лишенные пищи, немецкие разбитые части грабят мирных граждан и сжигают деревни Ихле, Бородавки, Застрежье, Гурнино Чашникского района.

О вышеизложенном доношу

Маркевич

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 40. Л. 131.*

*Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.*

### З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 29 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

...На Полоцком направлении наши войска вели наступательные бои, в ходе которых овладели районными центрами Витебской области городом Ушачи, Ветрино, а так же заняли более 150 других населенных пунктов, в том числе крупные населенные пункты Лысая, Валющина, Островляны, Туржец 1-й и 2-й, Воронеч, Орехово, Кубличи и железнодорожную станцию Ветрино. Наши войска перерезали железную дорогу Полоцк – Молодечно...

*З фондаў Ушацкага музея народнай славы імя У.Е.Лабанка.*

**ДАРОГА НА УШАЧЫ**

Войска 1-го Прибалтийского фронта, нанося основной удар силами 6-й гвардейской и 43-й армий в общем направлении на Бешенковичи, должны были форсировать Западную Двину, овладеть районом Бешенковичи и частью сил во взаимодействии с соединениями 3-го Белорусского фронта уничтожить группировку немцев в районе Витебска.

Соединения доукомплектовывались личным составом и боевой техникой. Усиленно велась боевая и политическая подготовка. Основное внимание уделялось на обучение стрелковых подразделений действиям в условиях лесисто-болотистой местности при прорыве обороны противника, боев в глубине и при форсировании водных преград. Большую работу проделал личный состав тыла армии. Было накоплено боеприпасов 2 боевых комплекта, или 10 400 тонн, ГСМ – 670 тонн, продфуража 1144 тонны.

Начиная с 12 июня, войска ночными маршами выдвигались в новые районы сосредоточения ближе к участку прорыва, а за два дня до начала боев были выведены в предисходное положение в 4 – 6 км от переднего края. На участке прорыва обороны противника протяженностью 18 км была создана плотность в 131 орудие и миномета на километр фронта. В результате тяжелых боев регулярные переправы через Западную Двину были наведены в районе Уллы, а затем и в Бешенковичах.

В Улле уже 27 июня действовал 9-тонный мост и курсировали паромы грузоподъёмностью 9,30 и 60 тонн.

Успешное наступление войск 6-й гвардейской армии было достигнуто в результате тщательной подготовки операции, осуществлению ряда мероприятий по всестороннему её обеспечению, правильной оценки обстановки и принятия командованием наиболее целесообразных решений.

Благодаря согласованным действиям артиллерии, авиации, взломавшим вражескую оборону, стрелковые дивизии при поддержке танков и содействии инженерных частей смогли наступать в высоких темпах 16 – 18 км в сутки.

За шесть дней боевых действий войска 6-й гвардейской армии прорвали оборону противника, форсировали Западную Двину и, развивая наступление в направлении Ушач, к исходу 28 июня вышли на рубеж Обаль, Озеро Яново, Сорочино, Ушачи, Камень.

*Друкуецца па кн.: Чистяков И.М. По приказу Родины. М., 1971. С. 161, 163.*

# Воіны-вызваліцелі — Героі Савецкага Саюза

**БАГРАМЯН Іван Хрыстафоравіч,** нарадзіўся 2.12.1897 г. у г. Гянджа (былы г. Елізаветполь), Азербайджан, савецкі ваенны дзеяч. Маршал Савецкага Саюза (1955). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1977). У арміі з верасня 1915 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Закончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1934) і Генштаба (1938). У пачатку Айчыннай вайны начальнік аператыўнага аддзела, намеснік начальніка штаба Кіеўскай асобай ваеннай акругі, з вясны 1942 г. начальнік штаба Паўднёва-Заходняга фронту. З ліпеня 1942 г. камандуючы 16-й (11-й гвардзейскай) арміяй Заходняга фронту, якая ўдзельнічала ў разгроме паўночнага фланга арлоўскай групоўкі праціўніка ў Курскай бітве 1943 г. З лістапада 1943 г. камандуючы войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту. Войскі гэтага фронту правялі Гарадоцкую аперацыю 1943 г., у ходзе якой акружылі і знішчылі варожую групоўку і стварылі спрыяльныя ўмовы для далейшага наступлення Чырвонай арміі. У час Беларускай аперацыі 1944 г. войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў акружылі і знішчылі віцебскую групоўку ворага, фарсіравалі Заходнюю Дзвіну, вызвалілі Віцебск. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту вызвалілі Полацк, Лепель, Ушачы, Глыбокае, Паставы, Браслаў, Панявежыс,



І.Х.Баграмян.



К.П.Кутрухін.



Б.І.Юркін.

Даўгаўпілс (Дзвінск), Елгаву (Мітаву) і інш. З лютага 1945 г. Баграмян намеснік камандуючага войскам 3-га Беларускага фронту. Удзельнічаў у арганізацыі і правядзенні Рыжскай, Усходня-Прускай і іншых аперацый. У пасляваенныя гады камандуючы войскамі Прыбалтыйскай ваеннай акругі. У 1954—1958 гг. у апараце Міністэрства абароны СССР: галоўны інспектар, намеснік міністра, потым начальнік Вышэйшай ваеннай акадэміі Генеральнага штаба. З 1958 г. намеснік міністра абароны, начальнік тылу Узброеных сіл СССР.

Узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, іншымі ордэнамі і медалямі СССР і замежных краін.

**КУТРУХІН Канстанцін Пракопавіч,** нарадзіўся 1.2.1916 г. у в. Удзельны Шумец Чэбаксарскага раёна. Герой Савецкага Саюза (1945). На фронце з 1943 г. Сяржант. Камандзір стралковага аддзялення 156-га гвардзейскага стралковага палка 51-й гвардзейскай стралковай дывізіі 6-й гвардзейскай арміі. Вызначыўся ў чэрвені 1944 г. пры фарсіраванні Заходняй Дзвіны ў Віцебскай вобласці і адбіванні на плацдарме 5 контратак. 27.6.1944 г. у баі за в. Хадакова Ушацкага раёна закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота. Пахаваны ў в. Дубраўка Ушацкага раёна. На месцы подзвігу пастаўлены мемарыяльны знак. Імя героя прысвоена Дубраўскай школе.

**ЮРКІН Барыс Іванавіч,** нарадзіўся 30.6.1919 г. у г. Арэнбург. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Закончыў Арэнбургскі тэхнікум шляхоў зносін (1938). У Чырвонай арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Айчынную вайну на фронце з красавіка 1944 г. Сяржант. Камандзір аддзялення 975-га стралковага палка 270-й стралковай дывізіі 6-й гвардзейскай арміі. Вызначыўся ў баях за вызваленне Ушацкага раёна. 26.6.1944 г. пераправіўся цераз Заходнюю Дзвіну, знішчыў варожы дзот, агонь якога перашкаджаў руху савецкіх войскаў, затым уварваўся ў траншэю і забіў 4 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Глыбачка Ушацкага раёна. Яго імем названы сярэдняя школа ў в. Глыбачка, вуліца ў Арэнбургу.

### З узнагароднага ліста на Б.І.Юркіна

**29 чэрвеня 1944 г.**

...Ком. отделения сержант Юркин Б.И., достигнув противоположного берега р. З.Двина, смело бросился в траншеи противника, который вел ожесточенный огонь по нашим подразделениям на переправах. Юркин гранатой уничтожил гарнизон ДЗОТа из 3 немецких солдат. Затем, действуя решительно, в самой траншее из автомата убил 4-х гитлеровцев. В этом бою сержант Юркин погиб смертью храбрых.

Его самоотверженный поступок увлек за собой других бойцов отделения, которые очистили данную траншею.

За героизм, проявленный в бою против немецких захватчиков, сержант Юркин представляется к званию Героя Советского Союза.

Командир 975 СП подполковник Гадецкий.

*З фондаў Ушацкага музея народнай славы імя У.Е.Лабанка.*

## Поўны кавалер ордэна Славы

**КЛОПАЎ Аніс Андрэевіч,** нарадзіўся 14.5.1914 г. у в. Наваселле. У Чырвонай арміі з 1938 г. У Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім і 3-м Беларускім франтах. Камандзір сапёрнага аддзялення малодшы сяржант Клопаў, вызначыўся ў баях ва Усходняй Прусіі. 10.1.1945 г. размініраваў поле шырынёй 40 м, 16.2.1945 г. адзін з першых фарсіраваў р. Штрадык і знішчыў з кулямёта каля 20 гітлераўцаў; у красавіку 1945 г. у час прарыву абароны на падыходзе да Кёнігсбер-

га зрабіў праход у мінным полі, разам з пяхотай уварваўся ў варожыя траншэі і знішчыў 13 гітлераўцаў, паранены працягваў бой. Удзельнік Парада Перамогі ў Маскве ў 1945 г. У 1953 г. вярнуўся на радзіму, жыў і працаваў ва Ушачах. Поўны кавалер ордэна Славы. Памёр 4.2.1995 г.

## Вызвалялі Ушаччыну

Тэрыторыю Ушацкага раёна вызвалялі ад фашыстаў у чэрвені 1944 г. часці 6-й гвардзейскай арміі. Дывізіі правага фланга гэтай арміі вялі наступленне з усходу на Полацк, а часці левага крыла арміі з поўдня і захаду рухаліся па зямлі Ушацкага раёна. У гэтых баях прымалі ўдзел воіны розных нацыянальнасцей.

Сярод іх быў гвардыі яфрэйтар Арамаіс Саркісаў — армянін, камандзір кулямётнага разліку. Ён удзельнічаў у баі пры прарыве варожай абароны каля г.п. Шуміліна. 24 чэрвеня 1944 г. гвардзейцы дывізіі выйшлі да ракі Заходняя Дзвіна ў раёне вёскі Бальбінава. Якраз у гэтым месцы знаходзіўся апорны пункт абароны праціўніка. Гітлераўцы ўмацаваліся на левым беразе ракі. Ноч прайшла даволі ціха. Раніцай наступнага дня 20 воінаў-гвардзейцаў пад агнём ворага пачалі пераправу цераз раку. У іх ліку быў і кулямётчык Арамаіс Саркісаў, які першым уступіў на заходні бераг ракі, заняў добрую пазіцыю і адкрыў трапны агонь па фашыстах. Адну за адной адбівалі атакі ворага гвардзейцы. Арамаіс Саркісаў загінуў у гэтым баі.

Тут жа здзейсніў свой подзвіг казах Абдула Жанзакаў. Ён падпоўз да дзота ворага і закідаў яго гранатамі: знішчыў 12 гітлераўцаў і аднаго ўзяў у палон.



А.А.Клопаў.

2-і гвардзейскі стралковы корпус разам з часцямі 1-га танкавага корпуса разгарнуў баі за вызваленне мястэчак Камень, Ушачы. Корпусам камандаваў генерал-лейтэнант А.С.Ксенафонтаў. Воіны 166-й і 46-й гвардзейскіх стралковых дывізій вызвалілі населеныя пункты Камень і Ушачы і да канца дня 29 чэрвеня выйшлі на лінію чыгункі Полацк — Маладзечна.

*Л.І.Чванаў.*

* * *

Першымі ва Ушачы ўвайшлі падраздзяленні 67-й гвардзейскай стралковай дывізіі 6-й гвардзейскай арміі. Сярод іх быў і гвардыі старшына Хачык Амаякавіч Меліксецян, наводчык 76-мм процітанкавай гарматы. Ён узнагароджаны ордэнамі Леніна, Славы (тройчы), Айчыннай вайны II ступені.

Пасля вайны Х.А.Меліксецян вярнуўся ў родны Ерэван, быў будаўніком. Памёр у студзені 1974 г.

*П.М.Фралоў.*

## Загінуў за вёску Павулле

Стаяла лета 1944 года.

Ішлі жорсткія баі на тэрыторыі Ушацкага раёна.

З баямі рухалася наперад і падраздзяленне, якім камандаваў гвардыі капітан Якаў Іванавіч Калашнікаў.

29 чэрвеня 1944 г. завязаліся баі непадалёку ад вёскі Павулле. Добра ўмацаваныя і замаскіраваныя дзоты праціўніка вялі па наступаючых прыцэльны агонь. Часта ўзнікалі рукапашныя схваткі. Адна з іх завязалася паміж ворагам і гвардзейцамі капітана Калашнікава. Камандзір сваім асабістым прыкладам натхняў байцоў. Пяць немцаў улажыў ён у рукапашным баі. Ды нямецкі снарад грымнуў побач. Упаў камандзір на зямлю. Асколак снарада трапіў яму ў жывот. Рана аказалася смяротнай. Праз некалькі гадзін гвардыі капітан Я.І.Калашнікаў памёр.

У хуткім часе ў Варашылаўградскую вобласць прыйшла «пахавальная» і баявыя ўзнагароды героя: ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалі. Не атрымала маці толькі дакладны адрас, дзе загінуў і пахаваны яе сын.



К.М.Літвінаў.



А.В.Шынкоўскі.

Яна вяла настойлівы пошук. Следапыты Глыбачанскай сярэдняй школы паведамілі ёй, што астанкі яе сына перапахаваны ў брацкую магілу ў в. Глыбачка.

На магілу Я.І.Калашнікава прыехалі маці Ксенія Сямёнаўна і сёстры Алена і Марыя. Прывезла Ксенія Сямёнаўна і пісьмы сына. У адным з іх ён пісаў:

*«Дарагая мама!*

*Ваша пісьмо атрымаў, за якое вялікі дзякуй. Вы паведамілі мне непрыемную вестку аб смерці Пеці. Даведаўшыся аб гэтым, я не мог прыйсці ў сябе. Ён загінуў у баі за вызваленне нашай Радзімы. За смерць любімага брата я буду, не шкадуючы сіл, біць фашысцкіх ворагаў.*

*Смерць брата выклікала ў мяне новую хвалю нянавісці да крывавых варвараў.*

* * *

*Мама! Цяжка нам, але ўсведамленне таго, што ён загінуў, як верны сын нашай Радзімы, змякчае гора. Хутка настане час, калі мы звядзём апошні лік з фашыстамі.*

*Перадавайце прывітанне Марыі і Алене.*
*З сыноўскім прывітаннем*
*Ваш Якаў.»*

*А.У.Салтук.*

**ЗЕМЛЯКІ НА ФРАНТАХ ВАЙНЫ**

## Адступаць далей было нельга

### З успамінаў удзельніка абароны Масквы К.М.Літвінава

Суровы 1941 год. Фашысцкія войскі рваліся да Масквы. Знаходзіўся ў ліку яе абаронцаў і я, камандзір аддзялення артылерыстаў. Нашы 203-мм гарматы наносілі па ворагу ўдар за ўдарам. Мужна змагаліся байцы, кожны ведаў, што адступаць далей нельга.

Дзякуючы стойкасці і мужнасці савецкіх салдат, праціўнік быў спынены. Больш таго, яго адкінулі на сотні кіламетраў ад Масквы. У гэтым была і заслуга артылерыстаў, якія крышылі варожую тэхніку, знішчалі пяхоту. За праяўленую мужнасць і адвагу пры абароне Масквы многія байцы былі ўдастоены ўрадавых узнагарод. У прыватнасці, я атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

І потым было нялёгка. Аднак абарона Масквы запомнілася больш за ўсё. Фашысты пацярпелі першае буйное паражэнне, правалілася іх ідэя «бліцкрыгу».

## Вылазка ў варожы тыл

У складзе 792-га сапёрнага батальёна падрыўнік Адольф Вікенцьевіч Шынкоўскі абараняў Маскву. У марозную ноч з 4 на 5 снежня 40 байцоў атрымалі загад зрабіць праходы ў варожай дротавай загародзе. Хутка яны былі заўважаны ворагам. Далей працавалі ўжо пад моцным агнём. А.В.Шынкоўскі быў паранены ў нагу. Паправіўшыся, трапіў у мотастралковую брыгаду, стаў разведчыкам. За адну з начных вылазак у варожы тыл атрымаў медаль «За адвагу». Тады ўдала разведалі месцазнаходжанне артылерыйскіх і мінамётных кропак праціўніка і перадалі аб гэтым у штаб. І іншыя «паходы» былі складанымі і рызыкоўнымі. Адольф Вікенцьевіч быў паранены ў другі раз.

Пасля шпіталя трапіў на курсы санітарных інструктараў, потым у санітарнае падраздзяленне. Вайну закончыў ва Усходняй Прусіі. Быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі «За абарону Масквы», «За баявыя заслугі», «За адвагу», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.».

Пасля вайны працаваў дырэктарам Весніцкай васьмігадовай школы, Селішчанскага дзіцячага дома, настаўнічаў у многіх школах раёна.

*В.В.Караленка.*

## Блакада была прарвана

### З успамінаў М.І.Кляшторнага, удзельніка абароны Ленінграда

Мне давялося бачыць, з якой упартасцю абаранялі Ленінград жыхары горада, савецкія байцы, бо сам знаходзіўся на перадавой з першых дзён блакады і да часу яе прарыву.

Стаялі на рацэ Свір. Праціўнік пастаянна нас атакоўваў, ды толькі мы ні на крок не адступалі. Мужнымі і адважнымі былі байцы і афіцэры 69, 70 і 3-й марскіх брыгад. Калі па ўсім фронце пачалося наступленне, мы пагрузіліся на катэры. Наш далейшы шлях ляжаў цераз Ладажскае возера. Перад намі стаяла задача перарэзаць чыгунку, не даць праціўніку магчымасці перакінуць пад Ленінград падмацаванне тэхнікай, жывой сілай. Баі ішлі жорсткія. Вораг штодня імкнуўся скінуць нас у возера. За тыя баі мяне і ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі. Блакада Ленінграда была прарвана.

## Фашысцкая хлусня

Вялікую Айчынную вайну Пётр Фёдаравіч Антопышаў сустрэў у Волагдзе, дзе быў прызваны ў Чырвоную армію. У складзе 58-га стралковага корпуса ў якасці стралка ручнога кулямёта ваяваў пад Ленінградам на Волхаўскім фронце. Асабліва памятны быў бой, у якім ён атрымаў цяжкае раненне.

Ветэран успамінаў: «Батальён трапіў у акружэнне. На працягу трох дзён праціўнік абстрэльваў яго з гармат і мінамётаў, бамбіў з самалётаў. Затым двое сутак было зацішша, самалёты не з'яўляліся. Становішча пагаршалася: скончыліся боепрыпасы, падступіў голад. У гэты цяжкі момант над пазіцыямі нашых войскаў самалёты скінулі лістоўкі, у якіх фашысты «прасілі прабачэння» за тое, што ў апошні час на нашу галаву не ляцеў смяротны груз. Прычына таму — захоп імі Масквы, а самалёты бамбяць цяпер Томск, Новасібірск і іншыя нашы гарады. «Здавайцеся — мы вам гарантуем жыццё», — так заканчваліся нямецкія лістоўкі. Але ніхто з нас не здаўся, ніхто не паверыў у гэту хлусню. Праз некаторы час падышло падмацаванне і батальён з акружэння выйшаў».

Пасля шпіталя П.Ф.Антопышаў быў дэмабілізаваны. Да 1968 г. працаваў на заводзе, затым вярнуўся ў родныя мясціны, на Ушаччыну.

*Ф.Р.Раманаў.*

## Абаранялі горад на Няве

Пад Ленінградам ваявалі жыхары Ушач М.І.Марковіч і А.К.Іваноў.

М.І.Марковіч камандаваў разлікам 75-мм гарматы. Яго баявы шлях прайшоў ад Ленінграда праз Польшчу, Румынію, Венгрыю. За вызваленне венгерскага горада Дэбрэцэна быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

А.К.Іваноў быў прызваны ў Чырвоную армію ў 1942 г. Вучыўся ў ваеннай школе радыёспецыялістаў. Затым трапіў у 42-і артылерыйскі полк 3-й стралковай дывізіі на Ленінградскі фронт. Цяжкімі былі баі пад Шлісельбургам. Ваяваў на 3-м Прыбалтыйскім фронце. Быў паранены. Калі паправіўся, зноў трапіў на фронт.

*Г.А.Варатынская.*

## Вышыня 178

200 дзён і начэй працягвалася гераічная Сталінградская бітва.

У радах 23-й стралковай дывізіі 65-й арміі адважна змагаўся ўраджэнец в. Забораўна камандзір роты Дзмітрый Ігнатавіч Касцюковіч. На фронце ён з першых дзён вайны.

Летам 1942 г. гітлераўцы пачалі наступленне на Сталінград. Асабліва жорсткія баі разгарнуліся ўвосень. Узвод малодшага лейтэнанта Дз.І.Касцюковіча з баямі авалодаў важнай вышынёй 178. Далася яна вельмі дарагой цаной. Жывымі засталося

толькі 7 байцоў, якія адбівалі адну контратаку фашыстаў за адной.

Усе байцы былі прадстаўлены да ўрадавых узнагарод. Дз.І.Касцюковіч атрымаў медаль «За адвагу».

У 1943 г., у адным з баёў ужо камандзір роты лейтэнант Касцюковіч быў цяжка паранены. Выратаваць яму жыццё ўрачам не ўдалося. 3 снежня 1943 г. ён памёр. Было яму ўсяго 20 гадоў.

*Л.І.Іванаў.*

## Марыў дайсці да Берліна

### З успамінаў М.Шаўчэнкі

Пасля заканчэння палкавой школы, мне прысвоілі званне сяржанта. Хутка пачалася вайна. Ваяваць пачаў пад Цярнопалем. Там мяне і параніла ў плячо. Правёў тры месяцы ў шпіталі, адтуль трапіў у запасны полк, які стаяў пад Ржэвам. Потым апынуўся пад Сталінградам. Прызначылі камандзірам разліку 120-мм мінамёта прарыўной брыгады. Баі ішлі і днём і ноччу. Фашысты распачыналі атаку за атакай, імкнуліся захапіць горад любой цаной. Але мы стаялі цвёрда, разумелі, што адступаць нельга, проста не маем на гэта права.

Наступіў доўгачаканы дзень: пачалося наступленне нашых войскаў па ўсім фронце. Мы прарвалі варожае акружэнне і замкнулі кальцо вакол 6-й нямецкай арміі на чале з фельдмаршалам Паўлюсам. Яна хутка капітулявала. А мне зноў не пашанцавала: асколак трапіў у нагу. «Падрамантавалі» — і зноў на фронт. Марыў дайсці да Берліна, але атрымаў новае раненне. 25 кіламетраў не дайшоў да логава фашыстаў...

З вайны вярнуўся з узнагародамі — медалямі «За абарону Сталінграда», «За адвагу» і іншымі.

## Будавалі абарончыя рубяжы

### З успамінаў М.А.Лявонцьева

Атрымалася так, што вайна для мяне праходзіла ў асноўным у тыле. Працаваў на будаўніцтве абарончых рубяжоў ва Ульянаўскай вобласці. Не верылася, што туды можа дайсці вораг. Але баі ішлі аж пад Сталінградам... Працавалі жанчыны і дзяўчаты, прыехаўшыя з Казані, Ульянаўска, навакольных раённых цэнтраў. Яны капалі процітанкавыя равы, акопы, рабілі бліндажы ўздоўж Волгі, вазілі лес для ўмацаванняў.

Трэба было бачыць, як працавалі людзі! Равы капалі ў асноўным у нізінах, дзе было мокра, не прамярзала зямля. Многія працавалі ў туфліках. Не было цёплай вопраткі. Але колькі было ў людзей рашучасці, веры ў перамогу!..

Увечары чалавек па трыццаць разыходзіліся па навакольных вёсках, каб трохі адпачыць. Гаспадыні рыхтавалі гарачую ваду, налівалі яе ў розны посуд і жанчыны разагравалі застыўшыя ногі.

Цяжка прыходзілася і тым, хто працаваў на падвозцы лесу. Дзяўчаты, якія некалі баяліся нават падысці да коней, цяпер кіравалі імі, рабілі мужчынскую работу. І ніхто не гаварыў пра цяжкасці.

Так тыл дапамагаў фронту, уносіў свой уклад у вызваленне Радзімы.

## Артылерыя дзейнічала зладжана

Ляскание танкавых гусеніц назаўсёды застаецца ў памяці знішчальніка танкаў. Менавіта ў такіх войсках служыў Рыгор Міхайлавіч Бандарэнка. Атрымалася так, што тэрміновую службу ён закончыў гарматным майстрам і, калі пачалася вайна, яго прызначылі камандзірам 45-мм гарматы.

Баявое хрышчэнне атрымаў пад Ленінградам. Нешчаслівым аказаўся гэты бой: побач разарваўся варожы снарад і некалькі чалавек з разліку трапілі ў шпіталь.

Пасля шпіталя Рыгора Міхайлавіча накіравалі ў процітанкавы знішчальны артылерыйскі полк, які ўваходзіў у склад узбекскай нацыянальнай брыгады. Размяшчаўся ён тады пад Масквой па Яраслаўскай шашы.

Хутка полк перакінулі пад Сталінград. Армія Паўлюса была ўжо акружана, аднак

вораг адчайна супраціўляўся. Каб не прапусціць варожыя танкі цераз раку Паўночны Данец, наш полк заняў абарону каля раённага цэнтра Андрэеўка пад Харкавам.

— Рака ў гэтым месцы была даволі шырокая, — успамінаў Рыгор Міхайлавіч. — Прыбылі мы туды 8 сакавіка 1943 г. Змяркалася, таму даводзілася спяшацца. Я з камандзірам другой гарматы старшым сяржантам Мазаевым выбралі пазіцыю, снегам замаскіравалі гарматы, а самі размясціліся ў старых траншэях.

Ноч прайшла спакойна. Пад раніцу недзе далёка пачуўся гул танкавых матораў. Ён то набліжаўся, то аддаляўся, і не зразумець было, у якім напрамку рухаліся танкі. Разлікі занялі свае месцы каля гармат.

Чакаць за ўсё цяжэй, асабліва бою. А гэта быў яшчэ і першы бой, у якім артылерысты выходзілі адзін на адзін з танкамі. Пасля было ўсялякае. Давялося нават выкочваць гармату наперад пяхотных пазіцый. Зараз жа іх чакаў суровы экзамен. Вось далёка паказаўся адзін танк, за ім другі…

— Чатыры танкі і шэсць бронетранспарцёраў, таварыш старшы сяржант, — далажыў наводчык.

Пакуль яшчэ быў час, сабраліся на кароткую нараду камандзіры гармат. Улічваючы, што боепрыпасаў было не так многа, рашэнне прынялі такое: падпусціць як мага бліжэй і страляць адразу на паражэнне. Старшы сяржант Бандарэнка страляе



Р.М.Бандарэнка.



І.Е.Качан.

па першым, Мазаеў па апошнім, а ўжо тады знішчаць і астатнія.

Усё бліжэй і бліжэй вораг, наводчык прыпаў да прыцэла, усе ў разліку застылі на сваіх месцах. Вось танк на мосце, яшчэ крыху і можна страляць. Як толькі гусеніцы дакрануліся да нашага берага, раздалася каманда «Агонь!». Адным снарадам Бандарэнку ўдалося падпаліць танк. Апошні, які ўзышоў на мост, падбіў Мазаеў. Затым разлікі, як і было дамоўлена, павялі агонь па астатніх, што былі на мосце.

Вораг, відаць, нават не зразумеў, адкуль стралялі — так зладжана дзейнічалі артылерысты. Яшчэ некалькі трапных стрэлаў — загарэліся і астатнія два танкі.

Бронетранспарцёры развярнуліся і, не прыняўшы бою, адышлі назад.

*Р.К.Гладышаў.*

## Браты Качаны

Тры браты з сям'і Качаноў змагаліся з ворагам на франтах вайны. Бывалым воінам быў Іван Еўдакімавіч: ваяваў на савецка-фінляндскай вайне 1939 – 1940 гг., штурмаваў «лінію Манергейма», за што атрымаў медаль «За баявыя заслугі». У гады Айчыннай вайны старшы лейтэнант І.Е.Качан абараняў Маскву, Сталінград, удзельнічаў у баях на Арлоўска-Курскай дузе. Пад Ленінградам загінуў яго старэйшы брат Аляксандр. Не адбылася і сустрэча Івана з братам Паўлам. Калі Іван прыехаў у авіячасць, дзе служыў Павел, былы беларускі партызан, аказалася, што два дні назад ён з групай дэсантнікаў быў закінуты ў варожы тыл. Павел загінуў у Германіі, пад Берлінам.

*Я.К.Лявонаў.*

## Гэта было пад Курскам

### З успамінаў С.Цыганкова

Вайну я прайшоў у складзе 33-й гвардзейскай мінамётнай дывізіі. На ўзбраенні нашага палка знаходзіліся славутыя «кацюшы».

Нас перакідвалі з фронту на фронт, у самыя гарачыя месцы. Пераязджалі звычайна сваім ходам, употай ад праціўніка. Займалі вызначаныя пазіцыі і рабілі некалькі вогненных залпаў, пасля чаго хутка пакідалі рубеж, бо вораг адразу ж адкрываў па нас агонь з гармат. У небе з'яўляліся самалёты.

Больш за ўсё запомнілася Курска-Арлоўская аперацыя. Адбіўшы націск вора-


К.Ц.Падворны.

га, савецкія войскі нанеслі на Курскай дузе сакрушальнае паражэнне фашыстам. У нашу задачу ўваходзіла наносіць залпавыя ўдары «кацюшамі» па ўмацаваннях, танках і пяхоце праціўніка. Стралялі маланкава, нечакана. У выніку фашысты неслі вялікія страты, нашы часці мелі магчымасць наступаць, узломваць варожую абарону.

У гэтых баях я быў паранены і доўгі час ляжаў у шпіталі. Менавіта за баі на Курскай дузе мяне ўзнагародзілі медалём «За баявыя заслугі». Вайну закончыў у Венгрыі. Можа б дайшоў і да Берліна, каб не новае раненне.

## Баі за Сапун-гару

### З успамінаў Л.Кляпца

Да вайны я займаўся будаўніцтвам дарог. У пачатку вайны давялося працаваць пад Оршай, Смаленскам, у Ніжнім Тагіле, на Каўказе. Ішла эвакуацыя заводаў, рознага абсталявання. Трэба было расшыраць чыгуначную сетку.

Пазней пайшоў ваяваць. У армію прызвалі, калі працаваў на Каўказе. Ішла вясна 1942 г. У вучэбнай аўташколе набыў прафесію вадзіцеля. Далі нам тэхніку і пачаліся выпрабаванні на ваенных дарогах.

У складзе 19-й зенітнай дывізіі вызваляў горад Грозны. Памятнымі былі баі на Таманскім паўвостраве. Вызваляў Крым. Трынаццаць сутак ішлі жорсткія баі за Сапун-гару. Зямля гарэла пад нагамі. Здавалася, не хопіць сіл утрымацца, але выстаялі. Быў вызвалены Севастопаль. Далей на маім баявым шляху былі Малдавія, Румынія, Венгрыя, Чэхаславакія. Перамогу святкаваў 12 мая а 4-й гадзіне раніцы за некалькі кіламетраў ад Прагі.

## Ішоў наперадзе сапёр

Мітрафан Асташкевіч пакінуў бацькоўскі дом адразу пасля прыходу захопнікаў. З трыма хлопцамі падаўся ў партызаны. Удзельнічаў у засадах на карнікаў, хадзіў на чыгунку. У 1944 г., пасля вызвалення, партызанская моладзь улілася ў дзеючую армію. М.Асташкевіч пачаў вывучаць складаную справу сапёра.

Колькі затым «падарункаў», хітрых і небяспечных, што пакінуў пасля сябе ў зямлі фашыст, абясшкодзіў салдат, колькім людзям выратаваў жыццё!..

У Літве, пад Шауляем, вораг аказаў нашым войскам моцнае супраціўленне. Фашысты замацаваліся на левым беразе невялікай, але даволі глыбокай ракі. Яны знішчылі пераправу цераз яе, узвялі на беразе перашкоды, падыходы замініравалі. Сапёрам выпала нялёгкая работа. Ноч, наша саюзніца, цяпер была бяссільнай, вораг бесперапынна асвятляў ракетамі мясцовасць, пасылаючы ў падазроны напрамак смертаносную чаргу. Але сапёры зрабілі сваю справу, і нашы войскі без затрымкі рушылі на захад. Радавы М.Асташкевіч за выдатнае выкананне задання быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

*Г.В.Багдановіч.*

## Салдат трох войнаў

Кірыла Цярэнцьевіч Падворны з в. Старына прайшоў тры вайны. Ён удзельнік 1-й сусветнай вайны. Тады ваяваў ён у складзе Гайваронскага палка на Украіне. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, разам з салдатамі сваёй часці добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію. У 1919 г. ваяваў супраць палякаў на тэрыторыі Беларусі ў складзе 1-га Рэвалюцыйнага палка. Закончыў 88-я Гомельскія пяхотныя камандныя курсы. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны быў дэмабілізаваны.

У гады Вялікай Айчыннай быў кулямётчыкам у партызанскай брыгадзе імя С.М.Кароткіна, камандзірам кулямётнага аддзялення ў 599-м стралковым палку 1-га Прыбалтыйскага фронту. У баях пад Рыгай быў паранены. Пасля шпіталя трапіў у 234-ы стралковы полк, але ненадоўга: зноў атрымаў раненне. Дадому вярнуўся ў 1946 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені.

Памёр 5.4.1993 г.



Д.Д.Віннік.

## Выстаялі!..

Сотні ваенных вёрстаў за плячамі Лаўрэна Іванавіча Пугача. Вызваляў Полаччыну, што побач з роднай Ушаччынай. Там, у в. Слабада, засталася яго сям'я. Многа прыйшлося яму перанесці цяжкасцей, выпрабаванняў.

...Аднойчы групу нашых салдат акружылі гітлераўцы. Іх заўважылі, калі раздаліся аўтаматныя чэргі. У адно імгненне Л.І.Пугач апынуўся каля кулямёта і, убачыўшы нямецкага афіцэра, націснуў на гашэтку. Ён не быў кулямётчыкам, але знаходзіўся побач з кулямётам і не разгубіўся. За геройскі ўчынак быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

За вызваленне Рыгі атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Артылерыйскі ўзвод, у якім быў Л.І.Пугач, панёс вялікія страты: былі разбіты амаль усе гарматы, загінула шмат людзей. Загад не прапусціць ворага прыйшлося выканаць тром чалавекам, якія засталіся жывымі, і яны выстаялі. Праціўнік на гэтым участку не прайшоў.

Далей Л.І.Пугач ваяваў ва Усходняй Прусіі. Быў двойчы паранены, але кожны раз вяртаўся ў строй.

Калі прыйшоў дадому, даведаўся, што датла была спалена гітлераўцамі яго вёска, у час блакады загінуў яго трохгадовы сын.

*У.К.Жыткоў.*

## Маракі з вёскі Рагуцкія

Бацька і сын Віннікі з в. Рагуцкія звязалі свой лёс з морам. Абодва сталі маракамі Балтыйскага флоту. Бацька Даніла Міхайлавіч удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях, грамадзянскай вайне. Ад яго аднавяскоўцы даведаліся аб гэтых падзеях, аб партыі бальшавікоў. З маленства для Дарафея Данілавіча бацька быў прыкладам. Таму, закончыўшы ў 1933 г. сярэднюю школу, паступіў у Ленінградскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча.

Малады лейтэнант выбраў службу падводніка. На працягу 1938 – 1954 гг. служыў на падводных лодках на Балтыйскім і Ціхаакіянскім флатах. Быў камандзірам баявой часці, вахтавым афіцэрам, дывізіённым мінёрам, памочнікам камандзіра і камандзірам падлодкі. Удзельнік двух войнаў — савецка-фінляндскай 1939 – 1940 гг. і Вялікай Айчыннай.

Як дывізіённы мінёр, Дарафей Данілавіч кіраваў падрыхтоўкай тарпеднага, міннага і артылерыйскага ўзбраення, ідучых у баявыя паходы лодак. Як вахтавы афіцэр з вопытам, хадзіў у баявыя паходы на падводных лодках. Ён быў удзельнікам патаплення шасці фашысцкіх суднаў. Будучы вахтавым афіцэрам на падлодцы С-4 у верасні 1941 г. Дарафей Данілавіч першым убачыў цяжкагрузны варожы танкер, які спяшаўся ў Лібаву. Танкер быў патоплены. Але і наша падлодка ўдарылася аб каменны грунт. Лодка ляжала на глыбіні 18 метраў. Корпус затрашчаў, у адсеках пагасла святло, над лодкай пачалі ўзрывацца глыбінныя бомбы. У адсеках стала цяжка дыхаць. Камандзір падводнай лодкі прыняў рашэнне ўсплываць.

Калі ўсплылі, убачылі, што лодка знаходзіцца ў сярэдзіне вялізнай масляной плямы, якая засталася ад падбітага танкера. Марудзіць было нельга. На вялікай хуткасці выйшлі ў раён вялікіх глыбінь.

За патапленне фашысцкага танкера ордэнамі і медалямі былі ўзнагароджаны многія члены экіпажа. Камандзір падлодкі Д.Д.Віннік за гады вайны атрымаў ордэны Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі (два) і шмат медалёў.

*А.Н.Полазаў.*

## Слова пра бацьку

Мой бацька Мікалай Арцёмавіч Каралёў у 1942 г. пайшоў у партызаны. Ваяваў кулямётчыкам у брыгадзе імя Сталіна. Пасля прарыва варожай блакады каля вёсак Паперына і Новае Сяло, вызвалення Ушацкага раёна часцямі Чырвонай арміі, пайшоў на фронт. Быў камандзірам аддзялення 2-й кулямётнай роты 171-га стралковага палка 182-й стралковай дывізіі. Баі ва Усходняй Прусіі былі цяжкімі. Прыходзілася авалодваць моцнымі абарончымі ўмацаваннямі праціўніка. Добра запомніў ён бой пры фарсіраванні канала. Фашысты контратакавалі, пусціўшы наперад танкі. Варожыя машыны падавілі адну нашу гармату, затым кулямётную кропку. Аднак далей прарвацца не змаглі, запалалі. За смеласць і адвагу, праяўленыя ў гэтым баі, мой бацька быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

Да перамогі было яшчэ далёка. Але бацька марыў сустрэць яе ў Берліне. Атрымалася ж інакш. Фашысцкая куля напаткала яго пад Кёнігсбергам. Здарылася гэта так. Пачаўся бой. Запрацаваў кулямёт бацькі. Некалькі разоў паступала каманда: «Кулямёт наперад». І бацька выконваў яе як мага хутчэй. Левы фланг амаль дасягнуў лініі абароны праціўніка, адставаў правы фланг і кулямётчык перанёс агонь туды, каб падтрымаць байцоў. І тут рэзкі ўдар па нагах... Але толькі на адзін момант змоўк кулямёт. Пераадолеўшы боль, бацька зноў адкрыў агонь...

Таварышы падабралі яго пасля бою, аднеслі ў медсанбат, дзе прыйшлося ампутаваць нагу. Там ён даведаўся, што Кёнігсберг узяты.

Дадому вярнуўся, калі вайна ўжо скончылася, праз дзевяць месяцаў. Хутка яго выклікалі ў райваенкамат, дзе ўручылі ордэн Славы II ступені.

*У.М.Каралёў.*

## Раніцай у наступленне

### З успамінаў А.Кляшчонка

Пад Альбавай мы сустрэлі моцную абарону праціўніка. Наша пазіцыя была не вельмі зручная. Восень, холад. Рота ляжыць на лузе, амаль у ледзяной вадзе. Камандзір узвода загадаў прарвацца да камандавання роты і ўзгадніць далейшы план дзеянняў. У сутычцы з ворагам загінула пяць маіх сяброў. Загад камандзіра роты быў як бы просты: дайсці, даставіць данясенне і, пакуль не будзе загаду, ляжаць і чакаць. Не памятаю толькі колькі нам прыйшлося ляжаць пад градам куль і снарадаў, але ўвечары падыйшло падмацаванне. Кароткі адпачынак, раніцай — наступленне. Вось тут мяне і параніла. Шпіталь. І зноў перадавая.

Не толькі ва Усходняй Прусіі змагаўся я з нямецкімі захопнікамі. Да гэтага давялося партызаніць у сваіх родных мясцінах. Наш атрад імя Чапаева дзейнічаў у раёне Ушачы — Стралок, дзе я знаходзіўся з 1943 г. па 1944 г. Удзельнічаў у прарыве блакады ў раёне вёсак Паперына і Пліна.

## Сапёр Гаўрыла Старадуб

Гаўрылу Пятровіча Старадуба вайна застала ў брата, у в. Лутава Сяльцо. Вярнуцца ў Вілейку, дзе ён жыў, не змог. Застаўся на Ушаччыне, пайшоў у партызаны. Ваяваў у брыгадзе імя Чапаева. Быў намеснікам камандзіра атрада па разведцы.

Здарылася так, што цяжка захварэў і яго накіравалі ў савецкі тыл на лячэнне...

Потым трапіў у дзеючую армію, у 94-ы гвардзейскі асобны сапёрны батальён. У ім і ваяваў да канца вайны.

Вызваляў родную Беларусь. Атрымаў тры медалі «За адвагу». Першую — за

ўдзел у прарыве абароны праціўніка пад Оршай, другую — за фарсіраванне Нёмана, трэцюю — за вызваленне Барысава...

Цяжкімі і памятнымі былі баі ва Усходняй Прусіі.

Аднойчы Г.П.Старадуба і яшчэ аднаго сапёра выклікаў да сябе камандзір батальёна і загадаў зрабіць праход у мінным полі для дывізіённай разведкі, якая ішла па «языка». Ноччу воіны зрабілі сваю справу. Як высветлілася потым, разведчыкі паспяхова выканалі загад, узяты імі ў палон варожы салдат даў каштоўныя звесткі. Гаўрыла Пятровіч атрымаў ордэн Славы III ступені.

У Кёнігсбергу кожны дом быў пераўтвораны ў крэпасць. Аднак нашы штурмавыя групы бралі квартал за кварталам, дом за домам. Сапёры дапамагалі штурмуючым. За тыя баі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.



Г.П.Старадуб.



С.А.Кучын.

*Г.В.Багдановіч.*

## Батальён задачу выканаў

Сямён Андрэевіч Кучын быў прызваны ў Чырвоную армію ў пачатку вайны. Памятны для яго баі ў Польшчы.

Ён, тады ўжо капітан, камандаваў батальёнам. У ноч на 1 жніўня 1944 г. атрымаў загад фарсіраваць Віслу.

Задача была не з лёгкіх, бо рака паўнаводная, шырокая, вораг у любы момант мог заўважыць пераправу і адкрыць агонь. Камбат вырашыў заблытаць праціўніка і пачаў пераправу адначасова ў некалькіх кропках. Байцы знайшлі на беразе некалькі лодак, з розных падручных матэрыялаў зрабілі плыты і ў поўнай цішыні пачалі пераправу ў трох месцах. Капітан Кучын арганізаваў зладжаную работу салдат. Гітлераўцы позна ўбачылі небяспеку і не паспелі арганізаваць абарону, таму і страты ў батальёне былі мінімальныя. Перадавы эшалон хутка дасягнуў супрацьлеглага берага. Завязаўся бой. Падыйшла дапамога. За паўтары гадзіны салдаты разам з матэрыяльнай часткай фарсіравалі раку, пераправілі і мінамётную батарэю.

Батальён уступіў у бой. Стаяла задача пашырыць плацдарм. І гэта ўдалося зрабіць батальёну: былі збіты заслоны фашыстаў, знішчаны некалькі кулямётных кропак, і да світанку вораг быў адціснуты на пяць кіламетраў ад ракі.

Наступіла раніца. Фашысцкае камандаванне кінула супраць атакуючых новыя сілы. Умела кіраваў батальёнам капітан Кучын. Пад яго камандаваннем байцы адбівалі адну за адной контратакі ворага. Фашысты надавалі плацдарму выключнае значэнне. Паспяховыя дзеянні нашых байцоў дазволілі ў хуткім часе пераправіць яшчэ адну мінамётную батарэю.

З кожнай гадзінай нарастаў напал бою. Нават ноч не прынесла перадышкі. Вораг узмацніў абстрэл. На світанні праціўнік узняўся ў атаку. Зноў закіпеў бой. Але не адступілі байцы Кучына. Сем контратак адбілі яны за адзін толькі дзень.

Сваю задачу батальён выканаў. Ён адцягнуў сілы праціўніка на сябе. Тым часам полк, а затым і дывізія пераправіліся цераз раку.

Многія байцы і камандзіры былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, С.А.Кучын — ордэнам Леніна.

Пасля вайны ён працягваў службу ў Савецкай арміі.

*П.М.Фралоў.*

## У баях за Венгрыю

### З успамінаў М.Марковіча

Я ганаруся тым, што ўдзельнічаў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Служыў у артылерыі. Змагаўся з танкамі, пяхотай праціўніка. Першы раз быў



М.Я.Коўшаль.

## Вызвалілі савецкіх ваеннапалонных

### З успамінаў Р.Первянёнка

Давялося мне біць фашыстаў на тэрыторыі Балгарыі, Венгрыі, Югаславіі. У пачатку мая мы прыйшлі на аўстрыйскую зямлю. 8 мая 1945 г. нашаму палку далі заданне рухацца далей. Адышлі кіламетраў мо дваццаць, дагнаў нас сувязны штаба і паведаміў, што вайна скончылася. Што тут было! Бязмежная радасць ахапіла кожнага з нас. Тут жа арганізавалі мітынг. Бралі слова і афіцэры, і радавыя. Гаварылі пра моц нашага народа. Рушылі далей.

...Прыбылі ў горад Грац. Дзіўна было, што людзі ў ім нікуды не спяшаліся, па вуліцах хадзілі трамваі. Але мы памяталі аб сваёй місіі вызваліцеляў. Зусім мала часу спатрэбілася, каб адшукаць два вялікія лагеры ваеннапалонных. Збілі з дзвярэй замкі і выпусцілі людзей. Не трэба тлумачыць, што значыла для іх доўгачаканае слова «перамога».

Вось такім быў для мяне той веснавы дзень — 9 мая 1945 г.

## Перамогу сустрэў каля Вены

У 1936 г. Міхаіл Якаўлевіч Коўшаль быў прызваны ў Чырвоную армію. Неўзабаве яго накіравалі ў Магілёўскае вучылішча сувязі. Там і сустрэла яго вайна. Разам з вучылішчам ён быў эвакуіраваны ў горад Сярдобск Пензенкай вобласці. Там і закончыў ён вучылішча. Маладога лейтэнанта накіравалі ў Новачаркаск, дзе ён быў прызначаны начальнікам сувязі корпуса.

На данецкай зямлі ўпершыню зведаў Міхаіл Якаўлевіч варожае акружэнне, быў паранены ў руку і сківіцу. Паранены пераплыў Днепр і дабраўся да сваіх. У прытомнасць прыйшоў у адным са шпіталяў Сталінграда. Праз месяц у якасці начальніка сувязі артылерыйскага палка абараняў горад Сталінград. Гэта былі страшэнныя баі, здавалася, што гарыць зямля. З палка засталося жывымі толькі 17 чалавек. Пасля гэтых падзей М.Я.Коўшаль трапіў у 3-ю танкавую армію, у складзе якой удзельнічаў у Арлоўска-Курскай бітве, вызваляў Кіеў, штурмаваў Берлін, Прагу. Не толькі наладжваў сувязь, але хадзіў у штыкавыя, рукапашныя атакі.

За ўдзел у фарсіраванні Дняпра, калі вызвалялі Кіеў, Міхаіл Коўшаль атрымаў ордэн Вялікай Айчыннай вайны II ступені, другі такі ж ордэн — за Сандамірскую аперацыю ў Польшчы. У гэтых баях былі ўзяты ў палон 12 нямецкіх «тыграў». Адзін з іх быў накіраваны сваім ходам у Маскву на выстаўку, дзе дэманстравалася зброя праціўніка.

За ўдзел у баях на Арлоўска-Курскай дузе Міхаіл Якаўлевіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Ёсць у яго і медалі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Прагі», «За ўзяцце Берліна».

Перамогу сустрэў непадалёку ад Вены. Атрымаў водпуск. Бацька паведаміў яму аб смерці брата Валодзі, які партызаніў у родных мясцінах, што браты Ягор і Сцяпан яшчэ не вярнуліся з фронту дадому.

Дэмабілізаваўся М.Я.Коўшаль у 1947 годзе. 16 гадоў кіраваў калгасам «Новы мір» у родных мясцінах.

*У.К.Жыткоў.*

# Уперад, на Берлін!

## З успамінаў А.Чарткова

Вясна 1945-га. Кожны з нас адчуваў набліжэнне доўгачаканага часу перамогі. Нікому не хацелася паміраць за некалькі дзён да канца вайны, але страху не было, мы імкнуліся наперад. Намі валодала жаданне хутчэй разграміць ворага, хутчэй вярнуцца ў родныя мясціны.

Пачаўся штурм Берліна. Як чакалі мы гэтых слоў: «Уперад, на Берлін!». І загад прыйшоў. Штурм быў упартым, дзёрскім. На подступах і ў самім горадзе завязаліся кровапралітныя баі. Мы бралі квартал за кварталам, дом за домам. Гінулі мае таварышы. Аднак нішто не магло спыніць нас.

Памятаю, рота, у якой я ваяваў, штурмавала трохпавярховы дом. Фашысты знаходзіліся на трэцім паверсе, мы на другім. З вялікімі цяжкасцямі, але ўсё ж выбілі іх адтуль. Праз праёмы вокнаў было бачна, як гітлераўскія салдаты перабягалі вуліцу. Я раз-пораз адкрываў па іх агонь з аўтамата. У гэты момант побач разарваўся снарад. Я быў кантужаны і апрытомнеў толькі ў шпіталі. Не доўга знаходзіўся там. Зноў баі за Берлін. Потым была Прага.



А.Л.Чарткоў.



В.Я.Шкецік.

# Дайшоў да Германіі

Віктар Якаўлевіч Шкецік у верасні 1939 г. трапіў на ваенныя зборы. Удзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь. У 1940 г. трапіў на савецка-фінляндскі фронт. Атрымаў узнагароду ордэн Чырвонага Сцяга. На другі дзень Вялікай Айчыннай быў прызваны ў Чырвоную армію. Яго прызначылі намеснікам начальніка шпіталя па палітчастцы. Шпіталь знаходзіўся тады ў Полацку. Цяжка было. Адступалі. Пад Ржэвам здарылася бяда — нямецкая бомба трапіла ў вагон, дзе знаходзіліся медыкаменты, гаспадарка шпіталя. Загінулі тады дзесяць чалавек з медперсаналу. Параненых выратавалі. Калі пачалося наступленне, стала лягчэй — усе жылі прадчуваннем перамогі. Дайшоў да Германіі. Перамогу сустрэў у Патсдаме. За гады вайны быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, некалькімі медалямі.

У 1946 г. вярнуўся дадому. Працаваў намеснікам старшыні Ушацкага райвыканкома, пракурорам раёна, узначальваў калгас «Бальшавік», быў намеснікам дырэктара саўгаса «Ушацкі».

*У.К.Жыткоў.*

# Паядынак з «тыграмі»

Першую баявую ўзнагароду, ордэн Чырвонай Зоркі, Мікалай Фядосавіч Лявошка атрымаў за вызваленне Гомеля. Нямецкія танкі рабілі спробу адбіць толькі што вызвалены горад. Процітанкавы дывізіён, у якім быў М.Ф.Лявошка, прыняў на сябе ўдар гітлераўцаў. Бой быў працяглы і жорсткі. З другога стрэлу наводчык Лявошка падбіў нямецкі танк. Па акопах тады хадзіў лісток аб яго подзвігу. Баявы шлях салдата пралягаў праз Гомель, Рэчыцу, Жлобін, Польшчу ў Германію. У баях за горад Франкфурт-на-Одэры ён быў ужо камандзірам гарматы. Жудаснай была атака нямецкіх танкаў. «Тыгры» ішлі калонамі па тры. Ад бесперапыннай стральбы на гармаце абгарэла фарба. У тым баі ён падбіў «тыгр» да таго, як гітлераўцы выявілі іх дыслакацыю. Сябры віншавалі яго з узнагародай — ордэнам Славы III ступені. Затым ён атрымаў яшчэ ордэны Славы II ступені, Айчыннай вайны II ступені.

*В.В.Караленка.*

## Радаваліся вясне і цішыні

### З успамінаў В.Балабоўкі

У красавіку 1945 г. наша 207-я дывізія 3-й ударнай арміі займала пазіцыі на Одэрскім плацдарме. Стаялі ў 60 кіламетрах ад Берліна.

Усе разумелі, хутка фашызму прыйдзе канец. Але ішлі жорсткія баі, гінулі салдаты. А так хацелася жыць!..

Мне ў тую пару было толькі дзевятнаццаць, а ўжо давялося паваяваць і ў партызанскім атрадзе, а з 1944 г. быў у Чырвонай арміі.

Дзень 16 красавіка асабліва ўрэзаўся ў памяць. Пасля двухгадзіннай артпадрыхтоўкі пайшлі ў атаку. Я быў мінамётчыкам. Толькі мы падняліся ў атаку, як з фашысцкіх пазіцый пачаў біць кулямёт.

Камандзір загадаў падавіць агнявую кропку. Прыцэльным агнём пачалі біць па ворагу. Нямецкі кулямёт змоўк. За паспяхова выкананы загад мяне ўзнагародзілі медалём «За адвагу».

У апошнія дні красавіка наша дывізія абышла Берлін з паўночна-заходняга боку і завязала вулічныя баі. Яны ішлі цэлыя суткі. Мы амаль валіліся ад стомы. «Па якой цэлі б'ём?» — цікавіўся я ў камандзіра. Аказалася, што па рэйхстагу.

Адзін са снарадаў трапіў у будынак, дзе мы ўкрыліся і мяне засыпала. Толькі раніцай наступнага дня мяне вызвалілі з каменнага палону. Я застаўся жывым. Усе мы радаваліся вясне, цішыні. Гэта быў дзень 1 мая.

## Жанчынам на вайне цяжэй

### З успамінаў М.Каньковай, ветэрана вайны

У першы ж дзень вайны прасілася на фронт. Адказалі, што жанчын не бяруць. Дабілася ўсё ж свайго. Накіравалі мяне ў Кемераўскую ваенную школу малодшых ваенных спецыялістаў. Атрымаўшы званне малодшага сяржанта і спецыяльнасць майстра па электраабсталяванні самалётаў, трапіла ў 783-і штурмавы авіяцыйны полк. З ім і дайшла да Берліна.

Мы былі ў рэзерве Галоўнага камандавання, нас перакідвалі з фронту на фронт, звычайна пры прарывах. Так было на Арлоўска-Курскай дузе, у час вызвалення Беларусі, Польшчы, разгроме гітлераўцаў ва Усходняй Прусіі. Дзень перамогі сустрэлі ў 17 кіламетрах ад Берліна. Які гэта быў дзень! Слёзы і радасць разам. Успаміналіся таварышы, якія загінулі, было іх нямала.

Вайна і жанчыны. Гэтыя два словы не сумяшчаюцца. Але мы іх сумясцілі. Цяжка было мужчынам, а нам яшчэ цяжэй. Усе мы імкнуліся да аднаго — да перамогі.

Свой баявы полк я пакінула ў верасні 1945 г. і зноў пачала працаваць у школе, была на партыйнай і савецкай рабоце.

## Салдацкі салют

### З успамінаў К.Швядко

169-ы гвардзейскі стралковы полк 1-й Маскоўскай дывізіі знаходзіўся на адпачынку на ўскраіне Кёнігсберга, ва Усходняй Прусіі. Наперадзе былі баі за гарады Кужум і Лібава. Салдаты нашага 3-га стралковага батальёна размяшчаліся ў адным з цагляных будынкаў нямецкай фермы.

Было дзесьці каля двух гадзін ночы, калі нечакана і неяк незвычайна гучна і працягла прагучала ў калідоры каманда днявальнага: «Пад'ём, трывога!».

Салдаты імгненна ўскочылі, у спешцы разабралі сваю зброю. Высветлілася, што дзяжурны афіцэр штаба палка паведаміў ва ўсе падраздзяленні, што закончылася вайна, фашысцкая Германія капітулявала. Салдаты абдымаліся, цалаваліся, віншавалі адзін аднаго з перамогай. Гучна крычалі «ўра!»

Нехта даў аўтаматную чаргу. Гэта і стала пачаткам усеагульнага пераможнага салюту.

Аднекуль з'явіліся акардэон і скрыпка. Пачаліся танцы. Настала раніца. Байцы прывялі сябе ў належны выгляд. Камандаванне батальёна арганізавала мітынг, камандзір горача павіншаваў усіх з перамогай.

Гэты дзень на ўсё жыццё застанецца ў маёй памяці.

## Нас вітала Прага

### З успамінаў І.Клопава



І.П.Клопаў.

У армію мяне прызвалі перад вайной, але на фронт трапіў толькі ў снежні 1943 г. Мяне накіравалі ў 5-ю мінамётную брыгаду.

Наша армія была ў наступленні і нам, сувязістам, хапала работы. Ніколі не забудуцца баі на тэрыторыі фашысцкай Германіі. Асабліва фарсіраванне Одэра. Менавіта за ўдзел у гэтай аперацыі я атрымаў падзяку ад Вярхоўнага галоўнакамандуючага і ордэн Чырвонай Зоркі.

Мне і майму памочніку далі загад перайсці ноччу раку і наладзіць сувязь. Паўзлі мы па тонкім лёдзе, а дзе немагчыма было прапаўзці, перакідвалі дошкі і пераходзілі па іх. Так дабраліся да другога берага. Разведалі мясцовасць і звязаліся са штабам палка. Неўзабаве нашы часці пайшлі ў наступленне. Пад моцным агнём фарсіравалі Эльбу.

Пачалася Берлінская аперацыя. Наша мінамётная брыгада таксама ўдзельнічала ў ёй. Аднак сам Берлін мы не бралі. Брыгаду знялі з фронту і накіравалі на Прагу. 9 мая мы ішлі калонамі па вуліцах горада. Жыхары Прагі сустракалі нас са слязьмі радасці і з кветкамі. Нас віталі і дарослыя, і дзеці. Нашы твары свbadціліся гордасцю за сябе, за ўвесь савецкі народ, які адолеў фашызм, пераможна завяршыў вайну.

Пасля службы ў Савецкай арміі. Вярнуўшыся дадому, доўгі час працаваў у органах унутраных спраў. За мірную працу ўзнагароджаны медалямі «Ветэран працы», «За бездакорную службу».

## Апошні бой

### З успамінаў М.Каліноўскага

Наш 38-ы гвардзейскі стралковы полк 14-й гвардзейскай дывізіі 1-га Украінскага фронту вёў баі з гітлераўскімі войскамі на Дрэздэнскім напрамку. У гэты час многія фашысцкія падраздзяленні берлінскага гарнізону здаваліся ў палон. Нам зачыталі зварот ваеннага савета фронту аб дапамозе паўстаўшай Празе. Гітлераўцы вырашылі патапіць у крыві паўстанцаў чэхаславацкай сталіцы.

Кароткія зборы і наш полк на аўтамашынах і танках рушыў на Прагу. Ішлі з баямі. Асабліва гарачымі яны былі пры пераходзе Судзецкага перавалу ў Карпатах. Вораг аказваў упартае супраціўленне, замініраваў дарогі і масты, зрабіў завалы з векавых дубоў.

...Перасяклі дзяржаўную граніцу Чэхаславакіі. Мясцовыя жыхары плакалі ад радасці, дарылі нам кветкі, запрашалі ў госці. Мы рухаліся без перапынку. Заняўшы прыгарад Прагі, мястэчка Жадзец, мы даведаліся, што ў Берліне фашысцкае камандаванне падпісала акт аб капітуляцыі. А ў Празе фашысты не здаваліся. Вялі баі з засад, з вокнаў дамоў, з закапаных танкаў і штурмавых гармат. Асабліва жорсткія баі былі на падыходзе да Пражскага крамля. Але нішто не магло спыніць нашы войскі.

Ва ўсёй сваёй прыгажосці паўстала перад намі Прага з яе шматлікімі залатымі купаламі. Яшчэ ішлі баі, савецкія байцы дабівалі супраціўляючыхся гітлераўцаў, а на вуліцы выйшлі людзі. Вызваленне Прагі для нашага палка было апошняй баявой аперацыяй.

## З батарэі цяжкіх гармат

Вайна застала Васіля Маркіянавіча Клопава на Украіне, каля Львова, дзе ён служыў у палку цяжкай артылерыі рэзерва Галоўнакамандуючага. Абараняў Кіеў і Харкаў. Здарылася так, што батарэя цяжкіх гармат на станцыі Фастаў, што пад Харкавам, аказалася на перадавой лініі. Тут прыйшлося артылерыстам быць і аўтаматчыкамі

і гранатамётчыкамі. У гэтым баі артылерыя поўнасцю апраўдала сваю назву «Бога вайны». Дзесяткі фашысцкіх аўтамашын і танкаў знішчылі нашы артылерысты.

З Паўднёва-Заходняга фронту трапіў на Паўднёвы. У 1942 г. у баях за Закаўказзе старшына В.М.Клопаў быў цяжка паранены. Некалькі месяцаў праляжаў у шпіталі. Затым зноў фронт. Вызваляў Аўстрыю, Чэхаславакію. Перамогу святкаваў на чэхаславацкай зямлі, у раёне Астраўскай Маравіі. Адтуль ён дэмабілізаваўся, вярнуўся на родную Ушаччыну.

*У.Кавалеўскі.*



В.М.Клопаў.



І.І.Крахотка.

## Мінала смерць салдата

Іван Іосіфавіч Крахотка — чалавек шчаслівага лёсу. У якія толькі пераплёты не трапляў на фронце! У першы раз мінула смерць салдата, калі ў час тэарэтычных заняткаў бомба замаруджанага дзеяння трапіла як раз у цэнтр выкапанага сховішча. Ён быў кантужаны і паранены ў нагу. На дзіва, і ўсе астатнія засталіся жывымі. У 1943 г. ён уступіў у партыю. У той час ішлі жорсткія баі пад Варашылаўградам. Наша пяхота акапалася і вяла абарону. І.І.Крахотку і яшчэ некалькі салдат выклікалі ў штаб для ўручэння партыйных білетаў. Калі вярнуліся, сваёй часці не знайшлі, яна трапіла ў акружэнне. Кальцо акружэння было прарвана, але яго рота панесла вялікія страты — загінула амаль палова асабовага складу.

...Нарэшце ўступілі ў Германію. Да Берліна заставалася 80 кіламетраў. Але не дайшоў да яго салдат. Значная частка нашых войскаў была павернута на Чэхаславакію, дзе яшчэ моцна супраціўляліся гітлераўцы. Там і сустрэў перамогу старшы лейтэнант І.І.Крахотка.

Пасля вайны працаваў на Ушаччыне.

*В.В.Караленка.*

## Камандзір «саракапятак»

